ARCHE Зьмест № 9’06

1. Зьмест / Уводзіны
2. ARCHE :: Галоўная
3. Фольксваген. Жнівень 1991 года: нараджэнне краіны.
4. Андрэй Вашкевіч. Брыль час-почас успамінаў пра мяне.
5. Улады ў Беларусі ня маюць ніякай ідэі, апроч жаданьня застацца пры ўладзе. Гутарка з айцом Аляксандрам Надсанам.
6. Уладзімер Мацкевіч. Самавызначэньне беларускага інтэлектуала
7. Андрэй Казакевіч. Па той бок «крэольскай» праблематыкі
8. Аляксей Дзермант. У чаканні Івана Жахлівага
9. Стывэн Коўэн. Новая халодная вайна Амэрыкі
10. Дзяніс Мельянцоў. Новая халодная вайна Коўэна
11. Разгон. Успаміны дэпутатаў Вярхоўнага Савета XII склікання.
12. Георгі Навіцыян. Князь, які «прішелъ и-заморья»: гіпотэза паходжаньня Рагвалода
13. Юры Пацюпа. Найлепшы верш Цішкі Гартнага?
14. Да гісторыі Беларускай Сацыялістычнай Грамады: агляд крыніцаў
15. Марыя Вайцяшонак. Гліняны Вялес каля маёй студні.
16. Марсэль Пруст. У пошуках страчанага часу.
17. Мікола Нікалаеў. Мне 17 год. Вечарам я запісваю, што сёння бачыў і пра што думаў
18. Аляксей Бацюкоў. Мой цень на тваёй руцэ
19. Даніла Жукоўскі. Saeculorum novus nascitur ordo.
20. Павел Усаў. Геапалітычная карыда
21. Андранік Антанян. Вільня новалітоўскага пэрыяду
22. Аляксей Дзермант. Беларусы: радавод да сто трыццатага калена

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 9 (49) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

9[image]-[image]**2006**

аналітыка • крытыка • эсэістыка • гісторыя • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

[image]

Зьмест

Contents

БЛОГЕР ФОЛЬКСВАГЕН Жнівень 1991 года: нараджэньне краіны
АНДРЭЙ ВАШКЕВІЧ Брыль час-почас успамінаў пра мяне Улады ў Беларусі ня маюць ніякай ідэі, апроч жаданьня застацца пры ўладзе. Гутарка з айцом
АЛЯКСАНДРАМ НАДСАНАМ

АНАЛІТЫКА

УЛАДЗІМЕР МАЦКЕВІЧ Самавызначэньне беларускага інтэлектуала
АНДРЭЙ КАЗАКЕВІЧ Па той бок «крэольскай» праблематыкі
АЛЯКСЕЙ ДЗЕРМАНТ У чаканьні Івана Жахлівага: геапалітыка вачыма расейскіх еўраазіятаў
СТЫВЭН КОЎЭН Новая халодная вайна Амэрыкі
ДЗЯНІС МЕЛЬЯНЦОЎ Новая халодная вайна Коўэна

ГІСТОРЫЯ

Разгон. Успаміны дэпутатаў Вярхоўнага Савету XII скліканьня
ГЕОРГІ НАВІЦЫЯН Князь, які «прішелъ и-заморья»: гіпотэза паходжаньня Рагвалода

ЮРЫ ПАЦЮПА Найлепшы верш Цішкі Гартнага?
АНАТОЛЬ СІДАРЭВІЧ Да гісторыі Беларускай Сацыялістычнай Грамады: агляд крыніцаў

ЛІТАРАТУРА

МАРЫЯ ВАЙЦЯШОНАК Гліняны Вялес каля маёй студні
МАРСЭЛЬ ПРУСТ У пошуках страчанага часу.
У апрацоўцы ГАРАЛДА ПІНТЭРА і ДЫ ТРЭВІС
МІКОЛА НІКАЛАЕЎ Мне 17 гадоў. Вечарам я запісваю, што сёньня бачыў і пра што думаў
АЛЯКСЕЙ БАЦЮКОЎ Мой цень на тваёй руцэ

РЭЦЭНЗІІ

ДАНІЛА ЖУКОЎСКІ Saeculorum novus nascitur ordo
ПАВАЛ УСАЎ Геапалітычная карыда
АНДРАНІК АНТАНЯН Вільня новалітоўскага пэрыяду
АЛЯКСЕЙ ДЗЕРМАНТ Беларусы: радавод да сто трыццатага калена

[image]
[image]

№ 9 (49) - 2006

Copyright © 1998-2007 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2007/02/19
[image]

Powered by phpBB © 2001, 2005 phpBB Group

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 9 (49) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

9[image]-[image]2006

ада Зтыкату

[image] [image] [image]

ФОЛЬКСВАГЕН

аўтар Інтэрнэт-блогу TOL Belarus. Імаверна, за гэтым псэўданімам хаваецца адзін з маладых беларускіх палітолягаў.

Фольксваген Жнівень 1991 года: нараджэнне краіны

24 і 25 жніўня 1991 года паўстала сучасная беларуская дзяржава, краіна Беларусь. Не рэспубліка, не БССР, а краіна. Многія з гэтым будуць спрачацца. Адны ўзгадаюць абвяшчэнне суверэнітэту 27 ліпеня 1990 года, іншыя – Белавежскую пушчу. Але суверэнітэт быў хутчэй папяровы, а стварэнне СНД – толькі юрыдычнае афармленне таго, што адбылося дэ-факта ў жніўні.

Гэтае паўстанне было даволі кволым, не вельмі рамантычным, і таму не адбілася ў гістарычнай памяці так, як дзве іншыя вышэйзгаданыя падзеі. Нават дэкларацыю аб незалежнасці не прынялі. А так – з падачы Кебіча – пастанову «аб абвяшчэнні палітычнай і эканамічнай незалежнасці». Згодна з бюракратычным рангам, пастанова – гэта штосьці паміж прызначэннем персанальнай пенсіі якому-небудзь апаратнаму праціральніку штаноў з 40-гадовым стажам і выдзяленнем бясплатнага паліва на пасяўную. Аднак галоўнага гэта не адмаўляе. 24 і 25 жніўня ў Беларусі здарыўся цуд. Мабыць, 27-га ці 28-га гэта ўжо было б немагчыма.

Я добра памятаю гэтыя падзеі. Тады мне было 18 гадоў, студэнт 3 курса БДУ. Пабачыўшы ў блакітнай скрынцы «Лебядзінае возера» 19 жніўня, я сабраўся і паехаў у Маскву – дапамагаць Ельцыну абараняць Белы дом. Нават дзесьці ў тэчках са старымі архівамі валяецца адксераная падзяка ад яго…

Пра маскоўскі супраціў таксама варта было б напісаць – можа, некалі засяду за мемуары. У прынцыпе, людзі, якія прагнуць свабоды, паўсюль аднолькавыя, і тыя, што стаялі ля Белага дома, чымсьці нагадвалі мне потым тых, каго можна было пабачыць на вуліцах Бялграда, Кіева, Тбілісі. Хаця расейская рэвалюцыя – пэўна, заўжды трошкі «бессэнсоўная і бязлітасная». З аднаго боку, людзі пелі песні, жартавалі, імкнуліся дапамагчы адзін аднаму. З іншага – паўсюль валакліся нейкія адмарожаныя, якія патрабавалі тэрмінова расстраляць гэкачэпістаў і заяўлялі, што камуністаў вешаць не будуць, бо «вяроўкі на іх шкада». Не ведаю, на Майдане ў Кіеве не быў, цікава, ці была там хоць нейкая канцэнтрацыя гарадскіх вар'ятаў? А яшчэ смецце, смецце… Калі з'язджаў з Масквы, там скідвалі Фелікса Эдмундавіча. Шкада, не пабачыў. Наступны раз, калі будуць скідваць таго, што стаіць перад КДБ у Менску, абавязкова пастараюся не прапусціць.

Прыехаўшы ў Менск і атрымаўшы пендалёў ад бацькоў (я ім сказаў, што паехаў да бабці на Палессе хавацца ад прызыву ў «гарачыя кропкі»), здзівіўся амаль татальнай цішы і апатыі. Гэй, усе, тут імперыя ляснулася, вам што ўсім, па барабане??? Здавалася, што так. Менск быў ціхі, сонечны, чысты і не вельмі, скажам так, заклапочаны тым, што адбывалася. Рэвалюцыя адбылася выключна ў «Рэкордах» і «Гарызонтах». Думаючы пра гэта праз паўтара дзесяцігоддзі, я злавіў сябе на думцы, што, можа, так усё і мусіла быць. Бо калі б не падышоў просты памяркоўны савецкі беларус да таго, што робіцца ў Маскве, са сваім прыродным скептыцызмам, з думкай, што «паны б'юцца, а ў мужыкоў косці трышчаць», калі б дацяміў, што вось ён, твой савецкі раёк, развальваецца на тваіх вачах, што гэта ўсё вельмі і вельмі сур'ёзна – ух і не ведаю, адбыўся б гэты цуд, альбо 1994 год, у нейкай форме, адбыўся б на два з паловай гады раней…

Гэта, так сказаць, прэамбула. Цяпер амбула.

Праз усе гады лукашызму, за якія мы прызвычаілся лаяць апазіцыю, нават не верыцца, што адзін раз яна не проста выціснула амаль усё з сітуацыі, дасягнула немагчымага. Як я ўжо сказаў, у Менску – амаль агульная млявасць і амаль

абсалютная абыякавасць да… усяго. Не, на вуліцах і на кухнях толькі пра путч і размаўляюць, вось пакуль і ўсё (ну і пару соцень чалавек, што 19–21-га тусаваліся на плошчы Леніна, сённяшняй Незалежнасці, на месцы, дзе зараз паркінг). Тут даходзіць звестка, што апазіцыя здолела дамагчыся сесіі Вярхоўнага Савету. Крытычным чыннікам было тое, што сесію прызначылі 1) адразу пасля путчу, калі па ТВ яшчэ на ўсю ішла карцінка з Масквы, якая прымушала нашых апаратчыкаў накладаць у штаны па некалькі разоў у дзень, 2) якраз у той момант, калі незалежнасць абвесціла Украіна і 3) якраз у той момант, калі Ельцын пагразіў тэрытарыяльнымі прэтэнзіямі для рэспублік, што думаюць аддзяляцца. Праз тыдзень наменклатура магла б зарыентавацца, што не ўсё так страшна, паглядзела б, як «адаптаваліся» сярэднеазіяцкія баі-прэзідэнты, магло б усё пайсці павордле іхняга сцэнару. А тады пачуцце, што дэмакратычная зграя зараз абрынецца на Менск, як калісьці Тухачэўскі на Варшаву, у іх, відавочна, прысутнічала.

Вось жа, 24 жніўня – другая рэвалюцыя за тыдзень, цяпер дома. Іду зранку на плошчу Леніна. Людзі збіраюцца. Пакуль што – некалькі тысяч чалавек, шмат каго за тры гады мітынговай дэмакратыі ведаю ў твар. На нейкі момант прыходзіць адчуванне аблому: а што калі задушыць наменклатуру сілаў не хопіць?.. Першыя выступы на сесіі, Дземянцей дае слова «старой гвардыі» (сесія транслюецца праз мацюгальнікі на вуліцу). Тая палівае «агалцелых антыкамуністаў» і клянецца, што путч не падтрымлівала. Народу на плошчу прыбывае, але паціху. І тут…

Маладыя, можа, не памятаюць, а нам, савецкім дзеткам, чыталі словы Вовы Ульянава, якія ён нібыта сказаў следчаму ў турме ў адказ на пытанне: «Куды лезеш, не бачыш – сцяна!» Вова адказаў (згодна з легендай): «Сцяна – ды гнілая, ткнеш – ды разваліцца». Карацей, ткнулі. Не тое, каб вельмі моцна, але ткнулі. Апазіцыя пачынае ціснуць, уносіць у залу бел-чырвона-белы сцяг (паводле фотаздымкаў у газетах дакладна памятаю, што сцяг першы раз унёс Голубеў, а ніякі не Лукашэнка), гучаць заклікі да забароны КПБ… Але асноўным момантам, на мой погляд, было тое, як сагналі з трыбуны камуністычнага першага сакратара Малафеева. Таго самага, які адзіны з

прэзідыуму Вярхоўнага Савету СССР падтрымаў путч. Зганялі голасна і рашуча. Памятую дакладна голас Ганчара: «Вон отсюда!», побач была Сямдзянава і яшчэ некалькі дэпутатаў ад БНФ (як потым высветліцца, таксама і Лукашэнка, але хіба каб абараніць Малафеева).

Ад такога нахабства ў наменклатуры, здаецца, адбылося выдзяленне крытычнай масы адыходаў чалавечай жыццядзейнасці ў штаны. Дзядзька Дземянцей аб'яўляе перапынак, потым заяўляе, што сыходзіць у адстаўку. Фактычна, гэты момант запраграмаваў дзве падзеі. Першая, тое, што будзе каму падпісаць белавежскую дамову (пры ўсіх Шушкевічавых астатніх выбрыках і галавацяпстве, гісторыя за гэта ўрэшце апраўдае яго). Другое – тое, што Кебіч пабачыў, што партнаменклатура бездапаможная, што калі яе цяпер здаць, то ён атрымлівае ўладу (ён яе назаўтра і здаў – ціха і цынічна: потым паўладкоўваў у дэпартаменты і аддзелы). Магчыма, у гэты самы момант апазіцыя і не даціснула. Магчыма, трэ было плошчы займаць будынак і дамагчыся роспуску Вярхоўнага Савету і наступных выбараў. Магчыма, у нас не было тады свайго Саакашвілі. Але гісторыя ўмоўнага ладу не церпіць.

На працягу некалькіх гадзінаў бездапаможнасць улады адчуваецца на кожным кроку. Тут вам Ціхіню (тады сакратара ЦК) аплявалі на вуліцы. Тут пачынаецца блакада ЦК пад нацыяналізацыю маёмасці, што мае адбыцца. Блакавалі, праўда, у колькасці, супастаўнай з нейкім пікетам *неравнодушных* людей а-ля 2005-ты. Калі была б у наменклатуры палітычная воля, рэвалюцыю можна было б і спыніць. А яе не было. Не было ў Кебіча – ён і так пры ўладзе. Не было ў Дземянцея – таму што ў яго не было ніколі. Не было ў Малафеева – таму што Масквы, адкуль трэба было атрымліваць загады, ужо не было. Далей – па ланцужку. Мянты, кадэбісты, вайскоўцы – каго ім слухаць, хто галоўны, хто камандуе? Уся сістэма ўлады стала закладніцай свайго сямідзесяцігадовага халуйства перад Масквой. Калі знікла задніца, якую трэба было лізаць, аказалася, што больш яны ні на што не здатныя. Тут іх трэба было і даціснуць. Як потым высветлілася – не даціснулі.

Шкада. Можа, тыя, хто былі на нашым баку, таксама не адчулі, што ўлады няма, што яе трэба браць? Усё магло пайсці па-іншаму… Не сумняюся, дарэчы, што дэпутат Лукашэнка тыя падзеі потым узгадваў не раз. Ягоная «эліта» добра навучылася ад адваротнага з папярэднікаў – гэта ўжо факт.

На наступны дзень абвясцілі незалежнасць і прыпынілі дзейнасць КПБ. У той дзень Ельцын у Маскве акурат разбуяніўся пра межы, і схіліць камуністаў-ветэранаў да прыняцця незалежнасці было ўжо нашмат прасцей – гэта ім давала хоць нейкую гарантыю, што Ельцына тут не будзе (яны і за Віскулі потым прагаласавалі пад забабоны, што, маўляў, Гарбачова скідаем). На вуліцы народу ўжо амаль зусім не засталося. На плошчы стаяла, калі прымаліся рашэнні, ужо хіба тысяча людзей.

На Менск апускаліся хмары, цямнела, масавых народных гулянняў з нагоды нараджэння краіны не адбылося. Ваўкі засталіся сытымі (бо атрымалі незалежнасць), авечкі цэлымі (бо захавалі ўладу). Праз тры гады «маладыя ваўкі» сажруць і тых і іншых, як авечак, а потым будуць такім жа чынам спажытыя адным, самым спрытным і пражэрным…

Але ў той час пра гэта зусім не думалася.

Ну і Бог з ім. Магчыма, на той момант краіна Беларусь магла паявіцца на свет толькі так: калі хочаце, праз чорны ўваход, без чырвоных дываноў і ганаровай варты. Магчыма, тады і не даціснулі, аднак давайце лепш падумаем і ўшануем тое, што здабылі, і тых, хто тады праткнуў тую сцяну. Перш за ўсё – вядома ж, Пазьняка і апазіцыю БНФ, чыёй зорнай гадзінай жнівень 1991 года так і застаўся.

А адзначыць нараджэнне краіны Беларусь напоўніцу яшчэ будзе нагода. Засталося толькі здабыць ёй свабоду.

Друкуецца з згоды аўтара паводле: tolblogs.org/belarus/by
[image]
[image]

№ 9 (49) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/09/21**
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 9 (49) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

9[image]-[image]2006

"да Зтыкату"

ада Зтыка • гісторыя • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Андрэй Вашкевіч Брыль час-почас успамінаў пра мяне

АНДРЭЙ ВАШКЕВІЧ гісторык. Апошняя публікацыя ў «ARCHE» – нарыс «Сымон Якавюк: адраджэнец, спекулянт, манархіст і савецкі дыверсант» (5/2005). Аўтарскі загаловак эсэ – «Наш Янка Брыль».

Маё завочнае знаёмства з Янкам Брылём адбылося дзякуючы незабыўнаму Апанасу Цыхуну. У свае дзевяноста з гакам гадоў той не любіў дарэмных размоваў і звычайна гаварыў так: «Не губляй часу і не гуляйся ў ветлівасць, бяры і запісвай адрас і тэлефон, таго, што табе мы, старыя, скажам, ніхто ніколі не скажа».

З яго лёгкай рукі я пачаў перапісвацца з Арсенем Лісом і Барысом Кітом, атрымаў рукапіс успамінаў кампазітара Аляксандра Шыдлоўскага пра ксяндза Адама Станкевіча. Спачатку было ніякавата чапляцца да старэйшых са сваімі бясконцымі гістарычнымі пытаннямі, пасля прывык. Упэўненасць у справядлівасці і неабходнасці справы, якую робіш, заўсёды дадае сілаў.

Гады тры-чатыры таму ў некалькіх жыхароў Горадні ўзнікла ідэя надрукаваць збор твораў паэта, філосафа і грамадскага дзеяча са Скідзеля Пятра Сеўрука. Пётр Сяўрук у 1920-я гады паспеў стаць знакавай асобай для Скідзельшчыны і ўсяго Гарадзенскага павета. Зусім малады хлопец (у момант смерці ў 1929-м яму было ўсяго дваццаць чатыры), гарачы прыхільнік вучэння аб непраціўленні злу сілай Льва Талстога, ён, нягледзячы на рэпрэсіі паліцыі, арганізаваў у Скідзелі і

бліжэйшых ваколіцах больш за дзесятак гурткоў Таварыства беларускай школы і перапісваўся бадай што з усімі знакамітымі беларусамі таго часу. На працягу 1927 года ўзначальваў гарадзенскую акружную ўправу ТБШ, якая аб'ядноўвала пяцьдзесят тры гурткі арганізацыі, і вельмі шмат пісаў сам. Адным словам, спадчына Пятра Сеўрука была вартай асобнага выдання.

Аднак мне, які да таго часу паспеў пакаштаваць рэдактарскага хлеба з выданнем дзвюх кніжак Апанаса Цыхуна, ангажавацца яшчэ ў адзін туманны праект вельмі не хацелася, але, пакліканы абавязкам гісторыка, я паставіў перад сабою задачу сабраць максімум інфармацыі аб тым, дзе знаходзіцца большая частка агромністага рукапіснага архіва скідзельскага паэта.

Частка архіва Пятра Сеўрука была раскідана па гарадзенскіх музеях, частка знаходзілася ў розных сваякоў, што-нішто з вялікай бібліятэкі скідзельскага гуртка ТБШ захоўвалі краязнаўцы, іншае было ўвогуле невядома дзе. Трэба было шукаць і збіраць, і дапамога Янкі Брыля магла тут быць неацэннай. Ён асабіста Сеўрука ніколі не ведаў, аднак пад канец 1930-х, калі Пятра ўжо не было сярод жывых, сам моцна захапляўся вучэннем Льва Талстога і быў звязаны з дзвюма сталіцамі талстоўскага руху ў Заходняй Беларусі: Скідзелем і палескай вёскай Рачканы. Брыль яшчэ дваццацігадовым хлопцам перапісваўся з сястрой Пятра Марыяй, яе мужам Аляксандрам Мазалеўскім і іншымі скідзельскімі актывістамі, а праз шмат дзесяцігоддзяў, восенню 1986 года, надрукаваў у «Полымі» падборку вершаў Сеўрука, першую больш чым за палову стагоддзя.

Менавіта з просьбай распавесці аб тым, у каго яшчэ могуць захоўвацца рукапісы Пятра Сеўрука, вясной 2004 года я звярнуўся да пісьменніка. У тым, што ён адкажа на мой ліст, шчыра кажучы, быў амаль упэўнены, бо за папярэднія пару гадоў перапісцы з некалькімі вядомымі беларусамі пераканаўся: не так шмат народу, асабліва маладых, звяртаецца да іх з просьбамі нешта аднавіць у памяці, расказаць аб нечым, што можа быць вядома толькі ім. Саромеюцца? Не хочуць заклапочваць? Бадай не. А старому чалавеку ўвагі зашмат не

бывае.

Праўда, у адным такі мой разлік не апраўдаўся. Разлік адносна хуткасці і грунтоўнасці адказу. Ліст з Менску прыйшоў літаральна праз тыдзень (выходзіць, Янка Брыль атрымаў маё пісьмо і адразу пачаў збіраць інфармацыю) і ўражваў сваёй грунтоўнасцю. У лісце было ўсё, пачынаючы ад адрасоў і тэлефонаў тых людзей, з якімі мне трэба было абавязкова сустрэцца, і заканчваючы спасылкамі на яго ўласныя творы, дзе была тая ці іншая патрэбная мне інфармацыя. Ліст не толькі дапамог у пошуках і даў патрэбны кірунак далейшай працы, але і адназначна паказаў: да пісьменніка можна звяртацца і ў іншых, магчыма, менш неадкладных, але не менш цікавых справах.

Другой справай, у якой мог нешта высветліць пісьменнік, была гісторыя ўзаемаадносінаў двух вядомых у Заходняй Беларусі асоб: паэта Валянціна Таўлая і ксяндза Адама Станкевіча. Валянцін Таўлай, настолькі ж камуніст, як і патрыёт Беларусі, які з трынаццаці (!) гадоў не выходзіў з польскіх турмаў, у 1935 годзе напісаў даволі дзіўны верш пад назвай «Цень Сваяка». Верш быў прысвечаны памерламу яшчэ ў 1926 годзе актывісту беларускага хрысціянскага руху ксяндзу Канстанціну Стэповічу, вядомаму як паэт Казімер Сваяк. У вершы Таўлай ад імя сябе як паэта-камуніста крытыкаваў Сваяка за нявызначаную грамадскую пазіцыю. Апошні быццам шчыра імкнецца да шчасця паняволенай Заходняй Беларусі, нават «з ціхім сорамам» падсвядома чакае паўстання, бо разумее, што іначай дамагчыся гэтага шчасця нельга, але да канца стаць на бок збройнага змагання не можа. Гэты верш не меў нічога супольнага з сатырай, ён быў наскрозь прасякнуты павагай аўтара да свайго калегі па паэтычнай справе, што было надзвычай дзіўным для першай паловы 1930-х, калі камуністы не называлі Беларускую хрысціянскую дэмакратыю іначай як «беларускай нацыянал-фашысцкай партыяй».

Як паказала гісторыя, супярэчнасцяў у грамадскай пазіцыі Таўлая было не менш, калі не больш, чым у Казімера Сваяка, але ў любым выпадку, для паэта, які ў 1931–1932 гадах жыў у БССР і нават паспеў там прыняць удзел у ганеннях супраць

нацдэмаў, такі верш быў, мякка кажучы, незвычайным. І калі я, гартаючы старонкі «Віленскай праўды» за сакавік 1941 года, убачыў нататку аб тым, што ў Вільню з Менску прыехаў Валянцін Таўлай, каб сабраць матэрыялы пра Казімера Сваяка, то зразумеў – паэт-святар стаў для паэта-камуніста нечым большым, чым проста аб'ектам для абстрактнага палемізавання. Таўлай яўна крочыў шляхам ідэйнай эвалюцыі. Не, не ў бок беларускіх хадэкаў, ён застаўся ідэйным камуністам да самай смерці, а ў бок разумення іх пазіцыі, у бок разумення таго, што і тыя робяць для Беларусі сваю важную справу. На працягу 1940-х Таўлай шмат разоў сустракаўся і з ксяндзом Адамам Станкевічам. «Мілыя людзі. Беларуская стыхія чуваць у іх сільна», – напісаў ксёндз у сваім дзённіку пра Таўлая, Пестрака і Панчанку вясной 1946 года.

Яшчэ большай зацікаўленасці да справы кантактаў Таўлая і беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў дадалі радкі з дзённіка Максіма Танка за пачатак жніўня 1944 года: «Наведаў ксяндза Адама Станкевіча. Кіра расказвала, што ён уратаваў ад расправы групу камсамольцаў і памог вызваліць з нямецкіх лап Валянціна Таўлая». Таўлай, актыўны падпольшчык, трапіўся немцам выпадкова. У верасні 1943-га ён вяртаўся з Вільні на Наваградчыну і заехаў да сваякоў у Ліду. У Лідзе акурат ішлі арышты заложнікаў за забітага колькі дзён таму Вільгельма Кубэ. Бацька Таўлая, як былы грамадовец, лічыўся ў спісах ненадзейных, таму яго разам з сям'ёй арыштавалі сярод першых. Таўлая з турмы выцягнулі, бацька і сястра загінулі ў Асвенціме. Янка Брыль, які адразу пасля вайны сябраваў з Таўлаем і працаваў разам з ім, мог крыху высветліць абставіны вызвалення паэта. Ліста ад пісьменніка, як і ў папярэднім выпадку, доўга чакаць не давялося:

18.V. 04

Паважаны Андрэй!

Пра ксяндза Адама Станкевіча я нямала чытаў у свой час у заходнебеларускім друку, чытаў і ягоныя працы, нямала добрага ў 1945–1946 гадах чуў пра яго ад Валянціна Таўлая. Што да справы вызвалення Таўлая з лідскай турмы і чутак пра ўдзел у

гэтым кс. Адама нічога пэўнага сказаць не магу, – не чуў пра гэта ні ад самога Валянціна, ні ад яго жонкі, ні ад яго таварышаў па падполлі ў Наваградку і Лідзе – Леаніда Барысаглебскага і Ніны Тарас. Усе гаварылі і пісалі толькі пра спробы віленскіх сяброў прыняць адпаведныя меры, аднак ніхто з тых сяброў не быў персанальна названы. Калі б кс. Адам у той цьмяна акрэсленай акцыі прымаў удзел, Валянцін ад мяне гэтага не хаваў бы, – у сяброўстве мы былі ўзаемна шчырымі. З кс. Станкевічам ён, можна сказаць, сябраваў і даволі часта сустракаўся, ездзячы ў Вільню па справах музея Янкі Купалы, і ўтойваць той выратавальны ўдзел, калі б ён быў, не было б ні патрэбы, ні сэнсу.

Усяго добрага!

Янка Брыль.

Гледзячы па ўсім, Іван Антонавіч ды, мабыць, і сам Валянцін Таўлай не да канца ведалі абставіны таго лідскага выратавання. Шмат што праяснілася праз год падчас маёй размовы з Янкам Брылём у Менску і пасля некалькіх архіўных знаходак. Іван Антонавіч расказаў, што Валянцін Таўлай пасля верасня 1939-га ажаніўся са сваёй партыйнай таварышкай, былой сяброўкай КПЗБ, якую звалі Кіра. Жыццё ў іх не складвалася, і напярэдадні вайны яны ўжо былі на мяжы расстання. Калі на Ліду 22 чэрвеня ўпалі першыя бомбы, Кіра рушыла на ўсход, а Валянцін застаўся ў горадзе. Хтосьці паведаміў апошняму, што Кіра загінула падчас бамбёжкі. Таўлай даведаўся, што Кіра жыве, толькі ўвесну 1944-га, калі ўжо жыў разам са сваёй другой жонкай Лідзіяй. Аказаўшыся супраць волі «дваяжонцам», Таўлай нічога іншага не мог зрабіць, як напісаць сумна-лірычны верш, які, мне здаецца, ніколі не друкаваўся, таму варта яго зацытаваць поўнасцю:

Мае вы мілыя! Я – не султан,
А проста – чалавек, жыццём за жабры ўзяты,
Са стажам і паэт, і арыштант,
І кандыдат ад Магілёва ў дэпутаты.
Калі я шчасцю вашаму мяжа,

Навекі трактарам завалу заарыце,
Пакорна буду я пад скібаю ляжаць,
А вы – збірайце васількі ў жыце.
І не кляніце вы мяне
За вечную тугу душы паэта дзікай,
Падзолу бездані нат вершам не заткнеш,
На гэта ў сведкі вас магу паклікаць.

4.V.1944

Але бліжэй да справы выратавання Таўлая з лідскай турмы восенню 1943-га. Аб тым, што ксёндз Адам Станкевіч дапамагаў вызваленню паэта, паведаміла Максіму Танку менавіта Кіра, Лідзія падрабязнасцяў магла і не ведаць, пісала толькі, што віленскія сябры збіралі на выкуп грошы і золата. У сваю чаргу ва ўспамінах Янкі Шутовіча пра В. Таўлая, якія захоўваюцца ў рукапісных фондах бібліятэкі Акадэміі навук Беларусі, ёсць прамое ўказанне на той факт, што вызваліць Таўлая дапамог былы калега Шутовіча па Беларускай хрысціянскай дэмакратыі і паплечнік Адама Станкевіча Адольф Клімовіч, які ў той час працаваў перакладчыкам пры гэбітскамісарыяце горада Ліды. Так ці інакш, але гісторыя стасункаў Таўлая і Станкевіча яшчэ патрабуе больш грунтоўнага вывучэння.

Такім чынам вясной 2004-га кантакт з Янкам Брылём быў наладжаны. Колькі разоў на просьбу Апанаса Цыхуна даводзілася яму тэлефанаваць. У сваю чаргу і ён стараўся максімальна пашырыць кола маіх завочных знаёмстваў, даслаў адрасы і тэлефоны пляменніка Пятра Сеўрука, журналіста Міколы Дзелянкоўскага і гісторыка Анатоля Сідарэвіча.

У сярэдзіне кастрычніка прыйшла ад Івана Антонавіча трывожная нататка: *«Паважаны Андрэй! Напішыце, калі ласка, ці атрымалі вы пасланыя мною пісьмо і кніжку, недзе ў самым канцы жніўня або ў пачатку верасня»*. Ага, значыць Янка Брыль паслаў мне сваю кнігу (напэўна, з аўтографам), а яна недзе згубілася. Дрэнна. Прыйшлося тэлефанаваць, тлумачыцца. Брыль, таксама як і мая маці, паспрабаваў дапасці да справядлівасці. Схадзіў на пошту, але паколькі ліст з кнігай

быў не заказны, то ніякіх канцоў адшукаць не ўдалося. З Менску кніга выйшла, а ў Горадню не трапіла. Але якой бяды! У пачатку снежня такі прыйшоў пакунак з кніжачкай «Блакітны зніч», у якую была ўкладзена навагодняя паштоўка: *«Прыміце, дарагі Андрэй, мае найлепшыя Навагоднія пажаданьні, а таксама кніжыцу, такую ж як тая, што загінула ў паштовых нетрах»*. У кнізе ў вочы кідаліся два фотаздымкі. На адным Іван Антонавіч са сваёй будучай жонкай яшчэ тады, недзе пад канец трыццатых (такія маладыя і прыгожыя), на другім яны абодва праз шэсцьдзесят гадоў недзе ўжо ў новым тысячагоддзі. Вельмі мала, дарэчы сказаць, змяніліся, унутрана канечне. Часта і цяпер, разгортваючы «Блакітны зніч», спыняюся на гэтай старонцы. Ці ж можа такое быць, больш за паўстагоддзя разам!

2005-ты прынёс новую прыемную неспадзяванку. Пляменніца Пятра Сеўрука, з якой я пазнаёміўся ў Скідзелі ў снежні 2004-га і якая нават гаварыць не хацела пра тое, што пакажа нешта з работ свайго дзядзькі, усё ж такі рашылася і 25 сакавіка прынесла вялізарны пакунак матэрыялаў Пеці – безліч перапіскі, сшыткі з творамі, лекцыі, якія ён чытаў у 1920-х скідзельскім тэбэшоўцам… Сярод папер было і некалькі пазнейшых лістоў, ужо з канца 1930-х, перапіска беластоцкага філосафа Іосіфа Вігдорчыка з першым мужам Марыі Сяўрук Аляксандрам Мазалеўскім. Корпаючыся ў брудных і падпаленых аркушыках, раптам патрапіў на некалькі лісточкаў танюсенькай рысавай паперы, спісаных рукою Вігдорчыка: *«Милый, дорогой Ваня! Получил твоё письмо от 15 с. м. Глубоко в душе переживаю всё тобою рассказанное, чувствуя то, что тобою пережито и переживается»*. Які Ваня? У правым куточку ліста па-польску была напісана адрэса: Ян Брыль, вёска Загора, павет Стоўбцы, пошта Турэц. Дык гэта ж копія ліста, які Вігдорчык вясной 1937-га даслаў дзевятнаццацігадоваму Янку Брылю, а гэтую копію адправіў у Скідзель! Размова ў лісце ішла пра справу Мішы, брата Івана Антонавіча. Вясной 1937-га ён, як ідэйны пацыфіст, адмовіўся служыць у войску і, седзячы ў турме, чакаў суда. Заступніцтва Вігдорычка і замежных пацыфістаў не дапамагло. Міша атрымаў год турмы і пасля ізноў быў пастаўлены «пад ружжо», каб у верасні 1939 года разам з Янкам трапіць у пекла Другой сусветнай. Знаходка

расчуліла і мяне і Івана Антонавіча, якому я даслаў копію з копіі ліста. Пару разоў гаварылі па тэлефоне. Іван Антонавіч сказаў, што арыгінал ліста прапаў шмат гадоў таму і яму шмат чаго ўдалося аднавіць у памяці дзякуючы гэтым некалькім паперкам. Магчыма, ён нават нешта занатаваў у свае дзённікі.

У адным з лістоў Іван Антонавіч напісаў: *«Само сабою, калі будзеце ў Мінску, званіце ды заходзьце, трэба ж нам і пабачыцца, і пагаварыць»*. Я і сам ведаў, што трэба, таму, маючы афіцыйнае запрашэнне, пачаў чакаць адпаведнай нагоды.

Нагода надарылася ў пачатку чэрвеня, калі мне трэба было ехаць у Менск здаваць аспіранцкі экзамен і чытаць даклад на адной гістарычнай канферэнцыі.

У Менск прыехаў як звычайна а сёмай і, папіўшы на вакзале кавы, пешшу пайшоў у акадэмію. Экзамен здаваў разам з аспірантамі з нейкага хімічнага інстытута, таму перакладаць з англійскай прыйшлося тэкст пра шкоднасць курэння і празмернай вагі для арганізма чалавека. Праўда, выкладчыца аказалася надзвычай добрым чалавекам, і, абмеркаваўшы з ёю на ангельска-беларускай трасянцы грамадска-палітычную сітуацыю ў краіне, я атрымаў сваё незаслужанае «выдатна». Пасля сустрэўся з менскім гісторыкам Алесем Пашкевічам. Каля чатырох апоўдні развіталіся, і я з аўтамата насупраць акадэміі набраў Брылёў нумар, пацвердзіўшы сваё хуткае ў яго з'яўленне.

Дом шукаў доўга, ледзь не гадзіну і, убачыўшы на сцяне вялікага вуглавога шматпавярховіка чаканы нумар, уздыхнуў лёгка, бо торба з сабраным маці пайком на тры дні побыту ў Менску і пачак ксераксаў ад Алеся добра адцягнулі рукі.

Перагаварылі па дамафоне, хуценька падымаючыся па лесвіцы пачуў, як адчыняюцца дзверы. На парозе стаяў вялізарнага росту стары з кульбай. Стары ўсміхаўся: «Во, а мне Міхась Казлоўскі сказаў, што вы невысокі, то я сабе вас і ўяўляў невысокім, а вы яшчэ які высокі».

Хм, я ледзь не пакрыўдаваў на спадара Міхася, бо пры ўсёй сваёй згорбленасці ніколі не лічыў дадзеныя мне Богам

сантыметраў нізкім ростам, хаця, у параўнанні з дзядулем, што стаяў перада мною… Рост Івана Антонавіча сягаў, як я адразу прыкінуў, блізка двух метраў. Гэта быў сапраўдны марскі пехацінец!

У кабінеце было ўтульна: стол, некалькі крэслаў, канапа, кнігі і бюст Якуба Коласа. З Коласам, наколькі памятаю, Брыль быў добра знаёмы.

Хвілін праз дзесяць-пятнаццаць зазваніў тэлефон. Іван Антонавіч перагаварыў і, паклаўшы слухаўку, задаволена ўсміхнуўся: «Дочкі, гляджу, узялі нада мною апеку, мабыць, згаварыліся, звоняць праз дзень, то адна, то другая». Увогуле шчырая любоў Івана Антонавіча да ўсяго свайго сямейства адразу кінулася ў вочы. А з якім захапленнем ён, паказваючы сямейныя здымкі, расказваў пра самых маленькіх! З нейкай сур'ёзнай, вясковай павагай да маленькага чалавечка. Такую павагу рэдка цяпер сустрэнеш, асабліва ў мужчыны.

Змест нашай размовы паспрабую перадаць па сціплых нататках, што рабіў сабе на паперцы, і, асноўным чынам, па памяці, таму на даслоўную дакладнасць не прэтэндую, але за атмасферу размовы і яе галоўныя акцэнты гатовы паручыцца галавою.

Доўга гаварылі пра Пятра Сеўрука, Міхася Васілька і ўсё звязанае са Скідзелем беларускае асяроддзе, разглядалі фотаздымкі.

У Гродне я не быў з 1985 года, а да гэтага бываў часта, асабліва ў 1950–1960-х, калі вандравалі па Гродзеншчыне з Калеснікам, заязджалі ў Баброўню да Платона Касцевіча, да майго яшчэ армейскага сябра Мышкі…

Праўда, і той мой апошні побыт быў не дарэмны, менавіта тады бачыўся апошні раз з сястрой Пятра Марысяй. Калі яе брат памёр восенню 1929-га, яна склала ў куфар усе яго рукапісы і захоўвала іх як самае дарагое больш чым семдзесят гадоў. Мы разам з Міколам Дзелянкоўскім папрацавалі з рукапісамі Пятра Сеўрука і надрукавалі тую падборку яго вершаў у «Полымі». Але

ж бачыш, старая нават нам усяго братавага не паказвала, –

засмяяўся Іван Антонавіч, – *добра, што хоць дачка да цябе дайшла.*

Сябрам Пятра быў Даніла Скварнюк, – тут Брыль перадаў фотаздымак шыракаскулага мужчыны ў пінжаку, – *грамадовец, таксама пацыфіст, разводзіў пчолы і выдатна клаў печкі. Быў ажаніўшыся з другой сястрою Пятра Воляй. Разам з аднавяскоўцамі ў 1943-м яго расстралялі немцы ў Пузавічах. Менавіта ён адмовіўся выратаваць сябе і сваіх сямейнікаў, калі яго пазнаў афіцэр-карнік, бо Даніла колісь у гэтага афіцэра перакладаў печку. Ён і не мог іначай, бо быў самым аўтарытэтным на вёсцы чалавекам, своеасаблівым яе грамадскім сумленнем, разумееш... Пра тое, як загінулі Даніла і Вольга, расказаў мне стары Якуб Сяўрук, бацька Пятра, Вольгі, Марыі і іншых. Яго, разам з іншымі скідзельцамі, немцы прымусілі вывозіць з Пузавічаў нарабаванае дабро. У бацькі на вачах расстралялі дачку. Па матывах і напісаў сваё «Memento mori».*

Адразу ўспомніліся словы гарадзенскага гісторыка Сяргея Токця аб тым, што печкі, складзеныя Данілам Скварнюком, дасюль грэюць мноства хатаў у Скідзелі і ваколіцах, а старэйшыя людзі ў самога Скварнюка і ўсіх іншых талстоўцаў успамінаюць галоўнае дзівацтва: тыя не елі мяса. Праўда, падумаўшы, дадаюць: «Яны хацелі, каб Беларусі лягчэй было».

Пасля пачалі ўвогуле пра Заходнюю Беларусь.

Я з хлопцамі ў сваім Загоры летам трыццаць восьмага арганізаваў дзве пастаноўкі, адну па-беларуску, адну па-польску. Аншлаг быў. Пасля вырашылі паўтарыць у мястэчку, і тады войт ставіць беларускі спектакль мне забараніў, сказаў «пас гранічны, нельга». То мы тую пастаноўку, што была па-польску, так адыгралі. Людзі яшчэ прасілі.

Першы свой верш надрукаваў у 1938 годзе ў «Шляху Моладзі». Проста паслаў туды і ўсё. Зараз пакажу.

Іван Антонавіч пачаў перакладаць паперы, а я тым часам падумаў: «Так, значыць Адама Станкевіча не ведаў і віленскага асяроддзя не ведаў. Але ж во як было, праз дзесяць гадоў пасля Грамады, калі ў Заходняй Беларусі не засталося ніводнай беларускай школы, самі па сабе, фактычна, па вёсках вырасталі такія. І пачынаў з вершаў. Дзіўная традыцыя Заходняй Беларусі, за дваццаць міжваенных гадоў – цэлы тузін выдатных паэтаў: Танк, Арсеннева, Ільяшэвіч, Сваяк, Машара… і ніводнага вартага ўвагі празаіка. Хм, і паэт-Брыль памёр разам з вераснем 1939-га, нарадзіўся Брыль-празаік».

«Во, глядзі», – вывеў мяне з задумення Брылёў голас. Я ўзяў у рукі перафатаграфаваную старонку часопіса. Верш «Апошнія крыгі» размешчаны побач са знакамітым здымкам ураду Беларускай Народнай Рэспублікі. Ага, акурат у сакавіку 1938 года беларусы святкавалі дваццатыя ўгодкі абвяшчэння незалежнасці БНР. Святкаванне было сумнае, бо ўсё беларускае па абодва бакі Рыжскай мяжы ледзь-ледзь ліпела, было задушана да самай неймавернай ступені, але некаторыя, асабліва заходнебеларускія хрысціянскія дэмакраты, трымаліся. Стараліся не забывацца на ідэал, на свята і падтрымоўвалі дух у маладых – такіх, як Янка Брыль. Вось і паставіў рэдактар «Шляху Моладзі» цалкам лірычны верш каля здымка з урадам БНР. «Лёд ламаюць крыгаломы…» – сімвалічна, хаця за гэты сімвалізм пад канец саракавых у БССР можна было загрымець у лагер гадоў на пятнаццаць. Каб даведаўся які шкоднік, то ўзыходзячая зорка маладога трыццацізнечымгадовага празаіка магла згарэць вельмі хутка.

Іншыя рэчы, якія «Шлях Моладзі» надрукаваў у 1939-м, я не ўбачыў, быў у войску. Убачыў іх толькі гадоў праз дзесяць, калі корпаўся ў віленскіх бібліятэках.

Фактаў для мяне было зашмат, і я, губляючы нітку расповеду, час-почас аўтаматычна пераводзіў позірк на перамаляваны Міхасём Брылём партрэт Талстога мастака Ге. «Хлопчыкі, хлопчыкі. Талсты, непраціўленне злу сілай, ідэйны, моцны пацыфізм… А менавіта на ваш час і вашу маладосць выпала

эпоха мячоў. Як хутка давялося сціснуць зброю і забіваць! Як уся ваша вера ў дабрыню і людзей ацалела пасля ўсяго, што давялося перажыць і ўбачыць на Вестэрплятэ ці ў Налібоцкіх лясах? Здаецца, чытаў «Птушкі і гнёзды», а ўсё адно не разумею, не разумею…»

Калі я выказаў захапленне творамі Аляксея Карпюка, Брыль адзначыў:

Аляксей быў шалёна адважны хлопец, фактычна так і застаўся да самай смерці гэтым заходнебеларускім камсамольцам, што па начах развешвалі сцягі на тэлеграфных слупах і раскідвалі лістоўкі. Адважны, прынцыповы і надзвычай працавіты. Сваю «Дануту» перапісваў, мабыць, разоў пятнаццаць і заўсёды прысылаў новы варыянт мне. Гэта ж фізічна трэба было адолець такую работу. Я яму кажу: «Лепш перапрацуй грунтоўней», але яму, як маладому, таропка было.

З гэтага месца трэба падрабязней. Менавіта з кніг Аляксея Карпюка пачыналася мая зацікаўленасць заходнебеларускай гісторыяй. Ён пісаў пра свае маладыя гады, Заходнюю Беларусь, партызаншчыну неяк жыццёва, дыялектычна, без звычайных для савецкіх гісторыкаў і пісьменнікаў штампаў. Не выхваляў сябе, хаця за свае баявыя заслугі рэкамендаваўся на Героя Савецкага Саюза і меў ад палякаў ордэн «Віртуці Мілітары». І, галоўнае, пісаў толькі праўду.

Асабліва запалі ў душу два сюжэты з яго аповесцяў. Першы пра тое, як аднавяскоўцы біліся паміж сабою, пачуўшы з Менску па радыё, што Дварчанін, Рак-Міхайлоўскі, Валошын, Мятла і ўсе іншыя паслы польскага сейма, якія ў 1932-м выехалі ў БССР, насамрэч польскія шпіёны. Адныя, прывыкшы свята верыць слову Масквы, гаварылі, што так, сапраўды шпіёны, іншыя, якія больш верылі самім сабе, хапалі іх за грудкі. Другі сюжэт пра хлопца, сябра КПЗБ, які ўцёк у БССР, але праз пару месяцаў вярнуўся, паведаміўшы сваім здзіўленым сябрам, што ў Менску па хлеб стаяць агромністыя чэргі і прадаюць галошы з кардону, якія развальваюцца пасля першага дажджу. Хлопца дружна асудзілі ўсёй вёскай як польскага шпіёна, і той неўзабаве

ўтапіўся ў неглыбокай ручаіне.

Нешта падобнае давялося знайсці пасля і ў «Птушках і гнёздах». Янка Брыль напісаў пра адзінага камуніста ў сваім Загоры, які на ўсіх вечарынах і сходках вельмі горача бараніў палітыку Сталіна і ўсё тое, што адбывалася там, на ўсход ад Стоўбцаў. Але аднойчы і яго вера абрынулася. Прачытаўшы аб нейкіх чарговых расстрэлах «ворагаў народу», ён надрыўна заплакаў, гаворачы: «І што ж ён там, Бацька, вырабляе?». Ніхто з гісторыкаў нават блізка не перадаў атмасферы таго часу, гэта зрабілі толькі Аляксей Карпюк і Янка Брыль.

У гэтым самым кантэксце пісьменнік выказаўся і пра свайго старога даўно памерлага сябра Якуба Міска, аповесць якога «Было яно калісьці» я прачытаў літаральна за месяц да сустрэчы. Міско ў канцы дваццатых вучыўся ў Віленскай беларускай гімназіі, разам з Таўлаем, Урбановічам, Барысаглебскім і іншымі арганізаваў там забастоўку і быў здадзены паліцыі дырэктарам Радаславам Астроўскім. Пачалася цяжкая этапная дарога, якая, здавалася, скончылася для яго ў 1939-м, але

Якуб прыйшоў з фронта маёрам, з некалькімі ардэнамі Леніна і Чырвонага Сцяга, паехаў да сябе на вёску, і калі там даведаўся, што яго бацьку і брата, былых кэпэзэбоўцаў, забрала НКВД, упаў на зямлю і курчыўся на ёй ад бяссілля.

Памаўчалі. Кожны аб сваім і аб супольным адначасова. Тады ён, наўмысна расцягваючы словы, сказаў: «Ведаеш, Андрэй, а гэта будзе трагедыя «пачышчэ» шэкспіраўскай». Я выдатна разумеў, пра што ён гаворыць. Сапраўдная, трагічная і разам з тым гераічная гісторыя КПЗБ, Грамады і гісторыя ўсяго заходнебеларускага нацыянальна-вызваленчага руху яшчэ чакае і свайго майстра прозы і свайго гісторыка.

Галоўнае, аднак, Брыль пацвердзіў: і прафесар Барысаглебскі, і Міско, і іншыя яго знаёмыя вучні Віленскай беларускай гімназіі ўспаміналі пра Адама Станкевіча з бязмернай павагай, а ўсё нядобрае, што даводзілася ім пісаць пра яго і яго партыю пасля

вайны, было не больш чым данінай празмерна пільнай савецкай цэнзуры. Без гэтага нельга было б надрукаваць увогуле нічога.

«Так, цяпер трэба перакусіць», – сказаў мой суразмоўца і рашуча падняўся з крэсла. На мае слабыя пратэсты адрэзаў кароткім: «Сядзі», і знік за дзвярыма.

Пакуль Брыль запарваў гарбату і бразгаў на кухні талеркамі, я, папярэдне папрасіўшы дазволу, зрабіў два тэлефанаванні. Першае – дахаты бацькам, каб паведаміць аб выніках экзамену, другое сваім «залатым валасам», з якімі ў мяне, як пісаў Караткевіч, «мабыць, такі падыходзіў да заканчэння кароткі няўдалы раман». «Залатыя валасы» ў момант нашага знаёмства, гады за два да таго вечара, былі дасціпнай, разумнай і адчайна смелай шаснаццацігадовай дзяўчынкай, якая, пасля неяк незаўважна пасталеўшы, аднойчы сказала: «А ничего между нами и не было. И вообще, ты хотел, как у Короткевича, вот и получил, как у Короткевича». Вонкава я быў з ёю згодны, усё было акурат так, але я пакутліва хапаўся за яе голас і нават маўчанне ў слухаўцы, хаця і адчуваў, што яна рэагуе на ўсе мае адмоўныя і станоўчыя эмоцыі толькі таму, што не хоча пакрыўдзіць старога знаёмага. Але ізноў і ізноў, набіраючы нумар яе тэлефона, не пераставаў спадзявацца, што маё шчасце можа быць і яе шчасцем, паколькі нашае сяброўства і ўсё тое большае за сяброўства, што было паміж намі, пачыналася не з дыскатэкаў і гулянак у агульных знаёмых, а з Нёмана, Каложы і водару суніцаў, якія яна ў кубачку маршрутным аўтобусам са сваёй вёскі везла для мяне ў прапахлы гарачым асфальтам ліпеньскі горад…

«Андрэй», – пачуўся з кухні голас, і я пайшоў туды. Пілі гарбату, закусваючы яе батонам з сырам і кавалкамі смачнага ці тое хатняга, ці тое вельмі добрага крамнага сальцісону. Я сядзеў, зручна ўладкаваўшыся каля сцяны на вуглавой канапцы чырвонага колеру, ён – на крэсле насупраць вакна і часам падсоўваў мне то тую, то іншую страву. За гарбатай неяк адышлі ад гісторыі і пачалі гаворку аб надзённым.

Брыль усміхнуўся: *«У мяне два суседы-«афганцы», адзін быў салдацікам, дык той прадпрымальнік, усё круціцца-круціцца,*

грошы зарабляе, а другі, падпалкоўнік у адстаўцы, зусім іншы. У яго два сыны, абодва ў беларускім ліцэі, на заняткі ходзяць па нядзелях, вучацца, як падпольшчыкі. А як у вас?»

А што ў нас. Тое самае, што і паўсюль. Я пачаў расказваць, спачатку без асаблівага жадання, пасля вір думак, як заўсёды, зацягнуў поўнасцю. Разказваў доўга. Пра тое, што наш гарадзенскі беларускі ліцэй памёр не сваёй смерцю яшчэ ў 2000-м. Пра старых, апошніх са змагарнага заходнебеларускага пакалення, якія сядзелі за завалеными накрыўкамі і цыбульным лушпіннем сталамі і пакутліва ўспаміналі чыны сваёй нікому не патрэбнай маладосці: бойкі з паліцыяй на кірмашовых плошчах напаўвымерлых цяпер мястэчак, беларускія спектаклі ў сялянскіх хатах, словы песні «Ад веку мы спалі...». Пра сваіх аднакурснікаў з гарадзенскага гістфака, што, адслужыўшы ў пагранвойсках і спецназе, занялі пачэсныя месцы ў школах КДБ і менскім АМАПе, пра былых сяброў са шматлікіх у канцы 1990-х нацыянальна-патрыятычных арганізацыяў, якіх не столькі чыясьці злая воля, колькі ўласнае гарачае жаданне раскідала па ўсёй Еўропе ад Бруселя да Уроцлава і Варшавы. Пра маладзейшых за мяне гадоў на пяць-сем хлапцоў і дзяўчат са Скідзеля, праўнукаў тых, хто ў верасні 1939-га з вінтоўкамі ў руках выганяў з мястэчка палякаў. Пра тое, што гэтыя хлопчыкі з задавальненнем жуюць птушыны памёт, які лёгка здабыць у Горадні ў гандляроў з Сярэдняй Азіі, а ў бадай кожным старэйшым класе ёсць пара дзяўчат, што не за грошы, а так, дзеля задавальнення, адзін-два разы на тыдзень выходзяць на трасу...

Брыль слухаў уважна, і, калі я, нарэшце выгаварыўшыся, змоўк, маўчаў нядоўга. Выпрастаўся, паклаў абедзве рукі на стол і, гледзячы на гмахі нейкага суперсучаснага банка за акном, вымавіў: *«И царствию его не будет конца»*. Пасля паўтарыў яшчэ раз.

Трэба было развітвацца, на гадзінніку пераваліла за дзесятую. На хвілінку зайшлі ў залу, пісьменнік паказаў колькі здымкаў сваіх маладзейшых, надта ганарыўся ўнукам, які «такога самага, як і ты, узросту…».

На развітанне дастаў кніжку «З людзьмі і сам-насам» з заранёў

напісаным аўтографам: «Дарагому Андрэю Вашкевічу на добры сяброўскі ўспамін. 2.VI.05 г.». Ён паціснуў руку моцна і ўвесь час усміхаўся, ці тое сапраўды маючы добры настрой, ці тое падсвядома жадаючы адагнаць ад мяне думку, што пачала чапляцца ўжо ў калідоры: «Ці давядзецца калі пагаварыць так яшчэ?». Назад ішоў пешшу, толькі пасля адзінаццатай прыцёгся на кватэру, упаў на канапу і выдатна спаў да самай раніцы.

У наступныя дні мяне захлынулі ўражанні ад канферэнцыі, прысвечанай 80-годдзю Беларускай сялянска-работніцкай грамады, вочнае знаёмства з Арсенем Лісом і многімі іншымі цікавымі людзьмі, пра якіх чуў, але ніколі не бачыў. Пятага чэрвеня, у дзень ад'езду, увогуле здарылася вясёлая гісторыя. Адзін з арганізатараў канферэнцыі, Аляксандр Краўцэвіч, прапанаваў вяртацца ў Горадню на яго машыне разам з ім ды яшчэ двума паважанымі гарадзенскімі гісторыкамі. Але, сказаў, выязджаем хутка, таму бяжы да сябе, забірай рэчы і вяртайся назад. Разам з Алесем Пашкевічам мы хуценька пакрочылі да дому, дзе я жыў апошнія тры дні. Перад пад'ездам спыніліся, і я, дэкларавaўшы Алесю, што за дзесяць хвілін збяруся, кінуўся наверх. Але не пашанцавала. Акурат перада мною з ліфта выйшла нейкая жанчына, і я, які звычайна прынцыпова ходзіць па лесвіцы, ускочыў у заманлівую ліфтавую кабінку. Калі праз сорак хвілін (з іх трыццаць праседзеўшы ў ліфце) выбег з пад'езда, надзея на тое, што мяне яшчэ нехта чакае, была марная. Аднак Алесь быў на месцы і, пачуўшы гісторыю пра ліфт, надзіва спакойна заўважыў: «А я-то думаю, нешта ты даўгавата збіраешся».

Дабег да машыны, два дактары навук і адзін кандыдат былі калі і не ўзлаваныя, то прынамсі знерваваныя, але, даведаўшыся аб маёй прыгодзе, ад душы парагаталі.

Дарога ў Горадню была выдатная, колькі кіламетраў злева ўзнімалася сцяна Налібокаў, блішчэла майская яшчэ і дадаткова абмытая добрым дажджом лістота. Шмат аб чым размаўлялі, у галаве блыталася ад уражанняў, між іншым часта ўспаміналася і тая сустрэча.

У сярэдзіне ліпеня ў «Гродзенскай праўдзе» надрукавалі мой артыкул да 100-гадовага юбілея Пятра Сеўрука, і я адаслаў яго

Брылю. Хутка трымаў у руках пісьмо з Менску:

Добры дзень, Андрэй! Назаўтра пасля атрымання Вашага пісьма прыйшоў «Куфэрак Віленшчыны», так што дзякую двойчы – і за пісьмо з ксераксам, і за добры артыкул пра А. Станкевіча, наогул за ўсю падборку матэрыялаў пра яго… Увесь нумар «Куфэрка» цікавы і значны, пра што я з прыемнасцю пішу нястомнаму Міхасю Міхайлавічу, які так слаўна робіць сваю патрыятычную справу.

Заўтра з адной дачкой і ўнучкай еду ў родныя мясціны, другая дачка далучыцца да нас праз тыдзень, каб разам прабыць на лецішчы да канца жніўня. На кожныя выходныя да нас будуць прыязджаць хто-небудзь з родных, што застаюцца на гэты час ў Мінску, такім чынам пошта будзе ў нас штотыдня.

Дарэчы, у сувязі з вядомым мудрым перайменаваннем вуліцаў у мяне змяніўся адрас: замест «Дразда 8» – «праспект Машэрава 78»…

Калі я ў нечым спатрэблюся пры падрыхтоўцы юбілея М. Васілька, рад буду далучыцца.

«ARCHE», у якім надрукавана штосьці Сеўрукова, пакуль што не бачыў. Разлічваю на дапамогу Анатоля Сідарэвіча, які мяне да гэтага прызвычаіў.

Пачалася восень, і хутка прыйшоў 2006-ты. Сваімі лістамі і тэлефанаваннямі стараўся Брыля не даймаць, так, гаварылі па тэлефоне перад Новым годам, пра што нават і не помню. Ды і дзякуй Анатолю Сідарэвічу, трымаў мяне ў курсе жыцця пісьменніка, яго здароўя, пісаў аб сваіх з ім сустрэчах. Сустрэча ў Менску часта ўспаміналася сама сабою, але лезці ў свае паперкі і нешта праз сілу аднаўляць у памяці забабонна не хацелася. Была надзея-ўпэўненасць, што яшчэ абавязкова ўбачу, перапытаю аб тым, што блага запомніў, і занатую ўсё як след.

Моцна захацелася патэлефанаваць толькі адзін раз, недзе

акурат на Дзень Перамогі. Чытаючы Канстанціна Сіманава, патрапіў на гісторыю аб тым, як Янку Брылю ў 1952-м давалі сталінскую прэмію. Сталін, паслухаўшы вылучэнне на прэмію аповесці «У Забалоцці днее», раптам запытаўся, чым добрая аповесць, што, там – занадта ідэальна і без класавай барацьбы паказана вёска, ці ўсе калгасы добрыя? Пасля, аднак, паддаўся перакананням, што аповесць з мастацкага гледзішча выдатная, і задаволіў яе вылучэнне, адкінуўшы творы некалькіх пісьменнікаў з іншых рэспублік.

«І Гэты пра Брыля ведаў». Стала ніякавата. Набраў нумар, аднак слухаўку ніхто не падняў. Пісьменнік, па-мойму, ляжаў у бальніцы.

Апошні ліст ад Янкі Брыля трапіў у маю паштовую скрынку ў сярэдзіне лютага. Ён крыху наракаў на гісторыю Сымона Якавюка, якую мы з сябрам надрукавалі ў «ARCHE» ў канцы 2005-га. «Чытаеш, чытаеш, здаецца неблагі чалавек, а ў канцы на табе...» Большую частку пісьма прысвяціў жыццю асобаў, звязаных з Пятром Сеўруком, аб якіх я прасіў яго напісаць, – Мар'яну Любецкаму, Вільяму Тышу, Уладзіміру Кату. Заканчваўся ліст не так, як звычайна – «Усяго Вам добрага». Апошнім радком стаяла бадзёра-шматабяцальнае: «Жадаю далейшых поспехаў. Я. Брыль».

У нядзелю 23 ліпеня дастаў з паштовай скрынкі ліст Анатоля Сідарэвіча, датаваны 17-м чыслом (лісты ад яго ідуць да мяне доўга, тыдзень і болей). Між усім іншым было там і такое:

4 жніўня я буду святкаваць Дзень нараджэння Янкі Брыля ў яго на лецішчы ў Карэліцкім раёне. Як заўсёды, збярэцца кампанія. Стары перанёс – я, здаецца, не пісаў пра гэта пану, бо гэта была пэўны час таямніца – аперацыю на тоўстай кішцы, выдалялі паліп. У чацвер, 13-га, я быў у яго перад ягоным ад'ездам на лецішча. Выглядае стары добра і бадзёра. Згадваў пана. І чым гэта пан запаў старому ў сэрца?

Прачытаўшы апошнія словы, усхваляваўся, аднак асноўным пачуццем была радасць і нават крыху зайздрасць да тых, хто ў

пачатку жніўня збярэцца ў Крынічным, сонечным летнім днём пагаворыць аб перажытым, падумае аб сённяшнім і тым, што прыйдзе заўтра. І так, пэўна, будуць сядзець да самай поўначы ці нават пазней, пад зоркамі. Эх.

Пасля, як індык, пачаў дзьмуцца ад гонару, што Брыль час-пачас пра мяне ўспамінае. Хадзіў так некалькі гадзін, аднак ідылію самазадаволенасці перарваў званок ад бацькі найлепшага сябра, разам з якім я ў снежні 2004-га ўпершыню наведаў сваякоў Пятра Сеўрука і якога амаль у дваццаць пяць гадоў з-за прыгожага твару і добрага росту па чыёйсьці бязглуздай прыхамаці забралі ў войска па-дурному круціць вінтоўкай перад усёй кампаніяй нашых лідэраў і іх гасцей на разнастайных святах, плац-парадах і сустрэчах у аэрапортах. Непакой за яго і за ўсё намі разам недапісанае і недарабленае заняў маю галаву да самага вечара.

Раніцой у панядзелак пазваніў Сяргею Токцю. Паміж іншым пагаварылі і аб хуткім надрукаванні яго новай кнігі, куды ў якасці дадатку мы ўставілі некалькі дзесяткаў старонак з дзённіка Пятра Сяўрука. Прыкінулі, што файна будзе, як толькі кніга выдзе ў свет, недзе пад канец жніўня ці ў пачатку верасня, разам паехаць у Менск, завезці яе Брылю і ад душы, з уключаным дыктафонам, пагаварыць з ім некалькі гадзін. Выдатна, падумалася між іншым, гэта ж будзе другая сур'ёзная публікацыя твораў Сеўрука за апошнія дваццаць гадоў, з восені 1986-га.

Аўторкавая ідэалагічная нарада цягнулася вяла. Дакладчык, стоячы пад вялікім партрэтам свайго лідэра (чым больш важная ўстанова, тым большы партрэт) марна спрабаваў разварушыць аўдыторыю. Размова ішла аб прапагандысцкай рабоце з моладдзю.

Сейчас молодёжь ничем не удивишь, они на компьютере играют, фильмы смотрят продвинутые, а у нас что, тоска. Вот есть, скажем, макет города, это мертвый макет, а хорошо было бы, чтобы по реке вода журчала, и пароход плыл…

Параўнанне нарадзілася імгненна: зусім як гарадзенскі войт Цыкмун Жаба са знакамітага рамана Караткевіча. Той таксама любіў інтэрактыў, будаваў з кубікаў горад з людзьмі, жывёламі, дрэвамі, а пасля даставаў корак з бочкі і заліваў усё гэта вадою. Вялікая была яму асалода глядзець, як ён, быццам Гасподзь, насылае на народы патоп і пажары.

Пераводзячы позірк з дакладчыка на партрэт над ім і наадварот, я ўжо пакрысе пераставаў разумець сэнс яго словаў, але раптам заскуголіў тэлефон, і гэта вярнула мяне да жыцця. Знаёмая прыслала SMS, тры словы – ПАМЁР ЯНКА БРЫЛЬ.

Высокапастаўлены ідыёт нешта натхнёна вяшчаў з-за трыбуны, а ў мяне перад вачыма стаяў Брыль. Толькі нейкі нечакана сур'ёзны, выпрастаны, зусім не стомлены дзевяццю дзесяткамі перажытых гадоў. Стары марскі пехацінец маўчаў, але галаву маю свідравалі словы, пачутыя тады, у канцы нашай з ім размовы ў менскім шматпавярховіку крыху больш за год таму: «И царствию его не будет конца».

31 ліпеня 2006 года
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/09/21
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 9 (49) - 2006**

[image]

[image]

[image]

9[image]-[image]2006
"[illegible]"
[image]

[image]

[image]

[image]

Гутарка з айцом Аляксандрам Надсанам Улады ў Беларусі ня маюць ніякай ідэі, апроч жаданьня застацца пры ўладзе

АЛЯКСАНДАР НАДСАН

апостальскі візытатар для беларусаў-каталікоў у замежжы, дырэктар Беларускай бібліятэкі імя Ф. Скарыны ў Лёндане – найлепшага збору беларусікі ў Заходняй Эўропе. Сёлета ў сэрыі «Бібліятэка часопісу «Беларускі гістарычны агляд» убачылі сьвет дзьве ягоныя кнігі: «Pro patria aliena:

— Юбілей – гэта добрая нагода азірнуцца назад. Якія яскравыя выпадкі, падзеі дзяцінства найперш прыходзяць Вам на памяць?

— Раз, як быў я малы – гадоў пяць меў, – захацелася мне на неба патрапіць. І пабачыўшы, што далёка на даляглядзе неба злучаецца зь зямлёю, я аднога дня раненька падняўся, узяў свайго любімага мядзьведзіка і пайшоў, разумны такі, на край сьвету, каб адтуль узьлезьці на неба. Крочыў я ўздоўж чыгункі, каб не заблукаць. Ды праз колькі часу дагнаў мяне бацька – ён быў пытаўся ў суседзяў, ці хто дзе бачыў мяне. Дагнаўшы, бацька кажа:

— Ты куды ідзеш?

— На неба, – тлумачу я.

— Ды яшчэ рана табе – гаворыць бацька. – Хадзем дамоў, бо мама непакоіцца.

Гэтак ня выйшла ў мяне тады трапіць на неба. Але ад таго часу я амаль 80 гадоў усё іду й іду да неба. Спадзяюся адыйду дайсьці.

— А што Вам прыгадваецца з часоў маладосьці?

[image]— Ведаеш, аднаго разу нават давялося ногі ў віне мыць. Мы былі ў Італіі на перадавой, за сто мэтраў ад лініі фронту. Сядзелі ў адной сялянскай хаце (гаспадароў даўно эвакуавалі ў тыл). Вады не было. На дварэ стаяла помпа, але кожны, хто выправіўся б па ваду, рызыкаваў атрымаць кулю ў лоб. Аднак у хаце было поўна віна ў вялізных-вялізных бочках. І зь нявыкруткі мае таварышы паспрабавалі мыць ногі ў віне. Не скажу, што выйшла надта ўдала. Змарнавалі добры напой. Таму ўсё ж пад покрывам ночы мы стараліся набраць вады, а віно ўжо толькі пілі…

— Вы блізка ведалі шмат самых розных людзей. Хто зь іх найглыбей паўплываў на фармаваньне Вашай асобы? Чаму Вы ў іх навучыліся?

— Сапраўды, лёс мяне зьвёў з мноствам вельмі цікавых людзей. Цяжка сказаць, хто побач з бацькамі найбольш на мяне паўзьдзейнічаў. У 1938 г., калі я зусім маладым чалавекам вучыўся ў польскай гімназіі і ня меў яшчэ дакладна акрэсьленага нацыянальнага самаўсьведамленьня, адно разумеў дакладна, што я не паляк, адзін звычайны работнік сказаў мне: «Мой брат вучыцца ў Віленскай беларускай гімназіі. Трэба і табе туды». Ягоныя словы моцна запалі мне на думку. Зь іх, мабыць, і пачаўся мой шлях да беларушчыны.

Але перакананым беларусам я стаў у гады нямецкай акупацыі. Немцы далі беларусам магчымасьць мець свае школы, прынамсі, пачатковыя і сярэднія. Беларусы скарысталіся з нагоды, каб стварыць свае, беларускія, установы. Іх ніяк не назавеш пранямецкімі. Урэшце, Беларусь увесь час знаходзілася пад акупацыяй – расейскай, польскай, савецкай, тады нямецкай. Трэба было выкарыстоўваць любы шанец, каб

Кампазітар беларускіх айцоў-марыянаў у друку і «Княгіня Радзівіл і справа адраджэньня Уніі ў Беларусі».

рабіць беларускую справу. Нашыя настаўнікі – як з заходняй, гэтак і з усходняй Беларусі – далі нам вельмі шмат. Усе яны былі шчырымі патрыётамі Беларусі, і скончылі мы школу ўжо сьвядомымі беларусамі. Гэта засталося на ўсё жыцьцё. З усіх настаўнікаў я б вылучыў нашага матэматыка Рудакоўскага. Вельмі спакойны чалавек, ён ніколі шмат пра сябе не апавядаў. Аднак мы неяк дазналіся, што ён быў камбрыгам Чырвонай Арміі, але ўцёк і застаўся пад акупацыяй. Я мала бачыў гэткіх адданых беларускіх патрыётаў, як Рудакоўскі. А якая ў яго была цудоўная беларуская мова!

Пазьней вялікі ўплыў на мяне меў айцец (з 1960 г. біскуп) Часлаў Сіповіч, зь якім мы разам працавалі шмат гадоў. А. Сіповіч вельмі адрозьніваўся ад усіх сьвятароў, якіх я раней ведаў, – і каталіцкіх, і праваслаўных. Ён зрабіў на мяне вялікае ўражаньне сваёй надзвычайнай адкрытасьцю да людзей. І хоць мы не ўва ўсім згаджаліся, адно нас заўсёды лучыла: справа Божая і беларуская.

— Як так выйшла, што выкладчык матэматыкі Аляксандар Надсан вырашыў рэзка перамяніць усё сваё жыцьцё і стаць беларускім грэка-каталіцкім сьвятаром?

— Ды я не адзін такі. Айцец Леў Гарошка хацеў стаць інжынэрам або лекарам, а зрабіўся сьвятаром. Бог заўсёды вядзе чалавека да адно Яму вядомай мэты адно Яму вядомымі шляхамі. Матэматыка і цяпер мяне цікавіць, але яна не задавальняе мяне цалкам, бо ня ў стане даць адказу на самыя галоўныя пытаньні нашага існаваньня. Відаць, сустрэчы з такімі людзьмі, як айцы Часлаў Сіповіч, Леў Гарошка, Пётра Татарыновіч, змусілі мяне задумацца пра сэнс і канчатковую мэту жыцьця. Патрэба ў жыцьці духоўным высьпявала ўва мне спакваля. Я паступова прыходзіў да разуменьня, што без духоўнага апірышча ўсё астатняе – вельмі хісткае. Пераломны пункт настаў тады, калі пасьля вельмі доўгага перапынку я раптам адчуў патрэбу ў малітве. Гэта была, безумоўна, ласка Божая. І жаданьне быць сьвятаром таксама прыйшло не адразу, а спакваля. Я шмат чытаў, сярод іншага і працы з гісторыі Царквы, у тым ліку і ў Беларусі. Тады я і прыйшоў да пераканаьня, што нам трэба адрадзіць Грэка-Каталіцкую

Царкву ў Беларусі. Аднойчы я сказаў а. Сіповічу, што маю намер стаць сьвятаром. Мы разам памаліліся, і а. Сіповіч параіў, калі імкненьні мае сапраўды сур'ёзныя, паспрабаваць пайсьці вучыцца ў Русікум. Ну, трапіць у Русікум я ахвоты ня меў. Я ведаў пра Грэцкую Калегію ў Рыме, ведаў, што там у свой час навучаліся і беларусы. Таму я і спытаўся, ці нельга мне вучыцца ў Грэцкай Калегіі. Магчыма, а. Сіповіч і ня надта ўзрадаваўся гэткаму майму рашэньню, але, трэба аддаць яму належнае, не паказаў гэтага і зьвярнуўся да царкоўных уладаў у Рыме. Сакратаром Усходняе Кангрэгацыі, якая займаецца справамі каталікоў усходняга абраду, на той час быў вельмі разумны чалавек і сапраўдны сьвятар, кардынал Эўджэніё Тысэран. Дарэчы, яго выдатна ведалі ў навуковых колах як добрага арыенталіста і археоляга. Ён вельмі ўважліва, з глыбокім разуменьнем ставіўся да ўсіх, хто б да яго ні зьвяртаўся. Кардынал Тысэран згадзіўся на просьбу а. Сіповіча, і гэтак вось я трапіў у Грэцкую Калегію, правучыўся там шэсьць гадоў і атрымаў сьвятарства.

Нельга сказаць, што перад тым, як прыняць канчатковае рашэньне, я зусім не вагаўся. Апаноўвалі сумневы: ці вытрымаю? Урэшце ж я мусіў адмовіцца ад пэўнай часткі свайго жыцьця, ад звыклага парадку рэчаў. Але як толькі я пераступіў парог Грэцкай Калегіі, усе сумневы разьвеяліся, як дым. Я зразумеў, што гэта мой шлях.

— Я шмат разоў спрабавала падлічыць усе мовы, якімі Вы валодаеце, і кожны раз зьбівалася зь ліку. Можа, Вы самі іх пералічыце?

— Я вялікі гультай – мовы не любіў вучыць, ды жыцьцё змусіла, бо давялося пажыць у розных краінах. Ну, крыху ведаю беларускую, па-расейску і па-польску разумею. У Грэцкай Калегіі службы адпраўляліся па-грэцку, таму прыйшлося вывучыць грэцкую. А лекцыі ўсе чыталіся на лацінскай мове – хто ня ведаў лаціны, адразу разьвітаўся б з навучаньнем. Валодаю ангельскай, італьянскай, французскай, бо лёс закідаў у гэтыя краіны, крыху ўмею па-нямецку... Такі сабе дылетант – усяго пакрысе. Сьвятару карысна ведаць мовы, бо ніколі ня ведаеш, якая спатрэбіцца, каб несьці духоўную дапамогу

людзям. Было б прасьцей, ясная рэч, каб ува ўсім сьвеце гаварылі па-беларуску... Але як гэтага няма – што паробіш...

— Вы вельмі пільна сочыце за ўсім, што адбываецца ў Беларусі ў галіне гістарычнай навукі і гуманітарных ведаў. Як бы Вы ацанілі ўзровень досьледаў у гэтай сфэры, калі параўноўваць яго з эўрапейскім?

— Цяжка сказаць. У Беларусі ёсьць некалькі вельмі добрых навукоўцаў, напрыклад, Генадзь Сагановіч, якія з павагаю ставяцца да фактаў. Гэта самае важнае. Часам ім можа бракаваць веданьня моваў, яны не заўсёды маюць доступ да неабходных крыніцаў. Але яны ніколі не падтасоўваюць фактаў, не падганяюць іх пад свае погляды і ідэі. На жаль, далёка ня ўсе трымаюцца падобных прынцыпаў. Вельмі прыкра, калі нехта, імкнучыся давесьці ўласны пункт гледжаньня, падбірае і падганяе факты пад сваю ідэалёгію. Гэта ўжо не навука, а палітыка. Вельмі шкада, што ў Беларусі зашмат тых, для каго іхныя ідэі важнейшыя за факты. Уладзімер Арлоў некалі згадваў свайго ўнівэрсытэцкага выкладчыка, які казаў: «Сапраўдны гісторык заўсёды знойдзе факты, каб давесьці сваю тэорыю». Гэта вельмі заганны, вельмі шкодны падыход. А калі такія гісторыкі яшчэ і навучаюць іншых, яны робяцца «сьляпымі правадырамі сьляпых». Немагчыма ўявіць большую шкоду.

Калі чалавек, кіруючыся найлепшымі намерамі, бярэцца за справу, на якую ня мае належнай кваліфікацыі і ведаў, хай лепей не бярэцца. Як у прымаўцы: «Добрымі намерамі ўсё пекла высланае». Адпаведныя веды можна здабыць, але бязь іх немагчыма зрабіць добрую працу. Іначай лепш за яе нават ня брацца.

— Кожны, хто чытаў Вашыя працы з гісторыі Царквы, рэцэнзіі і палемічныя артыкулы, ня мог не зьвярнуць увагі на вельмі высокія патрабаваньні, зь якімі Вы падыходзіце да сябе і да іншых. Як бы Вы сфармулявалі «кодэкс навукоўца» – тыя прынцыпы, якімі мусіць кіравацца ўсялякі сур'ёзны дасьледчык, тыя крытэры, якім мусіць адпавядаць грунтоўная навуковая праца?

— Навукоўца мусіць мець адкрыты розум. Пачынаючы

дасьледаваць тэму, ты не павінен мець ніякай перадузятасьці, ніякіх папярэдніх меркаваньняў. Інтэлектуальная сумленнасьць і павага да фактаў – найважнейшыя патрабаваньні да навукоўцы. І яшчэ ён мусіць мець сьмеласьць прызнаваць свае памылкі.

— Тэарэтыкі нацыяналізму сьцьвярджаюць, што стварэньне нацыянальнага гістарычнага міту – неабходны складнік фармаваньня нацыі, які дае людзям магчымасьць адчуць сябе «ўяўленай супольнасьцю», аб'яднанай адзіным мінулым. А як Вы ставіцеся да гістарычных мітаў?

— Пісьменьнік можа прыдумляць, што хоча, – яму ніхто не забароніць. Можна, вядома, ствараць казкі для малых – і дарослых – дзяцей. З адной умоваю – каб усе ведалі: гэта казкі. Але ў навуцы... Хрыстос казаў: «Праўда зробіць вас свабоднымі». Каб рабіць нейкія высновы, трэба ведаць праўдзівыя факты. Што такое свабода? Гэта магчымасьць выбару. А каб мець выбар, неабходна як найглыбей ведаць усе факты. Калі я завяжу табе вочы, выведу на ажыўленую вуліцу і скажу: «Ідзі, куды хочаш», – ты будзеш мець выбар? Гэтак жа і ў гісторыі: каб ня быць сьляпымі, мы мусім вывучаць праўдзівыя факты. Вядома, мы людзі недасканалыя, усяго ведаць ня можам, але мы павінны імкнуцца як мага паўней і глыбей уведаць факты.

А шкода ад мітаў вядомая. Людзі часам у добрай веры прымаюць іх за праўду. Але яе ўсё адно не схаваеш, яна абавязкова рана ці позна выйдзе на паверхню, і тады тым, хто ствараў міт, ніхто верыць ня будзе. Прыклад «мітатворчасьці» – гісторыя Друйскага кляштару айцоў-марыянаў. Да апошняга часу існавала ўяўленьне, што яны вялі беларускую гімназію, казалі нядзельныя навукі па-беларуску, стварылі беларускі рэлігійны асяродак. Але ў сапраўднасьці ўсё было значна складанейшым...

— Як бы Вы ацанілі сытуацыю, у якой цяпер апынулася беларускае грамадзтва?

— Я не хачу быць катэгарычным. Мне сумна. Здаецца, у Беларусі ідзе нейкае сыстэматычнае вынішчэньне ўсяго

беларускага. Становішча яшчэ горшае, чым было ў Савецкім Саюзе. Саветы хоць мелі нейкія ідэалы, да чагосьці імкнуліся, нават калі гэтая дарога і была фальшывая. Цяперашнія ўлады ў Беларусі ня маюць ніякай ідэі, апроч жаданьня застацца пры ўладзе. Гэта ўзор поўнай бяздушнасьці. Яны ўсё нішчаць.

Але беларускае грамадзтва існуе быццам у двух паралельных сусьветах. Навонкі пануе сёньняшні палітычны рэжым, аднак недзе глыбока-глыбока ёсьць нейкая іншая плынь. На жаль, на паверхню яна яшчэ ня вырвалася. Дай Бог, каб гэта некалі здарылася.

— Чаго нам бракуе, каб збудаваць цывілізаванае дэмакратычнае грамадзтва?

— У нас яшчэ ня выкрышталізавалася нацыянальнага самаўсьведамленьня, разуменьня, хто мы і чаго хочам. І гэты рэжым усё робіць, каб не дапусьціць зьяўленьня ў беларусаў сапраўднае нацыянальнае ідэі. У нашыя дні ў цывілізаванай дзяржаве яе галава (прэзыдэнт, прэм'ер-міністар, кароль – як бы ён ні называўся) стаіць вышэй за ўсялякія падзелы і рэпрэзэнтуе ўсю нацыю. Недапушчальна, каб галава дзяржавы называў пэўную частку сваіх суграмадзянаў «адмарозкамі». Немагчыма ўявіць, каб нешта падобнае сказала брытанская каралева!

— Многія дасьледчыкі называюць беларусаў «недафармаванай» нацыяй. Васіль Быкаў у свой час выказаўся гранічна жорстка: «Беларускі народ памёр». На Вашую думку, ці існуе беларуская нацыя?

— Я не такі пэсыміст, як Быкаў. На маю думку, беларуская нацыя існуе, толькі яна моцна параненая. Якраз тымі, хто надта не хацеў бы, каб яна была. Я думаю, што цела нацыі можна параўнаць зь целам чалавека: калі хворыя клеткі адміраць, арганізм ім на зьмену прадукуе новыя. Спадзяюся, гэтак жа будзе і зь беларускай нацыяй.

— Вы часта цытуеце радкі а. Язэпа Гэрмановіча:
Беларусы самі
Бараны часамі.

У чым выяўляецца гэтая нашая «барановасьць»?

— Беларусы вельмі лёгка, не падумаўшы, згаджаюцца на ўсё, што ім навязваюць, – абы ціха было. Але недзе глыбока ўсярэдзіне яны маюць інстынкт самазахаваньня. Навонкі яны быццам бы прымаюць чужое, але ўнутры застаюцца самімі сабою. Гэтак было да цяперашняга часу. Ня ведаю, ці будзе і надалей, але спадзяюся, што так.

— Хто зь пісьменьнікаў найбольш сугучны Вашаму сьветаўспрыманьню?

— Найбольш я люблю паэму Якуба Коласа «Новая зямля». У ёй паказанае імкненьне беларускага селяніна да «абяцанай зямлі», да таго, што ён уважае за шчасьце для сябе і для сваёй сям'і. Міхал памірае, так і ня зьдзейсьніўшы сваёй мары, але перадае яе свайму брату і дзецям. Ці мы ня гэтак жа імкнемся да свайго ідэалу? Колькі людзей памерла, так і не дачакаўшыся спраўджаньня сваёй мары – незалежнасьці Беларусі... Але яны перадалі гэты ідэал сваім нашчадкам. Імкненьне Міхала «здабыць зямлю, прыдбаць свой кут» вельмі сугучнае з нашым імкненьнем да вольнай Беларусі.

Я ўжо не кажу пра цудоўную мастацкую форму «Новай зямлі». Стварыць яе мог толькі геній Якуба Коласа! Чытаеш – і немагчыма адарвацца.

— У траўні споўнілася 35 гадоў, як адчынілася Беларуская бібліятэка імя Францішка Скарыны ў Лёндане. Можа, Вы прыгадаеце якія цікавыя выпадкі са свайго досьведу шукальніка і зьбіральніка старадрукаў і рэдкіх выданьняў?

[image]— Шмат было ўсялякага... У нейкі час у букіністаў на Захадзе зьявілася досыць шмат рэдкіх беларускіх кніг. Часта букіністы самі ня ведалі іх сапраўднай вартасьці, і таму можна было здабыць вельмі цікавыя выданьні амаль за бесцань. Напрыклад, аднаго разу, лазячы па букіністычных кнігарнях у Нюрнбэргу, я натрапіў на «Кароткую гісторыю Беларусі» Вацлава Ластоўскага ў вельмі добрым стане – нават зь неразрэзанымі старонкамі. Відаць, уласьнік не ўяўляў, колькі яна можа насамрэч каштаваць, і папрасіў за яе ўсяго пяць

нямецкіх марак. Я хуценька сплаціў і выбег як найхутчэй з крамы, схапіўшы кнігу, за якую не пашкадаваў бы ня тое што пяць, а дзьвесьце марак.

У 1975 г. у Монтэ-Карлё на аўкцыён выстаўлялася кніжная калекцыя балетмайстра Дзягілева. Сярод іншага быў там і фрагмэнт «Кнігі царстваў», выдадзенай Скарынам. Мы зь біскупам Сіповічам вырашылі купіць яго, колькі б ён ні каштаваў. Нас падтрымалі сваімі ахвяраваньнямі беларусы Англіі. Паехаў на аўкцыён я. Быў у Монтэ-Карлё і прадстаўнік галоўнай савецкай бібліятэкі з Масквы. Фрагмэнт Скарынавай кнігі прапаноўваўся на продаж у апошні дзень аўкцыёну. Атмасфэра была вельмі напружаная. Я гэтак нэрваваўся, што думаў, атрымаю інфаркт. Але выявілася, што маскоўскі таварыш ня мог скласьці мне канкурэнцыі: ён ня толькі ня ведаў сапраўднай вартасьці гэтага фрагмэнту, але і мусіў увесь час шукаць паслуг перакладчыка, бо не валодаў ангельскай і французскай мовамі, на якіх вёўся аўкцыён. Урэшце я купіў Скарыну, да таго ж за параўнаўча невялікую цану. Калі я ўжо зьбіраўся ехаць дамоў, да мяне падышоў адзін расейскі белаэмігрант, які жыў у Монтэ-Карлё, і запытаўся:

— Слушайте, это Вы купили Скорину?

— Я, – адказваю.

— А Вы белорус?

— Так, беларус.

— Вот молодец! – кажа ён. – Хорошо, что в Москву не попал.

Часам я прыяжджаў на аўкцыён загадзя, мне давалі паглядзець каталёг, і я набываў кнігі, што мяне цікавілі, яшчэ да пачатку аўкцыёну. У выніку ў аўкцыённым каталёгу былі пазначаныя кнігі, якія насамрэч на продаж не выстаўляліся, бо іх ужо набыў я. Гэтак аднойчы ў Гаазе адна букіністычная крама мусіла дасылаць пакупнікам свой каталёг, у якім значыўся «Смоленскій областной словарь» В. Дабравольскага – вельмі рэдкае выданьне 1914 г., – хоць насамрэч у продажы яго ўжо не было, бо ён дастаўся мне. Я багата паезьдзіў па сьвеце,

шукаючы кнігі. Цяпер, на жаль, ужо ня маю тае энэргіі...

— Вы дапамаглі шмат каму з маладых людзей здабыць якасную эўрапейскую адукацыю. Чаго Вы чакаеце ад сваіх гадаванцаў?

— Каб былі добрымі людзьмі – гэта самае галоўнае. Калі я іх браў да сябе, я ня ставіў ім ніякіх умоваў. На маю думку, калі людзям ставіць умовы, гэта іх можа зламаць. Але я спадзяваўся, што яны прынясуць карысьць іншым, а найперш – беларускаму народу, бо яму вельмі патрэбныя добра адукаваныя людзі. Я мяркую, шмат хто з тых студэнтаў, якім я крыху дапамог, ужо робіць карысную справу. Дасьць Бог, яны зьдзейсьняць яшчэ больш.

Цеплілася ў мяне ціхая надзея, што хоць хто з хлапцоў стане сьвятаром. Адзін зь іх, Ігар Лабацэвіч, ужо атрымаў сьвятарства, другі, Сяргей Стасевіч, атрымаў дыяканскія сьвячаньні і, спадзяюся, неўзабаве таксама будзе сьвятаром. За гэта я дзякую Богу.

— Сьвятар, захавальнік бібліятэкі, гісторык, кіраўнік дабрачыннай місіі, перакладчык, публіцыст, настаўнік і выхаваўца моладзі... Але якая з гэтых іпастасяў для Вас найважнейшая?

— Безумоўна, сьвятарства. Усё, што я раблю, вынікае з гэтага, з майго разуменьня сьвятарскіх абавязкаў. Сьвятарства – гэта вялікая рэч сама сабою. Але яно мае на ўвазе адчуваньне абавязку. У маіх абставінах мне ніхто ня мог загадаць, што трэба рабіць – я мусіў слухаць сваё сумленьне. Яно падказвала, у чым мой абавязак.

— Якія рысы Вы найбольш цэніце ў людзях?

— Перадусім шчырасьць. І, безумоўна, уменьне бачыць у кожным чалавеку дзіця Божае і ставіцца да людзей з належнай пашанай і павагай.

— Ці Вы лічыце сябе шчасьлівым чалавекам?

— Бачыш, некалі старажытныя грэкі сьцьвярджалі, што нельга вызначыць, ці шчасьлівы чалавек, пакуль ён жывы. І я не магу сказаць, шчасьлівы я ці не. Як чалавек скончыць жыцьцё ў згодзе з Богам і пакіне па сабе добрую памяць сярод людзей, тады яго, пэўна, можна назваць шчасьлівым. Не магу сказаць, што я задаволены з усяго, што я рабіў – здараліся і памылкі, і няўдачы. Але адное пэўна: я дзякую Богу за той шлях, на які Ён мяне паклікаў.

— Дзякуй, дарагі айцец, за размову. Дазвольце шчыра павіншаваць Вас зь юбілеем і пажадаць Вам добрага здароўя і плёну ў Вашай дасьледчыцкай працы і пастырскім служэньні.

Гутарыла Вольга Калацкая

Фота Ірыны Дубянецкай
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/09/21
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 9 (49) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

[image]2006

[image] [image] [image]

[image] [image] [image]

УЛАДЗІМЕР МАЦКЕВІЧ

Уладзімер Мацкевіч Самавызначэньне беларускага інтэлектуала

філёзаф. Сёлета выйшла ягоная кніжка «Вопрски очевидности».

Грамадзкае разьвіцьцё немажлівае без удзелу ведаў, ідэяў, ідэалаў, праектаў, утопіяў і ўсяго таго, да вытворчасьці, захаваньня і трансьляцыі чаго мае непасрэднае дачыненьне нейкая спэцыфічная супольнасьць людзей, якіх у апошні час усё часьцей называюць інтэлектуаламі. Кажучы «ў апошні час», я меў на ўвазе той час, калі на постсавецкай прасторы старая савецкая інтэлігенцыя стала здаваць свае пазыцыі. Здаваць свае пазыцыі ў тым сэнсе, што інтэлігенцыя перастала вырабляць, захоўваць і трансьляваць ідэі, ідэалы, веды і г. д. Прычым захоўваць і трансьляваць нававырабленыя ідэі і веды. Акцэнт тут варта ставіць на вытворчасьці ідэяў, ідэалаў і ведаў. Бо інтэлігенцыя: настаўнікі, чынавенства, у першую чаргу, – працягвалі зьберагаць тую частку культуры, што была перададзеная ім на захаваньне яшчэ ў савецкі час. Фэномэн старой савецкай інтэлігенцыі заслугоўвае спэцыяльнага разгляду. Я ж тут зьбіраюся разгледзець новую зьяву – інтэлектуалаў, якія ў той ці іншай форме супрацьпастаўляюцца старой савецкай інтэлігенцыі. Нават калі зьява, якую мы называем інтэлектуаламі, існавала і раней, то быў час, калі інтэлектуалы не вылучалі сябе з масы інтэлігенцыі і не супрацьпастаўлялі сябе ёй.

Магчыма, што сёньняшнія інтэлектуалы ўжо маглі забыць пра той час, калі яны складалі з інтэлігенцыяй адно цэлае. Мне ж

выразна помніцца той пэрыяд перабудовы, калі развагі А. Салжаніцына аб «абразаваншчыне», пад якой разумелася тая частка інтэлігенцыі, якая і ўсьведамляла сябе інтэлігенцыяй, успрымаліся як эпатаж і адкрыцьцё. Пэрыяд, калі будучыя інтэлектуалы пакутліва рвалі з інтэлігенцыяй, якая спарадзіла іх, варты адмысловага дасьледаваньня. Магчыма, яшчэ знойдуцца гісторыкі-інтэлектуалы, якія здолеюць прапанаваць мэтад такога дасьледаваньня і зьдзейсьняць яго. Я ж пакуль наўрад ці змагу акрэсьліць той пэрыяд і ахарактарызаваць яго. Я ў той час жыў. Усё гэта адбывалася са мной, я сьведка. Таму я ахвотна апавяду пра тое, што я яшчэ памятаю з таго часу, усім, хто здолее задаць асэнсаваныя пытаньні. Магчыма, што інтэлектуаламі ў канцы 1980-х сталі ўсьведамляць сябе тыя, хто перастаў чытаць савецкія газэты. М. Булгакаў вуснамі свайго героя раіў гэта яшчэ ў 1920-я гады, але хто тады мог скарыстацца з такой парады? А ў канцы 1980-х і наагул. Кожны ранак інтэлігенты сустракаліся ля газэтных кіёскаў і выстройваліся ў чэргі па «Правду», «Известия», «Комсомольскую правду», а ў Латвіі, дзе я тады жыў, яшчэ па «Советскую молодежь», а потым і па «Атмоду». У чэргах стаялі акурат тыя інтэлігенты, якім датуль не прыходзіла да галавы падпісацца на гэтыя газэты. Яны падпісваліся на «Аргументы и факты», «Литературную газету» альбо «Московские новости». Гэта былі тыднёвікі, як і «Огонек». Але па «Огонек» часу рэдактарства Віталія Кароціча таксама даводзілася зранку займаць чаргу, таму што ў папярэдні год аніводнаму інтэлігенту не магло прыйсьці да галавы падпісацца на вульгарны «Огонек». Дык вось, інтэлігенцыя – гэта тыя, хто стаялі ў чэргах па газэты ў гады перабудовы і чыталі «тоўстыя часопісы». І ўсе будучыя інтэлектуалы бавілі багата часу ў гэтых чэргах. За выняткам тых, ведама, хто тады быў яшчэ дзецьмі. Чым інтэлектуалы займаліся яшчэ, я ня ведаю. Хто чым. Пра кожнага асобнага інтэлектуала гэта няцяжка высьветліць. І трэба высьветліць! Прычым у рэзкай і катэгарычнай форме: «А чым вы, спадары інтэлектуалы, займаліся да 1991 году?»

Я ведаю іншае: інтэлектуалы першымі перасталі стаяць у тых чэргах. Яны першымі перасталі чытаць савецкія газэты. Пасьля газэтаў настала чарга «Огонька», «Литературки», а потым і ўсіх

«тоўстых часопісаў». Інтэлектуалы пачалі думаць самі і чытаць толькі тое, што самі сабе вызначалі.

Ці былі інтэлектуаламі тыя, хто пісаў у той час у «Огонек», «Литературную газету», «Московские новости» і ў «тоўстыя часопісы»? Ці думалі яны самі? Гэта вельмі складанае пытаньне. Ці быў інтэлектуалам Фёдар Бурлацкі альбо, напрыклад, Рой Мядзьведзеў, альбо Сімон Салавейчык (ледзь не забыўся на «Учительскую газету» – адзін з флягманаў перабудовы)? Кароціч, Чарнічэнка, Нуйкін, Аганбегян, Заслаўская, Адамовіч і іншыя?

Потым, праўда, чытаць перасталі і інтэлігенты. Калісьці самая вялікая паводле колькасьці чытачоў краіна ў сьвеце пераключылася на мыльныя опэры па ТБ і на разгадваньне крыжаванак. Чытаць перасталі ўсе. Ці амаль усе, паколькі інтэлектуалы перасталі чытаць толькі тое, што выраблялася савецкай інтэлігенцыяй. А тое, што сталі пісаць самі інтэлектуалы, савецкая інтэлігенцыя не магла адужаць.

Складаныя дачыненьні паміж інтэлектуаламі і інтэлігенцыяй мы разгледзім у спэцыяльным разьдзеле. Тут жа нам важна, што інтэлектуалы ўзьніклі ў нетрах інтэлігенцыі, паходзілі ад яе альбо зь яе, але адасобіліся і перасталі быць ёю. Мы нічога не зразумеем пра інтэлектуалаў, калі будзем блытаць іх з інтэлігенцыяй. Перш чым фармуляваць нейкія дадатныя меркаваньні аб інтэлектуалах, варта абазначыць, чым альбо кім інтэлектуалы ня ёсьць, г. зн. задаць колькі катэгарыяльных апазыцыяў. На адным з палюсоў кожнай з апазыцыяў будзем разьмяшчаць інтэлектуалаў, а на другім тую катэгорыю, якая супрацьпастаўляецца інтэлектуалам, г. зн. чым альбо кім інтэлектуалы не зьяўляюцца.

[image]

На малюнку пазначаны шэсьць сацыяльна-дзейнасных катэгорыяў, зь якімі ў інтэлектуалаў шмат супольнага, але існуюць і прынцыповыя адрозьненьні. Інтэлектуалы гэта ня творцы. Не абываталі, не спэцыялісты і г. д. Ведама, інтэлектуалы не зьяўляюцца яшчэ шмат кім: ні

жывёлагадоўцамі, ні прадпрымальнікамі, ні паліцыянтамі. Магчыма, што нейкія істотныя адрозьненьні я прапусьціў, але мне цяпер важнейшая дэманстрацыя падыходу, спосабу разважаньня і аналізу, а не вычарпальнае дасьледаваньне. Калі тэма калі-небудзь стане актуальная, то ўсё астатняе можна будзе дадаць. Я спыніўся на шасьці пералічаных катэгорыях таму, што акурат зь імі часьцей за ўсё блытаюць інтэлектуалаў. Блытаюць ня проста ў сэнсе распазнаваньня. А ў сацыяльна-дзейнасных экспэктацыях. Ад інтэлектуалаў чакаюць і вымагаюць таго, чаго нельга ці бессэнсоўна чакаць і вымагаць ад інтэлектуалаў, але што можна атрымаць ад некага іншага, напрыклад, ад спэцыяліста, інтэлігента, творцы. Зь іншага боку, часам ужо сустракаюцца і адваротныя чаканьні, калі ад тых, хто інтэлектуаламі не зьяўляецца, чакаюць і вымагаюць таго, што маглі б даць толькі інтэлектуалы.

Такім чынам, першая катэгарыяльная апазыцыя: **ІНТЭЛЕКТУАЛЫ – ІНТЭЛІГЕНЦЫЯ**. ІНТЭЛЕКТУАЛЫ не інтэлігенцыя, хаця родніць іх ня толькі паходжаньне, але і супольныя функцыі адносна культуры. Пры тым, што з інтэлігенцыі ў постсавецкіх краінах паходзяць ня толькі ІНТЭЛЕКТУАЛЫ, але таксама ўладная і творчая эліта. Інтэлігенцыя і ІНТЭЛЕКТУАЛЫ – гэта асноўныя спажыўцы культурных каштоўнасьцяў. Гэта яны чытаюць сучасныя кнігі і перачытваюць клясычныя. Уласна, тое, што яны перачытваюць, і становіцца клясыкай. Яны слухаюць сур'ёзную музыку, ходзяць у мастацкія галерэі, тэатры. Для іх усё гэта і існуе. Яны ж трансьлююць культурныя каштоўнасьці новым пакаленьням, перадаюць неабходнасьць спажываньня культурных каштоўнасьцяў.

Самае істотнае адрозьненьне паміж інтэлігенцыяй і інтэлектуаламі палягае ў тым, што інтэлігенцыя – гэта катэгорыя з сацыяльна-клясавага дыскурсу, а ІНТЭЛЕКТУАЛЫ – з культурна-нацыянальнага. Для тлумачэньня гэтай тэзы неабходна прааналізаваць гістарычны фэномэн інтэлігенцыі.

Інтэлігенцыя – гістарычнае новаўтварэньне, якое існуе з другой паловы XIX ст. Інтэлігенцыя ўзьнікае ў спэцыфічных гістарычных умовах, калі разбураецца клясавая структура

традыцыйна-фэадальнага грамадзтва, з аднаго боку, а з другога – у краіне стымулюецца паскораная мадэрнізацыя, і паміж гэтымі працэсамі ўзьнікае дысбалянс: грамадзкая дынаміка не пасьпявае за працэсамі мадэрнізацыі. Зьяўляецца дастаткова шматлікая колькасьць няздольных самавызначыцца людзей, выхадцаў з розных станаў, якія ня маюць ні ўласнасьці, ні ўспадкаванай справы альбо прафэсіі. У Расеі гэтых людзей так і называлі – разначынцамі. Пры ўсіх адрозьненьнях у паходжаньні, разначынцаў яднала добрая адукацыя, якая давала ім ня толькі сродкі для існаваньня, але і вызначала лад жыцьця. Лад жыцьця разначынцаў у гэты час ня проста быў зьвязаны з інтэлектуальнай працай, што дала магчымасьць пісьменьніку Бабарыкіну назваць іх усіх інтэлігенцыяй, але і пошукамі свайго месца ў соцыюме. Страціўшы клясавую і сацыяльную пэўнасьць, разначынцы-інтэлігенцыя не маглі знайсьці сябе ні ў этнасе, ні ў нацыі. Этнічна разначынцы былі таксама разнастайныя, як і станава. Гэтыя людзі ў Расейскай імпэрыі паходзілі з самых розных этнасаў. Гэта аселыя ў Расеі немцы, палякі, беларусы, украінцы, габрэі. Акрамя таго, папоўскія дзеці фіна-вугорскіх і цюрскіх народаў, выхадцы з Каўказу. Усе яны, разам з самімі расейцамі, мелі квазіэўрапейскую адукацыю, якая адасабляла іх ад этнасаў, зь якіх яны паходзілі.

Варта падкрэсьліць, што гэта была не зусім эўрапейская адукацыя, а менавіта квазіэўрапейская. У масе сваёй разначынцы-інтэлігенцыя атрымлівалі адукацыю на расейскай мове, пры слабым валоданьні замежнымі і клясычнымі мовамі. Адукаваныя дваране ў Расеі ведалі мовы, але ня мелі сыстэматычнай адукацыі, а разначынцы ўжо ня ведалі моваў, таму атрымлівалі адукацыю ў адрыве ад першакрыніцаў, паводле перакладаў на расейскую мову і пераказаў. Матэматычная, прыродазнаўчая, тэхнічная адукацыя ад гэтага шмат ня страчвалі, але гуманітарная, філязофская і тэалягічная гублялі безьліч. Гэтыя страты ня зводзяцца толькі да гуманітарнай (і праўнай) неадукаванасьці. У адукацыі расейскай інтэлігенцыі ўтварыўся сур'ёзны маральна-этычны прабел, які меў глыбокія наступствы. Гэты недахоп адчуваўся вельмі востра, таму расейскія разначынцы-інтэлігенцыя літаральна былі зацыкленыя на маральна-этычных праблемах.

Гэтыя праблемы іх даймалі, але яны не маглі знайсьці ім адэкватнага вырашэньня. Слабая і зародкавая расейская філязофія адкідвала доўгую эўрапейскую схаластычную традыцыю і не разумела эўрапейскай філязофскай клясыкі. Пэўны час маральна-этычныя пошукі разначынцаў-інтэлігенцыі ішлі ў мастацкай літаратуры. Толькі для інтэлігенцыі пісьменьнікі былі «інжынэрамі чалавечых душаў». Гіпэртрафаваная роля мастацкай раманістыкі і літаратурнай крытыкі ў сьветаўспрыманьні разначынцаў-інтэлігенцыі прывяла да яшчэ аднаго разрыву. Разначынцы, адарваныя ад сацыяльных і этнічных каранёў, адарваліся яшчэ і ад рэчаіснасьці. Раманнае жыцьцё стала для іх больш рэальным за звычайнае. Асабліва яскрава гэта адлюстравалася ў ідэалёгіі народніцтва (хаця гэтая ідэалёгія атрымала сваю назву ад маленькай арганізацыі «Народная воля» і ад захапленьня разначынцаў «хаджэньнем у народ», распаўсюджана яна была настолькі шырака, што стала практычна супольным сьветаглядам). Народнікі хадзілі ў народ, жылі сярод народу, але меркавалі пра яго згодна з сэнтымэнтальным і пастаральным раманам, а не фармавалі ўяўленьне на аснове ўласнага досьведу. Разначынцы-інтэлігенцыя, у прыватнасьці народнікі, аддзялялі сябе ад народу, супрацьпастаўлялі сябе яму, таму панятак нацыі – супольнасьці ўсіх станаў, клясаў, сацыяльных слаёў і групаў – заўсёды заставаўся для расейскіх разначынцаў-інтэлігенцыі абстрактным паняткам. Разначынцы-інтэлігенцыя разглядалі народ і нацыю як аб'екты сваіх адносінаў, напрыклад, любові і клопату, а не як рамку для самавызначэньня і самаідэнтыфікацыі. Самавызначаліся ж яны па першым часе як касмапаліты, потым на зьмену гэтаму касмапалітызму прыйшла імпэрская ідэнтычнасьць. Імпэрскія сымпатыі і касмапалітызм для разначынцаў-інтэлігентаў радніла тое, што і адно, і другое дазваляла зьняць зь сябе этнічную прывязанасьць і сацыяльна-станавую прыналежнасьць, пазбавіцца ад абавязаньняў, зь імі зьвязаных. Пры гэтым сьветаглядны імпэрыялізм быў больш даспадобы, таму што ён дазваляў і любіць, і ненавідзець, г. зн. быў паўнейшы. Прычым увесь сьветагляд разначынцаў-інтэлігентаў сатканы з супярэчнасьцяў і нестыковак. Так, расейская інтэлігенцыя лічыла сябе эўрапейцамі ў азіяцкай краіне, пры гэтым баялася і ненавідзела Эўропу куды больш, чым той

азіяцкі народ, якому яны сябе супрацьпастаўлялі.

Калі ў Расеі пачаў распаўсюджвацца марксізм, ён сустрэў спрыяльную глебу – вялізную колькасьць адукаваных, але дэклясаваных, дэнацыяналізаваных, дэмаралізаваных разначынцаў-інтэлігенцыі. Марксізм як сыстэма поглядаў і сацыял-дэмакратыя як ідэалёгія давалі інтэлігенцыі ўсё, чаго ёй не ставала ў культуры народу, зь якога яна паходзіць, і тое, што яна не магла ўзяць з агульнаэўрапейскай традыцыі: сьветагляд, падставы для самаідэнтыфікацыі, мараль, мэты, рамкі і прынцыпы дзейнасьці. Далей інтэлігенцыя стала ўзнаўляць саму сябе як самастойны сацыяльны фэномэн, трансьлюючы прыстасаваны для сваіх патрэбаў марксізм як свой уласны інтэлігенцкі мэнталітэт.

Я так падрабязна расьпісваў узьнікненьне расейскай інтэлігенцыі ня толькі таму, што адукаваныя беларусы, палякі, габрэі Паўночна-Заходняга краю Расейскай імпэрыі складалі значную частку разначынцаў-інтэлігенцыі, расьселенай далёка па-за межамі былога Вялікага Княства, у першую чаргу ў абедзьвюх сталіцах імпэрыі. Справа ў тым, што фармаваньне расейскай інтэлігенцыі – гэта самы яскравы прыклад гэтай зьявы, якая сустракаецца ва ўсіх краінах, што трапляюць у сытуацыі мадэрнізацыі, спрабуюць дагнаць разьвітую Эўропу. Інтэлігенцыя ў любой краіне – гэта шмат адукаваных па-эўрапейску людзей, якія зь цяжкасьцю ўпісваюцца ў кантэкст традыцыйнай нацыянальнай, у нечым адрознай ад эўрапейскай, культуры (у гэтым выпадку цалкам дарэчы выраз «адукаваныя паводле эўрапейскага ўзору», ён робіць гэты фэномэн больш зразумелым). Калі такое ўяўленьне можа падацца некаторым спрашчэньнем, то можна ўскладніць яго такім чынам: інтэлігенцыя – гэта ар'ергард эпохі Асьветніцтва ў тых краінах, якія не пасьпелі вырашыць задачы і скончыць працэсы, што пачаліся ў эпоху Асьветніцтва, альбо наагул не перажывалі гэтую эпоху. То бок інтэлігенцыя існуе толькі ў эўрапейскай пэрыфэрыі, у краінах і культурах, якія разьвіваюцца згодна з эўрапейскім узорам, але затрымліваюцца ў сваім разьвіцьці. У краінах і культурах, якія абіраюць прынцыпова неэўрапейскі шлях разьвіцьця, інтэлігенцыі няма, напрыклад, у краінах з дамінаваньнем ісламскага

фундамэнталізму. Іншае пытаньне, ці магчымы ў пару глябалізацыі прынцыпова неэўрапейскі шлях разьвіцьця? У гістарычнай эмпірыцы гэта адкрытае пытаньне. Пакуль мы маем справу з ваганьнямі і шараханьнем асобных краінаў паміж мадэрнізацыяй і фундамэнталізмам. Як правіла, фундамэнталізм перамагае ў тых краінах, якія перажылі інтэнсіўны кароткі, але ня вельмі ўдалы пэрыяд мадэрнізацыі. Зьмена кірункаў на мадэрнізацыю альбо на фундамэнталізм адбываецца з-за частай зьмены палітычных рэжымаў, а тэрміну дзеяньня рэжыму відавочна недастаткова для праяўленьня такой зьявы, як інтэлігенцыя, ці для яе поўнага зьнішчэньня. Нават калі зьнішчэньне інтэлігенцыі адбываецца ў такіх маштабах, як у Камбоджы пры рэжыме Пол Пота альбо ў час «культурнай рэвалюцыі» ў Кітаі. Таму, у пэўным сэнсе гэтага слова, пра інтэлігенцыю можна гаварыць толькі ў краінах, якія знаходзяцца ў сфэры моцнага ўплыву заходнеэўрапейскай культуры і цывілізацыі, а гэта, акрамя Сярэдняй, Усходняй Эўропы і Расеі, толькі Сярэдняя Азія, Закаўказьзе, Турцыя і, часткова, Міжземнамор'е.

Варта зьвярнуць увагу на тое, што ў Заходняй Эўропе інтэлігенцыі няма. Там расклад фэадалізму і складваньне сучасных нацыяў ішлі сынхронна і ўзгоднена. А пара Асьветніцтва, хаця і пакінула шэраг неразьвязаных праблемаў у спадчыну сучасным нацыям Заходняй Эўропы, была скончаная пазытыўна.

Прыгадаем некалькі гістарычных задачаў, якія вырашаліся ў спрэчках, канфліктах і войнах пары Асьветніцтва, без таго, каб паглыбляцца ў іх аналіз, а толькі для таго, каб выявіць тыя фактары, што вядуць да фармаваньня альбо пласту інтэлектуалаў, альбо да зьяўленьня інтэлігенцыі:

– *У пару Асьветніцтва пераадольваўся разрыў паміж арыстакратычнай высокай і плебэйскай нізкай культурай*, здымаліся супярэчнасьці паміж імі. Калі гэты разрыў ліквідоўвалі, то ўзьнікалі нацыянальныя культуры, у якіх у адзінстве разнастайнасьці існавалі, узбагачаючы адзін аднаго, і вясковы фальклёр, і гарадзкія субкультуры, і тое, што захавалася ад касмапалітычнай высокай культуры. Прычым

формы захаваньня, трансьляцыі і творчасьці ў культуры станавіліся аўтарскімі для ўсіх узроўняў і жанраў. Выканаўцы народных песенек і опэрных арыяў не адрозьніваліся сацыяльным статусам і прэстыжам, але толькі памерам ганарараў. А ганарары, у сваю чаргу, залежалі не ад абранага жанру, а ад папулярнасьці і запатрабаванасьці. У тых народаў, якія не пераадолелі гэтага разрыву, нацыянальнай культуры так і ня склалася. Існавала народная культура і эўрапеізаваная культура адукаваных людзей. На базе апошніх і складвалася інтэлігенцыя. Калі культуру народу і культуру інтэлігенцыі зьвязвала адна мова, то, хаця і зь цяжкасьцямі, такія народы сфармавалі сучасную нацыю. Калі, як у беларусаў, народная культура і культура інтэлігенцыі на працягу некалькіх пакаленьняў існуюць на розных мовах, то фармаваньне нацыі істотна ўскладняецца, калі наагул магчымае.

– *У пару Асьветніцтва розум становіцца фактарам кіраваньня грамадзкімі працэсамі*. Да XIX ст. права прыняцьця найважнейшых рашэньняў у дзяржаўных і грамадзкіх справах было станавай прывілеяй, а культываваньне розуму і мысьленьня лічылася прэрагатывай некаторых цэхаў альбо гільдыяў, фактычна прыроўненых да рамесных (напрыклад, сярэднявечныя ўнівэрсытэты, пазьней да іх дадаліся аб'яднаньні навукоўцаў: акадэміі, гільдыі юрыстаў і г. д.). У XVIII ст. ад манархаў і кіраўнікоў-арыстакратаў, якія прымалі рашэньні, сталі патрабаваць разумнага абгрунтаваньня. Рэалізацыя гэтага патрабаваньня прывяла, з аднаго боку, да скасаваньня арыстакратычных прывілеяў, з другога – да публічнага культываваньня розуму і мысьленьня, у адрозьненьне ад карпаратыўна-гільдыйнага. Там, дзе гэтая задача была вырашаная, інтэлектуальная дзейнасьць стала неабходная ў грамадзкім жыцьці, а заняткі інтэлектуальнай дзейнасьцю не лічыліся нечым унікальным. Захоўваліся традыцыйныя інстытуцыянальныя формы для выкарыстаньня розуму і мысьленьня, яны лёгка дабудоўваліся новымі інстытутамі. Адукаваныя людзі, якія займаліся інтэлектуальнай працай, ідэнтыфікавалі сябе, у першую чаргу, з гэтымі інстытутамі (напрыклад, інстытут прафэсіі), і не разглядалі сябе ўдзельнікамі нейкай супольнасьці людзей, аб'яднаных толькі наяўнасьцю адукацыі. У краінах, дзе прыняцьце

найважнейшых рашэньняў застаецца прывілеяй арыстакратыі альбо, пазьней, пад канец XIX ст., узурпуецца бюракратыяй, а інтэлектуальная дзейнасьць ня мае інстытуцыянальных формаў, наяўнасьць у чалавека адукацыі становіцца дастатковай для грамадзкай самаідэнтыфікацыі. Адукаваная публіка, незалежна ад паходжаньня (тыя ж самыя разначынцы), пачынае адчуваць сябе асаблівай сацыяльнай групай – інтэлігенцыяй.

– *У пару Асьветніцтва легітымізуецца прыватная ўласнасьць і прыватнае жыцьцё, аўтанамізуецца асоба*. У краінах, якія пасьпяхова выканалі гэтую задачу, выразна адрозьніваецца грамадзкае і прыватнае. Нішто, улучаючы і дзяржаву, ня можа замахвацца на прыватную ўласнасьць, але дакладна так ніхто ня можа ўмешвацца ў прыватнае жыцьцё і спрабаваць уплываць на прыватнае меркаваньне чалавека. Розум і мысьленьне належаць да прыватнага жыцьця, да сфэры аўтаномнай асобы, таксама як і вераваньні, ідэалы, густы і прыхільнасьці. Але прадукты і вынікі інтэлектуальнай дзейнасьці могуць выстаўляцца публічна. Складваецца публічная сфэра выкарыстаньня розуму і мысьленьня. У краінах, дзе аўтаномія асобы, прыватнае жыцьцё і ўласнасьць зь цяжкасьцю вылучаюцца з публічнай сфэры, даволі распаўсюджаныя спробы навязваньня іншым сваіх поглядаў, прыхільнасьцяў, ідэалаў. Больш за тое, узьнікае асаблівы пласт людзей – інтэлігенцыя – якая лічаць сваёй грамадзкай задачай і жыцьцёвай місіяй «сеяць разумнае, добрае, вечнае», прасьвятляць іншых. Не прасьвятляць сфэру грамадзкага, супольнага, палітычнага – ад чаго гэтая група ізаляваная, а прасьвятляць асобных людзей альбо цэлыя супольнасьці, не беручы пад увагу аўтаномію асобы.

Гэтых трох фактараў больш чым дастаткова, каб паказаць кардынальныя адрозьненьні паміж інтэлектуаламі і інтэлігенцыяй.

Такім чынам, інтэлектуал адрозьніваецца ад інтэлігента не сваімі якасьцямі і вартасьцямі, а ўмовамі свайго жыцьця і дзейнасьці.

Інтэлектуал упісаны ў сацыяльную структуру, інтэграваны зь

іншымі сацыяльнымі пазыцыямі і ролямі, добра адаптаваны да разнастайнага сацыяльнага атачэньня. Інтэлігент добра пачуваецца толькі ў асяродзьдзі сабе падобных, пошукамі гэтага асяродзьдзя ён і займаецца ўсё жыцьцё. Інтэлектуал не вылучае сябе з народу, нацыі, грамадзтва. У яго не існуе праблемаў з самавызначэньнем і ідэнтычнасьцю. Інтэлігента ж гэтыя праблемы суправаджаюць усё жыцьцё, паколькі ягонае жыцьцё ідзе ў праблемным грамадзтве, несфармаваных нацыях.

Заходнеэўрапейскія нацыі абыходзяцца без інтэлігенцыі. Чаму акурат гэтыя краіны пасьпяхова вырашылі праблемы і парадоксы Асьветніцтва, можна разьбірацца адмыслова. Таксама, як і спэцыяльна высьвятляць, якія менавіта нацыі належаць да Заходняй Эўропы, а якія – не. З гэтымі пытаньнямі разьбіраліся тыя ж самыя заходнеэўрапейскія ІНТЭЛЕКТУАЛЫ. Хтосьці лякалізуе Заходнюю Эўропу паводле тэрыторыі, на якую распаўсюджвалася ў канцы Асьветніцтва дзеяньне Кодэксу Напалеона – праўнай сыстэмы, што ўвабрала ў сябе ідэі Асьветніцтва. Хтосьці праводзіць мяжу згодна з пашырэньнем прынцыпу маярату, бо дзякуючы дзеяньню гэтага прынцыпу праблемы, ад якіх мучаюцца дарослыя інтэлігенты, вырашаюцца на ўзроўні сямейнага выхаваньня дзяцей. Для абмеркаваньня ўсіх гэтых пытаньняў фармат артыкулу відавочна малы. Мне гэты экскурс у гісторыю фармаваньня інтэлігенцыі патрэбны для таго, каб сфармуляваць простую тэзу-гіпотэзу. У меру інтэграцыі краінаў Сярэдняй і Цэнтральнай Эўропы ў аб'яднаную Эўропу колькасьць інтэлігенцыі будзе скарачацца. І ў грамадзкім жыцьці ўсё большае значэньне будуць набываць ІНТЭЛЕКТУАЛЫ – людзі, якія апэруюць розумам і мысьленьнем у публічнай сфэры, робяць у публічнай прасторы інтэлектуальную працу нацыі, але ня ўмешваюцца ў прыватнае жыцьцё людзей.

У Беларусі ж пакуль інтэлігенцыя дамінуе ў грамадзкім жыцьці. Гэтае дамінаваньне выяўляецца ня толькі ў кантролі інтэлігенцыяй усёй сфэры ідэалёгіі, СМІ і адукацыі. Гэта выяўляецца ў забароне на публічную інтэлектуальную дзейнасьць. ІНТЭЛЕКТУАЛЫ ў Беларусі ўжо ёсьць. Яны не адукоўваюць народ, не навязваюць грамадзтву свайго меркаваньня. Яны займаюцца сваёй прафэсійнай дзейнасьцю,

але прадукты гэтай дзейнасьці, сваёй інтэлектуальнай работы, яны імкнуцца зрабіць публічным здабыткам, спрабуючы паўплываць такім чынам на прыняцьце найважнейшых рашэньняў у краіне. Акурат тут праяўляецца найвастрэйшае супрацьстаяньне інтэлігенцыі і інтэлектуалаў. Інтэлігенцыя прапаноўвае ўсяму грамадзтву сваё меркаваньне як самае адукаванае, а ІНТЭЛЕКТУАЛЫ ўсяго толькі жадаюць, каб іх меркаваньне ўлічвалася пры прыняцьці грамадзка значных рашэньняў. Асабліва яскрава гэта відаць падчас рэфэрэндумаў, якія ў апошні час сталі частай зьявай у нашай краіне. Пакуль інтэлігенцыя навязвае сваё меркаваньне шырокім пластам грамадзтва, ІНТЭЛЕКТУАЛЫ лічаць неразумным і рашэньні рэфэрэндумаў, і самі рэфэрэндумы як спосаб прыняцьця рашэньняў.

Пакуль беларускае грамадзтва ўхіляецца ад эўрапейскай інтэграцыі, у беларускіх інтэлектуалаў няма шанцаў стаць уплывовай сілай у грамадзтве. Бяда яшчэ і ў тым, што ў інтэлектуалаў практычна няма і ня можа быць адзінай пазыцыі, нават што да эўрапейскай інтэграцыя. Многія ІНТЭЛЕКТУАЛЫ добра бачаць недахопы і заганы аб'яднанай Эўропы. Але эўраскептыцызм беларускіх інтэлектуалаў мае зусім іншую прыроду, чым эўрафобія беларускай інтэлігенцыі.

Адрозьненьню інтэлектуалаў ад інтэлігенцыі давялося надаць так багата ўвагі, таму што на сучасным этапе разьвіцьця нашага грамадзтва ІНТЭЛЕКТУАЛЫ і інтэлігенцыя ня проста маюць шмат падобнага паміж сабой, яны цяпер канкуруюць за ўплыў у культурным працэсе, і гэтая канкурэнцыя можа мець вельмі важныя наступствы для лёсу краіны і нацыі. Далейшыя катэгарыяльныя апазыцыі разабраць і сфармуляваць значна прасьцей.

ІНТЭЛЕКТУАЛ – ТВОРЦА. Часам ІНТЭЛЕКТУАЛЫ нешта ствараюць. Але гэта ня ёсьць сутнасьцю іхнага існаваньня. Сутнасьць інтэлектуалаў акурат у спажываньні. Яны ня творцы, а спажыўцы. У тым ліку і інтэлектуальных прадуктаў. ІНТЭЛЕКТУАЛЫ роўна настолькі ІНТЭЛЕКТУАЛЫ, наколькі яны спажываюць інтэлектуальную прадукцыю. Яны чытаюць філёзафаў і мысьляроў мінулага. Чытаюць для таго, каб

выносіць меркаваньні ў сучаснасьці. Калі ІНТЭЛЕКТУАЛЫ спажываюць сучасную інфармацыю, то яны аддаюць перавагу аргумэнтам перад фактамі. Іх цікавяць ня столькі падзеі, колькі прычыны і тлумачэньні іх, ня столькі рашэньні, колькі абгрунтаваньні рашэньняў. Ад інтэлектуалаў часта чакаюць і патрабуюць дзеяньняў, учынкаў альбо артэфактаў. Часам ІНТЭЛЕКТУАЛЫ нават дзейнічаюць, зьдзяйсьняюць учынкі і ствараюць (твораць) артэфакты: пішуць кнігі, здымаюць фільмы, ствараюць новыя навучальныя курсы, распрацоўваюць стратэгіі, канцэпцыі і праграмы. Але гэта іх факультатыўная, а не галоўная функцыя. Іх галоўная місія – выносіць меркаваньні. Ня проста выказваць свае прыватныя меркаваньні. А публічна дэманстраваць разважаньне, каб публічна ж выяўляць вынікі інтэлектуальнай работы – меркаваньні, што прэтэндуюць на ўсеагульнасьць. Ноэм Хомскі (Чомскі) ня можа сам спыніць вайну на Балканах, але ягонае меркаваньне аб гэтай вайне даводзіцца да шырокай публікі і ўплывае на прыняцьце дзяржаўных рашэньняў. Не істотна, мае ён рацыю ці не ў сваім меркаваньні. Істотна, што гэтае меркаваньне разумнае, а не эмацыйнае, свабоднае, а не ангажаванае. І гэтаму меркаваньню павінна быць супрацьпастаўленае такое і разумнае, і свабоднае меркаваньне. Інтэлектуал здольны на такія меркаваньні не таму, што ён іх стварае сам, а таму, што ён іх выносіць на падставе папярэдняга спажываньня інтэлектуальнай прадукцыі, а не бульварнай прэсы, не ідэалягічных агітак.

Антыінтэлектуалізм беларускай эліты і інтэлігенцыі выяўляецца ня ў тым, што яны чагосьці ня твораць, а ў тым, што яны не чытаюць, не спажываюць інтэлектуальнай прадукцыі. Таму і меркаваньні іхныя інтэлектуальна не падмацаваныя. Думку аб тым, што адбываецца ў краіне, можна сфармаваць і на падставе тэлеперадачаў БТ. Але паўнавартаснага меркаваньня не сфармаваць бязь веданьня Арыстотэля, Канта, бяз крытыкі сьветагляду Алеся Адамовіча, без аспрэчваньня меркаваньняў Валянціна Акудовіча.

ІНТЭЛЕКТУАЛ – АБЫВАТАЛЬ. У гэтай катэгарыяльнай пары складанасьць ня ў тым, каб указаць на адрозьненьне, але каб зразумець падабенства. Справа ў тым, што вядомае супрацьпастаўленьне інтэлігенцыі і абывацельства

(філістэрства), запазычанае беларусамі ад расейскай інтэлігенцыі, часьцяком пераносіцца і на інтэлектуалаў. Але інтэлектуал не супрацьпастаўляецца абываталю, як не супрацьпастаўляецца народу, іншым сацыяльным ролям і функцыям. Інтэлектуал падзяляе абывацельскія ідэалы і каштоўнасьці, ідэнтыфікуе сябе з народам. Інтэлектуал жыве так сама, як жывуць ягоныя суседзі. У яго такая ж сям'я, такі ж дом (кватэра), машына, мэбля, тэлевізар, нават дыплём аб вышэйшай адукацыі. Нязначныя адрозьненьні можна знайсьці ў тым, якія каналы ўключаюць людзі ў тэлевізійным прыёмніку, якія кнігі стаяць на паліцы ў аднолькавых кніжных шафах, якія кнігі валяюцца зранку ля ўзгалоўя. Але гэтыя адрозьненьні ўкладваюцца проста ў дыяпазон індывідуальных адрозьненьняў. То бок у прыватным жыцьці інтэлектуал можа нічым не адрозьнівацца ад любога іншага абываталя. Яны адрозьніваюцца публічным жыцьцём. У большасьці людзей публічнага жыцьця амаль няма або яно зьведзенае да мінімуму, тады як інтэлектуал абавязаны весьці публічнае жыцьцё. Безь яго ён наагул не адрозьніваецца ад абываталя альбо ператвараецца ў маргінальнага шызафрэніка.

ІНТЭЛЕКТУАЛ – СПЭЦЫЯЛІСТ. Публічная прэзэнтацыя розуму і мысьленьня часта закранае вельмі спэцыфічныя галіны ведаў. Меркаваньні ў спэцыфічных сфэрах спрабуюць манапалізаваць спэцыялісты. Эканамісты разважаюць аб эканоміцы, эколягі аб экалёгіі, малочнікі аб малацэ, газэтчыкі аб газэтах, вайскоўцы аб вайне. Інтэлектуалам варта б было меркаваць аб інтэлекце. Але акурат гэта вельмі мала цікавіць інтэлектуалаў. Меркаваньні інтэлектуалаў часта спрабуюць дэзавуяваць акурат на падставе таго, што гэта не меркаваньні спэцыялістаў. Але для таго інтэлектуал і зьяўляецца спажыўцом складанай інтэлектуальнай літаратуры, каб разьвіваць у сабе здольнасьць разьбірацца ў самых складаных пытаньнях ня горш за спэцыялістаў. Ня горш, хаця і іначай, чым спэцыялісты. Як правіла, інтэлектуал можа быць спэцыялістам у адной альбо некалькіх сфэрах. Але ня гэта робіць яго інтэлектуалам. Зрабіўшы кар'еру ў пэўнай прафэсіі, інтэлектуал займае спэцыфічнае месца ў структуры прафэсіі. Часьцей за ўсё гэта месца з функцыяй рэфлексіі і асэнсаваньня самой прафэсіі, то бок гэта мэтапазыцыя, а не пазыцыя

спэцыяліста. Гэта дазваляе яму працаваць з распрадмечанымі ведамі, у распрадмечаных формах. І ня толькі працаваць, але і весьці камунікацыю зь іншымі прафэсіяналамі, якія займаюць аналягічныя пазыцыі ў іншых прафэсіях альбо сыстэмах дзейнасьці. Пераадольваючы спэцыялізацыю, выходзячы за рамкі спэцыяліста, прафэсіянал не пакідае прафэсіі, не становіцца філёзафам альбо мэтадолягам. Ён проста становіцца дастаткова свабодным і экіпаваным для заняткаў іншымі, самымі разнастайнымі справамі. Будучы экіпаваным і свабодным для міжпрафэсійнай камунікацыі, ён гатовы для публічнага выкарыстаньня свайго інтэлекту. Выходзячы ў публічную прастору, ён становіцца інтэлектуалам. Выхад у публічную прастору патрабуе пэўнай ступені вядомасьці, папулярнасьці, рэпутацыі, бяз гэтага інтэлектуалаў не бывае. Калі ж у публічнай сытуацыі патрабуецца меркаваньне спэцыяліста, то гэта можа быць і нікому не вядомы спэцыяліст.

Згаданае вышэй меркаваньне Хомскага аб вайне на Балканах ня ёсьць меркаваньнем вядомага лінгвіста (спэцыяліста вышэйшай кваліфікацыі), але меркаваньнем інтэлектуала. Пры гэтым Хомскі не спэцыяліст у вайсковых справах альбо міжнародных дачыненьнях. Ён не спэцыяліст у пытаньнях, аб якіх разважае, але і тое, у чым ён спэцыяліст, у гэтым выпадку ніяк не запатрабаванае. Ня варта патрабаваць ад інтэлектуалаў таго, што варта патрабаваць ад спэцыялістаў, і наадварот.

ІНТЭЛЕКТУАЛ – МАСТАК, АРТЫСТ, ДЗЕЯЧ МАСТАЦТВА. Інтэлігенцыя сфармавала шэраг архетыпаў грамадзкай сьвядомасьці, якія застаюцца жывучымі. У прыватнасьці, да такіх архетыпаў належыць гіпэртрафаваная роля мастацтва ў асэнсаваньні грамадзкіх і палітычных працэсаў і зьяваў. У абагуленым выглядзе гэты архетып не вытрымлівае крытыкі, але ёсьць у сьвеце мастацтва адна пазыцыя, пра якую я ўжо згадваў вышэй пры разглядзе генэзісу расейскай інтэлігенцыі, якая доўгі час прэтэндавала на найвышэйшы аўтарытэт ува ўсіх пытаньнях. Гэта пісьменьнікі. Добра б толькі пісьменьнікі, якія прэпаруюць грамадзтва з-за недахопу навуковых зьвестак аб гэтым грамадзтве, чым займаліся раманісты XIX і XX стст., але для інтэлігенцыі і «паэт у Расеі большы, чым паэт». Ніяк не прыніжаючы ролі, месца і значэньня мастацкай творчасьці, і

паэзіі ў прыватнасьці, у духоўным жыцьці чалавецтва, хочацца проста нагадаць, што ня варта зьмешваць і блытаць адно з адным. Публічная прэзэнтацыя розуму ня можа будавацца на паэтычных мэтафарах і гіпэрбалах. Але доўгі час, калі ІНТЭЛЕКТУАЛЫ не маглі зьявіцца ў Беларусі, іх функцыю выконвалі пісьменьнікі. Гэта не раўнацэнная замена. Але звычка засталася. Да гэтага часу замест асэнсаваньня і рацыянальнай аргумэнтацыі не-не ды і выскокваюць паэтычныя вобразы. І ня толькі ў адных паэтаў, але і ў людзей, якія прэтэндуюць на ролю інтэлектуалаў.

ІНТЭЛЕКТУАЛ – КЛЕРК, НАЙМІТ, ЛЁКАЙ. Гэта самая простая катэгарыяльная апазыцыя, але і самая небясьпечная. Публічная прэзэнтацыя розуму можа быць толькі свабоднай і неангажаванай. Магчыма, што гэтая тэза нават і не патрабуе якой бы ні было аргумэнтацыі – так шмат на гэтую тэму сказана і напісана. Аднак тэндэнцыя выкарыстаньня інтэлекту ў сэрвільнай функцыі не зьнікае. Магчыма, яна будзе існаваць вечна, прынамсі, пакуль людзі будуць імкнуцца да ўлады, грошай. Інтэлектуальнае абгрунтаваньне і апраўданьне дзеяньняў палітыкаў, вайскоўцаў, чынавенства заўсёды і паўсюль карыстаецца вялікім попытам. Беларусь не выключэньне. У краіне шмат разумных, адукаваных, крэатыўных людзей. Дзяржава і бізнэс заўсёды будуць прыцягваць такіх людзей на службу і працу. Гэта цудоўна і добра, гэта неабходна, каб дзяржава і бізнэс разьвіваліся. Але паступаючы на службу, чалавек губляе сваю аўтаномнасьць, ён становіцца часткай нейкага надасабовага суб'екту, зьверхчалавечага ўтварэньня.

Але ж акурат у кантролі над такім суб'ектам і палягае функцыя публічнага выкарыстаньня розуму!

Я далёкі ад таго, каб прапаноўваць інтэлектуалам ніколі не наймацца на службу, не станавіцца чыноўнікамі альбо функцыянэрамі ў бізнэсе. Наадварот, я б толькі вітаў такую дзяржаву і такі бізнэс, якія б прываблівалі інтэлектуалаў. Але любы дзяржаўны чыноўнік і сацыяльна адказны бізнэс абавязаны публічна выстаўляць абгрунтаваньні сваіх дзеяньняў і рашэньняў. Публічна, г. зн. у СМІ, у публічных выступах, у

дыскусіях. Яны павінны ўступаць у камунікацыю са свабоднымі інтэлектуаламі. Зусім ня факт, што ў такой камунікацыі, у сур'ёзных дыскусіях свабодныя ІНТЭЛЕКТУАЛЫ будуць разумнейшыя і мацнейшыя за талковых і разумных чыноўнікаў. Але ня ў тым жа справа, каб высьветліць, хто разумнейшы, чыноўнік альбо інтэлектуал! Справа ў тым, каб розум і інтэлект выкарыстоўваліся пры прыняцьці найважнейшых для нацыі і для краіны рашэньняў.

Сёньня ў Беларусі ІНТЭЛЕКТУАЛЫ аддадзеныя самім сабе. Значыцца, задачы Асьветніцтва мы ў нашай краіне яшчэ ня вырашылі.

І бяда нават ня ў тым, што дыктатура і аўтарытарны рэжым не даюць інтэлектуалам слова, не даюць магчымасьці паўдзельнічаць у прыняцьці рашэньняў на нацыянальным узроўні. Бяда ў тым, што ІНТЭЛЕКТУАЛЫ гэтага пазьбягаюць. Яны пазьбягаюць сваёй сацыяльнай функцыі і місіі. Хтосьці ўцякае ў мастацкую творчасьць. Хтосьці ў вузкую спэцыялізацыю, хтосьці прымае сэрвільную функцыю і інтэлектуальна абслугоўвае чужыя рашэньні і дзеяньні. Большасьць жа знаходзіцца ў забабонах савецкай інтэлігенцыі, бясьсільнай, бязвольнай, сэнтымэнтальнай і рэзанэрскай.

Аднак важна, што ІНТЭЛЕКТУАЛЫ ў Беларусі ўжо ёсьць. Ня проста разумнікі й разумніцы, а публічныя постаці. Варта б пачаць і дзейнічаць публічна.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/11/30
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 9 (49) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

[image]

[image]2006

[image] [image] [image]

АНДРЭЙ КАЗАКЕВІЧ

Андрэй Казакевіч Па той бок «крэольскай» праблематыкі*

палітоляг, галоўны рэдактар часопісу «Палітычная сфера».

Першапачатковая версія артыкула была падрыхтавана як рэцэнзія на артыкул Уладзіміра Абушэнкі («Креольство как ино-модерность Восточной Европы…»)[1], але паступова яна пераўтварылася ў нешта падобнае да агульных уводзінаў у канцэпт «крэольства» з пэўнымі прэтэнзіямі на яго выпраўленне і размяшчэнне ў шэрагу магчымых праграм даследавання беларускае сітуацыі. Менавіта дзеля гэтых мэтаў тэкст утрымлівае пашыраныя каментары да асобных праблем дыскусіі. Тым не менш, яго стратэгія разглядаць крэольскую праблематыку праз тэкст У. Абушэнкі захоўваецца – гэта зручна і лагічна, тым больш, што артыкул У. Абушэнкі ёсць найбольш рафінаванай спробай легітымізаваць вышэйпазначаную праблематыку ў інтэлектуальнай прасторы. Артыкул Уладзіміра Абушэнкі, які быў надрукаваны ў першым нумары часопіса даследаванняў усходнееўрапейскага памежжа «Перекрестки», ёсць постпрэзентацыяй адносна шырокай і пленнай дыскусіі на тэму «крэольства» ў коле беларускіх інтэлектуалаў і, часткова, у публіцыстыцы. Пік дыскусіяў прыпадае на 2001–2002 гг. Іх акадэмічным «цэнтрам» робіцца сумесны метадалагічны семінар інстытутаў філасофіі і сацыялогіі НАН Беларусі, а публіцыстычным – часопіс «ARCHE» і газета «Наша Ніва».

* Абноўленая і скарочаная версія. Першапублікацыя пад назвай «Дэканцэптуалізацыя крэольства» ў «Палітычнай сферы» (2005. № 4).

[1] Абушенко В. Креольство как ино-модерность Восточной Европы (возможные стратегии исследования) // Перекрестки. 2004. № 1–2.

(Тэкст у фармаце PDF на сайце Эўрапейскага ўнівэрсытэту ў Санкт-Пецярбургу)

[2] Электронная версія артыкула была змешчана на web-старонцы часопіса «Фрагмэнты».

[3] Южная Америка. Страны и народы. Москва, 1983. С. 171. Гэта навукова-папулярнае выданне, але адлюстроўвае агульную сітуацыю.

Першы варыянт тэксту У. Абушэнкі пра «крэольства» быў пададзены ў 2001 г. пад назвай «Мицкевич как «креол»: от «тутэйшых генеалогій» к «генеалогіі тутэйшасці»[2]. З таго часу ён набыў крыху іншае канцэптуальнае афармленне, былі ўзмоцнены рэгіянальныя акцэнты, ды і сам артыкул з «рэфлексіўнага» зрабіўся пераважна «метадалагічным», што і было адлюстравана ў назве: «магчымыя стратэгіі даследавання». «Метадалагічная» перспектыва дамінуе ў тэксце і мае фармат, які дысцыплінарна можна аднесці хутчэй да «філасофіі», нягледзячы на тое, што сам тэкст быў напісаны вядомым сацыёлагам.

Дыскусія пра крэольства вызначаецца неакрэсленасцю канцэптуальных пазіцый. Шмат у чым такое рознае ўспрыняцце «крэольства» было звязана з адрознай семантыкай слова ў розных гуманітарных дысцыплінах, а таксама ў побытавым і публічным ужыванні. Таму варта пачаць менавіта з аналізу этымалогіі канцэпту «крэол».

ПАХОДЖАННЕ ПАНЯТКА

Слова «крэол» увайшло ў большасць еўрапейскіх моваў з французскай (creole), куды яно трапіла з іспанскай (criollo – чалавек, які з'яўляецца мясцовым для пэўнае тэрыторыі) ды партугальскай (crioulo – чалавек, асабліва слуга, які вырас у чымсьці доме). Слова мае этымалогію ад лацінскага «creare» – ствараць, вытвараць – тая ж аснова, што ў словах «крэатыўны», «крэацыя» (анг. creation) і г. д. Як відаць з этымалогіі, умоўна «іспанскай» і «партугальскай», слова «крэол» мела вельмі адрозныя значэнні, але першапачаткова не было звязана з колерам ці расаю.

У Лацінскай Амерыцы крэоламі называюць нашчадкаў перасяленцаў з Іспаніі, гэта значыць еўрапейцаў, народжаных у калоніях. Менавіта «крэолы», як мясцовая эліта, вялі войны з метраполіяй і сталі стваральнікамі незалежных лацінаамерыканскіх дзяржаў у XIX ст. У Аргенціне прыметнік «крэольскі» да гэтага часу семантычна блізкі да слова «нацыянальны»[3]. Крэоламі таксама называліся французскія каланісты ў Паўночнай Амерыцы: як тыя, што былі

амерыканізаваны ў Луізіяне, так і продкі сучаснага франкафоннага насельніцтва Квебека. Гэтае азначэнне ўжывалася і для еўрапейскага насельніцтва Маскарэнскіх выспаў у Індыйскім акіяне (Рэюньён, Маўрыкій і інш.). Такім чынам, слова «крэол» выкарыстоўвалася для абазначэння сацыяльнай групы, якая мела прывілеяваны статус у калоніях, але звычайна другасны ў метраполіях. Адначасова крэолы мелі праблемы нацыянальнай ідэнтыфікацыі кшталту «быць іспанцам ці лацінаамерыканцам». Такая традыцыя ўжывання тэрміна натуральным чынам увайшла ў лацінаамерыканскае мысленне, літаратуру і пазней вылілася ў розныя версіі інтэлектуальнага вызвалення (у тым ліку і «філасофіі вызвалення»).

Але гісторыя тэрміна «крэол» гэтым не вычэрпваецца, і ў іншых кантэкстах ён меў іншае, практычна супрацьлеглае, значэнне. У Бразіліі, былых брытанскіх, галандскіх і французскіх калоніях Лацінскай Амерыкі і Вест-Індыі «крэоламі» называлі народжаных у Амерыцы неграў-рабоў. Тут сацыяльная семантыка «крэольства» адносіла да самай нізкае прыступкі ў сацыяльнай іерархіі калоніі. Акрамя гэтага, у Афрыцы крэоламі называлі групы змяшанага, еўрапейска-мясцовага паходжання ды нашчадкаў рабоў, якія атрымалі свабоду. Гэтае слова нават ужывалася для азначэння дзяцей ад змяшаных расійска-індзейскіх шлюбаў на Алясцы. Ва ўсіх гэтых прыкладах тэрмін «крэол» меў ужо значэнне «змяшанага, нячыстага паходжання» і дастаткова «негатыўныя» сацыяльныя канатацыі.

У прынцыпе, менавіта другая («партугальская») традыцыя ўжывання слова «крэол», звязаная са змяшаным ці нееўрапейскім паходжаннем, замацавана ў лінгвістыцы («крэольская мова», «крэалізацыя піджыну»), а таксама дамінуе ў побытавай мове[4]. Крэольская мова – мова, створаная на аснове піджыну[5], калі апошні робіцца родным для пэўнай супольнасці, звычайна змяшанага паходжання. Большасць крэольскіх моваў былі створаны на еўрапейскай аснове для патрэбаў камунікацыі нееўрапейскага насельніцтва.

Такім чынам, дзве традыцыі ўжывання тэрміна вельмі розныя, што ўскладняе яго канцэптуальнае выкарыстанне. Рачулевіч

[4] Вікіпедыя. Рачулевіч

дыхатаміі дзвюх традыцый «крэольства» вельмі важна для асвятлення эвалюцыі гэтага тэрміна ў беларускай інтэлектуальнай і публічнай прасторы.

Як было пазначана вышэй, артыкул У. Абушэнкі прысвечаны не столькі аналізу феномена ўсходнееўрапейскай «інша-мадэрнасці», колькі выкладанню «магчымых стратэгій даследавання», гэта значыць, што ён хутчэй метадалагічны і праектыўны. Большасць канцэптаў і мадэляў толькі пазначаюцца, але не разгортваюцца ў поўнай ступені, напрыклад: «інша-мадэрнасць» (ино-модерность), «лакальная універсальнасць», «падключаныя да універсальнасці інтэлектуальныя традыцыі» і г. д. Такая сітуацыя ўвогуле вельмі характэрная для «крэольскае праблематыкі». Менавіта «раскрыцця», асабліва з улікам вялікай канцэптуальнай насычанасці тэксту, па-сапраўднаму не хапае, хоць тэкст адкрывае «шмат напрамкаў» («ходов» – у тэрміналогіі аўтара).

Прадметам разгляду У. Абушэнкі выступае перш за ўсё лацінаамерыканская схема культурных адносін былых калоній з метраполіяй і прыдатнасць гэтай мадэлі для аналізу палітычнай і культурнай сітуацыі Усходняй Еўропы.

Метадалагічная частка артыкула пачынаецца з увядзення ў кантэкст «крэольства» канцэпту «тутэйшасці» як блізкіх паняткаў, непарыўна звязаных з «месцам знаходжання». З гэтым вельмі цяжка пагадзіцца, але нашу пазіцыю ў гэтым пытанні мы раскрыем пазней, а пакуль спынімся на ўдакладненні тэрміна «крэольства». Абушэнка пазначае тры мадэлі канцэптуалізацыі «крэольства» ў гуманістыцы.

Моўная сістэма ствараецца пры кантакце памiж рознымі этнічна далёкімі групамі. Звычайна піджын складаецца з невялікай колькасці словаў, якія служаць для паразумення ў гандлі, камерцыйных справах і т. д. Гл.: Перехвальская Е. В. Языковые контакты и «прагматический код». Лингвистические исследования. Социальное и системное на различных уровнях языка. – Москва, 1986.

Першая мадэль: канцэпцыя крэольскага нацыяналізму, створаная ў межах так званай «тэорыі нацый і нацыяналізму» Б. Андэрсанам для аналізу дзяржава- і нацыятворчага працэсу ў калоніях – перш за ўсё Лацінскай Амерыкі. Другая: лацінаамерыканская традыцыя «вызвалення» (часткай якога было «пераадоленне крэольства») – Л. Сэа, Э. Дзюсель. Трэцяя: аналіз феномена крэольскае ідэнтычнасці (нацыяналізму) у працах украінскіх аўтараў, галоўным чынам М. Рабчука.

беларускай навуковай літаратуры «крэоль» няправільна асацыюецца толькі са змяшанымі шлюбамі суранецаў і абарыгенаў розных часцяк свету. Напрыклад: Мечковская Н. Б. Общее языкознание. Структура и социальная типология языков. Минск, 2000. С. 203.

ТРЫ ВЕРСІІ «КРЭОЛЬСТВА»

Беларускія аўтары звычайна не пазначаюць генеалогіі гэтых мадэляў, таму мы паспрабуем запоўніць гэты прабел. Дарэчы, У. Абушэнка вызначае мадэлі як «спробы пераінтэрпрэтацыі» канцэпту «крэольства», што не зусім карэктна, бо не паказвае вельмі розныя мэты і сутнасць гэтых «пераінтэрпрэтацый» (інтэрпрэтацый), якія мелі вельмі розны сацыяльны ды інтэлектуальны background[6]. Працы Б. Андэрсана – акадэмічная тэорыя, філасофія Лацінскай Амерыкі – шырокі і працяглы праект культурнага і інтэлектуальнага вызвалення, рэфлексіі М. Рабчука – спроба нетрывіяльнага (шмат у чым публіцыстычнага) аналізу палітычнай ды культурнай сітуацыі ва Украіне. Мы пачынаем разгляд з другой мадэлі, якая і храналагічна, і генетычна была першаю.

Лацінаамерыканская «філасофія вызвалення» прадстаўлена ў тэксце дзвюма знакавымі персонамі – Л. Сэа і Э. Дзюсель. Для Л. Сэа «крэол» – гэта праблема суб'екта, які не можа «адрэфлексаваць сваю кантэкстуальнасць як роўную іншым». Ён знаходзіцца ў культурна несамастойным стане і яго ўласнае трывалае ідэнтычнасці. Таму крэольскія культурныя праекты XIX ст. складаюцца з запазычання існых канцэпцый. Самымі значнымі культурнымі праектамі для Лацінскай Амерыкі выступалі «неіспанская іспанскасць», ствараная ў ўласнай культуры паводле стандартаў «метраполіі» і імпартаванне «найбольш прагрэсіўных» канонаў Захаду, перш за ўсё французскага і паўночнаамерыканскага, якія паступова выціскалі Іспанію на культурную перыферыю. Натуральная эвалюцыя «крэольскае сітуацыі» прывяла ў XX ст. да паўстання праекта культурнага «вызвалення» Лацінскай Амерыкі, часткай якога стала «пераадоленне крэольства знутры». У 1960-я – 1970-я гг. Лацінская Амерыка, як вядома, канчаткова абвясціла пра свой «культурны суверэнітэт».

[6] Філасофія вызвалення Л. Сэа і канцэпцыя нацыяналізму Б. Андэрсана.

Э. Дзюсель разглядаў «вызваленне» з перспектывы філасофіі, перш за ўсё праз аналіз «татальнасці» еўрапейскага мыслення, якая не прадугледжвала альбо рэпрэсавала сваіх іншых. Праект вызвалення Э. Дзюселя палягаў менавіта ў парушэнні еўрапейскай татальнасці і разбурэнні яе прэтэнзій на універсальнасць, што дасягаецца, у тым ліку, праз «старонняе»

(з перспектывы Лацінскай Амерыкі) прачытанне еўрапейскае спадчыны. Такім чынам, вызваленне – гэта перш за ўсё вызваленне ад «цэнтра» і ўсяго, што з ім звязана (імперыялізму, каланізатарскага капіталізму і г. д.[7]). З аднаго боку, «цэнтр» ёсць рэпрэсіўнай сілай, з другога – аб'ектам жадання, таму яго «татальнасць» патрабуе дэканструкцыі і іншых практык непадпарадкавання (напрыклад, канструяванне сябе ў межах кантэкстнасці – тут). «Філасофія вызвалення», у прынцыпе, заклапочаная не столькі аналізам «крэольства» самога сабой, колькі генеалогіяй вызвалення і яго рэфлексіўнымі практыкамі. «Вызваленне ад дамінавання» ў гэтай перспектыве цікавае значна больш, чым «аналітыка падпарадкавання», і праблема «палітычнага» змагання больш важная, чым праблема ідэнтычнасці.

Б. Андэрсан у сваёй дагэтуль папулярнай працы «Уяўныя супольнасці» (1983) сярод іншых версій нацыяналізму вылучае асобны тып «крэольскага нацыяналізму». Ён выступае адной з формай працэсу канструявання нацыі (nation building), які мае спецыфічнае адрозненне ад «класічнага» дзяржаўнага (грамадзянскага) і культурнага (моўнага) нацыяналізмаў. Грамадзянскі нацыяналізм быў характэрны для Францыі і Брытаніі, моўны – для Германіі і Італіі, крэольскі – для краін Лацінскай Амерыкі XIX ст. У рамках крэольскага нацыяналізму лацінаамерыканская эліта вырашала складанае пытанне пабудовы нацыі як пры адсутнасці традыцый дзяржаўнасці, так і моўнай, культурнай своеасаблівасці. Таму асновай крэольскага нацыяналізму стала рэгіянальная самадастатковасць, а таксама адміністратыўная і эканамічная еднасць. З культурнага і моўнага пункту гледжання новыя краіны былі лакальнымі копіямі метраполіі, што не замінала ім ваяваць з апошняй. Для разбудовы дзяржавы вырашальнае значэнне мела нацыятворчая актыўнасць эліт, якія займаліся не столькі «абуджэннем народу» (што рабілі эліты еўрапейскія), колькі яго канструяваннем, у тым ліку і праз стымуляванне іміграцыі з Еўропы. Можна згадаць пашыраны палітычны лозунг Аргентыны XIX ст.: «Кіраваць – значыць засяляць».

З выхадам працы Б. Андэрсана яго канцэпцыі набылі

[7] Гл., напрыклад: Келлнер Д. Культура медыя, крытычная тэорыя, постструктуралізм і філасофія крэольскага нацыяналізму // Еўрапейскі тэкст. 2000. № 8. С. 227.

ўстойлівую папулярнасць, у тым ліку і на постсавецкай прасторы. Ягоная канцэпцыя «крэольскага нацыяналізму» як асобнай формы нацыятворчых практык у краінах Лацінскай Амерыкі была перанята шэрагам украінскіх інтэлектуалаў (перш за ўсё М. Рабчуком) для аналізу посткаланіяльнай / постімперскай сітуацыі ва Украіне. У гэтым вузкім сэнсе, натуральна, набываючы новыя, у тым ліку і публіцыстычныя формы, гэтая канцэпцыя функцыянавала ва ўкраінскім мысленні, адкуль і трапіла ў беларускія інтэлектуальныя колы[8]. Праграмнай для актуалізацыі канцэпту «крэольства» стала праца ўкраінскага даследчыка М. Рабчука «Від Малоросії до України: парадокси запізнілого націєтворення»[9]. Кніга прыцягнула значную грамадскую ўвагу, стала сапраўдным інтэлектуальным бестселерам і прадметам вострых дыскусій. У 2000 г. выданне нават зрабілася «кнігай года» ў адной з намінацыяў.

У адпаведнасці з канцэпцыяй, закладзенай Б. Андэрсанам, М. Рабчук акрэслівае ў якасці «крэолаў» значны пласт украінскага грамадства, які прыняў ідэю дзяржаўнай незалежнасці Украіны, але не прыняў да канца «ўкраінскасць», украінскую «новую» гістарычную спадчыну і міфалогію ў яе «галіцкім» варыянце. Канцэпт быў уведзены для пераасэнсавання традыцыйнай дыхатаміі «ўкраінскамоўныя» – «расійскамоўныя», «дзяржаўнікі» – «савецкія людзі» і пазначэння новага, але ігнараванага феномену сучаснай украінскай рэальнасці. Як вызначае М. Рабчук, «крэолы» паводле сваёй культурнай арыентацыі, расійскамоўныя, спажываюць пераважна прадукты расійскай мас-культуры і арыентаваныя на расійскую культурную традыцыю (для іх А. Пушкін можа быць значна бліжэйшым за Т. Шаўчэнку). Але яны трывала стаяць на пазіцыі дзяржаўнай незалежнасці Украіны і адчуваюць выразную розніцу паміж Украінаю і Расіяй.

Менавіта як праява крэольскага нацыяналізму інтэрпрэтаваўся палітычны і культурны рэжым, складзены ў час прэзідэнцтва Л. Кучмы, і, напрыклад, Маскалянка (Київ: Критика, 2000). Свае

[8] Відаць, у Беларусі можна лічыць, што на тое, што

[9] Рабчук М. Від Малоросії до України: парадокси запізнілого націєтворення. (Київ: Критика, 2000). Свае

Паўночнае сяброўства ідэнтычнасці Рабчук, можна дадаць, кніга Л. Кучмы «Украіна – не Расія», самаідэнтыфікацыя

державі. Київ: Критика, 2000, і дакладна пра Дві Украіны рэжыму Ежы нацыяналізм Кіеў: Крытыка, 2003 Украіна: дзяржаўны Ежы нацыяналізм Кіеў: Крытыка, 2003 Украіна: дзяржаўны Ежы нацыяналізм Кіеў: Крытыка, 2003

10 Бушмас, І. (укр.) Украіна, — на Расіяна Маскві, 2003 ўнай і

11 Грабчай, Сяргей. Украінізацыя без сумневу, (тэрыт.) // Украіны, 2001. № 5. С. 429.

культурнага і палітычнага зместу, а яго прыхільнасць да расійскай культуры можа вагацца ад шчырай адданасці да звычайнага «прагматызму»[11]. Менавіта ў гэтым значэнні – калі-нікалі ў пазітыўным, калі-нікалі ў негатыўным – «крэольства» стала функцыянаваць у публіцыстыцы і інтэлектуальных дыскусіях для апісання спецыфічнага феномена постсавецкае Украіны. Паступова была знойдзена і больш глыбокая генеалогія феномена крэольства, з праявамі ў XIX і пач. XX ст.

БЕЛАРУСКАЯ АДАПТАЦЫЯ

Натуральна, што падобны феномен «дзяржаўнага нацыяналізму» можна назіраць і ў Беларусі, як і ў большасці іншых постсавецкіх краін ад Эстоніі да Казахстана (асабліва гэта датычыцца расійскамоўных групаў), што ёсць адным з наступстваў палітычнага распаду савецкай імперыі, якая не знікла без следу і працягвае сваё замагільнае жыццё ў культурных кантэкстах новых дзяржаўных утварэнняў.

Але беларускія публіцысты і інтэлектуалы пачалі выкарыстоўваць тэрміналогію «крэольскасці» для зусім іншых феноменаў, што набывае часам дзіўныя формы. У варыянце «публіцыстычнай дыскусіі» канцэпцыя «крэольства» трапіла ў Беларусь, але ў крыху «варварызаваным» выглядзе. Рэцэпцыя была моцна звязана з інфармацыйнай хваляй, якая была выклікана кнігамі М. Рабчука, але рэцэпцыя гэтая была своеасабліваю і толькі ўскосна звязанаю са зместам украінскіх дыскусій. Паняцце «крэольства» ўжывалася ў адпаведнасці з іншай семантыкай, блізкай да побытавай, гэта значыць, практычна выключна негатыўнай – звязанай са змяшэннем, культурным пагаршэннем і г. д. Фактычна, як слушна пазначае У. Абушэнка, «крэольства» пачынае функцыянаваць як субстытут «дрэннага народу».

У прыватнасці, В. Булгакаў, аналізуючы культурны і палітычны фон прэзідэнцкай кампаніі 2001 г., вызначае «крэолаў» не толькі як «этнічных беларусаў, якія дагэтуль не набылі акрэсленае нацыянальнае ідэнтычнасці», але і шырэй – як «носьбітаў ідэнтычнасці, сфармаванай яшчэ за часоў нацыянальнага грамадства».

Такім чынам, «крэолы» з незразумелай прычыны робяцца тоеснымі «несвядомым», а ў больш разгорнутай перспектыве – «тутэйшым», носьбітам этнічнай свядомасці[12]. Прычыны ўвядзення новага азначэння застаюцца незразумелымі. Яшчэ больш паказальнае параўнанне «трасянкі» з піджынам, якое не мае пад сабою ніякіх падстаў[13].

Маюць месца і памылкі ў разуменні самога паняцця «крэольства». Напрыклад, у рэцэнзіі на том 4 серыі «Беларусы» У. Корбут адзначае, што «білінгвізм» і існаванне «крэольскага жаргону», магчыма, «традыцыйная сітуацыя для Беларусі» (маецца на ўвазе доўгае існаванне змяшанай балцка-славянскай моўнай і культурнай сітуацыі пасля славянскай каланізацыі / моўнай асіміляцыі тэрыторыі Беларусі). На гэта робіцца спасылка: «Пра паняткі «крэолы» і «крэольскі» ў дачыненні да беларускае сітуацыі гл.: Булгакаў, 2001». У той час як у дадзеным тэксце В. Булгакаў пад «крэоламі» разумее зусім іншае: праявы не столькі змяшанай, колькі «дагістарычнай» свядомасці сучаснае Беларусі[14].

Пункт гледжання Булгакава, які ён выказаў у сваіх працах, знайшоў падтрымку ў Кастрычніцкай Кастрычніцкай Кастрычніцкай

Дракахруста (2002)[16].

Тэрміналогія і канцэпты «крэольства» ўстойліва выкарыстоўваюцца ў тэкстах І. Бабкова, дзе яны, наколькі я разумею, таксама недастаткова абгрунтаваныя. Напрыклад, у «Генеалогіі беларускай ідэі» «часам крэолаў» абазначана ўсё развіццё Беларусі пасля 1917–1920 гг., а таксама, у больш вузкім сэнсе, паўстанне Савецкае Беларусі (і, трэба разумець, адпаведнае ідэнтычнасці)[17].

Такім чынам, розныя аўтары разумеюць пад крэольствам вельмі розныя рэчы. Гэта і «носьбіты данацыянальнай свядомасці» (нацыянальна несвядомыя ўвогуле), і праявы гетэрагеннасці ў культуры, і беларуская савецкая культура. І практычна ні ў водным выпадку не даецца больш-менш задавальняльнае абгрунтаванне таго, у чым сутнасць «крэольства» і прычыны выкарыстання гэтай тэрміналогіі.

У. Абушэнка ў сваім аналізе спрабуе ўвесці яшчэ адно разуменне крэольства, базуючыся на традыцыі лацінаамерыканскіх інтэлектуалаў. У адрозненне ад большасці беларускіх аўтараў, цікавасць У. Абушэнкі да тэмы «крэольскасці» выклікана не ўплывам Украіны, а сталай увагай да лацінаамерыканскага мыслення, якое «раптам» выявілася прыдатным для апісання рэальнасці Усходняй Еўропы.

ВЫЗНАЧЭННЕ «КРЭОЛА»

У. Абушэнка прапануе свой варыянт адказу на пытанне «Хто такі крэол?». Яшчэ раз падкрэсліваецца значэнне месца, на гэты раз у форме «месца прыбыцця», якое стварае «кантэкст», сітуацыю «тут і цяпер», якая паступова разрывае, раздвойвае ідэнтычнасць, маналітную свядомасць метраполіі. З аднаго боку, крэол адчувае сваю адрознасць ад чалавека з «цэнтра», з другога (і гэта яшчэ больш важна) – чалавек метраполіі перастае ўспрымаць культуру «перыферыі» як роўную ўласнай. Тое, што ствараецца ў цэнтры, ёсць для крэола эталонам – аб'ектам жадання (напрыклад, каланіяльныя спробы паўтараць стылі і формы метраполіі). У сваім імкненні імітаваць каноны «метраполіі» крэол пачынае прадукаваць «непаўнавартаснае

мысленне». З іншага боку, «цэнтр» імкнецца да рэпрэсавання праяў адрознасці праз навязванне ўласнае мовы, «універсальных» стандартаў і ўяўленняў пра рэальнасць. «Універсальнае», «правільнае», «эталоннае» прадукуецца «цэнтрам». «Крэольскае», «мясцовае», «лакальнае» спараджаецца кантэкстам, які можна не заўважаць.

Добра вядомыя схемы «postcolonial» можна раскрыць на прыкладзе. Ва Украіне і Беларусі, напрыклад, можа існаваць расійская літаратура і яе эталоны і нормы, зададзеныя з Расіі. Больш за тое, такая літаратура вельмі часта не прызнаецца за «русскую» і звычайна класіфікуецца як «расійскамоўная літаратура краінаў СНД», што адлюстроўвае яе перыферыйны статус. Калі такі літаратар пачынае пісаць толькі пра ўласны кантэкст, ён рызыкуе перастаць быць цікавым для «цэнтра», а калі выкарыстоўвае «лакальную» лексіку і выразы, можа быць кваліфікаваны як «варвар». Лакальныя расійскія літаратуры, такім чынам, знаходзяцца ў стане адначасовай залежнасці ад нормаў «цэнтра» і ад кантэксту, які жыве паводле іншых правіл. Спалучэнне гэтых дзвюх «залежнасцяў» не простае. Акрамя гэтага, існуюць і рознага кшталту інстытуцыйныя абмежаванні: стаўленне з боку выдавецтваў, фондаў, прыналежнасць да прафесійных карпарацый ды аб'яднанняў.

У. Абушэнка адзначае, што такая сітуацыя спараджае, па-першае, «тутэйшыя генеалогіі», па-другое, новае прачытанне сэнсаў «цэнтра».

Калі звярнуцца да Усходняй Еўропы, можна згадаць імкненне часткі беларускай інтэлігенцыі, якая арыентавана на панславізм, да актуалізацыі традыцыі «заходнерусізму» XIX ст. – канструявання ўласнай «тутэйшай генеалогіі» з лініі, якая знікла на пачатку XX ст. Імкненне да канструявання новай «тутэйшай генеалогіі» заўважнае ў корпусе так званай «ідэалогіі беларускай дзяржавы». Прычым крытычнае стаўленне да «метраполіі» паступова ўзрастае – яна перастае быць эталонам і аб'ектам жадання. Для «крэольскага нацыятварэння» (у тэрміналогіі М. Рабчука) ва Украіне таксама канструююцца адпаведныя генеалогіі. «Кантэкст», такім чынам, «разбурае канон» і стварае зусім іншую культурную сітуацыю.

Пазіцыя крэола, паводле У. Абушэнкі, – пазіцыя ўмоўна перыферыйнага чытача, «які знаходзіцца ў іншасці (яна не адразу рэфлексуецца як гэткая нават ім самім), якая дазваляе выявіць іншае ў тэксце «цэнтра», першапачаткова ўспрымаючы яго (цэнтр. – **А.К.**) як іншае ў дачыненні да ўласнай сітуацыі крэольскасці і спрабуючы яго выправіць ці замяніць (сваім «иным-инаковым»), утрымліваючы пры гэтым асноўны інварыянтны змест тэксту». Практычна гэта азначае дэканструкцыю «метраполіі». Падсумоўваючы сказанае, У. Абушэнка прапануе разглядаць «крэольскасць» як «першасную (іншую ў полі дадзенай тоеснасці «еўрапейскага цэнтра»), але недастатковую нацыянальна-культурную ідэнтыфікацыю». Еўропацэнтрызм – аснова лацінаамерыканскага досведу крэольскасці (іншыя формы «цэнтрызму», адпаведна, спараджаюць свае варыянты «крэольскасці»).

Паўстае праблема аналізу еўропацэнтрызму, які доўгі час не заўважаў «іншага» і ўсё, акрамя створанага ў «цэнтры», класіфікаваў як маргінальнае. Сярод прычын фармавання універсалісцкага светагляду і неактуальнасці кантэкстаў для Еўропы У. Абушэнка адзначае існаванне трывалых універсалісцкіх традыцый: рымска-антычнай, каталіцка-хрысціянскай, асветніцкай, што натуральным чынам трансфармуецца ва універсалізм нацыянальнай ідэнтычнасці еўрапейцаў. Разбурэнне еўрапейскага цэнтрызму было звязана з паўстаннем вельмі розных інтэлектуальных традыцый. Першая: праект стварэння сацыяльных навук, які быў пакліканы «актуалізаваць дадзенасць», заснаваную на пазітывісцкай метадалогіі. Гэта асабліва відавочна ў кантэксце паўстання ў XIX ст. розных версій «нацыянальных» пазітывізмаў. Другая: «філасофія жыцця» і розныя варыянты сацыяльнага песімізму (Ф. Ніцшэ, О. Шпенглер) і культурна-кантэкстуальнай рэфлексіі (М. Вебер). Пасля Першай сусветнай вайны У. Абушэнка адзначае паўстанне марксісцкага універсалісцкага праекту, а пасля Другой – універсалізму заходніх каштоўнасцяў як працягу «місіі белага чалавека». Разбурэнне гэтых універсалізмаў звязваецца з паўстаннем тэорый «цэнтра і перыферыі», «наўздагоннага развіцця», дыскурсаў «іншага», «адрознага», крытыкі рацыянальнасці (у прыватнасці, з пазіцый «архаікі» К. Леві-Стросам), асабліва

адзначае ролю постмадэрнізму ў дэканструкцыі «цэнтра».

Такім чынам, пад панятак «крэол» падводзіцца дастатковая канцэптуальная база, але вызначэння крэолаў як сацыяльнае групы, на жаль, зноў не адбываецца.

«ТУТЭЙШАСЦЬ» І «КРЭОЛЬСТВА»: АДЭКВАТНАСЦЬ СУАДНОСІН

Акрамя семантычнае разнастайнасці, яшчэ адной прыкметай беларускай дыскусіі стала імкненне спалучыць «крэольства» з інтэграваным у беларускую культуру феноменам «тутэйшасці». Напрыклад, пры разглядзе ўласцівасцяў «крэольскасці» У. Абушэнка звяртаецца да аналізу канцэпту «тутэйшасці», а дакладней, спрабуе атаясаміць «крэольскасць» і «тутэйшасць» праз іх шчыльную прывязанасць да «месца знаходжання» і лакалізацыю ў прасторы ўвогуле.

«Тутэйшасць», як вядома, мае непасрэдную сувязь не толькі з сучаснай беларускай рэальнасцю, але і з інтэлектуальнай традыцыяй канца XIX – пачатку XX стст., таму, каб пазбегнуць тэрміналагічных праблем, коратка спынімся на практыцы ўжывання гэтага панятку. Доўгі час слова «тутэйшыя» было саманазвай значнай колькасці этнічных беларусаў. «Тутэйшасць» прэзентавала форму данацыянальнай свядомасці, а дакладней, імкненне пазбегнуць нацыянальнай ідэнтыфікацыі. «Тутэйшыя» выразна адрознівалі сябе ад іншых – перш за ўсё расійцаў і палякаў, – але не ідэнтыфікавалі сябе з уласным этнасам ці нацыяй. Для беларускага нацыянальнага руху «тутэйшасць» была важнай праблемай і прадметам дыскусій. Ацэнкі гэтага феномену былі розныя, але збольшага атрымалі ў публіцыстыцы пачатку XX ст. негатыўны змест. Тэкстам-сімвалам, які рэпрэзентуе разуменне тутэйшасці пачатку XX ст., можна лічыць вядомую п'есу Я. Купалы «Тутэйшыя» (1922). Беларуская савецкая культура цалкам пераняла «адраджэнскае» разуменне «тутэйшасці» як нацыянальнага феномену. У 1990-я гг. узнікаюць новыя інтэрпрэтацыі «тутэйшасці». З аднаго боку, данацыянальныя ўласцівасці беларускае свядомасці пачынаюць успрымацца як ключ да разумення беларускага нацыятворчага працэсу, з

другога – з’яўляюцца адлюстраваннем сучаснай нацыянальнай тоеснасці.

«Тутэйшая» ідэнтыфікацыя мае вельмі моцную повязь з месцам (тут), таму У. Абушэнка практычна злівае гэты канцэпт з «крэольствам», які, у сваю чаргу, мае моцную прывязку да кантэксту. Феномены гэтыя падобныя паводле формы, але генетычна вельмі розныя. Механічнае збліжэнне гэтых двух феноменаў, як падаецца, павінна забяспечыць угрунтаванасць канцэпцый у беларускую рэальнасць. На нашу думку, такі падыход памылковы. «Тутэйшасць» і «крэольскасць», калі штучна не прыдумляць ім дадатковай семантыкі, маюць хутчэй супрацьлеглую прыроду.

«Крэольская» ідэнтычнасць, калі трымацца звыклага значэння гэтага слова, паўстае ў выніку прасторавага расшчаплення свядомасці метраполіі («цэнтра»). Расшчапленне, у сваю чаргу, настае ў выніку перамяшчэння, міграцыі[18]. Што тычыцца «тутэйшасці» як беларускага феномена, то яна практычна не ўтрымлівае ў сабе метраполіі ці нейкага іншага знешняга цэнтра і ніякім чынам не звязаная з расшчапленнем ідэнтычнасці. Для «тутэйшай» свядомасці «сваё месца», каб выступае ў якасці цэнтра, гэта свайго роду «самацэнтрычны» погляд на наваколле[19]. «Крэольскасць» перажывае ад ранейшае ад метраполіі, што спалучаецца з жаданнем альбо «ўз’яднання», альбо «набыцця новай радзімы». З гэтага пункту гледжання «крэол» мае вельмі моцную повязь з метраполіяй і знаходзіцца ў стане палітычнай і культурнай залежнасці ад «цэнтра». «Тутэйшасць» мае ў дачыненні да метраполіі выключна спажывецкае стаўленне. «Тутэйшасць» не прывязана да канцэпту «цэнтр» (у адрозненне ад «крэольскасці»), тутэйшая свядомасць вышэйшая за універсальнасць і наўпрост не залежыць ад яе; яна ўсведамляе сваю іншасць, але інакш, чым крэол. Малаверагодна, каб беларус XIX ст., які выразна разумее розніцу паміж сабою і іншым – расійцам, палякам, – успрымаў іх як «цэнтр», для такой свядомасці праблемы цэнтра ўвогуле няма. У сваю чаргу, крэол Лацінскай Амерыкі першапачаткова не разумеў «метраполію» як іншае і быў вымушаны рэфлексаваць над праблемай сваёй адрознасці і залежнасці ад «цэнтра».

[18] Як прыклад сваю чаргу, О’Брэн, Юджын. Чарга Ірландыяў: эміграцыя і эпістэмалогія ідэнтычнасці // Палітычная сфера. 2005. № 5.

[19] Альбо нават этнацэнтрычны, гл. у прыватнасці: Радзік Р. Прычыны слабасці нацыятворчага працэсу беларусаў у XIX–XX стст. // Беларускі гістарычны агляд. Т. 2: Сьнежань 1995. С. 197.

Тут мы падыходзім да самай значнай метадалагічнай праблемы. Абушэнка адзначае, што яго разуменне «крэольскасці» «максімальна пашыранае». Гэта «першаснае ўсведамленне ўласнае іншасці ва ўмовах навязанай і прынятай прасторы тоеснасці з яе маёй і чужой для мяне мадэрнісцкай універсальнасцю ва ўмовах адсутнасці першапачатковых змястоўных крытэраў для канструявання ўласнай кантэкстуальнай прасторы і ўпісвання яе ва універсальнасць пры адрэфлексаванасці неабходнасці-жадання спрадукаваць такую ідэнтыфікацыю» (крыху спрошчаны пераказ). Сам канцэпт «крэольскасці» выкарыстоўваецца для «азначэння ўсведамлення іншасці кантэкстуальнасці, якая дадзеная ў сваёй першаснай «нулявой ступені» («тутэйшасці»)».

Тут узнікае некалькі пытанняў. Па-першае, ці варта разумець «крэольскасць» максімальна шырока, і наколькі гэта апраўдана з метадалагічнага пункту гледжання. Спецыфіка феномена ў гэтых абставінах робіцца вельмі размытай, а эўрыстычныя магчымасці мінімальнымі. Па-другое, наколькі карэктнае спалучэнне «тутэйшасці» і «крэольскасці». Першаснае ўсведамленне іншасці «крэолам» і «тутэйшым» вельмі рознае, і ў беларускім кантэксце можна знайсці адпаведныя сацыяльныя практыкі. Змешванне гэтых паняткаў прыводзіць не толькі да немагчымасці прасачыць дынаміку культурных працэсаў у Беларусі, але і да складанасцяў пры звычайным апісанні культурнага ландшафту.

КАНФІГУРАЦЫЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ТРАДЫЦЫІ

У. Абушэнка вызначае універсальнасць як аснову, на якой будаваліся нацыянальныя універсальнасці Заходняй Еўропы. Для іншых нацый, «якія падключыліся» да універсальнасці, праблема разумення ўласнае рэчаіснасці (паводле У. Абушэнкі – кантэксту) расколвае культурную традыцыю на два супрацьлеглыя кірункі» – заходнікаў, якія арыентуюцца на «пазакантэкстныя» ўзоры і імкнуцца да пераадолення рэгіянальных асаблівасцяў, і традыцыяналістаў (почвенников), якія імкнуцца да захавання кантэксту і асаблівасцяў. Трэба прызнаць, што такая дыхатамія сапраўды характэрная для развіцця шэрагу еўрапейскіх і ў большай ступені нееўрапейскіх

краін, асабліва калі сітуацыя ўскладняецца наяўнасцю ўласнай «цывілізацыйнай місіі», як у Расіі. Але далёка не для ўсіх.

Многія нацыі, якія «далучыліся» да універсальнасці, перажываюць свой комплекс праблем, галоўная з якіх – існаванне звычайна некалькіх цэнтраў прыцягнення – лакальнага і універсальнага. Для беларускай сітуацыі гэта класічнае супрацьпастаўленне Захаду і Расіі.

У гэтым кантэксце цікавая праблема палягае ў вызначэнні таго, калі ў беларускім кантэксце паўстае праблема Захаду. Як падаецца, усё XIX ст. Беларусь была месцам сутыкнення двух лакальных цэнтраў – расійскага і польскага, і, адпаведна, дзвюх палітычных традыцый: Расійскай імперыі і Рэчы Паспалітай. Захад як праблема і аб'ект жадання трапляе ў нацыянальны дыскурс толькі на пачатку XX ст., а кадыфікацыя вобраза адбываецца ўжо ва ўмовах БССР і эміграцыі[20]. Такім чынам, апазіцыя «заходнікі» – «традыцыяналісты» выглядае не зусім пераканаўчай (першыя часта супадалі з другімі). Украінскі прыклад нетрывіяльнае «траекторыі» нядрэнна паказаны М. Рабчуком, калі ён аналізуе асаблівасці ўкраінскага славянафільства і палітычныя ды культурныя механізмы яго пераўтварэння ў «заходніцтва»[21].

Для нацый Усходняй Еўропы працэс нацыятварэння вышаваў, як «вяртанне», «нармалізацыя» (параўнайце «людзьмі звацца» Я. Купалы) уласнай прасторы. Прычым гэта выступала тэкстам, а не рухальным фактарам, а не стратэгіямі, якія «зацямнялі сутнасць справы» (У. Абушэнка). Досвед Усходняй Еўропы ў гэтым дачыненні больш падобны да іспанскага (XIX ст.), чым час як для ўласна лацінаамерыканскага ўбудоўвання ў універсальнасць гэта, перш за ўсё, імкненне «авалодаць цэнтрам», упісаць у свой кантэкст і вызваліцца ад яго дамінавання.

Стратэгіі дачынення «цэнтраў» са сваім іншым вельмі розныя. У. Абушэнка адзначае, што «цэнтры» для захавання ўласных прывілеяваных пазіцый імкнуцца да «выраўноўвання прасторы» і рэпрэсуюць кантэкстуальнасць і лакальныя асаблівасці. Перш за ўсё гэта тычыцца лакальных цэнтраў у межах імперый – Расійскай, Аўстра-Вугорскай. Адпаведна, галоўнымі сродкамі

[20] Напрыклад, у творчасці Я. Купалы Захад як культурны ідэал ёсць ужо ў 1910-х гг., але ён набывае завершаны выгляд толькі ў 1920-х («Адвечным шляхам» І. Канчэўскага (1921). Гл.: Адзяраловіч І. Адвечным шляхам. –

супраціўлення «выраўноўванню» для нацый робіцца «актуалізацыя інша-кантэкстуальнасцяў», што стала суправаджаецца «вяртаннем да рэканструкцыі адраджэння... новых ідэнтычнасцяў розная капіталу», гэта значыць паўстанне рухаў нацыянальнага вызвалення. У гэтых умовах праблемы «нацыянальнага» робяцца «асаблівым, часам асноўным прадметам філасофскай рэфлексіі і навуковых намаганняў». У той жа час «цэнтр» ставіцца да такіх тэкстаў і практык падазрона, як да пагрозы свайму дамінаванню. І, трэба зазначыць, зусім не беспадстаўна. Сродкі «цэнтра» ўключаюць у сябе як рэпрэсіі, так і заахвочванне «перыферыі». З аднаго боку, гэта можа быць канцэпцыя «адзінага народу» – у якасці класічнага прыкладу прыводзіцца Францыя (можна дадаць ЗША і Вялікабрытанію). З другога боку, розныя формы «дэнацыяналізацыі» (знішчэння адрознасці). Такім чынам, «кантэкстуальнае» ў асяроддзі універсальнасці (лакальнае) робіцца «этнаграфічным» і заганяецца ў розныя формы «гета», як з'ява дамадэрная і a priori несучасная.

У якасці прыкладу У. Абушэнка згадвае палітыку русіфікацыі ў Расійскай імперыі, якую аўтар называе «адваротнай крэалізацыяй». На жаль, культурны і палітычны змест гэтага канцэпту не развіваецца і застаецца нявызначаны. Як, дарэчы, і пастулат пра тое, што расійскія ўлады ўспрымалі беларусаў як «прыроджаных крэолаў». Ці значыць гэта, што беларусы ў Расійскай імперыі не ўспрымаліся як «инородцы», альбо ў гэты канцэпт укладзены нейкі дадатковы сэнс?

Разглядаючы перспектыву Усходняй Еўропы, У. Абушэнка закранае праблему саветызацыі, якую прапануе апісваць у «тэрмінах спецыфічнай крэалізацыі і дэкрэалізацыі», але якім чынам – застаецца нявызначаным. Нераскрытымі застаюцца якасныя адрозненні паміж «універсальнасцю» і «лакальнай універсальнасцю», у той жа час, відавочна, гэтыя феномены маюць вельмі розны змест.

Што да Беларусі, то яе культурная і палітычная сітуацыя, як адзначае У. Абушэнка, цікавая як месца сутыкнення некалькіх праектаў цэнтра (цэнтраў) і кантэксту, які дэманструе не толькі разнастайнасць праектаў, але і іх пастаянныя рэінкарнацыі.

21 Рябчук М. Западники поневоле: парадоксы украинского нативизма // Перекрестки. 2004. № 1–2.

Для адэкватнага вывучэння тутэйшае сітуацыі патрабуецца «як мінімум сумяшчэнне розных перспектыў і іх бязлітасная крытычная экспертыза на ўзроўні (пост)сучаснага «універсалісцкага» мыслення, што, аднак, ніякім чынам не павінна азначаць адкідванне ўжо напрацаванага, з аднаго боку, і ігнараванне кантэкстуальнасці – з другога». Перспектыва «цьмяная», але цікавая. І далей – «менавіта кантэкстнасць уяўляецца ў святле прапанаванага аналізу тым «месцам», дзе належыць шукаць адказы».

Сам аналіз беларускага кантэксту займае сціплае месца ў тэксце Абушэнкі, напрыканцы артыкула (с. 145–150), і з'яўляецца схематычным. Аўтар вызначае, на яго думку, два найбольш значныя аспекты беларускае сітуацыі. Першы – працяглая канстантная прысутнасць «лініі расійскасці», якая дастаткова трывала ўбудаваная ў мясцовую рэальнасць. Другі – «нацыятворчыя стратэгіі і праекты», якія ствараюць сам кантэкст, але ўвесь час пяражываюць астракізм унутры гэтага кантэксту. Падаецца, што зводзіць культурную і палітычную сітуацыю да дыхатаміі «расійскае» і «нацыянальнае» значыць троху спрашчаць справу. Такі падыход пакідае па-за ўвагаю сам феномен постсавецкай крэольскасці, як яго вызначаюць украінскія аўтары (нагадаем, што канцэпт быў уведзены менавіта для злому апазіцыі «расійскае» – «нацыянальнае»). Больш за тое, не варта забываць і пра ўласна «тутэйшую», пазанацыянальную культурную ідэнтыфікацыю, якая захоўвае сваю актуальнасць і дагэтуль. Акрамя гэтага, для цэласнасці культурнага ландшафту трэба ўлічваць «краёвую» традыцыю, якая, нягледзячы на тое, што знікла ў 1930-я – 1940-я гг., важная для разумення беларускае сітуацыі і, прынамсі, вартая асобнай увагі.

Лінія расійскасці, паводле У. Абушэнкі, «прадстаўлена чаргаваннем версій», а ключавым для іх разумення застаецца тэза пра «тоеснасць і нераспазнавальнасць уласна расійскага і беларускага». Трэба зазначыць, гэта вельмі спрэчнае сцверджанне, нават для традыцыі заходнерусізму «тоеснасць» беларускага і расійскага ніколі не была такой адназначнай[22]. У. Абушэнка звязвае «лінію расійскасці» з «дыскурсам вызвалення» (ад іншых), які пераплецены з дыскурсам

«выпраўлення» (вяртанне да сапраўднае ідэнтычнасці). Апошняя рыса «лініі расійскасці» – міф пра супольнае гістарычнае мінулае, непадзельнасць лёсу ды «кантроль над гістарычнымі рэканструкцыямі». Усё гэта спалучаецца з непрызнаннем статутнасці беларускае мовы ці, прынамсі, абмежаваннем яе сферы дэкаратыўным гета.

Размова тут, відавочна, ідзе пра шырокае разуменне «расійскасці». Бо адданасць «сапраўднай расійскай ідэі» існуе толькі сярод вельмі вузкага кола па-панславісцку арыентаванай інтэлігенцыі, якую колькасна нельга параўнаць з «беларусамі». Самастойныя палітычныя праекты панславістаў былі дазнаны няўдалыя, інстытуцыялізацыі «расійскасці» ў палітычнай сістэме так і не адбылося.

Лінія «адраджэння», якая, паводле У. Абушэнкі, ёсць другім складнікам беларускае сітуацыі, на жаль, практычна не аналізуецца. Аўтар адразу пераходзіць да выкладання метадалогіі даследавання Беларусі з «крэольскае» перспектывы.

«Вузел для разумення беларускага кантэксту стварае крытычная рэфлексія і аналіз прапанаваных і рэалізаваных тут стратэгій і праектаў авалодвання культуртрэгерамі ўласнай кантэкстуальнай прастораю, у якой так ці інакш латэнтна прысутнічае фактар «крэольскасці». Аналіз крэольскасці дапамагае зразумець «пралікі стратэгій адраджэння, а таксама вызначыць магчымыя перспектывы».

На нашу думку, месца «крэольскага аналізу» больш сціплае. У беларускім кантэксце, як падаецца, крэольскасць можа быць адэкватна праінтэрпрэтавана толькі як феномен, паўсталы ў выніку разбурэння ідэнтычнасці расійскага, савецкага ці польскага цэнтраў: беларускія расійцы (расійскаарыентаваныя беларусы), беларускія палякі, постсавецкая ідэнтычнасць, якую пазбавілі звыклых «цэнтраў».

Паводле У. Абушэнкі, аналіз «крэольскасці» ў яе шырокім разуменні дазваляе выявіць: 1) спосабы і стратэгіі фармавання «тутэйшых» генеалогій; 2) спосабы і стратэгіі набыцця і канструявання гістарычна-культурнае спадчыны; (…) 5)

[22] Гл., у прыватнасці, прыентаванай спарусамі ідэалогіі: Казакевіч, Андрэй. Пра калёнію // Палітычная сфера. 2001. № 1.

магчымасці пераходу ад канструявання тутэйшых генеалогій да генеалогіі тутэйшасці. (…) Пазначаныя пункты, на нашу думку, выразна дэманструюць, што дасягненне пастаўленых мэтаў магчыма толькі пры разуменні «крэольскасці» ў спецыфічным вузкім сэнсе і пры выразным адрозніванні яе ад феномена «тутэйшасці».

Таксама не зусім карэктным падаецца выкладанне крэольскасці ў беларускім кантэксце як «характарыстыкі (вылучана мною. – **А.К.**) нацыі, якая сацыяльна фармавалася ў апошнюю «хвалю» мадэрнізацыі». Ці ёсць падставы гаварыць пра ўласцівасці нацыі? Прынамсі, з папярэдняга аналізу «крэольскасці» вынікае, што гэта, па-першае, культурная пазіцыя, па-другое, гэта пазіцыя, якую займаюць далёка не ўсе культурныя і палітычныя праекты беларускага кантэксту. У кожным разе, апісанне «крэольскасці» як *характарыстыкі* ўсёй нацыі патрабуе дадатковага тлумачэння. З адзначаных вышэй прычын нельга пагадзіцца і з інтэрпрэтацыямі «крэольскасці» як «механізму культуры, які ўзнаўляецца кантэкстуальнай (якая ідэнтыфікуе сябе з беларускасцю) элітай, якая сканструявала і ўсвядоміла сябе першапачаткова з «агучвання» «тутэйшасці» і дыскурсіўнага нараджэння «тутэйшых» генеалогій і якая рухаецца па шляху нараджэння генеалогіі тутэйшасці». «На гэты час беларускасць спрабуе ўтрымацца ў кантэкстуальнасці «іншага» і артыкулюе сваю вылучанасць і адасобленасць іншых сацыяльных групаў… Генеалогія тутэйшасці, такім чынам, застаецца недапраяўленая, а гэта значыць, што беларуская сітуацыя па-ранейшаму можа інтэрпрэтавацца праз механізм «крэольскасці». Зноў адзначым неапраўданасць выкарыстання канцэпту «крэольскасці» ўсяго беларускага грамадства, у межах якога функцыянуюць вельмі розныя ідэнтычнасці.

Не зусім зразумела таксама гучыць тэза пра тое, што пачатак генеалогіі беларускай тутэйшасці можна маркіраваць Адамам Міцкевічам і што менавіта гэтая постаць, магчыма, «вызначала рух беларускай культуры па шляху крэольскасці». Усё ж такі сцверджанне, што беларуская культура развівалася ў фармаце «крэольскасці», ёсць значным перабольшваннем. Хутчэй, наадварот, менавіта таму, што А. Міцкевіч быў «крэолам» і шмат у чым не ўспрымаў «тутэйшасці», ён так і не быў да канца

ўпісаны ў беларускі культурны канон.

АГУЛЬНЫЯ ЗАЎВАГІ

Дыскусія пра крэольства паказвае пэўную даследчую перспектыву і мае дастаткова цікавую аснову для аналізу культурных феноменаў сучаснае Беларусі, але сам канцэпт пражыў беспадстаўную семантычную інфляцыю.

Дыскусія пра «крэольства» не прапануе гатовай схемы прачытання сітуацыі ў Беларусі. На нашу думку, гэта не ў апошнюю чаргу выклікана прыдатнасцю выкладзенай метадалогіі «крэольства» для аналізу не «інша-мадэрнасці» (У. Абушэнка) ці савецкасці (І. Бабкоў), а толькі яе асобных частак.

Прынцыпова нельга пагадзіцца з атаясамленнем феноменаў «крэольскасці» і «тутэйшасці» ў беларускім кантэксце і тым больш з прачытаннем беларускай культуры як «крэольскай» у сваёй аснове. На гэта няма ніякіх падстаў, калі адкінуць a priori неэфектыўнае наданне звыклым тэрмінам новых, зусім «некантэкстуальных» значэнняў.

З пункту гледжання даследчае сферы існуюць два аспекты «крэольскай» праблемы. Па-першае, ужыванне «крэольскага» тэрміналогіі і метадалогіі («крэольскі тып нацыяналізму», «крэольскасць» і г. д.) патрабуе прапісвання (кантэкстуалізацыі – у тэрміналогіі У. Абушэнкі), а не метафарычных ці абстрактна-тэарэтычных адсылак[23]. Па-другое, патрэбна аналітычная лакалізацыя феноменаў «крэольскасці» ў ЗША неапраўдана, як гэта робіць У. Абушэнка, звязваць гэты феномен з усім беларускім грамадствам і, тым больш, з беларускай нацыяй. Гэта надта нагадвае прадукаванне «заходнееўрапейскай татальнасці», у той час як рэальны культурны і палітычны ландшафт значна больш складаны.

Эфектыўнае выкарыстанне метадалогіі, якая была выкладзена вышэй, магчыма толькі ў дачыненні да некаторых сацыяльных групаў і палітычна-культурных феноменаў. У прыватнасці, «небеларускай беларускасці», «краёвасці», у значнай ступені «заходнерусізму». «Максімальна шырокае» выкарыстанне

[23] Дарэчы, гэта датычыць і «крэольскага» ў ЗША. Ці можна называць некаторых беларусаў, якія пражываюць на поўдні ЗША альбо гэта выключна спецыфіка індыі? Гэта не толькі ў

«лацінаамерыканскай» ды «ўкраінскай» метадалогіітым, непрадуктыўнае, што і паказвае досвед апошніх чатырохсот гадоў, калі «крэольская» рыторыка ў публічным дыскурсе была зведзена да мінімуму.

мадэль адэкватная для апісання сацыяльнай рэальнасці, але і ў тым, якія канатацыі выклікае слова «каста» і наколькі яго ўжыванне прымальнае для акадэмічнай супольнасці (у тым ліку і з ідэалагічнага пункту гледжання). Аб дыскусіі пра «касты» ў ЗША гл., у прыватнасці: Дюмон, Луи. Homo Hiererchicus. Опыт описания системы каст. Санкт-Петербург, 2001. С. 268–274.

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/11/30
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 9 (49) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

[image]

[image]2006

[image] [image] [image]

[image] [image] [image]

АЛЯКСЕЙ ДЗЕРМАНТ

Аляксей Дзермант У чаканні Івана Жахлівага Геапалітыка вачыма расійскіх еўраазіятаў

культуроляг, філёзаф, сябра Цэнтру этнакасмалёгіі «Крыўя». Ягоны апошні тэкст у «ARCHE» – «Этнагенэз беларусаў II: Яшчэ раз пра навуку і ідэалегію, або Куды вядзе «легіка здаровага розуму», напісаны ў суаўтарстве зь Сяргеем Саньком.

З гісторыяй і падставовымі прынцыпамі руху еўрапейскіх «новых правых» (*Nouvelle Droite*) зацікаўлены беларускі чытач ужо меў магчымасць пазнаёміцца ў шэрагу публікацый. Адным з вынікаў шматгадовай працы гэтай інтэлектуальнай плыні можна назваць пан'еўрапейскі маштаб пашырэння яе ідэй ды дзейнасці. Не абмінуў гэты ўплыў і краінаў Усходняй Еўропы, дзе ва ўмовах пераходу ад камуністычнай да ліберальна-дэмакратычнай ідэалогіі светагляд, прапанаваны «новымі правымі», мог скласці ёй канкурэнцыю.

Любыя ідэі не застрахаваныя ад адвольнай інтэрпрэтацыі, адлюстравання ў крывым люстэрку, якое часам цалкам скажае іх сутнасць ды ператварае ў нешта зусім процілеглае. Амаль адразу па скасаванні «жалезнай заслоны» на еўрапейскіх «новых правых» звярнулі ўвагу прадстаўнікі настроеных па-антызаходняму расійскіх радыкалаў, знайшоўшы там арыгінальны тэзаўрус ідэй у гатовым выглядзе, якімі захацелася ўзбагаціць собскі звычайны набор партыйных праграм. Адным з першых, хто ўзяў на ўзбраенне тэарэтычныя распрацоўкі *Nouvelle Droite*, прышчапіўшы іх да рэанімаванага

еўразійства, быў колішні ідэолаг эпатажнай Нацыянал-бальшавіцкай партыі Расіі, а цяпер «рэспектабельны» палітык і лідэр руху «Еўразія» Аляксандр Дугін. Пазней да яго далучыўся шэраг іншых тэарэтыкаў і публіцыстаў, якія ў меру сваёй адукаванасці намагаліся прыстасаваць *Weltanschauung* «новых правых» да расійскай рэчаіснасці.

У сваіх шматлікіх опусах, а таксама частых выступах у мас-медыях (у тым ліку беларускіх) А. Дугін высоўвае ідэі геапалітычнага дэтэрмінізму, які ён уяўляе як зацятае змаганне Захаду і Усходу. Паводле Дугінавай візіі свету Усход у гэтым змаганні паўстае ўвасабленнем «раю», абсалютнага станоўчага полюсу, а расійцы, натуральна, маюць выключную місію на Зямлі ў стварэнні і задзіночанні ўсіх усходніх ды не толькі народаў у кантынентальную еўразійскую Звышімперыю. Дугін пераканаць:

Расійскі народ адназначна належыць да ліку месіянскіх народаў. І як кожны месіянскі народ, ён мае універсальнае ўсечалавечае значэнне, якое канкуруе не толькі з іншымі нацыянальнымі ідэямі, але і з тыпамі іншых формаў цывілізацыйнага універсалізму… Місія расійцаў мела універсальны характар, і менавіта таму расійскі народ планамерна ішоў у гісторыі да стварэння Імперыі, межы якой пастаянна пашыраліся, ахопліваючы ўсё большы і большы кангламерат народаў, культур, рэлігій, тэрыторый, рэгіёнаў. Лічыць гэты планамерны і яскрава выяўлены «экспансіянізм» расійцаў гістарычнай выпадковасцю абсурдна. Гэты «экспансіянізм» складае неад'емную частку гістарычнага быцця расійскага народу і шчыльна злучаны з якасцю яго цывілізацыйнай місіі. Гэтая місія нясе ў сабе нейкі «агульны назоўнік», які дазваляе расійцам інтэграваць у сваю Імперыю самыя розныя культурныя рэальнасці. Гаворка ідзе… пра сцвярджэнне адмысловага «расійскага» тыпу светагляду, які акцэнтаваны эсхаталагічна і прэтэндуе на апошняе слова ў зямной гісторыі. Гэта – найвышэйшая звышзадача нацыі як «баганоснага народу»[1].

Этнакультурная адметнасць расійцаў бачыцца ідэолагу неаеўразійства гэтак:

У нас, расійцах, цяжка адшукаць чыстую кроў – маладушы, вялікаросы, татары, вугры, іншыя еўразійскія этнасы перамяшаныя ў ісцінна расійскім чалавеку. Гэта не нашае хвароба, гэта аснова нашай унікальнасці, нашага унікальнага нашай велічы[2].

Падобныя ідэі амаль цалкам процілеглыя тым, што атаясамліваюцца з еўрапейскімі «новымі правымі». Для апошніх любы месіянскі імпэт, празелітызм, роўна як і чорна-белы падзел свету, ёсць непрымальным і вытворным ад крытыкавага іудзейска-хрысціянскага рэлігійнага светагляду. Гэтаксама існуе прынцыповая розніца між індаеўрапейскім, фундаментальным дыферэнцыялісцкім праектам Еўрапейскага Саюза і [3] Тоіпарі А. The European New Right: Arena between Empire and Federation // Telos. Dec. 2008 – Feb. 2009. № 146. P. 101–112.

[4] Alain de Benoist. The Idea of Empire // Telos. Dec. 1993 – May 1994. № 98–99. P. 80–98.

[5] Evola J. Essais Politiques. Paris, 1988. P. 86.

[1] Дугин А. Основы геополитики. Геополитическое будущее России. Мыслить пространством. Москва, 1997. С. 189–191.

[2] Дугин А. Основы геополитики. Геополитическое будущее России. Мыслить пространством. Москва, 1997. С. 189–191.

[3] Тоіпарі А. The European New Right: Arena between Empire and Federation // Telos. Dec. 2008 – Feb. 2009. № 146. P. 101–112.

[4] Alain de Benoist. The Idea of Empire // Telos. Dec. 1993 – May 1994. № 98–99. P. 80–98.

[5] Evola J. Essais Politiques. Paris, 1988. P. 86.

[6] Дугин А. Основы геополитики. Геополитическое будущее России. Мыслить пространством. Москва, 1997. С. 189–191.

[7] Дугин А. Основы геополитики. Геополитическое будущее России. Мыслить пространством. Москва, 1997. С. 189–191.

[8] Дугин А. Основы геополитики. Геополитическое будущее России. Мыслить пространством. Москва, 1997. С. 189–191.

ўжыванне гвалту пры пашырэнні тэрыторыі (да прыкладу, генацыд жыхароў Цвярскога княства, Наўгародскай рэспублікі, насельніцтва ВКЛ); усталяванне жорсткай цэнтралізаванай і дэспатычнай сістэмы ўлады (дзейнасць Івана Жахлівага, у прыватнасці, стварэнне інстытута апрычніны); пераслед і рэпрэсіі іншадумцаў ды іншаверцаў і г. д.

Утрапёны імперыялізм, прапагандаваны А. Дугіным ды яго паслядоўнікамі, мае ўважацца не проста за экстравагантныя месіянскія трызненні, але фактычна за спробу тэарэтычнага абгрунтавання рэвалюцыі супраць традыцыйных уяўленняў пра Космас, згодна з якімі звяваванне, пакарэнне чужой прасторы наогул, усіх месцаў запар, нясуць з сабою бязмернасць і бязмежнасць, што пазбаўляюць чалавека памяркоўнасці, а месца – суладнасці ды сакральнасці, спараджаючы не што іншае, як хаос і зло[6].

А. Дугін цвердзіць:

Мы, расійцы, дзеці Чынгісхана, гэтаксама як татары, чуркі, манголы. Але калі яны спадкуюць перадусім кроў, то мы спадкуем дух, памножаны на прасторы сакральных глебаў. Чынгісхану мы забавязаныя ўсім[7].

Тое, што еўразійцы ёсць спадкаемцамі Чынгісхана, мы не будзем аспрэчваць, толькі згаданы дух бязмежных прастораў наўрад ці можа ўважацца за сакральны. Гісторык Аляксандр Юрчанка, аналізуючы «неафіцыйную» версію мангольскага імперскага міфа, прыйшоў да процілеглых высноў:

Няспынная экспансія, дэкларованая афіцыйнай ідэалогіяй, абарочваецца ірацыянальнай вайной з Богам… У супрацьвагу рэальнай імперыі, якая мыслілася яе ідэолагамі як правобраз нябеснай, паступова вымалёўваюцца контуры інфернальнай імперыі. На ўзбраі перыферыі імперыі, што паглынула амаль увесь засвоены свет, прастора скажаецца і абарочвае знакі сакральных арыенціраў на процілеглыя, таму Чынгісхан, не здагадваючыся пра сутнасць таго, што адбываецца, урываецца ў ніжні свет[8].

[6] Санько С. Канстытутыўныя элементы апытычнага космасу як эталённыя для стараэўрапейскай тэсматычнай культуры // Kryuja. Crivica. Baltica. Indogermanica. 1994. № 1. P. 116.

[7] Дугин А. Чингис-хан и монголосфера (по мотивам книги калмыцкого еврази йца Хара-Давана) // Основы евразийства. Москва, 2002. С. 767.

Зрэшты, здаецца, А. Дугін зусім і не хавае інфернальнага аблічча сваёй новай арды:

…у нашай крыві выюць памерлыя, што нас спарадзілі, што запавялі нам аграмадныя абшары, якія маюць стаць яшчэ аграмаднейшымі, пакуль не заслоняць сонца, і Месяц, і зорнае неба над намі, і паскудны, нікім і ніколі не пільнаваны, навязаны падступным Захадам «маральны закон унутры нас»[9].

Нягледзячы на квяцістую рыторыку пра «цветущую сложность Евразии», Дугінавы прысуды апрычоным народам ды суверэнным краінам красамоўна гавораць самі за сябе:

У дачыненні да Беларусі геапалітычная карціна даволі ясная. За выняткам невялікай часткі паланізаваных беларусаў (каталікоў і уніятаў, а таксама палякаў), пераважная бальшыня насельніцтва абназначна належыць да расійскай прасторы і павінна ўважацца за суб'ект цэнтральнага еўразійскага этнасу, то бок за «расійцаў» у культурным, рэлігійным, этнічным і геапалітычным сэнсах... Украіна як дзяржава не мае ніякага геапалітычнага сэнсу. У яе няма ні асаблівай культурнай весткі універсальнага значэння, ні геаграфічнай унікальнасці, ні этнічнай выключнасці… Далейшае існаванне ўнітарнай Украіны недапушчальнае[10].

У імкненні загадзя вызначыць месца «службовым» нацыянальным, як найхутчэй распусціць іх у бязмежнай прорве расійскай дзяржавы А. Дугін далёка не адзінокі. Папулярны ўпоўнены публіцыст Аляксандр Елісееў перакананы:

[8] Юрченко А. Империя и космос. Реальная и фантастическая история походов Чингис-хана по материалам францисканской миссии 1245 года. Санкт-Петербург, 2002. С. 58–59.

[9] Дугин А. Россия может быть великой или никакой // Основы евразийства. С. 786.

[10] Дугин А. Основы Русской правы… С. 376, 379.

[11] Елисеев А. СНГ против Империи.

[12] Малер А. Союз с Белоруссией – любым путем.

[13] Севастьянов А. Русская этнополитика // Атеней. Русский международный журнал. № 7. С. 80.

[14] Інтэрв'ю З А. Дугіным. Клекаю на Івана Лютого» // І. Незалежний культурологічний часопис. 2009. № 16. С. 174–175.

[15] Тамсама. С. 171.

[16] *на можна і думаць пра раўнапраўны саюз Беларусі і Расіі. Ён немагчымы. Уласна кажучы, не можа быць ніякай самастойнай Беларусі. Яна можа стаць часткаю альбо еўрапейскага, альбо расійскага «Вялікага абшару». І апошні варыянт, вядомі, нам найбольш прымальны. Расіі варта трымаць курсу на дасягненне Беларусі да РФ на правах суб'екта Федэрацыі. Натуральна, гэта будзе вельмі цяжка. Прыйдзецца зацікавіць беларускую эліту ў*

далучэнні, даўшы ёй шэраг кіроўных пазіцыяў у расійскім кіраўніцтве[11].

Адзін з найбольш таленавітых Дугінавых эпігонаў – Аркадзій Малер, абвяшчаючы саюз з Беларуссю як «абсалютны імператыў расійскай геапалітыкі», дэталізуе тое, чым жа можна зацікавіць беларускую эліту:

З нашага гледзішча дзеля паўнавартага вяртання Беларусі ў Расію Лукашэнку можна надаць самыя розныя правы: ён можа быць прызначаны губернатарам Беларусі, кіраўніком асобнай (восьмай) «Беларускай федэральнай акругі», нарэшце, атрымаць больш істотны статус у сістэме палітычнай улады, ажно да кандыдата ў прэзідэнты Расійскай Федэрацыі ад самога Крамля[12].

Уплывовы лідэр значнай часткі расійскіх нацыяналістаў Аляксандр Севасцьянаў таксама гатовы заплаціць любую цану за «ўз'яднанне» Беларусі і Расіі, бо для яго гэта «адзіны спосаб павялічыць удзельную вагу расійцаў у краіне»[13].

Зусім не дзіўна, што па наведванні Расіі, пазнаёміўшыся з асаблівасцямі расійскага метапалітычнага думання, А. дэ Бенуа прызнаўся, што не ведае ў Расіі нічога, што магло б быць падобным да еўрапейскіх «новых правых». А. Дугін таксама ўжо імкнецца адмежавацца ад *Nouvelle Droite* з іншых прычынаў:

Яны занадта цывілізаваныя, занадта кансерватыўныя… Таму мне не падабаецца параўнанне з імі… Еўропа мае сёння выбар: еўразійства або атлантызм. Або яна пойдзе за Расіяй, або за Амерыкай. Калі Новыя Правыя абяруць нас, г. зн. абяруць варварскую стыхію, тады маюць прыняць і нашыя метады дзеяння[14].

Захад мае заплаціць за ўсё. Найлепш было б засяліць яго кітайцамі, татарамі, мусульманамі, усімі еўразійскімі вандроўнікамі[15].

Вельмі трапным і годным адказам на гэта могуць быць словы А. дэ Бенуа, напісаныя яшчэ ў часе існавання савецкай сістэмы, але надзвычай актуальныя і дарэчныя для сучаснай Беларусі, у якой дагэтуль, па вялікім рахунку, нічога не змянілася:

Між матэрыялізмам Захаду і матэрыялізмам Усходу, між Амерыкай распусты ды гандлярскага духу і Расіяй ГУЛАГаў, прыгнёту, вязніц і канцэнтрацыйных лагераў існуе цяпер прорва. Гэтая прорва – Еўропа. Акупаваная Еўропа: варварствам з Усходу, заняпадам з Захаду. Найлепшая рэч, якая магла б здарыцца, – гэта канец людскога меркавання пра тое, нібы адна акупацыя мае перавагу над іншай. Што да мяне, я не схіляюся апранацца ні як казак, ні ў Levi's. Між Масквой, якая забівае целы, і Вашынгтонам, які забівае душы, я чакаю Еўропы, што паўстане зноўку.

Еўразійства, нягледзячы на пэўныя збліжэнні з еўрапейскай «новай правіцай», увасабляе хімерычную дактрыну месіянскага кшталту, якая супярэчыць анталагічным падставам уласна еўрапейскай культуры.

Ідэі *Nouvelle Droite* карыстаюцца пэўнай папулярнасцю і ў асяроддзі расійскіх нацыяналістаў-славянафілаў. Бадай найяскравейшае ўвасабленне інтэлектуальных намаганняў гэтай плыні – творчасць аўтараў часопіса «Атеней». Галоўны рэдактар выдання Павел Тулаеў вядомы як адзін з лідэраў і арганізатараў неапаганскага[16] панславянскага руху, пад эгідаю якога, у прыватнасці, адбываліся г. зв. «Родавыя славянскія Вечы». Наведваючы гэтыя ды іншыя «славянскія» мерапрыемствы, П. Тулаеў досыць часта бывае ў Беларусі і актыўна прасоўвае тут свае погляды. У змесце «Атенея», апрача адназначнай ухвалы палітычнага і культурнага курсу цяперашняга кіраўніцтва беларускай дзяржавы, можна знайсці спецыфічныя рэфлексіі з нагоды альтэрнатыўнай версіі нашай гісторыі і ідэнтычнасці. Да прыкладу, водгук на вядомую кнігу «Краіна Беларусь», укладзеную Уладзімірам Арловым і Змітром Герасімовічам:

…бездакорная паліграфія і мастацкае аздабленне з найдаўшымі

[16] Да таго,

прыёмамі дызайну выклікаюць захапленне, а вось тэкстуальная канцэпцыя – многія пытанні. Нацыяналізм і месацэнтрызм даведзеныя ўкладальнікамі да скрайняга. Перыяд Вялікага Княства Літоўскага ідэалізаваны і рамантызаваны. Масква, Пецярбург і нават Кіеў разглядаюцца аўтарамі як варожыя цэнтры[17].

Сябры рэдакцыі «Атенея» займаюцца актыўнай міжнароднай дзейнасцю. 8–10 чэрвеня 2006 г. у Маскве імі была арганізаваная канферэнцыя «Будучыня белага свету», у якой, між іншым, узяў удзел шэраг прадстаўнікоў еўрапейскай «новай правіцы»: вядомы французскі дзеяч Гіём Фай, П'ер Віяль (асацыяцыя «Terre et Peuple», Францыя), П'ер Крэбс (таварыства «Thule-Seminar», Нямеччына) ды інш. На канферэнцыі абмяркоўваліся пытанні еўрапейскай ідэнтычнасці, масавай эміграцыі і скарачэння колькасці аўтахтоннага насельніцтва ў многіх краінах Еўропы, перспектывы этнакультурнага адраджэння белых народаў.

Г. Фай чарговым разам рэпрэзентаваў там свой геапалітычны праект кантынентальнага блока Еўропы і Расіі, названы ім дзеля ўнікнення аналогій з еўразійствам «Еўрасібір». Аднак не ўсе расійскія правыя мысляры цешацца з гэткіх прапаноў. А. Елісееў саркастычна адказвае:

Безумоўна, Сібір «французскім таварышам» патрэбная – хто б сумняваўся? Гэткае сховішча прыродных рэсурсаў! …«Французікі з Бардо» яшчэ шматкроць будуць прыязджаць да нас і прапаноўваць свой геапалітычны тавар розных гатункаў. Ці ж не лепей падтрымаць «айчыннага вытворцу»[18]*?*

І П. Тулаеў, для якога Расія «больш чым краіна» ды утрымлівае ў сабе нейкую «адмысловую якасць», таксама не згаджаецца на «Еўрасібір» і рэкламуе «айчынны тавар» – «ЕўраРасію». Карыстаючыся сафістыкай пра «трыадзіны расійскі народ», рэдактар «Атенея» не каліва не бянтэжыцца ўжываць некарэктныя гістарычныя паралелі ды «удасканальваць» Фаева know-how:

*…яшчэ ў 1917 г. Расія ўступіла ў Першую сусветную вайну, маючы ў сваім складзе 170 млн. чалавек, а ў 1920 г. ужо ў 1922 г. у ёй засталося толькі 130 млн. чалавек. Дзе падзелася 40 млн. чалавек? Гэта не толькі ахвяры вайны, але і ахвяры ўнутранага канфлікту, ахвяры рэвалюцыі, ахвяры бальшавіцкага тэрору, ахвяры голаду, ахвяры эміграцыі. Гэта ахвяры ўсяго таго, што ў выніку прывяло да страты Расіяй 40 млн. чалавек

журнал. – 2015. – № 5. – С. 8.

[19] Тулаев П. Сам усіх старэйшы: Наш погляд на гісторыю Еўразіі // Літ. Беларусь. – 2015. – № 7. – С. 23.

[20] Тулаев П. Сам усіх старэйшы: Наш погляд на гісторыю Еўразіі // Літ. Беларусь. – 2015. – № 7. – С. 23.

[21] Тулаев П. Сам усіх старэйшы: Наш погляд на гісторыю Еўразіі // Літ. Беларусь. – 2015. – № 7. – С. 23.

[22] Тулаев П. Сам усіх старэйшы: Наш погляд на гісторыю Еўразіі // Літ. Беларусь. – 2015. – № 7. – С. 23.

[23] Тулаев П. Сам усіх старэйшы: Наш погляд на гісторыю Еўразіі // Літ. Беларусь. – 2015. – № 7. – С. 23.

народ стаў сёння падзеленай нацыяй, як немцы пасля Другой сусветнай вайны. Сам усіх старэйшы, Расія Русь, Атлантыда Русскага міра, Вялікая Айчынная, Украіна – з колісь адзінай Русі, Праект Еўразія – адзіноя імёны трох Русей на новых шляхах і на новым роўні[19].

«Славянска-руская» рэдакцыя гістарычнага лёсу прапануецца разам з беларусамі ды ўкраінцамі яшчэ і заходнееўрапейцам. П. Тулаеў пераканаўчы ў тым, што сучасныя немцы з этнічнага гледзішча нібы напалову складаюцца з нашчадкаў паўночна-заходніх славянаў[20] (пры гэтым ён чамусьці забывае, што і згаданыя славяне ўтварыліся збольшага на ранейшай усходнегерманскай аснове, не кажучы ўжо пра фіна-вугорскі і балцкі субстрат у паўночнай, цэнтральнай і заходняй Расіі), і адначасна мяркуе, што немцы «гістарычна шчыльна звязаныя з яўрэйствам. Яўрэі ім і замінаюць, і адначасна патрэбныя ў якасці антыпода»[21]. Цікава, як адрэагаваў бы на гэтыя словы, што не агучваюцца ў прысутнасці еўрапейскіх гасцей, скажам, П. Крэбс?

Прыхільнікі «славянскага адзінства», якія рэзка крытыкуюць А. Дугіна ды яго паслядоўнікаў, разважаюць у катэгорыях, вельмі падобных да еўразійскай рыторыкі. Параўнайма, з аднаго боку, выказванне П. Тулаева: «У этнакультурнай палітыцы нам патрэбныя: русізм і панславізм. Нам патрэбная крышталізацыя нацыянальнай свядомасці і духу дзеля выхаду спачатку на рэгіянальны (славянскі) ровень, затым на ровень кантынентальны (еўразійскі) і, нарэшце, на ўсясветны (універсальны) ровень»[22], з другога боку – класічны дугінаўскі «імператыў»: «Існаванне расійскага народу як арганічнай супольнасці нельга ўявіць без імперабудаўнічага, кантынентальнага тварэння. Расійцы застануцца народам адно ў асадах Новай Імперыі. Гэтая імперыя, згодна з геапалітычнай логікай, гэтым разам мае пераўзыходзіць папярэдні варыянт (СССР). Адпаведна, Новая Імперыя мае быць еўразійскай, вялікакантынентальнай, а ў перспектыве – Усясветнай»[23]. Ёсць і яшчэ адна дробная акалічнасць, якая лучыць «гуру» еўразійцаў і панславістаў – абодва дзеячы паходзяць з сем'яў

кадравых афіцэраў расійскіх спецслужбаў.

Шмат заўваг выклікае змест самога «Атенея», які прэзентуе якасць і кшталт расійскіх славянафілаў. Кажучы аб'ектыўна, гэтае выданне досыць эклектычнае з канцэптуальна-эстэтычнага гледзішча. Яго тэкстам уласцівыя квазі- ды паранавуковы пафас, псеўдатрадыцыйная кічовая «славянская» стылістыка, а пазычаныя ў еўрапейскіх «новых правых» ідэі падаюцца ў прымітызаваным выглядзе. У водгуку на змест «Атенея», звернутым на імя рэдактара, А. дэ Бенуа, канстатуючы, «якая бездань раздзяляе мае перакананні ад Вашых», зацямляе:

Вы пішаце, што «Атеней» успрымаецца ў Расіі як «тэарэтычны орган новых правых». Калі гэта так, дык я мушу сказаць, што Вашае разуменне «новых правых» значна розніцца ад таго, якое мы маем у Францыі. Французскія НП не ўважаюць сябе ні за «правых радыкалаў», ні за «нацыянал-патрыётаў». Яны не маюць ані каліва сімпатыяў ні да нацызму, ні да ультраправых, якіх Вы ўзносіце ў сваіх публікацыях… Наадварот, яны змагаюцца з расізмам, ксенафобіяй ды ісламафобіяй. Яны супрацьстаяць логіцы капіталу і ідэалогіі гандлярства, якія ўяўляюць галоўную пагрозу грамадскім каштоўнасцям і народным культурам. Яны змагаюцца за якасную экалогію, тутэйшую дэмакратыю, аўтаномію і рэгіяналізм. Для іх непрымальны як лібералізм, гэтак і індывідуалізм… У Заходняй Еўропе існуюць групы «правых радыкалаў», «расістаў», «неафашыстаў» ды г. д., падобныя да Вашай. Аднак мы не хочам, каб нас атаясамлівалі з імі[24].

У адказ на гэта П. Тулаеў звінаваціў А. дэ Бенуа ў недастатковай «правізне» і лявацкіх поглядах.

Шчыльна звязаным з асяродкам «Атенея» ёсць «расалагічны» кірунак расійскай правіцы, адметны вульгарным біялагізатарствам ды тэндэнцыйным маніпуляваннем матэрыяламі фізічнай антрапалогіі і генетыкі. Найбольш прыкметная ў ім асоба – пісьменнік Уладзімір Аўдзеў, які ў самым пачатку сваёй «навуковай» кар'еры гэтак характарызаваў «адмысловую якасць» Расіі:

[24] Тулаев П. Кто из нас правый? // Атеней. Русский международный журнал. № 3. С. 27.

…у аснову расійскай дзяржаўнасці быў пакладзены пазарасавы крытэр еўразійскага змяшэння, а не прынцып расавай чысціні. Менавіта ў візантыйска-маскоўскім абсалютызме той эпохі мы маем шукаць цяперашні еўразійскі тэзіс пра вяршэнства глебы над крывёй. Канцэпцыя Масквы як Трэцяга Рыма ўвабрала ў сябе расавую мешаніну і Рыму Першага, і Рыму Другога, то бок Візантыі. Сумятня нораваў, культур, звычаяў, што трывала назіралася ў гэтых вялікіх імперыях, перадалася, як генетычная хвароба, і паўсталаму расійскаму гаспадарству. Усё гэта прывяло да таго, што на расійскага чалавека сталі глядзець як на белага дзікуна, а пакаленні еўрапейцаў сталі гаварыць пра Расію як пра «Вялікую Татарыю»[25].

Пазней «расолаг» Аўдзееў палічыў за лепшае не толькі не згадваць пра наступствы еўразійскага вектару расійскага нацыягенезу, але, напэўна, адчуўшы троху іншую канфіскацыю, пачаў пафасна сцвярджаць зусім адваротнае:

Міф пра генетычную панміксію расійцаў – усяго толькі ненавуковая правакацыя не столькі супраць расійцаў, колькі супраць Белай расы агулам… а ўсе размовы пра згубныя з расава-біялагічнага гледзішча наступствы мангола-татарскага ярма – усяго толькі шкодны міф, які не мае пад сабою ніякай навуковай базы[26].

Падобныя супярэчнасці не выключэнне, а хутчэй правіла для поглядаў самазваных антраполагаў. Прыкладам, для Ул. Аўдзеева «расійцы – гэта пэўная генетычна-біялагічная канстытуцыя, а не тыя, хто прыкрываецца расійскаю моваю, расійскаю культураю»[27], а для ягонага найбліжшага паплечніка і сурэдактара «расалагічных» зборнікаў, дэпутата Дзяржаўнай думы Аляксандра Кольева (Савельева)

…разуменне расійскасці як этнічнасці проста пярэчыць расійскай культуры, агульнарускаму праваслаўнаму веравызнанню. Пушкін для нас зусім не афрарасіянін, Сувораў – не польска-армянскі паўкроўка, Даль – не русіфікаваны швед, Мікалай II – не

[25] Авдеев В. Сначала Евразия, теперь Азиопа // Авдеев В. Метафизическая антропология. Москва, 2002. С. 59.

[26] Авдеев В. Новая парадигма в расологии // Расовый смысл русской идеи. Вып. 2. Москва, 2002. С. 11, 12.

[27] Авдеев В. Новая парадигма в расологии // Расовый смысл русской идеи. Вып. 2… С. 25.

[28] Кольев А. Философия расового неравенства и этнополитическая доктрина // Тамсама. С. 389.

[29] Жуков В. Наследственный полиморфизм и биологические законы самоочищения рас // Тамсама. С. 62.

асіміляваны немец. Яны расійцы паводле духу, паводле самасвядомасці. Менавіта таму мы гаворым пра расійскую літаратуру, расійскае войска, расійскую дзяржаўнасць[28].

«Шкоднікі» і «дыверсанты», якія адмаўляюць дзівосную здольнаць расійцаў «забруджвацца» і адразу ж «ачышчацца» ад усіх іншаэтнічных дамешкаў, «расолагі» знаходзяцца ў тым ліку сярод беларусаў:

Гэтыя натуральныя працэсы выклікаюць дзікую злобу з боку наваяўленых «антраполагаў» кшталту беларускага нацыста Зянона Пазьняка, які рэзка выступае супраць саюзу Беларусі з Расіяй: «Расійцы – гэта не славяне, гэта звырадненая нацыя – агрэсіўны паўмангольскі натоўп»[29].

Папраўдзе, Зянон Станіслававіч слынны сваёй жорсткай антымаскоўскай рыторыкай, але нам не вядомая крыніца, адкуль цытуецца прыпісанае яму выказванне. Хутчэй за ўсё, гэтай крыніцы папросту не існуе, а мы маем справу з чарговай спробай дэманізацыі і шальмавання сваіх апанентаў.

Некаторыя «расолагі» таксама не супраць крыху «выправіць» і нашую гісторыю:

Калі ратуючыся ад Арды, Полацкая зямля трапіла пад уладу Літвы, руская нацыянальная знаць, арыстакратыя, з'язджала альбо ў Вялікарасію, становячыся маскоўскімі баярамі і дваранамі, альбо да двара польскага караля, становячыся панамі і шляхтай Рэчы Паспалітай. Пад ціскам каталіцкай агрэсіі ў Масковію сыходзілі найлепшыя рамеснікі і кніжнікі, інтэлектуалы. Самыя лёгкія на пад'ем, прадпрымальныя сяляне ішлі на заробкі і асядалі ў расійскіх гарадах[30].

Агулам жа, паводле гэткай інтэрпрэтацыі мінуўшчыны, дачыненні расійцаў з суседнімі этнасамі выглядаюць ідэальнымі: «…з даўнейшых часоў расійцы выразна ўсведамлялі факт сваёй кроўнай і моўнай роднасці з іншымі славянскімі народамі і нават калі сутыкаліся з імі ў

[30] С. Марочкин. Народ. Среда. Характер. Отбор на

ворагамі, то ніколі не вялі са славянамі войнаў на нефармальное – як у выпадках, калі ворагі былі абсалютна чужыя па крыві»[31]. Не іначай як абсалютнай чужароднасцю беларусаў да «славяна-расійцаў» варта было б патлумачыць тое, што найвялікшы генацыд у нашай гісторыі быў здзейснены менавіта імі. У выніку вайны з Масковіяй 1654–1667 гг. насельніцтва тагачаснай Беларусі скарацілася больш як напалову. Пасля сканчэнні вайны Маскоўская дзяржава назаўсёды пакінула сабе сотні тысяч палонных, што трапілі туды далёка не добраахвотна. І не дзеля «каталіцкай агрэсіі». Дарэчы, прыкладна ў гэты ж час паводле крапівалагічных матэрыялаў, зноўдзеных у Цэнтральнай Расіі, антрапалагічны партрэты фіксуецца узмацненне еўрапеоідных рысаў тамтэйшага насельніцтва. Відаць, ужо тады маскоўскія валадары павялічвалі удзельную вагу «расійцаў» у сваёй дзяржаве коштам «уз'яднання» са «славянскімі братамі».

[31] Муромцев И. Опыт решения национальных проблем в Древней Руси // Русский смысл русской идеи. Вып. 2. С. 113.

[32] Сагановіч Г. Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст. Мінск, 2001. С. 284–288; Гарбукевіч А. Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай 1654–1667 // Вялікае княства Літоўскае: Этнікакультура. У 2 ч. Ч. 1. Мінск, 2005. С. 373–376.

[33] Резников К. Балты ли белорусы? Падрабязную крытыку «уз'яднальніцкіх» поглядаў К. Резнікава гл. Дзеружинская А. і Санько С. Этногенез белорусов и славян // Балто-славянские исследования. 2005. № 3. С. 233–252.

[34] Параўн. Савецкая А. Образ врага в белорусской и литовской историографии // Baltica et Lithuanica. Беларусь і яе суседзі. Кн. 2. С. 300–301.

[35] Грыцкевіч А. Дзяржаўны лад Вялікага княства Літоўскага // Гісторыя Беларускай дзяржаўнасці. Т. 1. Мінск, 1994. С. 300–301.

вынікі археалагічныя і гістарычныя звесткі адназначна сведчаць пра культурную і цывілізацыйную кампліментарнасць літоўцаў і расійцаў. Адпаведна, літоўскія плямёны можна поўнасцю выключыць з ліку продкаў і блізкіх сваякоў беларусаў»[33]. Калі для раманскамоўных французскіх *Nouvelle Droite* інспірацыя гальска-кельцкай мінуўшчынай ёсць звычайнай і нават падставовай з'явай, то для балышыні расійскіх «патрыётаў» за даславянскім этнічным субстратам не толькі свайго народу, але і беларусаў ды ўкраінцаў мільгаціць «вобраз ворага»[34]. Але найбольш рэзкая ацэнка «miłośników Litwy» прагучала з праваслаўнага боку:

…праціўнікі ўз'яднання цвердзяць, што беларусы гістарычна ёсць асобным народам (г. зв. «крывіцкая тэорыя»), а затым, нібыта, былі акупаваныя Расіяй і прыгняталіся ёю. Найбольш радыкальныя праціўнікі агульнарускай еднасці намагаюцца навязаць г. зв. «ліцьвінскую ідэю», пазбавіць беларусаў іх

гістарычнай рускай ідэнтычнасці, папросту пераназваць іх у ліцьвінаў, намагаюцца пераканаць у існаванні «ліцьвінскай нацыі», што, быццам, вядзе сваю гісторыю з часоў літоўска-рускай дзяржавы… Тут (у Беларусі. – **Аўт.**), *спрадвеку жыве рускі народ, а нацыі «ліцьвінаў» ніколі не існавала. Адпаведна, падобныя ідэі і сілы, што іх рэалізуюць – антынацыянальныя. Па сутнасці яны ёсць гэткімі «хунвэйбінамі», прыхільнікамі знішчэння традыцыйнай праваслаўнай рускай культуры Заходняй Расіі (Беларусі)*[35].

Няма сумневу, што ўсе разгледжаныя вышэй адмены ўяўнай расійска-еўразійскай імперыі, угрунтаванай на кульце варварства, бальшавізму, мегаламаніі, азіяцка-еўрапейскай гібрыдызацыі або фальшывага славянскага народніцтва нясуць у сабе беспасярэднюю пагрозу нашай этнакультурнай ідэнтычнасці і дзяржаўна-палітычнаму суверэнітэту. Харвацкі прадстаўнік «новай правіцы» Таміслаў Суніч, які на прыкладзе сваёй краіны меў магчымасць бачыць, да чаго прывяла ідэя «славянскага адзінства» (у паўднёваславянскай версіі), у сваім часе справядліва зацямляў, што

ўсе формы панславізму, якія калі-кольвек з'яўляліся на свет, заўсёды аказваліся найгоршымі ворагамі перадусім саміх славянаў… Славянскі месіянізм у шмат якіх сваіх гістарычных аспектах супадаў з месіянізмам амерыканскіх пурытанаў[36].

Не ўсе расійскія мысляры падтрымліваюць гэткія ідэі. Як процілегласць да іх з'явіліся ды пакрысе набіраюць сербы – прыхільнікі адрозных перакананняў. Яны рэзка крытыкуюць расійскую імперыялістычную палітыку, масквацэнтрычную тыранію ды еўразійскую ідэалогію. Вадзім Штэпа – ідэолаг, найбольш яскравы тэарэтык новага асэнсавання расійскасці – гэтак акрэслівае сваё стаўленне да еўразійства:

[36] Сунич Т. Сербы – враги Европы // Элемент, Евразийское обозрение. 1992. № 2. С. 14.

Яно нівелюе любыя канкрэтныя канфесійныя, этнічныя, індывідуальныя ідэнтычнасці, «геапалітыка» ў ім фактычна падмінае і падмяняе сабой усе рэлігіі і культуры, становіцца адзіным «сімвалам веры». Сітуацыю, калі папы, мулы і равіны

чытаюць малітвы пад лозунгам «Еўразія вышэй за ўсё!», а трохкаляровы сцяг уздымаецца пад савецкі гімн, часта тлумачаць імкненнем да «агульнанацыянальнага замірэння». Аднак гэта спалучэнне разнародных пачаткаў тут загадзя ставіцца на службу не іхнаму «суквіццю складанасці», а плоскаму чорна-беламу геапалітычнаму дуалізму[37].

Сваім сукрэвічам, здатным да вольнага ад дагматыкі мыслення, В. Штэпа прапануе новыя духоўныя арыенціры: сакральная Еўразія. Поўнач замест бязмежнай Еўразіі, пакрыёмы Кіеж Екатеринбург, Трэцяга Рыму, рэспубліканскі Ноўгарад замест дэспатычнай Масковіі. Апошняя апазіцыя займае важнае месца ў гістарычнай перспектыве выбару іншага шляху. Страта Цверам, Псковам, Ноўгарадам незалежнасці ўспрымаецца як праўдзівая трагедыя:

[37] Штэпа В. Еўразія. Екатеринбург, 2004. С. 310.

Маскоўская агрэсія на Ноўгарад фактычна была поўным аналагам асманскага нашэсця на Царград… Маскоўскае войска складалася амаль напалову з ардынцаў… Апраўдваючы гэты набег, маскоўскія гісторыкі любяць гаварыць пра «ўз'яднанне рускіх земляў». Аднак само слова ўз-яднанне *мае на ўвазе нейкае* адзінства, *што існавала раней, а яго ў Ноўгарада з Масквой не было ніколі. Пачаткова гэта былі цалкам розныя цывілізацыі – паводле грамадзянскай свядомасці, культуры, гаспадаркі…*[38]

[38] Штэпа В. Еўразія. С. 147.

Нетыпова для расійскай гістарыяграфіі ацэньваецца і шэраг іншых фактар: «У Ноўгарадзе ж доўгі час займала лідэрскія пазіцыі… «партыя» мудрай пасадніцы Марфы Барэцкай, падтрымлівая бальшынёй моладзі. Пад пагрозаю маскоўскай агрэсіі яны выступалі за палітычны звяз з Літоўскім княствам – пры безумоўным захаванні праваслаўя і гарадскога суверэнітэту. Дарэчы, Літва на гэта і не думала замахвацца – у ёй самой траціна насельніцтва была праваслаўная, і афіцыйна прызнавалася права вольных местаў»[39].

[39] Тамсама.

Блізка падобных поглядаў трымаецца і ветэран расійскага нацыянал-рэвалюцыйнага руху – Аляксей Шырапаеў. Масковія для яго – гэта «Перуся», а ўласна Русь засталася «у Кіеве, Літве і Ноўгарадзе. Масковія сфармавала… асобны, ужо не рускі тып культуры, дзяржаўнасці і асобы, прычым вырашальным

[40] Широпаев А. Тюрьма народа. Русский взгляд на Россию. Москва, 2002. С. 17, 25.

[41] Тамсама. С. 22.

чынікамі. С. 139.

[40] Шыпанаў І. Ардынска-Наваградскія палітыка вялікага літоўскага князя Вітаўта і Адраджэнне Украіны // Наш шлях. 2011. № 19–20. С. 70.

[41] Шыпанаў І. Украінскі нерэзідэнт // Свабода. 2005.

[42] Тамсама. С. 139.

[43] Шыпанаў І. Вялікая Наваградчына. С. 217.

працэсе стала знаходжанне Масквы ў складзе *Вялікага Княства Літоўскага*, а *Украіна як перарэзідэнцыя* – *Маскоўскага царства*[41]. Сваю ідэю А. Шырапаеў заклікае да рускага сепаратызму, скіраванага супраць расійскай дзяржавы, якая называецца азіяцкім Праектам і Турмою рускага народу: «Цягам стагоддзяў вялікадзяржаўнасць была навязаная ў якасці сіноніма рускасці. Для пераважнай балышыні расійцаў *нацыянальнае* стала атаясамлівацца з *імперскім* і *дзяржаўніцкім*». Але ж досыць аднаго позірку на расійскую гісторыю, каб зразумець, што велізарная тэрыторыя з яе багаццем не зрабіла расійцаў багацейшымі, а ўсёмагутная дзяржаўнасць – мацнейшымі. Гэтыя абшары, багацце і сіла – *не нашыя* і *не для нас*. Шкадаваць пра іх няма чаго. Развітаўшыся з імі, мы не страцім, а вызвалімся, вырвемся з Еўразійскай Турмы. Расійцам прыспеў час задумацца: што *нам* заўсёды было *карысней* – бяскрайняя, адчужаная ад нас вампірычная дзяржава або кампактнае (максімум да Урала) нармальнае еўрапейскае гаспадарства з жорсткімі казацкімі граніцамі на поўдні і ўсходзе? …*Толькі на аснове сепаратызму пачнецца праўдзівы нацыянальны генезіс рускіх*»[42].

Расійскія «сепаратысты», «паўночнікі» і «наўгародцы» маюць адметнае стаўленне і да «славянскай» ідэі, якое ілюструецца выказваннямі адносна нашай краіны: «Беларусь зможа адыграць сваю натуральную ролю аднаго з цэнтраў паўночнага славянства, толькі пазбавіўшыся ад сваёй «еўразійскай» дыктатуры»[43]. Немагчыма казаць і пра ўяўны «трыадзіны народ», бо ў Беларусі з’явіліся нават тыя, хто адкідае славянскую самаідэнтыфікацыю і вызначае беларусаў як балтаў-крывічоў. Будучыню ж краіны ўяўляюць маладыя, пакуль яшчэ не шматлікія сілы, а не «бацька» Лукашэнка, які здатны толькі на тое, каб трымаць краіну ў стане квазісавецкай «замарозкі». Ментальна Лукашэнка знаходзіцца ў ардынска-імперскім полі. Зусім невыпадковае ягонае непрыязнае стаўленне да нацыянальнай беларускай сімволікі, якую ён замяніў чырвоным сцягам і штучным гербам савецкага тыпу. Таму пры ўсёй этычнай адрознасці рэжымы Пуціна і Лукашэнкі лучыць адна істотная ўласцівасць: інерцыйнасць, адсутнасць гістарычнай перспектывы, няздатнасць да творчасці. Карацей,

вырачанасць[44].

Погляды тых, каго ў Расіі можна параўноўваць з еўрапейскімі «новымі правымі», вылучаюцца стракатасцю і антаганізмам, тым не менш яны класіфікуюцца ў пэўныя катэгорыі. Дыскурс еўразійцаў і панславістаў цікавы тым, што ў ім у канцэнтраваным выглядзе засяроджаныя тыя стэрэатыпы і мадэлі мыслення, што пашыраныя ў значнай часткі расійскай палітычнай эліты. Бадай усе прапанаваныя імі шляхі развіцця расійскай дзяржаўнасці апелююць да недарэчных як у кантэксце *Nouvelle Droite*, гэтак і з гледзішча беларускіх нацыянальных інтарэсаў спосабаў уладкавання свету. З іншага боку, абнадзейвае той факт, што ў нашых усходніх суседзяў існуюць правыя інтэлектуалы, якія пераканаўча абгрунтоўваюць магчымасць альтэрнатыўнай перспектывы. З імі, вядома, можна і варта шукаць паразумення ды дыялогу.

[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 9 (49) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/12/06**
[image]

СТЫВЭН КОЎЭН
прафэсар расейскіх дасьледаваньняў і гісторыі Нью-Ёрскага ўнівэрсытэту. У сфэру ягоных навуковых інтарэсаў уваходзіць расейская палітыка (пасьля 1917-га), амэрыканска-расейскія дачыненьні, асьвятленьне расейскай тэматыкі ў амэрыканскіх мэдыях. Апошняя публікацыя – «Failed Crusade: America and the Tragedy

Стывэн Коўэн
Новая халодная вайна Амэрыкі

Насуперак распаўсюджанаму меркаваньню, найвялікшая пагроза нацыянальнай бясьпецы ЗША па-ранейшаму зыходзіць з Расеі. Яна вынікае з таго магчымага непрадбачанага разьвіцьця падзеяў, на якое большасьць амэрыканскіх палітстратэгаў у сваім нядбайстве проста не зьвяртаюць увагі. Пра гэта сьведчыць неаб'яўленая халодная вайна, якую пятнаццаць апошніх гадоў вядзе супраць посткамуністычнай Расеі Вашынгтон – як за рэспубліканцамі, гэтак і за дэмакратамі.

Па распадзе СССР у 1991 г. Расея – дзяржава, што валодае ядравай і ўсімі іншымі тыпамі зброі масавага зьнішчэньня, – перажыла глыбокі крызіс. Ніводны надзелены ўладай палітык і падумаць ня мог, што адна са звышдзяржаваў XX ст. абрынецца ў такую бездань. На сёньня здаецца – прынамсі, звонку, – што краіна пераадолела заняпад. Аднак больш падставовыя паказьнікі сьведчаць, што ў Расеі па-ранейшаму назіраюцца нечуваныя для мірнага часу дэмадэрнізацыя і скарачэньне колькасьці насельніцтва. Інвэстыцыі ў эканоміку і іншую жыцьцёва важную інфраструктуру ледзьве дацягваюць да траціны ад узроўню 1990 г. І – самае трагічнае й самае красамоўнае – паказьнікі нараджальнасьці і сьмяротнасьці застаюцца такімі ж, як і ў ваенную пару. Можа, у крыку

нацыяналістаў: «Радзіма памірае!» – і ёсьць нейкае of Post-
перабольшваньне, але нават рэктар самага празаходняга Communist
маскоўскага ўнівэрсытэту папярэджвае: Расея па-ранейшаму ў Russia. New
надзвычай глыбокім крызісе». York: Norton, 2000).

Стабільнасьць палітычнага ладу на гэтым панылым постсавецкім ляндшафце ў значнай ступені (калі не выключна) залежыць ад асабістай папулярнасьці й аўтарытэту аднаго чалавека – прэзыдэнта Ўладзімера Пуціна. Ён прызнае, што краіна яшчэ не дасягнула «поўнай стабільнасьці». Рэйтынг Пуціна трымаецца на неверагодна высокай адзнацы – 70–75 %. Але астатнія палітычныя інстытуты і магчымыя будучыя палітычныя лідэры ня маюць амаль ніякай грамадзкай падтрымкі.

Ня дзіва, што сур'ёзныя аналітыкі трывожацца: адзін-другі нечаканы паварот падзеяў – падзеньне кошту нафты, чарговы выбух міжэтнічных канфліктаў ці тэрарызму, сыход Пуціна – і Расея можа зьведаць яшчэ больш жорсткі крызіс. Напрыклад, пішучы пра беспарадкі, што распаўсюджваюцца з Чачэніі па ўсім поўдні краіны, вядомы навукоўца Пітэр Рэдаўэй нават задае пытаньне: «Ці дастатковы ў Расеі запас трываласьці, каб не распасьціся на часткі?»

Пакуль для гэтай дзяржавы застаецца рэальнай пэрспэктыва катастрофы, захоўваецца надзвычайная пагроза для ЗША і міжнароднай бясьпекі – бясспрэчна, значна большая, чым хоць калі за Саветамі.

Але катастрофа, зьвязаная з расейскай зброяй масавага зьнішчэньня, – не адзіная пагроза, што зыходзіць ад гэтай паранейшаму найвялікшай у сьвеце краіны. Уздоўж расейскіх межаў жыве каля чвэрці насельніцтва плянэты, у т. л. і варожыя між сабою этнічныя і рэлігійныя супольнасьці. Любыя праявы нестабільнасьці ў Расеі могуць зь лёгкасьцю перакінуцца на гэтыя надзвычай істотныя, выбухованебясьпечныя рэгіёны.

Існуе і іншы, бадай, больш верагодны варыянт. Нафтадаляры могуць забясьпечыць Расеі доўгатэрміновую стабільнасьць, але на глебе аўтарытарызму і нацыяналізму з дамешкам ксэнафобіі. Такі сцэнар часта называюць «вэймарскім».

Верагодна, ён усё ж не прывядзе да ўсталяваньня ў Расеі сапраўднага фашыстоўскага рэжыму. Але ў выніку мы будзем мець дачыненьні з краінай, якая валодае зброяй масавага зьнішчэньня і ладнай часткай сусьветных запасаў нафты і газу і яшчэ больш варожа ставіцца да Захаду, чым яе папярэднік – СССР.

Як рэагуюць улады ЗША на гэтую надзвычайную пагрозу? Ня трэба сканчаць факультэтаў міжнародных зносінаў, каб зразумець: першым прынцыпам палітыкі ў дачыненьні да посткамуністычнае Расеі мусіць быць Гіпакратава «Не нашкодзь!». Не рабі нічога, што можа падарваць яе крохкую стабільнасьць, нічога, што можа адвярнуць увагу Крамля ад найперш узнаўленьня зруйнаванай інфраструктуры, нічога, што можа падштурхнуць Расею больш разьлічваць на свае запасы зброі масавага зьнішчэньня, а не скарачаць іх, нічога, што можа адахвоціць Маскву ад супрацоўніцтва з Захадам у гэтай галіне. Усё астатняе ў далёкай зьдзічэлай краіне – дробязі.

З пачатку 1990-х гг. Вашынгтон у дачыненьні да Расеі адначасова праводзіць дзьве абсалютна розныя палітыкі. Адна – дэкаратыўна-вонкавая – «стратэгічнага партнэрства і сяброўства». Другая – рэальная і надзвычай жорсткая – палітыка бязьлітаснага карыстаньня са слабасьці Расеі, гэткае сабе «пераможцу дастаецца ўсё». У спалучэньні зь нявыкананымі абяцаньнямі, паблажлівымі павучаньнямі і патрабаваньнямі аднабаковых саступак гэтая палітыка выглядае яшчэ больш агрэсіўнай і бескампраміснай, чым стаўленьне Вашынгтону да савецкай камуністычнай Расеі. Давайце разгледзім асноўныя складнікі амэрыканскай палітыкі датычна Расеі, што сфармаваліся пры поўнай падтрымцы абедзьвюх палітычных партыяў, уплывовых газэтаў і «фабрык палітычнае думкі» з пачатку 1990-х гг.:

1. Усё шчыльнейшае атачэньне Расеі на яе межах або побач зь імі ваеннымі базамі ЗША і НАТО. Іх разгортваньне ўжо сталася фактам альбо плянуецца ў прынамсі палове з астатніх чатырнаццаці былых саюзных рэспублік: ад Балтыкі і Ўкраіны да Грузіі, Азэрбайджану і Сярэдняе Азіі. У выніку маем

пабудаваную ЗША «жалезную заслону» і вяртаньне да мілітарызацыі амэрыканска-расейскіх дачыненьняў.

2. Маўклівае адмаўленьне з боку ЗША, што Расея можа мець хоць якія законныя нацыянальныя інтарэсы па-за сваёй тэрыторыяй, нават у этнічна роднасных ці прылеглых былых савецкіх рэспубліках: Украіне, Беларусі, Грузіі. Як яшчэ патлумачыць «верхаводніцкія» настроі Рычарда Голбрука, магчымага будучага дзяржсакратара дэмакратаў? Ён рашуча асуджаў Крэмль за падтрымку прамаскоўскага ўраду ў суседняй Украіне, зь якой Расею злучаюць стагодзьдзі моўных, сямейных, рэлігійных, эканамічных і абарончых сувязяў, – і пры гэтым аб'яўляе далёкую славянскую дзяржаву «нашай ключавой зонай бясьпекі».

3. Далей – болей: пераканаьне, што Расея ня мае поўнага сувэрэнітэту нават на сваёй тэрыторыі. Яно выяўляецца ў няспынным, пачынаючы ад 1992 г., умяшаньні ў расейскія ўнутраныя справы. Сюды належаць: нашэсьці (асабліва ў 1990-я гг.) амэрыканскіх «дарадцаў», якія меліся кіраваць «пераходам» Расеі ад камунізму; бясконцыя «місіянэрскія» казаньні з-за акіяну (часта ў пагрозьлівай форме) пра тое, як Расея павінна і як не павінна ўладкоўваць сваю палітычную і эканамічную сыстэму; актыўная падтрымка антыкрамлёўскіх груповак у Расеі (некаторыя зь іх зьвязаныя зь ненавіснымі людзям алігархамі ельцынскай эпохі).

Гэтае імкненьне ўмешвацца ва ўнутраныя справы Расеі ўжо выросла ў прапановы зрынуць Пуціна ў ходзе «каляровай рэвалюцыі» пры падтрымцы ЗША. (Падобная зьмена ўлады адбылася, пачынаючы з 2003 г., у Грузіі, Украіне і Кыргызстане і не прайшла сёлета ў Беларусі.) У рэдакцыйных артыкулах галоўных газэтаў расейскага прэзыдэнта ўсё часьцей называюць «галаварэзам», «фашыстам», «Садамам Хусэйнам», а адзін вашынгтонскі «рыцар» з Фонду Карнэгі пераконвае нас у «слабасьці Пуціна» і магчымасьці «зьмены рэжыму». (Ці абыходзіць прыхільнікаў «дэмакратычнай зьмены рэжыму» ў Расеі тое, што гэта можа дэстабілізаваць ядравую дзяржаву?)

4. Падмацоўваюцца гэтыя складнікі рэальнай палітыкі ЗША знаёмымі з часу халоднай вайны падвойнымі стандартамі, калі

Маскву асуджаюць за тое самае, што робіць Вашынгтон: за пошук хаўрусьнікаў і стварэньне вайсковых базаў на тэрыторыі былых саюзных рэспублік, за падтрымку пры дапамозе сваіх актываў (у расейскім выпадку – нафты і газу) прыхільных да Расеі ўрадаў, за рэгуляваньне фінансавых сродкаў з-за мяжы на сваім палітычным полі.

У больш шырокім сэнсе, калі НАТО пашыраецца да самых расейскіх парогаў, паглынаючы краіны былога савецкага блёку і саюзныя рэспублікі, – гэта «вайна з тэрарызмам» і «абарона новых дзяржаваў», калі Масква пратэстуе – гэта «мысьленьне часу халоднай вайны». Калі Вашынгтон ублытваецца ўва ўкраінскія і грузінскія палітычныя справы – гэта «падтрымка дэмакратыі», калі тое ж самае робіць Крэмль – гэта «нэаімпэрыялізм». І каб не забыцца на гістарычныя паралелі: калі ў 1990-я гг. Ельцын, якога падтрымлівалі ЗША, сілай разагнаў законна абраны парлямэнт і Канстытуцыйны суд, аддаў нацыянальнае багацьце разам з тэлебачаньнем у рукі набліжаных да Крамля алігархаў, увёў Канстытуцыю, якая нічым не абмяжоўвае выканаўчую ўладу, і сфальсыфікаваў вынікі выбараў, гэта была «дэмакратычная рэформа». Калі тое ж самае працягвае рабіць Пуцін – гэта «аўтарытарызм».

5. І нарэшце, Злучаныя Штаты спрабуюць, карыстаючыся слабасьцю Расеі, дасягнуць ядравай перавагі, якую не маглі атрымаць за савецкім часам.

Незвычайная антырасейская скіраванасьць амэрыканскай палітыкі прымушае сур'ёзна ўсумніцца ў дзьвюх аксіёмах, растыражаваных амэрыканскімі афіцыйнымі коламі і СМІ: 1) нядаўняе «пахаладаньне» ў амэрыканска-расейскіх дачыненьнях выкліканае паводзінамі Пуціна ўва ўнутранай палітыцы і на міжнароднай арэне; 2) халодная вайна скончылася 15 гадоў таму. Першае цьверджаньне – хлусьлівае, другое – слушнае толькі напалову. Халодная вайна скончылася ў Маскве, але не ў Вашынгтоне.

Апошні савецкі лідэр Міхаіл Гарбачоў, прыйшоўшы да ўлады ў 1985 г., прапанаваў нечуваную гарэзію – «новае мысьленьне», якое мела на мэце ня проста зьнізіць напал халоднай вайны, а зусім яе спыніць.

Калі ў сьнежні 1991 г. распаўся Савецкі Саюз, амэрыканскія афіцыйныя асобы і СМІ імгненна пачалі сьцьвярджаць, што канец халоднай вайны – ня ўзгодненае рашэньне ЗША і СССР, як тое, бясспрэчна, было насамрэч, а вялікая перамога Амэрыкі і параза Расеі.

Менавіта гэты трыюмфатарскі наратыў і стаўся першапрычынаю хуткага аднаўленьня халоднае вайны – не ў Маскве празь дзесяць гадоў Пуціным, а на пачатку 1990-х, калі адміністрацыя Клінтана зрабіла два найвялікшыя глупствы. Першае – у тым, што да посткамуністычнае Расеі пачалі ставіцца як да пераможанае дзяржавы, нібыта абавязанай дакладна капіяваць у сябе ўсе амэрыканскія парадкі і слухацца Амэрыку ў вонкавай палітыцы. (Адсюль – няспыннае ўмяшаньне ва ўнутраную палітыку Масквы і ўяўленьне, што Расея ня мае ўласных неад'емных правоў ані ва ўласнай краіне, ані за мяжою.)

Другое глупства, учыненае Клінтанам, у тым, што ён парушыў абяцаньне, дадзенае Бушам савецкай Расеі ў 1990–1991 гг., – «ні на цалю» не пашыраць НАТО на ўсход. У выніку Расею бяруць у атачэньне вайсковых базаў – нібыта наўмысна правакуюць на пэўныя крокі ў адказ.

Яшчэ больш ускладняе сытуацыю няспынны рост «антырасейскай гістэрыі». У гэтым годзе яна выявілася ў патоку афіцыйных заяваў, у якіх выкрываецца ўнутраная і міжнародная палітыка Расеі, гучаць абяцаньні далучыць да НАТО яшчэ больш сумежных зь ёю дзяржаваў, а прэзыдэнту Бушу настойліва раяць байкатаваць саміт «вялікай васьмёркі» ў ліпені ў Санкт-Пецярбурзе, старшыняваць на якім мае У. Пуцін. Апроч таго, магчымы будучы кандыдат ад рэспубліканцаў сэнатар Джон Маккэйн заклікае да «вельмі жорсткіх захадаў» супраць Масквы; Кангрэс дэманстратыўна адмаўляецца скасаваць абмежаваньні на гандаль з Расеяй, уведзеныя за савецкім часам; Пэнтагон зноў запускае старыя чуткі, што расейская вонкавая выведка перадавала Садаму Хусэйну зьвесткі, якія маглі пагражаць бясьпецы амэрыканскіх вайскоўцаў; а дзяржсакратар Кандаліза Райс усьлед за прыхільнікамі «зьмены рэжыму» заклікае расейскіх

грамадзянаў, «калі неабходна, зьмяніць уладу ў сваёй краіне».

У сваю чаргу, Белы дом у «Стратэгіі нацыянальнай бясьпекі» на 2006 г. адмовіўся ад тэзы пра амэрыканска-расейскае партнэрства, ад пагадненьняў наконт дапамогі Маскве пры ўступленьні ў Сусьветную гандлёвую арганізацыю і ўвёў санкцыі супраць Беларусі – славянскай рэспублікі, якая мае самую шчыльную лучнасьць з Расеяй і зь якой Крэмль вядзе перамовы пра стварэньне саюзнай дзяржавы. І – самае галоўнае – у траўні Белы дом даслаў на канфэрэнцыю, скіраваную супраць Расеі, у былую савецкую рэспубліку Літву (цяпер яна ўваходзіць у НАТО) віцэ-прэзыдэнта Чэйні, які асудзіў Крэмль і недвухсэнсоўна даў зразумець, што ЗША больш ня лічаць Расею сваім «стратэгічным партнэрам і надзейным сябрам».

Яшчэ больш уражвае даклад Рады па міжнароднай палітыцы, прысьвечаны Расеі. У гэтым выдатным узоры нязьменнай палітыкі падвоеных стандартаў уся адказнасьць за «расчараваньне» разьвіцьцём амэрыканска-расейскіх дачыненьняў ускладаецца выключна на Расею – за Пуціным яна, маўляў, «пайшла ў памылковым кірунку»: умешваецца ў справы былых савецкіх рэспублік, падтрымлівае Іран, канфліктуе з НАТО і дапусьціла «адкат ад расейскай дэмакратыі».

Крыжовы паход у 1990-я гг. за трансфармаваньне Расеі, зь яго жудаснай «шокавай тэрапіяй» і, як вынік, антыдэмакратычнымі захадамі, яшчэ больш дэстабілізаваў краіну, паспрыяў зьяўленьню алігархічнае сыстэмы, што разрабавала нацыянальнае багацьце, пазбавіў жыцьцёва важную інфраструктуру інвэстыцыяў, выклікаў зьбядненьне народу і рост карупцыі. Ён дыскрэдытаваў рэформы на заходні ўзор, спарадзіў на роўным месцы масавыя антыамэрыканскія настроі – у траўні толькі 5 % апытаных расейцаў успрымалі ЗША як «сябра» – і зьвёў на нішто калісьці ўплывовую праамэрыканскую фракцыю ў Крамлі.

Падобная палітыка Амэрыкі прымусіла Маскву зьвярнуцца да ідэалёгіі «падкрэсьленага сувэрэнітэту» – выразна нацыяналістычнай, скіраванай супраць «пятай калёны» фінансаваных з Захаду НДА, разьлічанай на падтрымку

«патрыятычна настроенай» расейскай інтэлігенцыі і Праваслаўнай Царквы.

Масква бачыць у «каляровых рэвалюцыях», зьдзейсьненых пры падтрымцы ЗША, спробы стварыць вайсковыя аванпасты на расейскіх межах. Таму Крэмль актыўней, чым калі раней, выступае супраць дэмакратычных рухаў у былых савецкіх рэспубліках і падтрымлівае аўтарытарныя рэжымы – ад Беларусі да Ўзбэкістану. Пры гэтым Масква імкнецца да палітычнага, эканамічнага і вайсковага «стратэгічнага партнэрства» з Кітаем, падтрымлівае Іран, іншыя антыамэрыканскія рэжымы на Блізкім і Сярэднім Усходзе і ўжо зноў разгортвае ракеты клясы «зямля–паветра» ў Беларусі – фактычна на заходняй мяжы Расеі з НАТО.

Калі палітыка Амэрыкі і лягічныя захады ў адказ з боку Расеі перарастуць у поўнамаштабную халодную вайну, яна будзе яшчэ больш небясьпечнай за папярэднюю. Найперш таму, што праз узрослую прысутнасьць у былых савецкіх рэспубліках заходніх вайсковых базаў і праамэрыканскіх урадаў «лінія фронту» пасунулася на ўсход – ад Нямеччыны да расейскага «блізкага замежжа».

Ёсьць яшчэ адзін псыхалягічны чыньнік. Гэтая халодная вайна – неаб'яўленая, таму ў абодвух бакоў расьце адчуваньне, што другі ім здрадзіў і яму нельга давяраць. Пасьля таго, як Вашынгтон вітаў Пуціна як абранага Ельцыным пераемніка ягонай палітыкі і прапанаваў Пуціну сваю канцэпцыю «партнэрства і сяброўства», Белы дом пачуваецца падманутым палітыкай Пуціна. Як адзначала «Washington Post», Буш меў «добрыя намеры датычна Расеі», але «расейскі аўтакрат… падмануў надзеі Амэрыкі». Аднак дзеяньні Пуціна пераважна выкліканыя тым, што ўсё папярэдняе дзесяцігодзьдзе ЗША парушалі абяцаньні, дадзеныя Расеі, а п'яны Ельцын моўчкі з гэтым пагаджаўся. Таму Пуцін і заявіў: «Эпоха геапалітычных саступак з боку Расеі канчаецца».

Што яшчэ горш, у халоднай вайне, якая разгортваецца ў наш час, «дыялёг амаль цалкам адсутнічае», як сказаў адзін крамлёўскі чыноўнік. Найперш гэта датычыцца ядравай зброі.

І нарэшце, у ЗША больш няма сілаў, што выступалі б супраць халоднай вайны (а калісьці яны карысталіся значным уплывам). Між тым у Вашынгтоне паўстаў цэлы легіён інтэлектуалаў – рыцараў халоднае вайны. СМІ ахвотна даюць ім слова, і іхных апантаных нападаў на Пуціна амаль ніхто не аспрэчвае. (Адзін такі шчыры місіянэр увесь час абвінавачвае Маскву ў «непрыманьні» амэрыканскіх інтарэсаў, другі заклікае да кампаніі «пры падтрымцы міжнародных спонсараў», каб выправіць уяўленьні маладых грамадзянаў Расеі пра Сталіна – поўны сюррэалізм!) «Расею аддаюць анатэме», як выказаўся нядаўна Гарбачоў, настолькі адзінадушна, што нават вядомы палымяны крытык амэрыканскай палітыкі завяршыў свой артыкул словамі: «Вядома, вінаватая ў гэтым перадусім Расея».

Уплывовыя газэты на чале з «Washington Post» гэтак зацята дэманізуюць «аўтакратызм» і «жорсткі нэаімпэрыялізм» Пуціна, што нагадваюць старую «Праўду» на берагох Патомаку. «New York Sun» на першай старонцы называе сёньняшнія амэрыканска-расейскія адносіны «сьмяротнай дуэллю – магчыма, у літаральным сэнсе». У тым, што гэтыя фантазіі ня сталіся рэчаіснасьцю, заслуга Крамля, які мае цьвёрды намер «не вяртацца да часу халоднае вайны» – гэтак заявіў Пуцін 13 траўня ў адказ на правакацыйныя абвінавачаньні з боку Чэйні. Аднак у Маскве па гэтым пытаньні цяпер ідзе сур'ёзнае змаганьне – «заходнік» Пуцін супраціўляецца тым, хто патрабуе правядзеньня «больш жорсткай лініі».

Калі ЗША карэнным чынам ня зьменяць сваю зручную для крамлёўскіх «ястрабаў» палітыку, тады за Пуціным ці яго пераемнікам пачнецца новая поўнамаштабная халодная вайна – з усімі небясьпекамі, што адсюль вынікаюць. Нацыянальныя інтарэсы патрабуюць уменьня вызначаць асноўныя прыярытэты і іх дасягаць. Аднак амэрыканскія палітстратэгі ня робяць пасьлядоўна ні аднаго, ні другога. Адзіны сапраўдны жыцьцёва важны інтарэс ЗША ў Расеі – не дапусьціць, каб запасы расейскай зброі масавага зьнішчэньня пагражалі сьвету – ці праз дэстабілізацыю ў Расеі, ці празь яе варажнечу з Захадам.

Як эўразійская дзяржава, якая мае 20–25 млн мусульманскага насельніцтва і мяжуе з Іранам (дарэчы, гэта адзін зь

нешматлікіх суседзяў Расеі, якога не спрабуе ўцягнуць у сваю зону ўплыву НАТО), Расея ўсё яшчэ можа дазволіць сабе ўцягнуцца – у Іране ці ў Іраку – у канфлікт Вашынгтону з ісламскім сьветам. Амэрыка патрабуе ад Масквы адмовіцца ад ейных сталых палітычных і ваенных пазыцыяў у былых савецкіх рэспубліках, каб іх маглі заняць ЗША і НАТО, і нават настойвае, каб Расея па-ранейшаму субсыдавала Ўкраіну танным газам. Гэтым самым Вашынгтон заяўляе, што Расея ня мае ня толькі хоць якіх правоў у сваім «блізкім замежжы», але і ўвогуле ўсялякіх законных правоў на бясьпеку. Ня дзіва, што гэткая відавочная практыка падвоеных стандартаў пераканала Крэмль: пасьля сыходу Ельцына Вашынгтон заняў больш ваяўнічую пазыцыю – проста таму, што «расейская палітыка зрабілася больш прарасейскай».

Трыюмфатарскія настроі ў Амэрыцы не былі хуткаплыннай рэакцыяй на падзеі 1991 г. Празь дзесяць гадоў трагедыя 11 верасьня дала Вашынгтону яшчэ адну магчымасьць усталяваць з Расеяй па-сапраўднаму партнэрскія дачыненьні. Тады Крэмль дапамог Амэрыцы больш за ўсе краіны НАТО: Масква перадала ў распараджэньне Вашынгтону каштоўныя зьвесткі выведкі, навучаныя вайсковыя часьці, што былі ўдзельнічалі ў баёх у Аўганістане, дазволіла выкарыстоўваць авіябазы ў былых савецкіх рэспубліках Сярэдняй Азіі.

Зразумела, Крэмль разьлічваў на адпаведнае стаўленьне з боку ЗША. І што ён атрымаў наўзамен? Выхад Амэрыкі з дамовы па супрацьракетнай абароне, прэтэнзіі на сталую прысутнасьць вайсковых базаў у Сярэдняй Азіі (і Грузіі), на беспасярэдні доступ да касьпійскае нафты і газу, далейшае пашырэньне НАТО на ўсход, якое ахапіла некалькі былых савецкіх рэспублік і дзяржавы савецкага блёку, а таксама ўсё гучнейшае асуджэньне расейскай унутранай і міжнароднай палітыкі.

Чаму і дэмакраты, і рэспубліканцы не сумняваліся, што могуць ісьці на гэткія жорсткія антырасейскія захады, ня ставячы пад пагрозу нацыянальную бясьпеку ЗША? Яны верылі – і ў гэтым іх чарговая вялікая памылка, – што ў Расеі, аслабелай пасьля распаду СССР, няма іншага выйсьця, апроч як скарыцца перад воляй Амэрыкі. Нават калі не зважаць на запасы зброі, што

засталіся ў Расеі з савецкага часу, гэта была недаравальная аблуда. Расеі, зь яе матэрыяльнымі і чалавечымі рэсурсамі, заўсёды «наканавана быць вялікай дзяржавай».

Нават сёньня Расея, хоць яна і зьменшылася ў памерах, у стане весьці (а магчыма, і выйграць) халодную вайну на шырокіх абсягах былых савецкіх рэспублік. Геаграфічнае становішча, шчыльныя рынкавыя сувязі, расейскія трубаправоды і ўласнасьць, а таксама моўная блізкасьць і супольнае мінулае даюць Расеі істотную перавагу. Масква мае шмат разнастайных спосабаў – ад мяккіх да жорсткіх – узьдзеяньня на суседнія краіны, калі тыя стануць шукаць новага апекуна ў далёкім Вашынгтоне.

Крэмль можа эканамічна ўдушыць ушчэнт зьбяднелыя Грузію і Малдову, наклаўшы забарону на імпарт тавараў з гэтых краінаў, выдаліўшы з Расеі работнікаў-мігрантаў, якіх тады чакае беспрацоўе, і прымусіўшы Грузію і Ўкраіну плаціць па «поўным рынкавым кошце» за энэрганосьбіты. Масква можа палітычна падсячы маленькую Грузію і Малдову і вялікую Ўкраіну, заахвочваючы іх прарасейскія рэгіёны да ўваходжаньня ў склад Расейскай Фэдэрацыі або падтрымліваючы іх патрабаваньні незалежнасьці (як рабіў Захад у Косаве і Чарнагорыі).

Амэрыканскія ідэолягі крыжовага паходу на Расею ўпарта сьцьвярджаюць, што магчымасьць дэмакратызаваць Расею і іншыя былыя савецкія рэспублікі апраўдвае рызыку. Але насамрэч ад 1992 г. ЗША толькі дыскрэдытуюць справу дэмакратыі ў Расеі. Амэрыка ўсяляк ухваляла Ельцына, якім пагарджалі людзі, і падтрымлівала іншых непапулярных у Расеі «дэмакратаў». Цяпер яна асуджае папулярнага ў расейскім грамадзтве Пуціна. Такім чынам дэмакратыя ва ўспрыманьні расейцаў асацыюецца з сацыяльнай напружанасьцю, хаосам і прыніжанасьцю, як было ў 1990-я. Калі ЗША ганяць прэзыдэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнку, але радасна прымаюць азэрбайджанскага і казаскага тыранаў, дэмакратыя асацыюецца з жаданьням дарвацца да нафты. Калі «дэмакратычныя рэвалюцыі» ў Грузіі і Ўкраіне прывязваюцца да ўваходжаньня ў НАТО, дэмакратыя прыроўніваецца да амэрыканскага

экспансіянізму. Калі ЗША выстаўляюць ахвярай мільярдэра Хадаркоўскага і не зьвяртаюць увагі на агульную беднасьць, на масавыя пратэсты супраць сацыяльнай несправядлівасьці, гэта наводзіць на думку, што дэмакратыя – толькі для алігархаў. І калі амэрыканцы падкрэсьліваюць сваю незаменную ролю ў дэмакратызацыі, яны проста сьцьвярджаюць (і глыбока памыляюцца!), што грамадзяне Расеі самі ня здольныя збудаваць дэмакратычную дзяржаву і супрацьстаяць злоўжыванням уладаю.

У выніку Расея падазрае, што сапраўдныя намеры Вашынгтону – у тым, каб узяць пад свой кантроль расейскія энэрганосьбіты і запасы ядравай зброі і, атачыўшы яе колам дзяржаваў-сатэлітаў НАТО, пазбавіць Расею сувэрэнітэту, ператварыць яе ў «васала Захаду». Увогуле ж амэрыканская палітыка пераконвае, што халодная вайна насамрэч заўсёды вялася ня супраць савецкага камуністычнага ладу, а супраць Расеі. І гэтыя падазрэньні толькі ўзмацняюць «Washington Post» і «New York Times», калі пішуць, што Расея нават пасьля краху камунізму – нязьменна «аўтарытарная дзяржава» з «хіжымі інстынктамі».

Каб пераадолець перашкоды да новага тыпу дачыненьняў з Расеяй, Вашынгтон мусіць адкінуць свае трыюмфатарскія ўяўленьні, празь якія мы перадусім і вяртаемся да халоднай вайны. Па-першае, гэта азначае, што трэба паважаць неад'емнае права Расеі самой вызначаць уласную ўнутраную палітыку (у тым ліку распараджацца сваімі энэргетычнымі рэсурсамі). Умяшаньне ва ўнутраныя справы Масквы толькі падрывае шанцы на ўсталяваньне палітычных свабодаў і эканамічнага дабрабыту ў гэтай шматпакутнай краіне.

Па-другое, гэта азначае, што трэба прызнаць законныя інтарэсы расейскай бясьпекі, асабліва ў «блізкім замежжы». У прыватнасьці, нельга дапусьціць трэцяга этапу пашырэньня НАТО, які ахапіў бы Ўкраіну. Пашырэньне НАТО да расейскіх парогаў ужо крайне абвастрыла становішча (і не ўмацавала бясьпеку аніводнае краіны). Калі НАТО паглыне Ўкраіну, якую Масква лічыць вельмі істотным складнікам сваёй славянскае саматоеснасьці і галоўным фактарам бясьпекі, гэта можа

стацца пунктам канчатковага разрыву. Падобнае рашэньне было б і недэмакратычным, бо супраць яго выступаюць дзьве траціны ўкраінскіх грамадзянаў.

Час, калі ЗША яшчэ могуць сфармуляваць новую палітыку ў дачыненьні да Расеі, імкліва скарачаецца. Але і ў афіцыйных, і ў неафіцыйных колах нічога падобнага няма ані знаку. У траўні, асуджаючы Крэмль, Чэйні казаў «як рыцар-пераможца халоднай вайны, калі карыстацца словамі карэспандэнта «New York Times». Адзін высокапастаўлены чыноўнік Дзяржаўнага дэпартамэнту ўжо абвясьціў, што «наступная вялікая місія ЗША» – у Расеі і сумежных краінах. У тым жа катэгарычным духу Кандаліза Райс патрабуе, каб Расея «прызнала, што мы маем законныя інтарэсы… у суседніх дзяржавах», і ані словам ня згадвае інтарэсаў Масквы.

У дэмакратычнай краіне ад прэтэндэнтаў на пасаду прэзыдэнта можна было б чакаць альтэрнатыўных прапановаў. Але ні ў той, ні ў другой партыі яны не гучаць – чуваць толькі патрабаваньні праводзіць яшчэ больш антырасейскі курс або маўчаньне. І тут няма чаго зьдзіўляцца. Маўклівае прыманьне разьвязанай Бушам жудаснай вайны ў Іраку яскрава засьведчыла, наколькі палітычнай эліце бракуе здольнасьці да самааналізу, самастойнага мысьленьня і грамадзянскай мужнасьці.

Каб пазьбегнуць новай халоднай вайны, спатрэбіцца новы погляд і адвага герэтыка. Але сярод амэрыканскіх палітыкаў цяжка ўявіць такога, хто адгукнуўся б на гэты покліч. А ў ня надта далёкім мінулым мы мелі прэцэдэнт, калі дваццаць гадоў таму артадаксальная рэпрэсіўная савецкая палітычная сыстэма спарадзіла Гарбачова, які паказаў выйсьце з тупіка халоднай вайны. Ці знойдзецца сёньня ў Амэрыцы лідэр, гатовы скарыстаць змарнаваны тады шанец?

Пераклаў з ангельскай М. Б. Друкуецца ў скароце
[image]
[image]

[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/12/10**
[image]

ДЗЯНІС МЕЛЬЯНЦОЎ
магістар гуманітарных навук у галіне міжнародных дачыненьняў, навуковы супрацоўнік Цэнтру па праблемах эўрапейскай інтэграцыі пры ЭГУ, асыпірант катэдры міжнародных дачыненьняў БДУ.
Апошняя публікацыя ў «ARCHE» – «Заходняе вымярэньне беларускага пытаньня» (6/2006).

Дзяніс Мельянцоў Новая халодная вайна Коўэна

Парадаксальнасць была найбольш характэрнай рысай Расіі. Яна несупынна ваявала і пашыралася ва ўсе бакі, але, тым не менш, лічыла, што ёй заўсёды пагражаюць.

Генры Кісінджэр
Cohen, Stephen F. *The New American Cold War //* The Nation. 2006 issue. July 10.

Сканчэнне халоднай вайны – жорсткага супрацьстаяння дзвюх антаганістычных ідэалагічных сістэм прывяло не толькі да перафарматавання ўсёй сістэмы міжнародных стасункаў. Адбыўся перагляд тэарэтычных падыходаў да сусветнай палітыкі, пачаўся пошук новых схемаў і азначэнняў, каб адлюстраваць новы сусветны парадак. «Аксамітныя» рэвалюцыі ва Усходняй Еўропе, распад Савецкага Саюза і пераход новых незалежных дзяржаў да пабудовы дэмакратычных палітычных сістэм і рынкавых эканомік выразна сведчылі: надышоў якасна новы перыяд ці нават эпоха ў міжнародных адносінах. Ей трэба было надаць «імя» і вызначыць яе сутнасныя характарыстыкі. Так з'явіўся шэраг найменняў новага перыяду сусветнай гісторыі, такіх як «unipolar moment» («аднапалярны момант», які мае на ўвазе дамінаванне ЗША), «Post-Cold-War Period» (перыяд пасля халоднай вайны), «постбіпалярны свет», «канец гісторыі» ды інш. А пасля трагічных падзеяў 11 верасня 2001 г.

з’яўляецца яшчэ і «Post-Post-Cold-War Period», які абазначае ўжо якасна новы гістарычны этап, што пачаўся пасля тэрактаў.

Як бы там ні называлі новы перыяд найноўшай гісторыі спецыялісты-міжнароднікі, але адно відавочна: свет стаў больш небяспечны, менш прадказальны, і ні адзін даследчык не рызыкуе даць вычарпальную характарыстыку новай сістэме міжнародных адносінаў, бо яна яшчэ канчаткова не склалася і знаходзіцца ў стане эвалюцыі, ці, кажучы словамі прыхільнікаў сінэргетычнага падыходу, у пункце біфуркацыі. Такая нявызначанасць спараджае цэлы набор футурыстычных канцэпцыяў і схемаў далейшага развіцця свету і міжнародных стасункаў. Ёсць дзве асноўныя і дастаткова вядомыя канцэпцыі – «сутыкнення цывілізацый» Сэмюэля Гантынгтана і «канца гісторыі» Фрэнсіса Фукуямы, – якія адлюстроўваюць адпаведна рэалістычную і ліберальную парадыгмы ў навуцы аб міжнародных адносінах.

Прапанаваная Сэмюэлем Гантынгтанам яшчэ на пачатку 90-х гг. XX ст. канцэпцыя сутыкнення цывілізацый прагназуе будучы раскол свету на шэраг варагоўных паміж сабой цывілізацыяў, якія прыйдуць на змену ідэалагічнаму супрацьстаянню камуністычнага і капіталістычнага лагераў. Усе патэнцыйныя канфлікты, на думку Гантынгтана, будуць адбывацца па лініях цывілізацыйных разломаў, і, такім чынам, ваенная сіла будзе па-ранейшаму адыгрываць вырашальную ролю ў міжнародных стасунках.

У сваю чаргу, Фрэнсіс Фукуяма атаясамлівае канец халоднай вайны з канцом гісторыі як такой, бо сканчэнне біпалярнага супрацьстаяння прывядзе да трыумфу ліберальных каштоўнасцяў заходняга грамадства ва ўсім свеце, знікнення ўзброеных канфліктаў і ўвогуле палітычнага працэсу. Надалей людзі «постгісторыі» будуць займацца выключна гаспадарчымі справамі. Нягледзячы на сваю відавочную утапічнасць, гэтая канцэпцыя набыла дастаткова шырокую вядомасць, пакуль міжнародныя падзеі і працэсы не прадэманстравалі яе неадпаведнасць і не прымусілі самога аўтара перагледзець яе. 90-я гг. XX ст. прайшлі пад знакам барацьбы менавіта гэтых дзвюх канцэпцый, якія прэтэндавалі на універсальнае

вытлумачэнне міжнародных працэсаў пасля заканчэння халоднай вайны.

Канец канфрантацыі дзвюх звышдзяржаў і далейшая дэзінтэграцыя СССР мелі вынікам не толькі распад двухполюснай міжнароднай сістэмы. Засталася незапатрабаванай цэлая армія саветолагаў – ім давялося тэрмінова мяняць кваліфікацыю, каб застацца ў цэнтры ўвагі. Некаторыя хутка здолелі адаптавацца ў новых умовах і праявілі сябе, распрацоўваючы новыя, больш актуальныя тэмы. Але іншым інертнасць мыслення ці то звычка, відаць, не дазволілі разьвітацца са старымі стэрэатыпамі. Гэтыя не знайшлі нічога лепшага, як прыстасаваць старыя звычныя схемы да аналізу сучасных падзей. Так была «вынайдзеная» канцэпцыя новай халоднай вайны.

Гэткія думкі выклікаў у мяне артыкул прафесара русістыкі і расейскай гісторыі Нью-Йоркскага універсітэта Стывена Коўэна «Новая халодная вайна Амерыкі» (The New American Cold War). Па шчырасці, да таго, як мне трапіўся гэты артыкул, я ўжо меў пэўную перадузятасць да аўтара, бо чытаў раней урыўкі з ягонай апошняй кнігі «Правалены крыжовы паход: Амерыка і трагедыя посткамуністычнай Расіі». Тады падыход Коўэна падаўся мне дастаткова арыгінальным: амерыканскі аўтар прымаў бок слабога і вінаваціў Амерыку ў шматлікіх бедах Расіі. Не шмат амерыканскіх даследчыкаў зыходзяць з такіх пазіцыяў.

Аднак «Новая халодная вайна Амерыкі» прымусіла мяне памяняць сваё папярэдняе меркаванне і запэўніла, што прарасійскі падыход Коўэна і канцэпцыя новай халоднай вайны – не больш чым даніна арыгінальнасці. Яны не грунтуцца на сур'ёзным аналізе. Аўтар мысліць у катэгорыях перыяду халоднай вайны, ягоныя разважанні відавочна абцяжараныя старымі схемамі і рамкамі, якія не дазваляюць яму шырэй зірнуць на зменлівую рэчаіснасць. Але пра ўсё па парадку.

Асноўны тэзіс Коўэна ў тым, што самая сур'ёзная пагроза амерыканскай нацыянальнай бяспецы зыходзіць сёння ад Расіі – яна настолькі аслабленая, што развіццё падзей унутры краіны

можа пайсці паводле катастрафічнага сцэнара. Тады Расея стане крыніцай самых разнастайных пагроз для міжнароднай супольнасці – ад некантраляваных арсеналаў ядравай зброі і да лакальных канфліктаў на памежжы. Амерыка яшчэ болей ускладняе сітуацыю ў нестабільнай Расіі, праводзячы супраць яе новую халодную вайну. Дакладней, паводле меркавання Стывена Коўэна, Вашынгтон ніколі і не спыняў халодную вайну, нягледзячы на адпаведныя заявы. І дэмакратычная, і рэспубліканская адміністрацыі ў ЗША падтрымліваюць «трыумфатарскі» падыход у дачыненнях з Расіяй. Яго сутнасць у тым, што Злучаныя Штаты ўважаюць Расію за пераможаны бок у халоднай вайне і таму імкнуцца скарыстацца з яе паразы і навязаць ёй статус малодшага партнёра ў амерыканска-расійскіх дачыненнях. ЗША ў парушэнне абяцанняў атачаюць Расію вайсковымі базамі, патрабуюць аднабаковых саступак, не прызнаюць законных нацыянальных інтарэсаў па-за межамі яе ўласнай тэрыторыі, адмаўляюць у суверэнных правах, ужываюць падвоеныя стандарты і інш.

Натуральна, такія дзеянні Вашынгтона не могуць не выклікаць адпаведных захадаў у адказ з боку Расіі. Аднак яе кіраўнік, праяўляючы добрую волю, не пачынае поўнамаштабнай канфрантацыі з Захадам. Цяжар адказнасці за развязванне новай халоднай вайны, на думку Коўэна, цалкам ляжыць на ЗША, бо яны не пажадалі адмовіцца ад трыумфатарскага падыходу і пабудаваць раўнапраўныя адносіны з Расіяй.

Што ж новага мы бачым у тэксце Стывена Коўэна, апроч таго, што Расія выяўленая ахвярай палітыкі ЗША? Перш за ўсё заўважаем выкарыстанне новага-старога тэрміну халодная вайна. Але ці апраўданае яго ўжыванне ў новых варунках? У XX ст. тэрмін халодная вайна, як вядома, абазначаў жорсткае супрацьстаянне дзвюх антаганістычных ідэалагічных сістэм, якое праяўлялася ў канфрантацыі ў ваеннай, палітычнай, ідэалагічнай, эканамічнай, культурнай і іншых сферах. Сёння мы такой з'явы не назіраем. Больш за тое, расійская эліта падзяляе палітычныя і эканамічныя каштоўнасці Захаду, таму пра аднаўленне халоднай вайны казаць не выпадае.

Завяршэнне халоднай вайны, аднак, не азначае адмовы ад

канкурэнцыі паміж дзяржавамі і пераследу нацыянальных інтарэсаў. Адсюль і падвоеныя стандарты, і аднабаковыя дзеянні на міжнароднай арэне. Амерыканская эліта працягвае ўспрымаць Расію як канкурэнта, якога трэба стрымліваць. У гэтым няма нічога дзіўнага, бо так паводзілі сябе ўсе дзяржавы, пачынаючы ад фармавання Вестфальскай сістэмы і нават яшчэ раней.

Хоць біпалярнае супрацьстаянне спынілася, ЗША ў сваёй міжнароднай палітыцы працягваюць кіравацца прынцыпамі Realpolitik. Але Амерыка пазбавілася ідэалагічнага кампаненту і спыніла гонку ўзбраення – у гэтым, паводле ейнага разумення, і палягала сутнасць халоднай вайны. Праблема Расіі ў тым, што яна разлічвала на іншы вынік заканчэння халоднай вайны, і яе чаканні аказаліся абсалютна неадэкватнымі практыцы міжнародных стасункаў. Расія спадзявалася на ўвагу да сябе і бескарыслівую дапамогу Захаду ў вырашэнні яе ўласных праблем. Але, на жаль, альтруізму няма месца ў міждзяржаўных адносінах.

Натуральна выглядае і тое, што Амерыка карыстаецца слабасцю Расіі і пераследуе ўласныя нацыянальныя інтарэсы. Па распадзе СССР на агромністай тэрыторыі ўтварыўся вакуум сілы, і цалкам лагічна, што яго запоўніла адзіная звышдзяржава. Няма падстаў, каб Амерыка ўласнаручна дапамагала Расіі аднаўляць яе сферу ўплыву і рэстаўраваць савецкую імперыю. Чакаць гэтага было б як мінімум наіўна.

Пахаладанне ў расійска-амерыканскіх адносінах абумоўлена не толькі канкурэнцыяй на прасторы традыцыйных расійскіх інтарэсаў, але і перамогай рэваншысцкіх настрояў сярод расійскай палітычнай эліты ў другой палове 90-х гг. XX ст. Адной з прычынаў такога вонкавапалітычнага павароту стаўся менталітэт расійскай эліты, значная частка якой сфармавалася з другога або трэцяга эшалону савецкай партыйна-гаспадарчай наменклатуры. У яе не было і не магло быць адэкватных уяўленняў пра вонкавы свет і матывы паводзін дзяржаў на міжнароднай арэне. Яны перакананыя ў велічы Расіі – магчыма, гэта звязана з патрэбай адчуць сябе элітай вялікай дзяржавы. Апроч таго, грамадскі статус асобных уплывовых групаў эліт, іх

становішча ў бюракратычнай і эканамічнай сістэме краіны наўпрост ці ўскосна залежалі ад савецкай вонкавай палітыкі, якая прадугледжвала жорсткую канфрантацыю з Захадам. Празаходняя палітыка расійскага кіраўніцтва на пачатку 90-х гг. XX ст. супярэчыла іх інтарэсам. Да таго ж гэтая палітыка не мела трывалай сацыяльнай базы. Таму ў выказваннях расійскага кіраўніцтва і загучалі нацыяналістычныя і неаімперскія ноткі – некаторыя аналітыкі паспяшаліся інтэрпрэтаваць іх як праяву новай халоднай вайны.

Паводле Коўэна, поўнамаштабнае супрацьстаянне Расіі і ЗША, падобнае да перыяду халоднай вайны, не пачынаецца толькі дзякуючы добрай волі Крамля, які не хоча вяртацца да мінулага. Коўэн піша, што, калі захоча, Расія можа сфармаваць антызаходні саюз і выйграць халодную вайну на постсавецкай прасторы. Гэты тэзіс таксама дастаткова спрэчны, бо ў сённяшніх умовах Расія проста не здатная скласці якую-кольвек канкурэнцыю ЗША, хоць бы таму, што ваенны бюджэт Амерыкі ў дзесяткі разоў большы за расійскі. У Маскве гэта добра разумеюць і таму стараюцца не раздражняць лішні раз свайго заакіянскага партнёра, ад якога яшчэ, дарэчы, чакаюць згоды на далучэнне да Сусветнай гандлёвай арганізацыі. Нягледзячы на свой каласальны ядравы арсенал, Расія не ў стане ўплываць на вонкавапалітычныя дзеянні ЗША. Напрыклад, расійская дыпламатыя не здолела папярэдзіць пашырэнне НАТО на ўсход, спыніць ваенную аперацыю супраць Югаславіі ці ўварванне ў Ірак. Расія нават не здатная сёння кантраляваць сітуацыю ў былых саюзных рэспубліках, дзе паступова ўзрастае ўплыў ЗША. Яскравым прыкладам можа быць вонкавапалітычны правал падчас украінскіх выбараў 2004 г.

Так, Расія захавала пэўныя падважнікі ціску на сваіх суседзяў, але ці пойдзе ёй на карысць поўнае збядненне і падзел Грузіі і Малдовы, як пра тое піша Стывен Коўэн? Самавызначэнне Прыднястроўя, Абхазіі ці Паўднёвай Асетыі або іх уваходжанне ў склад Расіі аўтаматычна актуалізуюць пытанне аб суверэнітэце Чачэніі, Татарстану ці Башкартастану, што можа прывесці да распаду Расіі. Таму такія падважнікі ціску застаюцца даволі ўмоўнымі. Расія не наважыцца запусціць

механізм, які можа знішчыць яе саму. Расія, такім чынам, не здольная выйграць халодную вайну з Захадам нават на постсавецкай прасторы.

Тэзіс, што Расія можа з лёгкасцю заключыць альянс з антызаходнімі ўрадамі і такім чынам стварыць супрацьвагу ЗША і іх саюзнікам, таксама дастаткова спрэчны. Тэарэтычна можа, але ці будуць такія дзеянні адпавядаць доўгатэрміновым расійскім інтарэсам? Хіба што не. Надзея часткі расійскіх ваенных і палітыкаў на стварэнне альянсу з Кітаем беспадстаўная. Пекін прынцыпова ўхіляецца ад удзелу ў любых ваенна-палітычных саюзах, а тэрмін «стратэгічнае партнёрства», прыняты абодвума бакамі за афіцыйную характарыстыку двухбаковых адносінаў, Кітай інтэрпрэтуе як «нармальныя стасункі», якія прадугледжваюць раўнапраўны дыялог, але не накіраваныя супраць нейкай трэцяй краіны. Магчымыя і іншыя непажаданыя наступствы: цяжка, напрыклад, прадказаць напрамак і характар экспансіі Кітая, калі завершыцца мадэрнізацыя ягонай эканомікі і ўзброеных сілаў.

Альянс з Іранам таксама можа прывесці да цяжкіх наступстваў для расійскай міжнароднай палітыкі. Узгадаем толькі, што ўпартая падтрымка рэжыму Мілошавіча ў Югаславіі ўрэшце прывяла да страты расійскага ўплыву на Балканах. А саюз з такімі краінамі, як Беларусь, Туркменістан і Казахстан, ніяк не цягне на супрацьвагу для НАТО ці ЗША.

Не адпавядае рэчаіснасці, на маю думку, і заява Коўэна аб тым, што ў халоднай вайне не было пераможцаў і пераможаных, бо, маўляў, Буш з Гарбачовым падчас гістарычнага саміту на Мальце ў 1989 г. разам абвесцілі пра спыненне халоднай вайны. Сапраўды, такі факт меў месца, але ці слушна яго інтэрпрэтуе прафесар Коўэн? Мяркую, не варта нагадваць, што ўяўляў сабой сацыялістычны лагер у канцы 1989 г., калі падпісвалася памянёная дэкларацыя: па Усходняй Еўропе пракаціласа хваля «аксамітных» рэвалюцый і былыя сатэліты Савецкага Саюзу сталі на дэмакратычныя і капіталістычныя рэйкі, у саюзных рэспубліках утварыліся нацыянальныя рухі, якія дамагаліся незалежнасці сваіх краін ад Масквы, планавая

эканоміка стаяла на парозе краху, а Каўказ раздзіралі міжэтнічныя сутыкненні. Усім было зразумела, што ў такіх варунках СССР не здольны больш працягваць гонку ўзбраення і канфрантацыю з Захадам і таму вымушаны падпісаць дэкларацыю пра завяршэнне халоднай вайны. Фактычна, гэта быў акт аб капітуляцыі. Савецкі Саюз адмовіўся ад сваіх ідэалагічных установак (якія ляжалі ў падмурку канфрантацыі) і прыняў заходнія каштоўнасці і мадэлі развіцця – і гэта таксама сведчыць пра паразу СССР у халоднай вайне.

У тэксце Стывена Коўэна ёсць некалькі згадак і пра Беларусь. Усе яны зробленыя ў кантэксце антырасійскіх дзеянняў ЗША. Напрыклад, Коўэн падае ўвядзенне санкцыяў супраць Беларусі як антырасійскі выпад Вашынгтона. Аўтар папікае Амерыку і тым, што яна зацята змагаецца з Лукашэнкам і адначасова падтрымлівае рэпрэсіўныя рэжымы ў Казахстане і Азербайджане. Насамрэч гэта сведчыць толькі пра тое, што амерыканцы не маюць інтарэсаў у Беларусі – таму яны і дазваляюць сабе рэзкія выказванні супраць беларускага лідэра, за якімі, аднак, не стаіць ніякіх сур'ёзных канкрэтных дзеянняў. Не зусім зразумелая логіка Коўэна, калі ён звязвае санкцыі супраць Беларусі з халоднай вайной паміж ЗША і Расіяй. У такім разе санкцыі толькі паспрыяюць далейшаму збліжэнню Расіі з ізаляванай ад вонкавага свету Беларуссю.

У непрыняцці Вашынгтонам беларускага рэжыму праяўляецца ідэалістычная плынь амерыканскай вонкавай палітыкі, якая, аднак, саступае месца рэалістычнай у тых рэгіёнах і ў тых пытаннях, якія закранаюць важныя нацыянальныя інтарэсы ЗША. Рэалізм і ідэалізм заўсёды ідуць поруч у вонкавай палітыцы ЗША, але праяўляюць сябе заўсёды залежна ад пэўных інтарэсаў Вашынгтона.

Апрача ўсяго іншага, Коўэн робіць цікавую выснову: амерыканская палітыка спарадзіла ўпэўненасць у тым, што мэтай халоднай вайны была не барацьба з камуністычным ладам, а з Расіяй як такой. Мяркую, гэтым цверджаннем Коўэн робіць адкрыццё, і так даўно ўсім вядомае. Проста амерыканцу Коўэну, відаць, цяжка і балюча ўсведамляць, што ўсе тыя

ідэалістычныя каштоўнасці, якія непарыўна атаясамліваюцца з місіяй Амерыкі ў сусветнай палітыцы, насамрэч нічога не вартыя, і ЗША працягваюць кіравацца ў замежнай палітыцы той самай рэалістычнай парадыгмай, якой кіраваліся дзяржавы Старога Свету ў час «канцэрту нацый», хіба толькі з невялікімі папраўкамі на міжнародныя прававыя нормы і грамадскую думку ў свеце.

І апошняе. Кажучы пра магчымасць змены курсу ў дачыненні да Расіі, Коўэн настойвае на адмове ад «трыумфатарскага» падыходу, ад прыніжэння гэтай «шматпакутнай» краіны, ад падвоеных стандартаў і патрабуе прызнання «законных расійскіх інтарэсаў у яе блізкім замежжы». Такі радыкальны паварот у вонкавай палітыцы можа здзейсніць толькі лідэр новага тыпу, ідэалам якога для Коўэна выступае Гарбачоў. Папулярнасцю Міхаіла Сяргеевіча на Захадзе нікога не здзівіш. Аднак, калі ўжо аўтар з такім спачуваннем ставіцца да расіян і іх меркавання, яму варта было б пацікавіцца іміджам Гарбачова ў той краіне, якой ён кіраваў. Лідэр пераможанай і дэзінтэграванай краіны – варты жалю прыклад для пераймання. І калі нехта хоча бачыць такога чалавека на чале сваёй нацыі, то ўзнікае заканамернае пытанне: а ці жадае ён ёй дабра?
[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 9 (49) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [mk]. Абнаўленьне [czyk].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/12/10**
[image]

Разгон
Успаміны
дэпутатаў
Вярхоўнага
Савета XII
скліканння*

Яўген
Анішчанка
Ад
укладальніка

Падзеі, пра якія гаворыцца ніжэй, адбыліся неўзабаве пасля прыходу да ўлады прэзідэнта А. Лукашэнкі. На пачатку 1995 г. ён запатрабаваў сабе неабмежаваных паўнамоцтваў, адкрыта заявіўшы, што пакліканы пакласці канец «разгулу экстрэмісцкіх і мафіёзных элементаў»[1], бо народ стаміўся ад бяздзейнасці ўлады, ад бясконцага спадзявання на яе.

У прэзідэнцкім атачэнні паставілі за мэту выдаліць з палітычнай сцэны дзейны парламент, зрабіць сілавыя міністэрствы паслухмянымі інструментамі прэзідэнцкай волі і спаралюшваць любое праяўленне грамадскай апазіцыі. 1 студзеня 1995 г. А. Лукашэнка прапанаваў выключыць з Закона аб Вярхоўным Савеце артыкул аб тым, што «Вярхоўны Савет з’яўляецца гарантам замацаваных у Канстытуцыі і законах і міжнародных абавязаннях дзяржавы правоў і свабод грамадзянаў Беларусі, арганізоўвае кантроль за іх выкананнем». ВС яму адмовіў, і А. Лукашэнка публічна заявіў, што не збіраецца больш хадзіць у ВС, дзе яго абавязкова «збэсцяць, стопчуць і здраднікам аб’явяць»[2].

* Друкуюцца ў скароце.
[1] Звязда. 1995. 20 лістапада.
[2] Шестнадцатая сессия Верховного Совета Республики Беларусь XII созыва. Бюллетень № 93. С. 97.
[3] Звязда. 1995. 28 лістапада.

15 сакавіка 1995 г. А. Лукашэнка выклаў у тэлеэфіры сваю ідэю рэферэндуму па мовах, саюзе з Расіяй, нацыянальна-дзяржаўных сімвалах і адначасова прапанаваў ВС самараспусціцца. Ён пагражаў, што калі дэпутаты на працягу тыдня не разгледзяць беларуска-расійскі дагавор і не разыдуцца добраахвотна, то ён зробіць захады, каб навесці парадак: «Ніякай абсалютнай улады мне б не хацелася, але я вымушаны прымаць адпаведныя меры»[3]. Калі ж апазіцыя ў ВС запрацівілася падобнаму ціску і на знак пратэсту абвясціла 11 красавіка 1995 г. галадоўку, Лукашэнка запатрабаваў «эвакуаваць» дэпутатаў з Дома ўрада.

Гэтак сканаў Вярхоўны Савет XII склікання – парламент, які «жыў грэшна і пакончыў смешна». Апазіцыя аказалася ў ім «запалам у іржавай гранаце», а сам ВС уласнаручна падпісаў сабе смяротны вырак.

Такое магло здарыцца выключна ў барацьбе за неабмежаваную ўладу праз адсутнасць супрацьвагі аўтарытарызму ў выглядзе грамадзянскай супольнасці. У выніку ў краіне знішчаны каштоўны прынцып дэмакратыі – падзел уладаў, які не дазваляе дамінаваць ніводнай яе галіне. Парушаны баланс непазбежна асуджае грамадства на валюнтарызм і аўтарытарызм.

Вось пра гэты пераходны працэс у найноўшай палітычнай гісторыі Беларусі і вёў я гаворку з дэпутатамі былога Вярхоўнага Савета XII склікання. Мае суразмоўцы, апроч старшыні прэзідыума ВС М. Грыба, якраз паходзяць з асяродку сяброў БНФ, на якіх паставілі таўро ворагаў народу, «экстрэмістаў, нацыяналістаў, фашыстаў, раскольнікаў, дэструктыўных сілаў» і г. д. Усе яны маглі шчыра адказваць на мае пытанні, і я старанна занатоўваў іх успаміны. Аднак з розных прычын некаторыя адмовіліся ад гутаркі. Іншыя абмежаваліся, як відаць з тэкстаў, занадта сціплымі выказваннямі. Сведчанні нябожчыка І. Герменчука, а таксама выступы А. Лукашэнкі і М. Цесаўца друкуюцца без выняткаў паводле стэнаграмы пасяджэнняў Вярхоўнага Савета XII склікання, якая захоўваецца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь. (Прамовы апошніх двух падаюцца ў перакладзе на

беларускую.) Таму, зразумела, цяжка назваць прыведзеныя тэксты сапраўднымі мемуарамі. Але можна не сумнявацца, што яны падштурхнуць усіх незадаволеных дапоўніць іх больш дакладнымі і праўдзівымі звесткамі.

Яўген Анішчанка

РАЗГОН: ЗЬМЕСТ

Ад укладальніка

МІКАЛАЙ АКСАМІТ	Скокі чорных гарылаў
ЛЯВОН БАРШЧЭЎСКІ	Крывавая ноч
ЮРАСЬ БЕЛЕНЬКІ	Хлопцы, ці патрэбны вам лідэр?
ІГАР ГЕРМЯНЧУК	Праверана: мінаў няма
ВАЛЯНЦІН ГОЛУБЕЎ	Галадоўка
МЕЧЫСЛАЎ ГРЫБ	Супрацьстаянне
ЛЯВОНЦІЙ ЗДАНЕВІЧ	Нягнуткасць загубіла БНФ
МІКАЛАЙ КРЖЫЖАНОЎСКІ	Са збіцця дэпутатаў пачалася дыктатура…
АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА	Я мушу дэманстраваць уладу
ПЁТРА САДОЎСКІ	Такое не забываецца
АЛЕГ ТРУСАЎ	Усё нагадвала ваенны пераварот
МІХАІЛ ЦЕСАВЕЦ	Пагражалі… праліццём крыві
ДАДАТАК	Пастанова аб прыпыненні папярэдняга следства па крымінальнай справе

[image]
[image]

Пачатак Цалкам Форум

№ 9 (49) - 2006

[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].

Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: **2006/09/24**

[image]

Георгі Навіцыян Князь, які «прішелъ и-заморья»: гіпотэза паходжаньня Рагвалода

ГЕОРГІ НАВІЦЫЯН
магістар міжнародных дачыненьняў Цэнтральнаэўрапейскага ўнівэрсытэту ў Будапэшце (1998). Дасьледчыя інтарэсы гістарычных ўключаюць сучасныя міжнародныя дачыненьні, раньнесярэднявечную гісторыю Беларусі, антычную цывілізацыю.

Рагвалод, першы полацкі князь, згаданы па імені ў гістарычных крыніцах, дагэтуль застаецца містычнай фігурай, якая прыцягвае ўвагу ўсіх неабыякавых да беларускай гісторыі. Цікавасьць да яго асобы тлумачыцца ня толькі і ня столькі чыста навуковымі чыньнікамі. Грамадзка значныя працэсы, якія адбываліся на беларускіх землях у IX–X стст., іх карані і вынікі магчыма даволі дэталёва аднавіць на падставе наяўных гістарычных, археалягічных, нумізматычных і іншых зьвестак. У гэтым кантэксьце вызначэньне асобы Рагвалода не выглядае безумоўна неабходным для разуменьня тых падзеяў. І усё ж спробы даведацца пра ягонае паходжаньне і жыцьцё больш за кароткія зьвесткі «Аповесьці мінулых гадоў» не спыняюцца – адпаведныя вэрсіі рэгулярна выходзяць з-пад пяра гісторыкаў і проста аматараў.

Прычына – у функцыі гісторыі, якая застаецца ў цяні, падобна адваротнаму боку Месяца, але паводле значнасьці не саступае бачнаму вокам абсягу. Паглынуўшы міталёгію, гісторыя пераняла яе функцыю вытлумачэньня месца чалавека ў прасторы і часе. З дапамогай свайго інструмэнтара гісторыя ўзялася за пошук зыходнага пункту, адкуль чалавек мог

прасачыць сваё паходжаньне і карані, і ўвасобленага чалавека, які сымбалізаваў пачатак асобных краёў і народаў. Першыя зафіксаваныя пісьмова зьвесткі пра падзеі прыйшлі на зьмену паданьням. Пачатак асобнага народу ці дзяржавы замяніў стварэньне сьвету і аддзяленьне ладу ад хаосу. Гістарычная асоба заняла месца легендарнага культурнага героя. З паўстаньнем такой асобы нацыянальны сусьвет знаходзіць свой пачатак, далучаецца да агульнага космасу і набывае паўнавартасьць. Знаўцы беларускай даўніны абмінаюць сваёй увагай ярла, накіраванага Рурыкам у Полацак у 862 г., і полацкага «сьветлага» князя, які хадзіў з Алегам пад Канстантынопаль у 907 г., менавіта празь іх ананімнасьць і безасабовасьць. У пошуках зыходнага пункту свайго сусьвету і першагероя погляд беларуса неадменна зьвяртаецца да полацкага князя, названага ў летапісе Рагвалодам.

Рагвалод зьяўляецца пры апісаньні падзей 980 г. Як сьцьвярджае «Аповесьць мінулых гадоў», у гэтым годзе наўгародзкі князь Уладзімер Сьвятаславіч заслаў сватоў да Рагвалода, які княжыў у Полацку, прыйшоўшы з-за мора, па ягоную дачку Рагнеду. Атрымаўшы адмову, Уладзімер рушыў у паход на Полацак, узяў горад, забіў Рагвалода і сілай пабраўся з Рагнедай. Летапісец падкрэсьлівае міталягічнае адценьне гэтага эпізоду як першавытоку далейшых гістарычных падзеяў, заўважаючы, што з гэтага часу і існуе варожасьць паміж унукамі Рагвалодавымі і нашчадкамі Ўладзімеравага сына Яраслава. Сам сюжэт пра Рагвалода, Рагнеду і Ўладзімера ўстаўлены ў летапіс пад 1128 г. пры апісаньні чарговага канфлікту паміж полацкімі і кіеўскімі князямі.

Згадка пра заморскае паходжаньне Рагвалода тлумачыцца большасьцю дасьледчыкаў як сьведчаньне яго прыналежнасьці да ўсюдыісных скандынаваў, якія ў той час узначалілі вайскова-дружынны пласт Русі і вялі бурлівую ваенную і гандлёвую дзейнасьць на шляхах паміж Балтыйскім, Касьпійскім і Чорным морамі. Імёны Рагвалода і Рагнеды, праўдападобна, выглядаюць на стараславянскую трансьлітарацыю скандынаўскіх імёнаў «Рагнвальд» (Rugnvalpr) і «Рагнхільд» (Ragnhilp). Разьбіраючы легендарную скандынаўскую генэалёгію, расейскі дасьледчык Ю. Канавалаў

спрабуе атаясаміць Рагвалода Полацкага і Рагнвальда Славутага, сына (ці стрыечнага брата) нарвэскага караля пачатку X ст. Харальда Цудоўнавалосага. Беларускія дасьледчыкі Алесь Белы і Алег Латышонак дапускаюць магчымасьць атаясамленьня Рагвалода з Рагнвальдам, сынам Эйрыка Крывавай Сякеры, сына Харальда Цудоўнавалосага. Кінем вокам на падзеі скандынаўскай гісторыі X ст. і мы.

Харальд Цудоўнавалосы аб'яднаў Нарвэгію пад сваёй уладай каля 900 г., разьбіўшы сваіх праціўнікаў у бітве ля Хаўрсф'ёрду. Пад старасьць ён адышоў ад дзяржаўнага кіраваньня і каля 930 г. перадаў уладу ў рукі свайго сына Эйрыка. Пасьля сьмерці Харальда каля 933 г. Эйрык пачаў аднаасобнае панаваньне з забойстваў сваякоў і патэнцыйных прэтэндэнтаў на ўладу, цалкам апраўдаўшы сваё мяно «Крывавай Сякеры». Неўзабаве ў Нарвэгіі высадзіўся Хакан, іншы сын Харальда, які выхоўваўся пры двары ангельскага караля. Дыпляматычны і абаяльны Хакан быў поўнай супрацьлегласьцю Эйрыка, за што і атрымаў мяно «Добрага». Гэта прыйшлося даспадобы нарвэскаму люду, у якім трывала захоўваліся традыцыі вольнасьці, і пераважная частка краіны стала на бок Хакана. Эйрык ня стаў распальваць бессэнсоўную вайну і разам з сынамі і жонкай Гунхільд адплыў з Нарвэгіі. Ён праславіўся сваімі вікінгаўскімі набегамі, быў каралём у Дубліне і Ёрку, у барацьбе за які і загінуў у бітве з англасаксамі пры Стэйнмары ў 954 г. Ягоныя сыны ізноў пачалі барацьбу за нарвэскую карону, забясьпечыўшы сабе падтрымку з боку данаў. Іх напады на Нарвэгію прыносілі мала плёну, пакуль у адным зь іх каля 960 г. не атрымаў сьмяротную рану Хакан Добры. Каралеўскі тытул пераняў сын Эйрыка Харальд Шэрая Скура. Але яму давялося дзяліць краіну з братамі, іншымі сваякамі і ярламі Хладзіра. У імкненьні да ўлады ён і яго браты аддавалі перавагу жорсткім звычаям свайго бацькі. Так, Гудрад Эйрыксан забіў свайго стрыечнага брата Тругві Олафсана. Малы сын Тругві Олаф ратаваўся ўцёкамі, трапіў у палон і рабства да эстаў і нарэшце знайшоў прытулак у князя Ўладзімера ў Ноўгарадзе. Тым часам Харальд Шэрая Скура выпаў з фавору ў данаў, і каля 970 г. з намовы хладзірскага ярла Хакана тыя завабілі яго ў засаду і забілі. Хакан фармальна падпарадкаваўся дацкаму каралю, але застаўся найбольш

уплывовым чалавекам у Нарвэгіі. Каля 971–972 гг. Рагнфрод (Ragnfrшр), яшчэ адзін сын Эйрыка Крывавай Сякеры, зрабіў няўдалую спробу адваяваць Нарвэгію. У 995 г., вярнуўшыся з доўгіх вандраваньняў па Русі і Заходняй Эўропе, каралём стаў Олаф Тругвасан. Вырваць уладу зь ягоных рук паспрабаваў забойца яго бацькі Гудрад, але спроба гэтая каштавала яму жыцьця.

Цяпер разгледзім вядомыя нам факты. Гіпотэзы паходжаньня Рагвалода будуюцца на атаясамленьні ягонага імені зь імем «Рагнвальд» і пошукам адпаведнага Рагнвальда ў скандынаўскіх крыніцах. Між тым фанэтычная перадача скандынаўскіх імёнаў у стараславянскай мове не была цалкам дакладная. Скажэньне магло ўзмацніцца за вялікі прамежак паміж часам Рагвалода і першай паловай XII ст., калі сюжэт пра яго быў уключаны ў «Аповесьць мінулых гадоў».

Удасканаленьне і рэдагаваньне летапісных зводаў у XII ст. у Кіеве суправаджалася ўсплёскам цікавасьці да нарманскіх вытокаў Русі і адраджэньнем рэтра-моды на нарманскае. Мода гэтая выявілася і ў княскім іменьніку. Смаленскі князь Расьціслаў Мсьціславіч меў сына Рурыка і дачку Рагнеду. У тураўскага князя Юр'я Яраславіча была дачка Малфрыд. У XII ст. вядомы полацкі князь Рагвалод Барысавіч. Кіеўскі і луцкі князь Яраслаў Ізяславіч меў сына Інгвара. Сузор'е нарманскіх імёнаў у княскіх сем'ях асабліва кідаецца ў вочы на фоне амаль поўнай іх адсутнасьці ў XI ст. Перапынак у анамастычнай традыцыі прывёў да зьяўлення розных варыянтаў таго самага запазычанага імені. У прыватнасьці, імя «Ingvarr», успрынятае ў IX–X стст. стараславянскай мовай як «Игорь», у XII ст. запазычылася яшчэ раз як «Ингварь».

Падваеньне скандынаўскіх імёнаў на адрозныя стараславянскія варыянты падводзіць да думкі пра магчымасьць кантамінацыі адрозных скандынаўскіх імёнаў у адзін стараславянскі варыянт, чаму спрыялі спад у сувязях Русі і Скандынавіі ў XI ст. і цьмянасьць зьвестак, якія мелі пра даўнейшы час людзі XII ст. Дапушчэньне, што Рагвалода неабавязкова атаясамліваць з адным з сучасных яму Рагнвальдаў, дапаможа пашырыць наш пошук у віры падзеяў X ст.

Правядзем храналягічныя паралелі паміж полацкай і нарвэскай гісторыяй таго часу. У пачатку X ст. Полацкае княства ўваходзіла ў склад Кіеўскай дзяржавы, асноўным заняткам паноўнага дружыннага слою якой былі гандаль і ўзброеныя набегі на прасторах паміж Балтыкай, Касьпіем і Чорным морам. Гэта прываблівала шматлікіх шукальнікаў шчасьця і прыгодаў са Скандынавіі. Сярод іх аказаўся і Эйрык Крывавая Сякера. Пры жыцьці бацькі, але да свайго прыходу да ўлады (г. зн. паміж 900 і 930 гг.) ён хадзіў у паходы ва «Ўсходнія Краіны», пад якімі нарманы разумелі прыбалтыйскія народы і Русь. Першы раз Эйрык зь пяцьцю караблямі выправіўся на ўсход, калі яму было дванаццаць гадоў. Пазьней ён зрабіў яшчэ адзін паход, зь якога вярнуўся «з баявымі караблямі і вялікім войскам». Прайшоўшы такую стажыроўку і натачыўшы іклы, ён, відаць, захаваў ва Ўсходняй Эўропе нейкія трывалыя сувязі.

Тым часам перамена палітычнага становішча на Русі адкрыла новыя магчымасьці вайскова-палітычнай кар'еры вандроўным нарманскім конунгам. Пасьля сьмерці Алега Вешчуна каля 912 г. кіеўскім князем стаў Ігар, які падчас свайго кіраваньня зазнаў шэраг буйных няўдачаў. Русы пацярпелі паразу ад хазараў у Крыме ў 940 г. і пад хазарскім ціскам зьдзейсьнілі вельмі няўдалы паход на Канстантынопаль у 941 г. Уплыў Хазарскага каганату на кіеўскую палітыку значна ўзмацніўся. У дадатак Ігару давялося саступіць збор даніны з углічаў і драўлянаў свайму паплечніку, уплывоваму ваяводу Сьвенельду. Вынікам гэтых падзеяў сталася слабеньне ўлады кіеўскага князя і яго гібель у паходзе на драўлянаў у 945 г.

З гэтай слабасьці маглі скарыстацца мясцовыя полацкія вярхі. Полацак панаваў над асобным дзьвінскім адгалінаваньнем гандлёвых шляхоў і таму быў натуральным канкурэнтам Ноўгараду і прэтэндэнтам на адасабленьне ад Кіеўскай дзяржавы, у якой Ноўгарад адыгрываў ролю другога паводле значнасьці цэнтру. Відаць, адасабленьне і адбылося пасьля паразаў Ігара, бо, адрозна ад паходу Алега, крыніцы ўжо ніяк ня згадваюць палачанаў пры апісаньні паўторнага паходу Ігара на Канстантынопаль у 944 г. У сваім творы «Аб кіраваньні імпэрыяй», напісаным каля 950 г., бізантыйскі імпэратар Канстантын Барвянародны ў ліку падуладных Кіеву гарадоў

называе Чарнігаў, Любеч, Вышгарад, Ноўгарад, Смаленск, але маўчыць пра Полацак.

Якраз у гэты час Эйрык беспрытульна мітусіўся паміж Дублінам і Ёркам, не патрапіўшы стала замацавацца ні там, ні там. Магчыма, паглядаў ён і на ўсход Эўропы, бо ягоныя «подзьвігі» на ўсходнім беразе згадвае ў напісанай паміж 947 і 954 гг. славутай песьні «Выкуп галавы» ягоны стары вораг Эгіль Скалагрымсан. Сыны Эйрыка, бясспрэчна, бралі ўдзел у некаторых ягоных справах, хоць пра іх уласныя дзеяньні нам вядома мала. Між тым канкурэнцыя паміж нарманскімі конунгамі на захадзе Эўропы была вельмі вострая, а іх пазыцыі цярпелі шораз большы ціск ад кельтаў і англасаксаў. На ўсходзе назіралася адваротнае становішча. Спрактыкаваныя і ўмелыя правадыры з дружынамі патрабаваліся як для вайны і рабаўніцтва, так і для абароны ад такіх самых нападнікаў і піратаў. Пад сьцягамі кіеўскіх і наўгародзкіх князёў адкрываліся шырокія магчымасьці для вайсковай кар'еры. Новаўзьніклая самастойная дзяржава кшталту Полацкага княства магла ж і зусім прапанаваць вышэйшыя пасады ў сваёй герархічнай лесьвіцы. Мужчыны Эйрыкавай сям'і валодалі для гэтага ўсімі неабходнымі якасьцямі. Ад Харальда Цудоўнавалосага яны ўспадкавалі каралеўскае паходжаньне, фармальныя падставы на ўладу над асобнай дзяржавай, сьмеласьць, рашучасьць, прадпрымальнасьць і вайсковае майстэрства. Падаецца магчымым, што нехта зь іх мог узначаліць самастойнае Полацкае княства ў 940-я гг.

Сувязі сям'і Эйрыка з усходнеэўрапейскімі землямі не перарываліся і па ягонай сьмерці ў 954 г. Вымушаныя жыць у выгнаньні, сыны Эйрыка мелі пільную патрэбу ў рэсурсах і шукалі іх, дзе маглі. У «Коле Зямным» Сноры Стурлусан кажа, што сыны Эйрыка «*багата* хадзілі ў паходы ва Ўсходнія Краіны». Паходы гэтыя могуць прыблізна датавацца другой паловай 950-х гг.

Кіраваньне і сьмерць Харальда Шэрай Скуры ў Нарвэгіі каля 960–970 гг. адзначаюць пачатак самага цікавага для нашай тэмы эпізоду нарвэскай гісторыі. Маці Харальда Гунхільд і ягоным ацалелым братом Рагнфроду і Гудраду давялося

ўцякаць на Аркнэйскія выспы. Рагнфрод вярнуўся каля 971 г. і на кароткі час адваяваў у хладзірскага ярла Хакана частку Нарвэгіі. Але ўжо праз год ён пацярпеў ад Хакана паразу ля Тынганэса паміж Согнам і Хёрдаландам і мусіў пакінуць краіну. Падзея гэтая дакладна адбылася да 974 г., бо ў гэты час хладзірскі ярл з нарвэскім кантынгентам ужо дапамагаў дацкаму каралю Харальду Сінязубаму адбіваць наступ германскага імпэратара Атона II.

Рагнфрод зьнікае з Нарвэгіі якраз перад тым, як летапіс паказвае Рагвалода на полацкім княжаньні. Карэктуючы 980 г. як дату паходу Ўладзімера на Полацак, сучасныя дасьледчыкі даводзяць, што залёты Ўладзімера да Рагнеды і ўзяцьце ім Полацку адбыліся пасьля 972 г. і за пэўны прамежак часу да 11 чэрвеня 978 г., калі ён уступіў у Кіеў. Адначасовасьць гэтых падзеяў з нарвэскімі пэрыпэтыямі, сувязі сям'і Эйрыка Крывавай Сякеры з Усходняй Эўропай і фанэтычнае падабенства імені «Рагнфрод» да летапіснага варыянту «Рагвалод» дазваляюць нам разглядаць Рагнфрода як магчымага кандыдата на атаясамленьне з полацкім князем. Ускосным аргумэнтам на карысьць гэтай вэрсіі служыць і тое, што пасьля паразы ад ярла Хакана ў Нарвэгію Рагнфрод ужо не вярнуўся і знайшоў сьмерць у іншых краёх. Нарэшце, сама сьмерць напаткала яго не пазьней за 999 г., калі пасьля таго, як загінуў Гудрад, сярод жывых не засталося ніводнага сына Эйрыка Крывавай Сякеры і Гунхільд.

Атаясамленьне Рагнфрода і Рагвалода дазваляе пад іншым ракурсам паглядзець і на абставіны нападу Ўладзімера на Полацак. Наўгародзкі князь меў на гэта дастаткова важкіх прычынаў: натуральнае спаборніцтва паміж Полацкам і Ноўгарадам; імкненьне не дапусьціць саюзу паміж полацкім князем і братам Уладзімера Яраполкам Кіеўскім, зь якім ён варагаваў; нарэшце, жаданьне выканаць свае шлюбныя пляны. Магла існаваць і яшчэ адна істотная прычына. У гэты ж час у Ноўгарадзе ва Ўладзімера хаваўся ня хто іншы, як Олаф Тругвасан, бацьку якога пазбавіў жыцьця Гудрад Эйрыксан. Олаф быў не апошняй асобай у атачэньні наўгародзкага князя. Ён камандаваў нейкімі атрадамі Ўладзімера і браў чынны ўдзел у ягоных вайсковых выправах. Ведаючы, што ў Полацку

княжыць брат забойцы ягонага бацькі (калі гэта сапраўды быў Рагнфрод), ён быў здольны ня толькі падбухторыць Уладзімера да паходу на Полацак, але і ўдзельнічаць у ім як спрактыкаваны правадыр.

Падвядзем рысу. Калі мы маем рацыю ў нашых меркаваньнях, то жыцьцёвы шлях Рагнфрода-Рагвалода выглядае наступным чынам. Ён правёў сваё дзяцінства ў Нарвэгіі пры сваім бацьку каралю Эйрыку. Каля 934 г. Рагнфрод разам з бацькам пакінуў краіну і вёў жыцьцё вандроўнага вікінга на Брытанскіх выспах і ва Ўсходняй Эўропе. На Русі сям'я Эйрыка патрапіла замацавацца на княскім пасадзе ў Полацку, які ў 940-я гг. адасобіўся ад Кіеўскай дзяржавы. Да вяртаньня ў Нарвэгію ў 960-я гг. сыны Эйрыка падтрымлівалі сувязі са сваімі ўсходнімі ўладаньнямі і наведвалі іх. Гэта аказалася вельмі дарэчы пасьля чарговага выгнаньня з Нарвэгіі каля 970 гг. Зрабіўшы няўдалую спробу адваяваць краіну ў ярла Хакана ў пачатку 970-х гг., Рагнфрод-Рагвалод канчаткова вярнуўся ў Полацак. У спрэчцы паміж братамі Яраполкам Кіеўскім і Ўладзімерам Наўгародзкім ён стаў на бок першага і адмовіў апошняму ў заляцаньнях да сваёй дачкі Рагнхільд-Рагнеды. У адказ Уладзімер арганізаваў паход на Полацак з удзелам Олафа Тругвасана, крэўнага ворага сыноў Эйрыка Крывавай Сякеры. Паход скончыўся ўзяцьцем Полацку і пагібельлю полацкага князя.

Хоць Эйрык Крывавая Сякера быў сумнеўным хрысьціянінам, а яго жонка Гунхільд і зусім навучалася вядзьмарству ў Фінмёрку, Рагнфрод і ягоныя браты хрысьціліся ў Англіі і нават спрабавалі насаджаць хрысьціянства ў Нарвэгіі. Атаясамленьне Рагнфрода і Рагвалода тады прывяло б да нечаканай высновы, што ў Полацкую зямлю хрысьціянства занёс не Ўладзімер, а забіты ім полацкі князь.

Цяпер выпрабуем гіпотэзу на трываласьць... і пабачым, як яна пачне распаўзацца. Атаясамленьне імёнаў «Рагнфрод» і «Рагвалод» на падставе фанэтычнага падабенства – папросту адвольнае дапушчэньне. Эйрык і ягоныя сыны бавілі нашмат больш часу і сілаў на захадзе Эўропы, чым на ўсходзе. Нават калі яны заплывалі ва «Ўсходнія Краіны», няма зьвестак, каб

яны знаходзіліся на Русі і, у прыватнасьці, на Полаччыне. Яны цалкам маглі абмежавацца рабаваньнем эстаў, зэмгалаў і кураў і ня рухацца далей. Храналёгія падзеяў X ст. даволі ўмоўная – яна не пацьвярджае наўпрост верагоднасьці выказаных меркаваньняў. Больш за тое, некаторыя генэалёгіі адносяць сьмерць Рагнфрода да 982 г., што ставіць пад сумнеў яго атаясамленьне з Рагвалодам. Што ж застаецца?

Застаюцца факты. Застаецца ключавая роля скандынаваў у фармаваньні дзяржаўнасьці Старажытнай Русі. Застаецца адасабленьне Полацку ад Кіеўскай дзяржавы ў X ст. Застаецца скандынаўскае паходжаньне Рагвалода. Застаецца дзейнасьць шматлікіх неспакойных нашчадкаў нарвэскага караля Харальда Цудоўнавалосага, якія хапаліся за любую магчымасьць узначаліць асобную дзяржаву і мелі для гэтага ўсе падставы. Застаюцца паходы Эйрыка Крывавай Сякеры і ягоных сыноў ва Ўсходнюю Эўропу. Застаюцца храналягічныя паралелі. Быць можа, нашыя меркаваньні і не дадуць дакладнага адказу на пытаньне пра паходжаньне полацкага Рагвалода, але набліжэньне да яго і звужэньне кола пошуку будзе някепскім вынікам.

Крыніцы:

1. Ипатьевская летопись. – Москва, 1998.
2. Лаврентьевская летопись. – Москва, 2001.
3. Стурлусон, Снорри. Круг Земной. – Москва, 1980.
4. Эгиль сын Грима Лысого. Выкуп головы //
Поэзия скальдов. Санкт-Петербург, 2004. С. 11–15.

Дасьледаваньні:

1. Джонс Г. Викинги: Потомки Тора и Одина. – Москва, 2003.
2. Коновалов Ю. В. Русско-скандинавские связи середины IX – середины XI вв. // Историческая генеалогия.
Вып. 5. Екатеринбург–Париж, 1995. С. 42–59.

3. Рапов О. М. Русская церковь в IX – первой трети XII в. – Москва, 1988.
4. Łatyszonek O., Bely A. On the Scandinavian Origin of Rahvalod //
Annus Albaruthenicus 2005. Krynki, 2005. P. 49–64.
[image]
[image]

№ 9 (49) - 2006

Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/12/10
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 9 (49) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

[image]

[image]2006

[image]

[image] [image] [image]

ЮРЫ ПАЦЮПА

паэт, крытык літаратуры. Жыве ў мястэчку Азёры пад Горадняй, выкладае ў Гарадзенскім унівэрсытэце.

Юры Пацюпа Найлепшы верш Цішкі Гартнага?

Гартаючы ў аддзеле рэдкай кнігі нумары часопісу «Вольны сьцяг», я ня раз сутыкаўся з прыгожым вершам «Стэп», падпісаным сьмешным псэўданімам *Стручок*. Перш-наперш кідаўся ў вочы выкшталцоны малюнак страфы, а па прачытаньні — уражваў маляўнічы пэйзаж, створаны няведамым аўтарам. Мне захацелася мець гэты верш у сваім архіве. Я зрабіў ксэракс і дома падоўгу ўчытваўся ў ягоныя радкі, спрабуючы зразумець: хто ж схаваўся за тым дзіўным псэўданімам? Трэба ж, думаў я, часамі мы гатовы перакапаць усе архівы сьвету, каб знайсьці адзін-адзінюткі беларускі радок, а тут ня можам убачыць, пагатоў ацаніць і зразумець тое, што ляжыць на паверхні! Імя аўтара — Цішка Гартны (адкрыем яго, каб не дурыць чытача), якое выявілася ў выніку параўнальнае працы, зьдзівіла мяне самога.

Уражаны адкрыцьцём, я пачаў абзвоньваць сваіх знаёмых, раіцца. Многія верш хвалілі, прымяркоўвалі вытанчанасьць пэйзажу да Фетавага. Бальшыня рэагавалі зычліва, але нічым не маглі дапамагчы. Некаторыя адмахваліся. А адзін ведамы літаратуразнаўца, на некалькі парадкаў больш дасьведчаны, чым я, успрыняў мае разважаньні раздражнёна. Пачаў цьвердзіць, маўляў, усё, што я кажу — ненавукова, але нічога навуковейшага не парадзіў і пасьпяшаўся адчапіцца ад

надакучлівага суразмоўцы. Скептыкі, усе ў адзін голас, цьвердзілі: *у Гартнага іншая эстэтыка!* На жаль, за гэтымі словамі, нічога апрача стэрэатыпаў і павярхоўнага веданьня паэта я ня ўбачыў. І цяпер мне толькі застаецца падзяліцца сваімі разважаньнямі публічна. Лепш раз абмыліцца, чым маўчаць. А хто ведае больш, няхай што дадасьць ці аспрэчыць мяне.

СТЭП

Навальніца прайшла. Над высокай травой
Ў пералеску хваёвым пахіл:
Я к бярозцы стамлёны прыпаў галавой —
Нада мной галубны небасхіл.
Я драмлю — не драмлю,
Сонным вокам лаўлю
Цені хмар,
І абшар,
І Случанкі-ракі дзіўны чар.

У паўціне пузаты гайдаецца жук,
Машкара навакола зьвініць,
Павуцінаю мушку апутаў павук,
На чуць бачанай нітцы вісіць;
А кругом між травы,
Зеляной муравы
Камялькі,
Матылькі
І махнатага маку лісткі.

Дажджавыя расінкі на вецьці вісяць;
Стэп паўнюткі і паху і сна...
Падуў вецер, і лісьці агнямі мігцяць,
І бярозка пяе, як струна:
Шэпча казачку бор
І вядзе разгавор
З збажыной
Яравой
І жытнянай палоскай буйной.

Я таплюся у шопатах ліп і бяроз,
Ў глухім шуме дубовых гальлёў.
Ў ціхім шопаце траваў і лісьцікаў лоз
Ля канаў прыдарожных ды зыку шмялёў.
І мне хочацца ўзяць
Стэпу грудзі абняць;
Між вецьця
І квецьця
Я заснуць, як дзіцятка, гатоў!

17/V 1921 г.
Вольны сьцяг. 1921. №3. С. 12.
Цішка Гартны (1887—1936)?

АБСЯГІ ШУКАНЬНЯ

Каб *адгадаць* запраўднага аўтара — паддастаткам мець пару ўдалых паралеляў. І яны ёсьць! Але каб гэтае ж аўтарства *давесьці* — мы мусім расчысьціць сабе поле дзеяньняў і пачаць «дэдукцыю» з сама агульных, прапэдэўтычных заўваг у галіне эстэтыкі, тады — перайсьці да матываў, як эстэтыкі прыватнае, і, нарэшце, прааналізаваць вершаваньне, мову. Найболей матэрыялу для высноў даюць матывы прыроды, сёе-тое дадае мова. Крыху менш дапамагае аналіз вершу. Праўда, яго разгляд ня марны, да таго ж — каштоўны сам празь сябе. Аднак, перш чым брацца за параўноўваньне, трэба вызначыць абсягі шуканьня. Такі верш мог напісаць хто заўгодна. Ведама, аўтар яўна не пачатковец, але чаму ня Янка Купала, не Якуб Колас, не Максім Багдановіч, не Ясакар (Зьмітрок Бядуля), не Алесь Гарун?..

Багдановіч адпадае адразу. З многіх, мяркую, досыць відочных прычынаў. Купала і Колас, добра разважыўшы, — таксама. Творчасьць кожнага зь іх пільна зьбертая і вывучаная. Гарун, што праўда, быў схільны да падобнага мудрагелістага страфаваньня. Але ў яго вершы пераважала харэічная кадэнцыя, дый паэтыка была крыху іншая. Кепска мы ведаем

творчасьць незаслужана занядбанага Ясакара, і ўсё ж, бяру на сябе рызыку казаць — ня ён. Зрэшты, чаму мусова шукаць сярод клясыкаў? У абсязе паміж нашаніўскім і маладнякоўскім пэрыядамі паўстала гэтулькі імёнаў, якія неўзабаве заніклі, што, бадай, ніхто ня дасьць рады ўсіх распазнаць. Прыкладам, чаму ня Паўла Каравайчык, які ў тым жа «Вольным сьцязе» надрукаваў верш «Memento mori» з малюнкам страфы ня менш вытанчаным?

Гэтыя «чаму» можна было б доўжыць бясконца, каб не адно паказаньне, найменьне рэчкі, якое спатыкаем у тэксьце: *І Случанкі-ракі дзіўны чар*. Ці не пашукаць сярод пляяды случакоў-капылянаў? І адразу ўзьніклі тры кандыдатуры: Хведар Чарнышэвіч, Алесь Гурло, Цішка Гартны. А можа хто з маладзейшых: Адам Бабарэка, Нічыпар Чарнушэвіч, Мікола Хведаровіч, Максім Лужанін?.. Маладзейшых я адкінуў адразу, яны ў 1921 годзе яшчэ не публікаваліся, або калі й публікаваліся, дык пісалі прынцыпова інакш. А паэтыка вершу, як убачым ніжэй, чыста нашаніўская. Тады хто з гэтых траіх?

На пачатку мае спадзевы былі на баку Хведара Чарнышэвіча, празыванага за доўгія вусы Тараканам, паэта хоць ня надта адукаванага, але схільнага да эстэцтва. Гэта пра яго казаў Максім Багдановіч: «Цяпер ужо ўмее пісаць сьціснута і ў кароткіх словах даць малюнак прыроды або вылажыць сваю думку, але робіць, на жаль, гэта ненатуральна, заблытана». І пра яго ж успамінаў Мікола Хведаровіч:

Бацькі яго жылі бедна. Сёе-тое ён зарабляў сваёй літаратурнай дзейнасьцю, сябраваў зь мясцовай інтэлігенцыяй і лічыў сябе паэтам. Таму ён насіў даўгія валасы, якія закручваліся ўгору так, што надзетая шапка ляжала зьверху, як у гнязьдзе. Справіў ён сабе картовы, але досыць шчыгульны гарнітур, нават насіў гальштук-матылёк на паркалёвай кашулі.

Другім кандыдатам уяўляўся досыць таленавіты, менавіта як прыродаапісальнік, Алесь Гурло. І, трэба прызнацца, у вершах Гурла можна ўбачыць нямала падабенства з вобразамі Стручка, прыкладам:

Адусюль паволі над лугамі, полямі

Мёдам пах разносіцца, пах салодкіх сот;
Жыта, пасьпяваючы, хваліцца куколямі,
А над рэчкай галкі выпусьціў чарот.

З параўнаньня шматлікіх тэкстаў гэтых двух аўтараў вынікае: пэйзаж Гурла куды больш падобны да «Стэпу», чым пэйзаж Чарнышэвіча.

Аж трэцім, запасным, кандыдатам значыўся ў мяне Цішка Гартны. Але чым болей я спазнаваў тэксты паэта, тым відочней вымалёўвалася яго аўтарства. Між іншым, з усіх капылянаў акурат Зьміцер Жылуновіч не скупіўся на псэўданімы і пёк іх, як бліны, відаць, не асабліва задумваючыся над матывацыяй. Вось толькі некаторыя: *Авадзень*, *Авадзён*, *В. Аса*, *Беларус*, *Беларус-Камуніст*, *Паўлюк Вартавы*, *Сымон Гляк*, *Габрусь Друк*, *Сымон Друк*, *Зьміжыла*, *Знаёмы*, *Янка Кліч*, *Чырвонь*, *Шулятнік*. Так, *Стручок* сярод іх нідзе ў даведніках ня значыцца, але ж ці можам мы ўсё ведаць за раз?..

ЭСТЭТЫКА

Адразу хацелася б зазначыць: эстэтыка Цішкі Гартнага далёка ня ўпісваецца ў той нудны вобраз пралетарскага паэта, які яму здаўна накідваецца. Яшчэ на самым пачатку творчае працы ў яго творах можна згледзець найразнастайнейшыя наслаеньні. У паасобных вершах адчуваецца ўплыў сымбалізму, заўважаецца цікавасьць да ўсяго прыгожага і загадкавага, увасобленага ў містычных паўфальклёрных вобразах. Возьмем, прыкладам, верш 1910 году «Начныя чары»:

Сьціш пануе укруг, —
Ўсё замоўкла і сьпіць.
Толькі месячны круг
Ў сінім небе гарыць;
І чароўны спакой
Залягае кругом:
Штось шапоча з кустом
І гуляе з травой;
А ў празрыстай вадзе
Ручайкоў і балот

Байкі-казкі вядзе
І цалуе чарот.

Далей у тэксьце ўзьнікае фантастыка, русалкі. І канцоўка ўдае ўжо на чыста дэкадэнцкую:

І усё на зямлі
Ў начных чарах жыве,
Нежывое тады
Весяліцца, пяе...

Падобная эстэтыка, упэўнена, штораз мацней і мацней, набірала голас у творах самых розных, ледзь ня ўсіх пагалоўна, нашаніўскіх паэтаў. Нездарма Максім Багдановіч у крытычных аглядах цешыўся з тэматычнага і фармальнага ўзбагачэньня літаратуры: «Бачым, што беларуская пісьменнасьць расьце... Але ня гэты ўзрост цікавіць нас, а ўзрост вартасьці твораў нашых пісьменьнікаў». Словы, сказаныя далей пра Купалу, можна ў той ці іншай меры аднесьці й да іншых аўтараў: «Зьяўляюцца новыя мэты, новыя спосабы творчасьці, новыя формы і вобразы... Часта-густа спатыкаецца прыгожая будова вершу, цікавая па спляценьні строк, расстаноўцы рыфм, ужываньні цэзур». Гэтыя фармальныя і філязофскія шуканьні дасягнулі піку разьвіцьця ў парэвалюцыйны час. А перарваліся — з прыходам Саветаў, праўда, не адразу. Пазьней жа шмат хто з творцаў быў рады проста замаўчаць былое, прыкладам, сваю супрацу зь неўпадабанымі бальшавікамі выданьнямі «Вольны сьцяг», «Адраджэньне».

Цішка Гартны меў схільнасьць да фармальных вынаходніцтваў ня менш як Купала ці той жа Багдановіч. Часамі ў яго можна спаткаць тонкую гульню нюансамі, як, скажам, у вершы «Я далёка...», дзе праз усю лірычную кампазыцыю пасьлядоўна і па-майстэрску выкарыстоўваюцца рэдкія ў беларускай

Я далёка цяпер ад цябе,
Я далёка, далёка — ў чужыне;
І так сэрца няшчаснае стыне,
Што далёка цяпер ад цябе!

Я няведамай сіле падданы,

’Ля таго неразлучны з табой,
І жыву я табою душой
Ўсё няведамай сіле падданы.

З пазнейшых твораў асабліва ўражвае рытмічнай будовай ды графічным малюнкам выкшталцоная мадыфікацыя каламыйкавага вершу з тупымі кляўзуламі, якую мы назіраем у тэксьце «Беларуска»:

Як ідзе —
Шнур кладзе
Лёгкае хады.
Роўны стан
Увабран
Стужкаю ўсягды.

На жаль, далёка ня ўсё зь лірычнага, містычнага ды эстэцкага лучала ў прыжыцьцёвыя перадрукі, а пазьней — у зборы твораў пісьменьніка. У гэтым, пэўна што, быў вінаваты час, зычліўцы-дарадцы і... сам пісьменьнік. Так ці гэтак, спакваля склаўся стэрэатып Цішкі Гартнага як суровага, каструбаватага пралетарскага песьняра-бэйгара. З усяго відаць, ён і сам, як той Максім Горкі, даражыў сваім модным іміджам, а дзеля захаваньня іміджу гатоў быў усё часьцей і часьцей «наступаць на горла» ўласнай песьні, ахвяраваць лірызмам дзеля моды (сёньня падобнае часьцяком робяць постмадэрністы!). Але... паэт ня быў бы паэтам, калі б ня дбаў пра чыстую красу. Якраз на апошняе ня трэба забывацца, чытаючы як Цішку Гартнага, так кожнага іншага яго сучасьніка.

Дзеля прыкладу, возьмем біябібліяграфічны слоўнік, выпішам паасобныя, найцікавейшыя найменьні вершаў Гартнага: «Лясун» (1911), «Любоў» (1911), «Пахаваньне» (1911), «Я — асобны сьвет» (1911), «’Ля цябе я садзіла лілею...» (1913), «Не сьпявай у садзе, салавей...» (1916), «К Богу праведнаму» (1918), «Рожа» (1920). Мы іх ня знойдзем ў апошнім чатырохтамовым зборы твораў. Затое знойдзем там такі камэнтар: «Побач зь вершамі, якія вызначаліся навізной тэматыкі і закладалі асновы беларускай рабочай паэзіі, а таксама творамі, поўнымі грамадзянскага патасу і глыбокага пачуцьця, у першай кнізе Ц. Гартнага была і эпігонская лірыка (цыкль «Песьні каханьня»)».

Гэта не выпадковая заўвага. З раньніх, лірычных апавяданьняў у анталёгіі ды выбранае таксама чамусьці не траплялі «Скошаны луг», «Думкі беларуса», «Пустуючы шнурок». Чаму? Бо там ёсьць нацыянальны патас, гучаць рэлігійныя ноткі! Так сэлекцыянавалі беларускую літаратуру.

Усякага роду «грамадзянскімі», г. зн. сацыяльна-публіцыстычнымі тэкстамі кагадзе былі пазадушваныя і анталёгіі, і хрэстаматыі, і зборы твораў. Пра што тут казаць, калі найлепшыя вершы Купалы — «Сярод магіл», «У бяссонную ноч», «Сьмейся», «Пчолы» — за савецкім часам былі фактычна пад забаронаю! Усё гэта скажала, і дагэтуль скажае, абліччы нашых пісьменьнікаў. Думаю, не аднаму пакаленьню дасьледнікаў, камэнтатараў ды ўкладаньнікаў давядзецца шуфлямі выграбаць тыя «грамадзянскія» трафарэты. Апрыёрна лічылася, быццам верш на грамадзкія тэмы каштоўнейшы за верш асабістай танальнасьці. І, калі што фармальна цікавае ці глыбока інтымнае лучала ў афіцыйныя хрэстаматыі, дык хутчэй выпадкова, чым пасьлядоўна.

У цэлым вымалёўваецца досыць сумная карціна. Да рэвалюцыі беларуская літаратура, дзе дабром, а дзе гвалтам, мусіла аплакваць цяжкую долю мужыка («Чаму плача песьня наша?»). А як толькі яна наважылася сплачваць доўг красе і каханьню («Сплачвайце доўг»), дык прыйшоў новы сацыяльны заказ, ужо куды больш патрабавальны: апяваць шчасьлівую рэчаіснасьць. Горка і сьмешна тое, што маладнякоўцы крытыкавалі нашаніўцаў акурат за «плач», за той ранейшы сацыяльны заказ, хоць самыя так і ня здолелі выскачыць з гэтай «грамадзянскай» наканаванасьці...

МАТЫВЫ

Адна з сама прывабных, на жаль, дагэтуль не апісаных і практычна не заўважаных рысаў лірыкі Цішкі Гартнага — гэта адмысловая экзыстэнцыйная сытуацыя, якую можна абазначыць як *заглыбленьне ў аб'ект спазіраньня*. Сытуацыя перажываньня праяўляецца наступным спосабам: паміж лірычным героем і сьветам адбываецца сустрэча — у нечым нечаканая — пачуцьці героя абвастраюцца, ён дзівіцца, спазірае і спакваля, як губка,

пачынае насычацца пэйзажам. Адпаведна, лірычнае «я» і прыродны аб’ект шчыльна зьліваюцца, пераламляючыся ў мностве падрабязнасьцяў, дэталяў і роздумаў. Але насамрэч, знутра, гэтая сытуацыя асаблівая якраз падкрэсьленым, трагічным распадам суб’екту і аб’екту.

Прытомнасьць суб’екту ў лірычным тэксьце не такая пашыраная зьява, як можа падацца на першы пагляд. Нават у такога яскравага лірыка, як Максім Багдановіч, яна спатыкаецца досыць рэдка. Вось, прыкладам, як гучыць адзін зь яго нешматлікіх вершаў, напісаных ня толькі ад «першай асобы», але й «з удзелам» яе:

Бачу я, з прыродай зьліўшыся душой,
Як дрыжаць ад ветру зоркі нада мной,
Чую ў цішы, як расьце трава.

І ўсё ж, нават у гэтым тэксьце спосаб бачаньня адрозьніваецца ад пагляду Цішкі Гартнага.

Лірычны герой у бальшыні паэтаў часьцей за ўсё спазірае аб’ект нібыта «з-за кадру», што само празь сябе нагадвае спосаб выкладу ў прозе ад трэцяй асобы. Хоць насамрэч у якасьці трэцяе асобы тут выступае толькі атачэньне — рэчы, прырода. Гэтак у лірыцы праяўляецца бахцінская *нестыкальнасьць* (вненаходимость) аўтара. Для Гартнага манера прытомнасьці «першай асобы», суб’екту побач з аб’ектам — досыць частая зьява, асабліва ў апісаньнях прыроды. Уласьцівая яна й апавяданьням.

Калі прасачыць паралелі паміж вершам Стручка і раньнімі лірычнымі апавяданьнямі Гартнага, дык зараз пераканаемся, што паасобныя ўрыўкі гучаць, як падрадкоўнік да «Стэпу», падабенства часамі проста ўражвае.

1. Прыход лірычнага героя:

Над высокай травой // Ў пралеску хваёвым пахіл: // Я к бярозцы стамлёны прыпаў галавой — // Нада мной галубны небасхіл. // Я драмлю — не драмлю, // Сонным вокам лаўлю // Цені хмар, // І абшар <…> Шэпча казачку бор // І вядзе

разгавор // З збажыной // Яравой // І жытнянай палоскай буйной («Стэп»);

Я стаяў на вузкай-вузкай мяжы, абросшай рэдкай высокай травой; а абапал яе, крышку шырэйшыя за мяжу, цягнуцца мужыцкія шнуркі жыта. Круг-кругом — зялёнае, пекнае, як дарагі аксаміт, — мора зелені. Пахне нечым сьвежым, лёгкім!.. <…> Я бязвольна схапіўся за галаву, апусьціў яе к зямлі і пачаў думаць… («Думкі»).

Тут нават перажываньне разьвіваецца паводле аднолькавай схемы:

а) момант сустрэчы:

Я к бярозцы стамлёны прыпаў галавой;
Я стаяў на вузкай-вузкай мяжы;

б) працэс перажываньня:

Я драмлю — не драмлю;
Я бязвольна схапіўся за галаву.

2. Спазіраньне прыроды:

У паўціне пузаты гайдаецца жук, // Машкара навакола зьвініць, // Павуцінаю мушку апутаў павук, // На чуць бачанай нітцы вісіць; // А кругом між травы, // Зеляной муравы // Камялькі, // Матылькі… («Стэп»).

Пад самым небам, чыстым, ясным, пяе-заліваецца рэзвы звонкі жаваранак, верціцца, як лёгкае пёрка ў паветры, і быццам весяліцца. Унізу ж над жытам цэлыя мільёны мошак, жучкоў, матылькоў! («Думкі»).

3. Зьліцьцё з аб’ектам:

Я таплюся у шопатах ліп і бяроз, // Ў глухім шуме дубовых гальлёў. // Ў ціхім шопаце траваў і лісьцікаў лоз // Ля канаў прыдарожных ды зыку шмялёў («Стэп»).

Я патануў у духу тварэньня, я загарэўся смагай усялюдзкай

карысьці і свайго ахвярства на аўтар дабра, шчасьця і красы высокай! («Не адрывайце мяне ад работы»).

Заглыбленьне ў аб’ект, сваім парадкам, у Цішкі Гартнага часта перадаецца адметна: спачатку з дапамогою прыназоўніка *у*, а потым — прыназоўніка *між*, што таксама характэрна для вершу «Стэп». Параўнайма:

Ў вербалозах, ў пухкім моху
Завіліся карагоды;
.....
Між кустамі над крыніцай
Распусьцілі бросьні-косы...

Або:

Я жыву у шчабятаньні... <...>
Дрэў стагодніх ў стройным гудзе.

Ды што там казаць! Часам мы нават не задумваемся, як асобнае слова ці выпадковы матыў могуць быць цесна зьнітаваныя зь біяграфіяй паэта. Прыкладам, у «Стэпе» трапляецца слова *канава* — далёка ня сама характэрнае для беларускае мовы: *Я таплюся у шопатах ліп і бяроз <...> // Ля канаў прыдарожных ды зыку шмялёў*. Гэтае слова нават сёньня гучыць неяк чужавата. Відаць, яно прыйшло з расейскае мовы, а пашырэньню спрыяла мэліярацыя. У звычайным жыцьці беларусы кажуць: *роў*, *равок*, *раўчук* і г. д. Але ў Гартнага таксама чытаем: *Направодзіў шырокіх і доўгіх канаў // І прарэзаў я цэлыя мілі равоў.* Выяўляецца, даны матыў не такі ўжо выпадковы, як, можа, падаецца на першы пагляд. Мікола Хведаровіч, які добра ведаў капыльскае асяродзьдзе, піша пра сям’ю Жылуновічаў: «Бацька вяртаўся з Палесься, дзе капаў канавы ў падрадчыка». Зрэшты, усе случакі так ці інакш былі знаёмыя з мэліярацыяй. Вось, прыкладам, як гэтую працу апісвае Максім Лужанін:

Прыйшлі грабары, а ня гнуліся крукам,

Каб дзерці канаўкі, прывязваць фашыны.

Любіў Гартны таксама ўспамінаць у сваіх тэкстах краскі. Часьцей, прынамсі, чым многія зь яго сучасьнікаў. Любіў і канкрэтныя найменьні кветак, адпаведна — меў свой букет. Ня раз у яго фігуруе мак, расьліна асабліва характэрная для раўнінных абшараў Палесься. Нават эпітэты маку падобныя: у вершы «Чырвоны мак» — *махравісты мак*, а ў «Стэпе» — *махнаты мак*.

ПАЭТЫКА

Калі нехта дагэтуль думае, быццам вершы пішуцца падборам слоў і падлікам ступ, дык ён памыляецца, і нават вельмі. Канструяваньне ступ — зьява шмат пазьнейшая, шкалярская, схаластычная. Яна ўплывае на паэзію, але не вызначае яе ходу. Вершы пішуцца радкамі, у аснове якіх ляжаць рытмавыя стэрэатыпы. З тых радкоў, што дзеляцца, множацца, складваюцца, вырастаюць строфы і растуць гэтаксама, як грыбы, паліпы ці каралы. Строфы, само сабою, пераживаюць мутацыі, ускладненьні, спрашчэньні. Адзін або некалькі старых відаў даюць новы падвід, і гэтак без канца.

«Стэп» напісаны адумыснай анапэставай страфой, характэрнай для нашаніўскай паэзіі і, адначасна, унікальнай, адзінай у сваім родзе. У аснове страфы — чаргаваньне чатырохступовых і трохступовых радкоў. Чатырохступовы радок, падзелены ці не падзелены цэзураю, стварае антыкадэнцыю, а трохступовы — кадэнцыю. Праз увесь верш застаецца ўражаньне, нібыта голас чытаньніка ўзьбягае на горку, а потым павольна падае долу. Апрача анапэсту спалучэньне націскаў 4 + 3 могуць даваць харэй (каламыйкавы верш), абсечаны на цэзуры дактыль (дзесяцьцёвік) і амфібрах. Якія ж карані мае камбінацыя чатырох- і трохступовага анапэсту? Думаю, тут можна прапанаваць дваякую этымалёгію, і кожная будзе аднолькава слушнаю.

1. Такая страфа магла ўзьнікнуць у выніку эвалюцыі сылябічнага дзесяцьцёвіка, дзе чаргаваньне доўгіх няцотных і кароткіх цотных радкоў задае свайго роду *моцны альтэрнанс*. А далей праз нарошчваньне анакрузы дактыль дзесяцьцёвіка можа перарастаць у амфібрах або анапэст.

Падобны дзесяцьцёвік спатыкаецца ўжо ў Альгерда Абуховіча:

Зоры паўночы // кроўю палаюць,
Сьнежны чырвоняць прасторы;
Людзям ворожбы // ліхі зьвяшчаюць
Зораў паўночных разоры.

Асабліва часта да яго зьвяртаецца Стары Ўлас:

У цяжкім змаганьні // зь цёмнаю сілай,
Гдзе шмат мазольнай работы,
Добрыя людзі // вестачкай мілай
Нам паддавалі ахвоты.

Акурат у Старога Ўласа гэтая страфа аздабляецца нутранымі рымамі:

Доўга у хаце /// нашыя брацьці
Рукі злажыўшы сядзелі,
Бо, як на згубу, /// дождж ліў як з лубу,
Ліў праз чатыры нядзелі.

Рымы, сваім парадкам, спрыяюць яе падзелу і ператварэньню чатырохрадкоўя ў шасьцірадкоўе на ўзор Рансаравай страфы.

2. Іншым спосабам страфа магла разьвіцца ў выніку складваньня дзьвюхступовага анапэсту ў анапэст чатырохступовы і альтэрнансавае абсячэньне цотных радкоў.

Кожны з нас, яшчэ з школы, помніць верш Янкі Купалы:

Я мужык-беларус, —
Пан сахі і касы;
Цёмен сам, белы вус,
Пядзі дзьве валасы.

Але далёка ня кожны ведае, наколькі такі анапэст быў папулярны сярод нашаніўцаў. Зрэшты, яшчэ ў XIX стагодзьдзі гэты памер тарнаваў Вінцэсь Каратынскі:

Далібог-то, Арцім,

Што прыплыў ты к сваім!
І зямля тут Твая,
І народ, як сям'я...

Цікава будзе гэтта зазначыць: практычна ўсе вершы, напісаныя дзьвюхступовым анапэстам, мелі тупыя кляўзулы, што надавала ім манатонную горную інтанацыю. І, як ні дзіўна, даны памер таксама мае нейкія сылябічныя вытокі — відаць, нездарма да яго зьвяртаўся раньні Трэдзіякоўскі. А беларускі вершазнаўца Іван Ралько, аналізуючы радкі расейскага клясыка, нават зблытаў ягоны анапэст з харэем. Высокая частотнасьць дзьвюхступовага анапэсту ў беларускай нашаніўскай паэзіі і нізкая ў расейскай гаворыць пра тое, што яго паходжаньне тоіць вялікія таямніцы.

3. Чатырохступовы анапэст у спалучэньні з трохступовым стаў адным з найпапулярнейшых беларускіх памераў. Павольны, напеўны, зьменлівы — ён выдатна перадаваў як элегічную глыбіню, так і эпічны размах.

Прыкладам анапэсту 4 + 3 могуць служыць хрэстэматыйныя радкі Янкі Купалы:

Паміж пустак, балот // беларускай зямлі
На ўзьбярэжжы ракі шумнацечнай
Дрэмле памятка дзён, // што ў нябыт уцяклі, —
Ўдзірванелы курган векавечны.

Ускладненьне страфы за кошт нутраных рымаў спатыкаецца ў М. Арла:

Як прыходзіць вясна, /// маю душу яна
Ўсю трывогай якойсь напаўняе.
Будзіць мары душы, /// родзіць сон залаты,
Казку дзіўну пяе-напявае.

А далейшае пераўтварэньне чатырохрадкоўя ў шасьціradкоўе назіраем у Ванды Лявіцкай:

На палі, на лугі,
На пагуркі, лясы
Майскі вечар паволі спусьціўся.
Зьвільгатнела зямля,
Легла густа раса,
Ясны дзень цёмнай ночкай зьмяніўся.

Паэтка зь Дзьвінску Вольга Сахарава чыніць падзел толькі ў трэцім радку, утвараючы пяцірадкоўе:

На чужым берагу мы з табою адны...
Навакол злая ўюга бушуіць...
І штодня сьніцца мне,
Як ў радной старане
Сонца ласкай п'яніць і калдуіць.

У Максіма Багдановіча архетып чатырохрадкоўя абяртаецца ў пяцірадкоўе іншым спосабам, за кошт «зацягваньня» трэцяга радка:

Чуеш гул? — Гэта сумны, маркотны лясун
Пачынае няголасна граць:
Пад рукамі яго, навяваючы сум,
Быццам тысячы крэпка нацягнутых струн,
Танкаствольныя сосны зьвіняць.

Вельмі цікавую мадыфікацыю данай страфы можна ўбачыць у Галіны Івановай, зямлячкі Сахаравай. Іванова падзяляе ня толькі няцотныя двухтактавыя радкі, але й цотныя паўтаратактавыя. У выніку кожнага такога падзелу анапэст 4 + 3 вяртаецца да свайго гіпатэтычнага вытоку, анапэсту дзьвюхступовага, дапоўненага кодаю — «хвосьцікам» даўжынёю ў паўтакту:

Было цёмна кругом...
На дварэ за акном,
Вецер выў і сьпяваў —
весяліўся.

Сьнег ляцеў, вар’яцеў...
Ведзьма, лешы ці чорт
Там вясельле спраўляў —
ажаніўся.

4. У Цішкі Гартнага можна спаткаць анапэсты ці ня ўсіх гатункаў. Заразом многія зь ніжэй прыточаных прыкладаў утрымваюць матывы, вобразы, рымы ды лексэмы, падобныя як у «Стэпе» — кожны такі выпадак тут адумысна падкрэсьліваецца.

Трохступовы анапэст у форме чатырохрадкоўя:

Там срэдзь галу зялёных лугоў
Я адкрыю збалелую грудзь,
І мне пахам прынадным квятоў
Ветры цёплыя ўцехай падзьмуць.
Яны прагную душу маю
Ўпояць воляй шырокіх палёў,
Упрыгожаць пакутную ўсю
Цеплатою пахучай сваёй.

Дзьвюхступовы анапэст у форме чатырохрадкоўя:

Я рабочы-гарбар,
Рыцар працы цяжкой,
Я з жалезнай душой,
З сэрцам палкім, як жар.

Дзьвюхступовы анапэст у форме шасьцірадкоўя:

Я гарбар малады,
Я вясёлы ўсягды, —
Як працую — пяю,
Цэлы дзень за сталом
Я з сабачкай, з нажом
Неутомна стаю.

Камбінаваная страфа анапэсту ў форме шасьцірадкоўя (2 + 2) + 3:

Вы ўсе кажаце мне,
Што ў маёй старане
Няма сэнсу сабе дабівацца
Лепшых шчасных дзянькоў
Для вялікіх збудоў,
Каб з краямі другімі зраўняцца.

Перавернутая страфа анапэсту ў форме чатырохрадкоўя (3 + 4):

У баку дзесь траскоча дзяргач,
Ды цвыркунчыка рэзкая рэч трапаціць...
«Но, малыя! старайцеся ўскач!» —
Паганяючы коні, рамізьнік крычыць.

Вольны анапэст (з наменкаю на спалучэньне 4 + 3):

Я хацеў бы пяяць,
Як пяе
Цёмны бор непагодаю,
Каб вакол абуджаць
Зыкам песьні свае,
Хто ня кінуў шчэ спаць
Пад нядолей-нягодаю.

Вольны анапэст (у чыстым выглядзе):

Мы — сыны
Новых дзён!
Мы прарокі — ваякі за волю.
Перуны
З бліскавіцамі значаць наш шлях
Ад нядолі мінуўшых вякоў
На чырвоны лунаючы сьцяг
Усясьветнай Камуны.
Нас вядзе
Да яе нестухаючы імпэт адвагі.

І нарэшце дзьвюхступовы харэй, які можа ўважацца за анапэст:

Вось і месяц <...>
Меліць пэндлем

Воду, бор.
Стада зор
Ў гала гоніць...

Як бачым, з анапэстам Цішка Гартны экспэрымэнтаваў даволі шмат. Ёсьць у яго трохступовы — найпапулярнейшы як у беларускай, так і ў расейскай літаратуры. Ёсьць розныя камбінацыі нашаніўскага дзьвюхступовага. Спатыкаюцца й спалучэньні 4 + 3, а таксама вельмі рэдкія, мала ўласьцівыя іншым аўтарам вольныя анапэсты. Далёка ня ўсе камбінацыі выглядаюць удалымі. Прыкладам, наколькі цешыць гармоніяй спалучэньне 4 + 3, настолькі ж рэжа слых 3 + 4. Калі ж дапусьціць, быццам «Стэп» запраўды належыць Гартнаму, дык можна сказаць, што гэта найскладанейшая і найгарманічнейшая зь яго мадыфікацыяў страфы 4 + 3. Хоць утвараецца яна досыць проста: праз нанізваньне і дзяленьне асноўнага чатырохрадкоўя. Прылучаюцца спачатку дзьве паловы няцотнага радка, потым — яшчэ дзьве чвэрці няцотнага і нарэшце нанізваецца цэльны цотны радок. Даны архетып і яго мадыфікацыю можна разгледзець на схемах.

Выходны варыянт, папулярны сярод нашаніўцаў:

оо**О**оо**О**оо**О**оо**О**
оо**О**оо**О**оо**О**
оо**О**оо**О**оо**О**оо**О**
оо**О**оо**О**оо**О**

Варыянт, змадыфікаваны Стручком (Цішкам Гартным?):

оо**О**оо**О**оо**О**оо**О**
оо**О**оо**О**оо**О**
оо**О**оо**О**оо**О**оо**О**
оо**О**оо**О**оо**О**
оо**О**оо**О**
оо**О**оо**О**
оо**О**
оо**О**
оо**О**оо**О**оо**О**

МОВА

Пры атрыбуцыі тэкстаў, як паказвае тэксталягічная практыка, мова ня можа служыць неапрэчным довадам таго ці іншага аўтарства. Аднак яе роля мяняецца. І найболей узрастае — у часы станаўленьня літаратурных нормаў. Маўленьне, насычанае дыялектызмамі, проста адхіленьнямі ад нормаў, спрыяе арэальнай атрыбуцыі тэкстаў. Бо для кожнага рэгіёну ўласьцівыя тыя ці іншыя дэталі-адрозьненьні, свайго роду *арэальныя маркеры*, якія дазваляюць звузіць абсягі шуканьня або высьветліць паходжаньне аўтара.

На жаль, разгляд «Стэпу» багатага «ўлову» не дае. Відаць, у случакоў няма такіх эксклюзіўных маркераў, якія назіраюцца ў дзісенцаў, Войслава Савіча-Заблоцкага, Вацлава Ластоўскага. І ўсё ж, пры пільным стараньні, тое-сёе можна зазначыць.

1. Прыметнікі з канцавым націскам: *галубн**ы**, зелян**ы**, буйн**ы***. У Ц. Гартнага: *Як паўн**ы**я вазы жніва // Пагрымяць да току*; *Настрэчу ж месяцу блядн**о**му<…> // Агні электрыкі вакол з акон…*. Пар. у М. Лужаніна: *даўг**і**, дзіўн**ы**, брудн**ы**, цьвярд**ы**, смачн**ы**, цаглян**ы***.

2. Спакменьнікі з канцавым націскам у множным ліку: *гальл**ёў***. У Ц. Гартнага: *Далей сьцеле ён цень // Ад калматых дзярэ**ў*** («НН», 1910, 2 вер.); *І мне з пахам прынадным квят**о**ў // Ветры цёплыя ўцехай падзьмуць*. Параўнайма ў М. Лужаніна: *Папросяцца ў хату да нас дзерав**а***; *І цяпер, б'ючы паклоны // Сінім дзерав**а**м… // Тую восень і дзяўчыну // Ўспамінаю я*; Хв. Чарнышэвіча: *Кругом квят**ы***.

3. Няўстойлівасьць лексычных нормаў: *паўціна / павуціна*. У Ц. Гартнага: *дзяроў / дзярэў / дрэў*. У гэтым пляне можна зьвярнуць увагу на слова *кругом* і яго адпаведнікі. У Стручка: *А кругом між травы <…> // Камялькі, // Матылькі*. У Ц. Гартнага: *І ў спакойнай прасторы кругом // Чуцен водгалас рэзьвенькіх бом*; *Сьціш пануе вакруг* («НН», 1910, 2 вер.); *І грымнуў гром наўкол-наўкруг*; *Ўкол руйнуюцца ўціску муры*. Пар. у Хв. Чарнышэвіча: *Ўвакруг краса*; *Кругом квяты*.

4. Некаторыя паралелі ў лексыцы:

***зык** Я таплюся у шопатах ліп і бяроз <…> // Ля канаў*

прыдарожных ды зыку шмялёў. У Ц. Гартнага: *Зыкі сталёвыя клёпу // Песьняй празрыстай зьвіняць*; *І зыкі выцісьне дзяўчына на гітары*.

хваёвы *Ў пералеску хваёвым пахіл: // Я к бярозцы стамлёны прыпаў галавой*. У Ц. Гартнага: *Хваёвы бор, як вострым клінам, // Сьцяной зялёнаю стаіць*; *Руйнавалі нашчэнт, нішчылі // Хаты, поле і хвойнікі*.

чуць *[Павук] На чуць бачанай нітцы вісіць*. У Ц. Гартнага: *Дзесь здалёк — чуць даходзіць ка мне ў шуме хвой <...> // Рух <...> жыцьця*.

чар *Сонным вокам лаўлю // Цені хмар // І абшар // І Случанкі-ракі дзіўны чар*. У Ц. Гартнага: *Хто маляр // Яе чар, Строю, пекнаты?*

З усіх пералічаных маркераў першыя два дазваляюць гаварыць, амаль дакладна, пра капыльска-слуцкае паходжаньне аўтара. Рэшта пацьвярджаюць, што верш «Стэп» запраўды *можа* належаць Гартнаму, але рабіць на падставе іх нейкія канчальныя высновы рызыкоўна, бо падобныя словы ўжывалі вельмі многія нашаніўцы.

ТЭКСТАЛЯГІЧНЫЯ ПАРАЛЕЛІ

Вось жа, усё сказанае вышэй, ні паасобку, ні нават у суме, не дае пацьверджаньня аўтарства Цішкі Гартнага. Мы маем толькі ўскосныя довады. Цяпер, у канчальнай аргумэнтацыі, павінны злучыцца ў адно цэлае *паэтыка*, *матывы* і *мова*. Верш, дзе лучацца ўсе разгледжаныя фактары, Цішка Гартны напісаў у 1922 годзе, будучы ў Бэрліне. Тое, што падобнасьць гэтая не выпадковая, сваім парадкам пацьвярджае больш раньні расейскамоўны тэкст Гартнага і, мяркую, яшчэ ранейшы, беларускамоўны.

Паралель першая (1922 г.):

Я стаю, заварожаны шумам лясным,
І гайдаюся ў рыхт па кірунку дзяроў,
Што схіляюцца нізка пад ветраны ўздым

Да абголеных шчэ нізкаросłых кустоў.
.....
Я стаю, заварожан шумлівасьцю дрэў,
Пазіраю уверх, дзе плывуць аблака...

Паралель другая (1912 г.):

Лишь только фабричный гудок прогудит —
Из корпусов мрачных уйти я спешу
За город, где бор молчаливо стоит —
Здесь воздухом свежим я жадно дышу.

Здесь взор мой ласкает открытый простор,
И синяя даль так зовёт и манит!..
О чём-то вздыхает задумчивый бор,
О чём-то своём затаённо молчит.

Паралель трэцяя (1909 г.):

Кавыляць па лагох я люблю,
Песьні пець ды на неба глядзець.
Чуткім вухам я шумы лаўлю,
Шумы ночак і дзён
Са ўсіх чыста старон. («НН», 1909, 4 чэрв.)

Апошні ўрывак узяты не з арыгінальнага тэксту, а зь перакладу расейскага паэта Аляксандра Фёдарава (1868—1949). Пераклад публікаваўся ў «Нашай Ніве» пад крыптанімам *Т. Г.* Біябібліяграфічны слоўнік «Беларускія пісьменьнікі» прыпісвае яго Якубу Коласу — *Тарасу Гушчы*, праўда, з пазнакаю «аўтарства спрэчнае». Цяпер, думаю, ёсьць куды больш падстаў расшыфраваць крыптанім *Т. Г.* як *Цішка Гартны*, тым больш, што Канстанцін Міцкевіч псэўданімам *Тарас Гушча* падпісваў ня вершы, а апавяданьні.

Пад канец яшчэ раз вернемся да фразы: *І Случанкі-ракі дзіўны чар*. Цішка Гартны ў вершах ня раз зьвяртаўся да канкрэтных геаграфічных найменьняў свайго краю. Прыкладам, у разьдзеле «Слуцак» зь нізкі «Чырвоная радзіма» ён піша:

Прытуліўся, прылёг пад садамі,

Новых дзён ды вякамі ждучы.
А цяпер вось старымі дамамі
Мову іншую кажа Случы.

«Украінская стыхія — стэп, у нас наша стыхія — лес і балота», — разважае Максім Багдановіч ў успамінах Вацлава Ластоўскага. І запраўды, хіба што ніхто зь беларускіх паэтаў не пісаў пра Беларусь, як пра стэп, апрача... Цішкі Гартнага. У той жа нізцы, у разьдзеле «Случчына», мы знаходзім гэтаму тлумачэньні:

Распасьцерлася раўнінаю,
Стройнаю распласталася...
Беларускаю Ўкраінаю
Нездарма ўсё ж назвалася.

Цяпер падсумуем факты: 1) аўтар «Стэпу» паходзіў з Случчыны, 2) ён добра, хоць, відаць, інтуіцыйна, валодаў вершам, 3) быў старэйшы за маладнякоўскае пакаленьне, 4) кандыдатаў на аўтарства налічваюцца адзінкі і, нарэшце, 5) толькі ў тэкстах Гартнага можна знайсьці амаль даслоўныя паралелі, дзе супадаюць і матывы, і мова, і вершаваньне. Хто, калі ня ён? Пакінем гэтае пытаньне адкрытым...

А завяршыць сваю нататку мне хацелася б яшчэ адною цытатаю з успамінаў Міколы Хведаровіча, дзе апісваецца Случчына ў час аднаго з наведваньняў гарбара-паэта, ці не апошняга? У найскладанейшыя часы грамадзянскай вайны, сталінскіх рэпрэсіяў ён часта наведваў родныя мясьціны і, пэўна ж, натхняўся любымі краявідамі. Пэйзаж у успамінах Хведаровіча такі самы, што і ў вершы «Стэп», але апісаны ўжо іншым чалавекам і таму іншы: «Дарога вілася паміж густых дуброў, але часта насустрач нам нечакана выбягаў малады сасоньнік. На шырокіх прагалах палёў шаўкавістым дываном перакатваліся, як хвалі, ураджайныя нівы. На поймішчы ракі Случ, якая вужакай выкручвалася паміж пералескаў, цьвілі ўсімі колерамі беларускага лета багатыя лугі».
[image]
[image]

[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [**mk**]. Абнаўленьне [**czyk**].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/12/12**
[image]

Да гісторыі
Беларускай
Сацыялістычнай
Грамады:
агляд
крыніцаў

Заканчэньне. Пачатак у №4, №5.

V

У чацьвёртым – самым вялікім – разьдзеле будучай кнігі «БСГ у дакумэнтах і матэрыялах» разьмесьцяцца ўспаміны і артыкулы (або іх фрагмэнты), прысьвечаныя гісторыі БСГ.

Усе матэрыялы будуць надрукаваныя ў храналягічнай пасьлядоўнасьці. Самы першы сярод іх – фрагмэнт артыкулу А. Луцкевіча «Национальное возрождение белорусов». Яго рукапіс захоўваецца ў Цэнтральнай бібліятэцы Літоўскай АН (Ф. 21. Спр. 336). Наверсе першае старонкі рукою А. Луцкевіча пазначана: «Slovansky Přehled». Čislo 4, Leden, Ročnik XI, 1909». Пра гэтую публікацыю пісаў Я. Журба ў «Лістах з Украйны» (Наша Ніва. 1909. 7(20) траўня). Артыкул пад загалоўкам «Национальное возрождение белорусов» друкаваўся таксама ў «Московском еженедельнике» (1909. № 9), а пад загалоўкам «Odrodženie narodowe Białorusinow» – у часопісе «Litwa» (1909. № 4). Супастаўленьне чэскае, расейскае і польскае публікацыяў пакуль што не праведзенае. Артыкул быў, наколькі вядома, першаю спробаю А. Луцкевіча апісаць і асэнсаваць гісторыю беларускага руху пачатку XX ст. Адрозна ад артыкулу «Белорусы» (1910), у якім, можна сказаць, пытаньне аб

дзейнасьці БСГ зацямняецца, у працы, прызначанай для чэскіх чытачоў, наўпрост сьцьвярджаецца, што БСГ «работает вплоть до настоящего времени», г. зн. і ў 1909 г.

Артыкул «Белорусы», што публікаваўся ў зборніку «Формы национального движения в современных государствах» (Санкт-Пецярбург, 1910) і ў кнізе А. Луцкевіча «Да гісторыі беларускага руху», ува ўкладзеным мною зборніку таксама будзе прапаноўвацца фрагмэнтам.

З нашаніўскіх публікацыяў А. Луцкевіча нельга ня вылучыць рэпліку «Данос», надрукаваную 16 жніўня 1913 г. Гэта адказ на артыкул у газэце «Россия», якая вінаваціла «Нашу Ніву» ў рэвалюцыйнай дзейнасьці. Называючы аўтара артыкулу агентам-правакатарам, А. Луцкевіч піша, што той «стараецца абвінаваціць чыста культурную, спакойную работу «Нашай Нівы» ў «рэвалюцыу», каб яе адміністрацыя зачыніла». Палемізуючы з аўтарам даносу, Луцкевіч выкарыстоўвае недакладнасьці ў ягоным артыкуле і сам высьвятляе некаторыя моманты з гісторыі беларускага руху.

З Луцкевічавых працаў у кнігу ўвайшлі таксама ўрывак з артыкулу «Жыцьцё і праца Івана Луцкевіча» (1920), артыкул «Дваццатыя ўгодкі БРГ» (1923), праца «Дваццаціцелецьце Беларускае Сацыялістычнае Грамады» (1925), фрагмэнт артыкулу «Роля моладзі ў пачатках адраджэнскага руху» (1927), успаміны «За дваццаць пяць гадоў» (1928), тое, што засталося ад артыкулу «Да гісторыі Беларускае Рэвалюцыйнае (пасьля Сацыялістычнае) Грамады. Даты і факты» (1930-я) і фрагмэнт уласнаручных паказаньняў НКУС БССР, напісаных 30 кастрычніка 1939 г. Усе гэтыя тэксты друкаваліся з камэнтарамі ў кнізе «Да гісторыі беларускага руху».

Шмат пісаў пра гісторыю БСГ Зьміцер Жылуновіч. У задуманай кнізе нельга не зьмясьціць ягоныя публікацыі ў «Полымі»: «Два бакі беларускага руху» (1923. № 3–4), «Уступамі да Акцябра» (1923. № 5–8), «Ад кастрычніка 1917 г. да лютага 1918 г.» (1924. № 1), урыўкі з артыкулаў «Арганізацыя сіл (да гісторыі Савецкае Беларусі)» (1924. № 2) і «Беларуская інтэлігенцыя ў гістарычным аспэкце» (1926. № 6), «Беларускія сэкцыі РКП і стварэньне Беларускай Савецкай Рэспублікі» (1928. № 10) і

артыкул «Алесь Бурбіс (Рэвалюцыйная характарыстыка)» (1927. № 2). Вядома, ніяк нельга абысьціся і без артыкулу «Люты–кастрычнік у беларускім нацыянальным руху». Ён апублікаваны ў зборніку нарысаў гісторыі, эканомікі, культурнага і рэвалюцыйнага руху «Беларусь» (1924) і папярэднічае артыкулу «Ўступамі да Акцябра».

Пры публікацыі пэўных працаў З. Жылуновіча паўстае праблема: ці друкаваць іх гэтак, як у «Полымі», ці зьвесьці ў адзін артыкул? Я маю на ўвазе такія творы, як «Уступамі да Акцябра» і «Ад кастрычніка 1917 г. да лютага 1918 г.». Як вядома, артыкул «Уступамі да Акцябра» падзелены на дзьве часткі, адна зь якіх мае падзагаловак «Да гісторыі Савецкае Беларусі», а другая – «Матар'ялы да гісторыі Савецкай Беларусі». Артыкул жа «Ад кастрычніка 1917 г. да лютага 1918 г.» пазначаны як трэцяя частка і таксама мае падзагаловак «Да гісторыі Савецкае Беларусі». Агульны падзагаловак, а таксама тое, што кожная публікацыя пададзеная як частка, наводзяць на думку: перад намі разьдзелы аднае працы «Да гісторыі Савецкае Беларусі». Калі гэтыя творы зводзіць у адзін, то першыя дзьве часткі павінны атрымаць падзагаловак «Уступамі да Акцябра», а трэцяя – «Ад кастрычніка 1917 г. да лютага 1918 г.». Натуральна, што іх трэба друкаваць у цесным суседзтве з артыкулам «Люты–кастрычнік у беларускім нацыянальным руху», «Арганізацыя сіл (да гісторыі Савецкае Беларусі)» і «Беларускія сэкцыі РКП і стварэньне Беларускай Савецкай Рэспублікі».

Складальнік зборніка «БСГ у дакумэнтах і матэрыялах» ня можа абмінуць увагаю і іншыя публікацыі З. Жылуновіча. Я маю на ўвазе ягоны выступ на Акадэмічнай канфэрэнцыі 1926 г. у дыскусіі па дакладзе Максіма Гарэцкага. Гэты пісьменьнік, публіцыст і гісторык літаратуры апынуўся ў шэрагах тых, хто ўбачыў у «Нашай Ніве» шавінізм. Праўда, самога слова ў тэксьце ягонага дакладу на канфэрэнцыі няма, але выступ З. Жылуновіча сьведчыць: яно прагучала. Востра крытыкуючы М. Гарэцкага, З. Жылуновіч, у прыватнасьці, сказаў: «Няхай ён [Гарэцкі] не забывае, што кіраўніцтва «Нашаю Ніваю» цалком знаходзілася ў руках сацыял-дэмакратаў, як: А. Навіна, Ян Луцкевіч, А. Бурбіс і інш., і вялікая большасьць пісьменьнікаў

нашаніўцаў таксама належалі да гэтае партыі, як-то: Ц. Гартны, С. Палуян, Ф. Шантыр, А. Гурло, Х. Чарнушэвіч, Я. Лёсік і да іншых сацыялістычных партый – А. Гарун, Л. Лобік, Л. Гмырак і інш. Як-то магло стацца, як бы яны былі шавіністамі ў час, калі ўвесь беларускі рух укладаўся выключна ў рамкі рэвалюцыйнасьці. Гэта тайна тав. М. Гарэцкага...»[1].

Ня зможа гісторык БСГ прамінуць і ўспамінаў З. Жылуновіча «Дваццаць гадоў назад», у якіх аўтар апавядае пра сяброўскае асабістае знаёмства зь сябрамі рэдакцыі «Нашай Ніўы». Менавіта словы пра тое, што яго «цягнула да Антона Луцкевіча», што ў гутарках з Луцкевічам «удалося пераканацца, што ён сьвядомы марксісты», і паслужылі зачэпкаю для палітычнага перасьледу З. Жылуновіча. Прыгадалі З. Жылуновічу і ягоныя словы на Акадэмічнай канфэрэнцыі

[1] Цэнтральны архіў грамадскіх аб'яднанняў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1. Воп. 1. Адз. захав. 1. Арк. 14–21 зваротнага боку.

У электроннай вэрсіі кнігі «БСГ у дакумэнтах і матэрыялах» рэпрэзэнтаваныя таксама і іншыя аўтары. Гэта Алесь Бурбіс з «Кароткім аглядам беларускага нацыянальна-рэвалюцыйнага руху»[2], Зігмас Ангарэціс з тэндэнцыйным артыкулам «Беларуска Соціалистычна Громада» в 1905–1906 гг. (По архивам КП Литвы)»[3] (публікуецца ўрывак), Яўген Хлябцэвіч з успамінамі «Цётка»[4] (таксама друкуецца ўрывак) і Аляксандар Цвікевіч з артыкулам «Да гісторыі БСГ»[5].

[2] Вольныя Беларускія Таварыствы // Дзесятка. 1924. № 3.
[3] Вперед. 1923. № 2–3.
[4] Полымя. 1924. № 3.
[5] Полымя. 1923. № 5.

Пазыцыі пункам Фэлікс Стацкевіч тройчы зьвяртаўся да гісторыі БСГ: у 17 кастрычніка 1923 г. ён апублікаваў у «Беларускім слоне» артыкул «Успаміны і думкі», а ў 1937 г. – успаміны «Зь мінуўшчыны беларускага руху»[6]. У апошнія гады жыцьця Ф. Стацкевіч напісаў свае «Ўспаміны». Яны захоўваюцца ў БДАМЛіМ (Ф. 55/4. Воп. 1. Адз. захав. 1). Тут упершыню друкуюцца ўрыўкі зь іх (выкарыстаныя арк. 31–60).

[6] Беларускі летапіс. 1937. № 6–9.

7 жніўня 1990 г. у газэце «Літаратура і мастацтва» надрукаваны тэкст Ф. Стацкевіча «З маіх успамінаў» з прадмоваю Вячаслава Адамчыка. Паміж тэкстам зь «ЛіМу» і пэўнаю часткаю «Ўспамінаў», што захоўваюцца ў БДАМЛіМ, ёсьць падабенства, але існуюць і адрозьненьні. На жаль, у тыднёвіку не паведамляецца, паводле якога арыгіналу друкуецца фрагмэнт і дзе захоўваецца гэты арыгінал.

Акадэмічная канфэрэнцыя па рэформе беларускага правапісу і палітычнага перасьледу 3. Жылуновіча 21 сьнежня 1926 г. / Пад рэд. С. Некрашэвіча і У. Ігнатоўскага. Менск, 1927. С. 373.

Не пашанцавала арыгіналу ўспамінаў А. Бурбіса «Колькі слоў аб беларускім тэатры і хоры»: ён недзе зьнік. Гэтыя ўспаміны цікавыя ня толькі тым, як дзеячы БСГ спрычыніліся да стварэньня беларускага прафэсійнага тэатру, але й інфармацыяй, што першая беларуская тэатральная пастаноўка ў Пятроўшчыне (цяпер частка Менску)[7] «мела на мэце прыдбаць крыху грошай дзеля працы 1-га Краёвага Камітэту Беларускай Сацыялістычнай Грамады й на рэвалюцыйную агітацыю на вёсцы». На шчасьце, дасьледчык Рыгор Семашкевіч у свой час перадрукаваў гэтыя ўспаміны на машынцы, і я магу імі пакарыстацца, за што вялікі дзякуй Рыгоравай жонцы Натальлі.

Р. Семашкевіч у сваім бліскучым эсэ «Сьвітка Буйніцкага паведамляе, што «ў падпольных гуртках Вільні» А. Бурбіс меў мянушку «Рыжы»[8]. І ні слова – пра крыніцу інфармацыі. Потым дасьледчык піша, як А. Бурбіс, апавядаючы аб рэвалюцыйных падзеях 1905–1906 гг., казаў: «Некалісь мы зь Цёткай Пашкевічанкай хадзілі па менскіх фабрыках і заводах, заклікаючы ўсіх работнікаў да забастовак»[9]. Але каму ён казаў пра гэта, з тэксту даведацца нельга, і дасюль зь іншых крыніц такіх гэтыя вусныя ўспаміны А. Бурбіса нічога высьветліць не ўдалося.

Няшмат засталося ад некаторых машынапісаў і рукапісаў, што дачакаліся нашага часу. Вельмі не пашанцавала «Кароткаму нарысу гісторыі беларускага рэвалюцыйнага руху» А. Бурбіса: ад машынапісу гэтае каштоўнае працы засталіся толькі два аркушы (19 і 20), а рукапіс (26 аркушаў) зьнік. Цёткі Бурбіс і Пашкевічанкі ў Менску, як і ў 1905 г., не было. Праца ў Менску, такім чынам, адбылася ў 1906 г. Дакладнае ж месца знаходжаньне ў той год у Менску Цёткі зьвестак няма.

Чым растлумачыць гэтыя страты? Нядбайнасьцю архівістаў-музэйнікаў? Ці наўмысным зьнішчэньнем дакумэнтаў? Што яно адбывалася, мне падказвае лёс архіву БСГ і пратаколаў сходаў Петраградзкай арганізацыі партыі, на якія спасылаецца З. Жылуновіч, у прыватнасьці, у сваіх артыкулах «Ад кастрычніка 1917 г. да лютага 1918 г.» і «Арганізацыя сіл». Дзе падзеліся лісты А. Бурбіса, на якія, зноў жа, спасылаецца З. Жылуновіч?

7. Сапраўдная назва невядомая. Мяркуем, што Бурбіс меў на ўвазе Цэнтральную друкарню, якая ў 1906 г. была ў Менску.

8. Гл.: Семашкевіч Р. Вышываванка рэвалюцыі // Маскоўскі летапісец. 1982. С. 16.

9. Гл.: Семашкевіч Р. Вышываванка рэвалюцыі // Маскоўскі летапісец. 1982. С. 16.

Сьпішам гэтыя страты на акупанта? Ці ёсьць надзея, што дакумэнты захоўваюцца ў справах ГБ і некалі ўбачаць сьвет?

Публікацыі чакаюць і тыя крыніцы, датычныя БРГ і БСГ, што захоўваюцца ў архівах Польшчы і Літвы. А яны там ёсьць. І на іх спасылаецца, у прыватнасьці, Ю. Туронак.

Нарэшце, трэба падумаць пра перадрук асноўных матэрыялаў зь цяжкадасяжнае цяпер партыйнае газэты «Грамада» і з газэты «Hramadzianin».

VI

Два апошнія разьдзелы падрыхтаванай кнігі «БСГ у дакумэнтах і матэрыялах» складаюць біяграма і нэкралёгі.

Біяграма захавалася адна, і ўтрымлівае яна зьвесткі пра жыцьцё А. Бурбіса. Былі пэўныя падставы думаць, што гэты тэкст А. Луцкевіч пісаў для міжваеннае «Літоўскае энцыкляпэдыі». Аднак энцыкляпэдычны артыкул пра Бурбіса адрозьніваецца ад Луцкевічавага рукапісу. Ня выключана, што біяграму адрэдагавалі ў адпаведнасьці з вымогамі «Літоўскае энцыкляпэдыі».

Антон Луцкевіч таксама склаў шэраг нэкралёгаў. Першы зь іх – «Памяці Вінцука Тубіса (У гадаўшчыну сьмерці)» – надрукаваны ў «Нашай Ніве» 15 (28) снежня 1911 г.

Магчыма, спрэчным было б зьмяшчэньне ў кнізе «БСГ у дакумэнтах і матэрыялах» нэкралёгу «Памяці Юзюка Пашкевіча»[10], але згадаем, што менавіта ў кватэры братоў Пашкевічаў праходзіла чэрвеньская партыйная канфэрэнцыя 1906 г. І можна зрабіць выснову, што Ю. Пашкевіч быў калі ня сябрам БСГ, дык яе сымпатыкам.

Празь няпоўны год пасьля брата гэты сьвет пакінула Цётка. Яна памяці А. Луцкевіч прысьвяціў два нэкралёгі: «Алёйзія Пашкевіч-Кейрысовая»[11] і «Памяці Цёткі (У гадаўшчыну сьмерці)»[12].

[10] Гл.: Наша Ніва. 1915. 21 лютага.

[11] Гл.: Homan. 1916. 15 лютага.

[12] Партыю ён уваходзіў з 1917 г. Максім Багдановіч. Да гэтага паэта ў А. Луцкевіча быў асобны верш.

[13] Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Расіі ўзнікла вялікая неразбярыха, і «Гамон» выйшаў толькі ўвосень 1917 г. А. Луцкевіч пазней у сваіх успамінах пісаў, што верш «Памяці А. Бурбіса» быў надрукаваны ў «Гамоне» 9 кастрычніка 1917 г. У 1918 г. партыя і беларуская культура страцілі яшчэ аднаго творцу. Яго памяці А. Луцкевіч прысьвяціў нэкралёг «Каганец (Пасьмертны ўспамін)»[13].

[14] Гэты беларускі ўрад 1922 г. Адразу пасля ўтварэння Літвы ў ліпені 1918 г. Антанта ўхваліла ўтварэнне Беларускай Народнай Рэспублікі, якая, аднак, не была прызнана ні Літвой, ні Польшчай, ні Савецкай Расіяй.

[15] Гэта Нэкралёг «Памяці А. Бурбіса» надрукаваны ў «Гамоне» 9 кастрычніка 1917 г. У 1918 г. партыя і беларуская культура страцілі яшчэ аднаго творцу. Яго памяці А. Луцкевіч прысьвяціў нэкралёг «Каганец (Пасьмертны ўспамін)»[13].

Апошні зь вядомых мне нэкралёгаў, напісаных А. Луцкевічам і прысьвечаных таварышам па партыі, – «Аляксандар Бурбіс»[14].

А. Бурбіса ўшанавала ў нэкралёгу «Памяці А. Бурбіса» і вядомая сацыялістка-рэвалюцыянэрка Палута Бадунова[15].

* * *

Такія крыніцы да будучай гісторыі БСГ, вядомыя на сёньняшні дзень. Зразумела, гэта не азначае, што пошук ня трэба працягваць. Неабходна працаваць у віленскіх архівах, працаваць з дакумэнтамі, што засталіся ад царскай ахранкі і царскіх судоў, якія судзілі дзеячаў БСГ. Як я ўжо адзначаў у сувязі зь невядомым лёсам архіву З. Жылуновіча, многае можа захоўвацца ў архівах ГБ. Нарэшце, ніхто не дасьледаваў менскіх, піцерскіх і маскоўскіх газэтаў і часопісаў 1905–1907 і 1917–1918 гг. Але нават наяўнага матэрыялу, мусіць, дастаткова, каб нехта з гісторыкаў пачаў пісаць гісторыю БСГ з новае старонкі – адкінуўшы напластаваньні, нагрувашчаныя бальшавіцкімі «байцамі ідэалягічнага фронту» і вярнуўшыся да першакрыніцаў.

❑

Дадатак

Фэлікс СТАЦКЕВІЧ
УСПАМІНЫ[16]

Друкуюцца фрагмэнты.

У Шчучыне бліжэйшы надзор за маёй асобай меў станавы прыстаў, па паходжаньню остзэйскі барон, ажаніўшыся з польскай Цзецкай. Ён часта вучыліся ў маёй маці па яе праграме. Зразумела, што надзор гэты не сьцясьняў маіх рухаў, прынамсі, у будзённай мне работы. Мне ўжо было 17 гадоў, і я ўдзельнічаў у нелегальных гуртках. Пасьля 1901 г. Пасьля 1901 г. Зразумела, што гэты надзор не перашкаджаў мне ў

Гурток студэнтаў-беларусаў у Пецярбурзе быў невялікі, зь іх ліку я ўпомніў толькі братоў Луцкевічаў, Іваноўскага і Малецкага. Тагды ж і заснавалася Беларуская Рэвалюцыйная Грамада, якая пазьней ператварылася ў Беларускую Сацыялістычную Грамаду.

Вясной 1903 г. я быў прымушаны дзеля заработку выехаць на гідратэхнічныя работы на прыладаскіх каналах і прабыў там да вясны 1905 г., перарваўшы сувязь зь беларускім рухам.

Вараціўшыся ў Пецярбург на вясну 1905 г., я атрымаў ад таварышаў з Грамады прапанову паехаць у Кракаў на друкарскую навуку і, вярнуўшыся, працаваць у партыйнай друкарні на працягу паўтара году. Атрымаўшы на дарогу 90 руб., пры помачы пэпээсаўца д-ра Міхайлоўскага я пераехаў у г. Чанстахове расейска-нямецкую граніцу па пропуску на выдуманае прозьвішча, якія выдаваліся пагранічным жыхарам праз гмінныя ўправы на двухтыднёвы побыт за граніцай.

У Кракаве на працягу аднаго месяца я работаў як наборшчык у ўнівэрсытэцкай друкарні. Там жа я пазнаёміўся з работай на ручной друкарскай машыне-«амэрыканцы».

Назад я варочаўся ўжо іншым шляхам: недалёка ад Кракава пехатой цераз аўстрыяцка-расейскую граніцу ўначы з кантрабандыстамі сьпірту.

У часе кароткага побыту ў бацькоў прыехаў да мяне ў Шчучын Бурбіс, зь якім я дагэтуль ня быў знаёмы. Цераз пасрэдзтва мясцовага Бунду позным вечарам быў скліканы за мястэчкам сход, на якім прысутнічала некалькі батракоў князёўскага маёнтку[17] і некалькі чалавек бундаўскай моладзі. Прамаўляў, галоўным чынам, Бурбіс. Ён зьдзівіў мяне талентам прамоўцы-агітатара. Тым болей, што сам ён быў хлапчук 17–18 лет[18], ня скончыўшы рэальнага вучылішча, па паходжаньню сын чыноўніка інтэнданцтва ваеннага ведамства, неказісты на від.

У Вільні, гдзе ўжо пачаўся ўздым рэвалюцыйнага руху ў сувязі з чыгуначнай забастоўкай, зь ліку таварышаў я застаў толькі Цётку і Бурбіса, іншыя, пераважна студэнты пецярбургскіх вышэйшых вучылішч, яшчэ не прыехалі ў Вільню.

[17] Гаворка пра толькі шчучынскі маёнтак

У Гарадзкой Думе відную ролю гуляў радны Ўмястоўскіх, бацька Пранука і Вітольда. У яго доме па Варшаўскаму перадзвоньлі адбываліся нашы сходкі, але ў масавай рабоце ён не прымаў удзелу.

Пасьля разгону дэманстрацыі[19] і напярэдадні паховін вучняў Луцкевіч пша, што зьезд адбыўся ўлетку 1906 г. тамсама.

Акрамя таго, была выпушчана ўлетку «да салдатаў». Вэрсію аўтар, пэўна, называе Каролькю (Каралінку) Ушкевічанку.

Пасьля разгону дэманстрацыі[19] і напярэдадні паховін вучняў Луцкевіч пша, што зьезд адбыўся ўлетку 1906 г. тамсама.

Акрамя таго, была выпушчана ўлетка

канторы Ваявудзкага. Кожную раніцу прыходзіла нанятая жанчына для ўборкі памешканьня. Час быў гарачы, работы многа, прыходзілася абодвым адначасна рабіць набор, працаваць да познага, а часам і ўначы. Побач з адозвамі друкаваліся і рэвалюцыйныя вершы Цёткі, як

На ўсход сонца красна неба, –
Нас ня дзівіць – так і трэба.
. . . . . .
Народ чуе голас зь неба,
Што цара павесіць трэба![24]

Пэпээсаўцы выдалі нават некалькі адозваў на яўрэйскай мове[25].

Друкарня мела «амэрыканку». Тут і прыдалася мая навука ў Кракаве.

Пры націсканьні ручкі машыны ў час адбіваньня друкаў атрымліваўся штуршок, які выклікаў пэўны гук і ўстрас падлогі. Каб аслабіць гэта, пад табурэтку, на якой стаяла «амэрыканка», падкладалася кошма, аднак зусім ухіліць гэтыя зьявішчы нельга было, і, відаць, яны выклікалі пэўнае зацікаўленьне кватарантаў памешканьня, знаходзячагася пад намі. Да таго ж падчас выезду майго таварыша ў Варшаву аднойчы пасьля работы па набору шрыфту ўначы я забыўся схаваць у камоду наборную касу. Ня ведаю, якое гэта зрабіла ўражаньне на нашай уборшчыцы, хаця пасьля гэтага здарэньня друкарня трывала яшчэ больш двух тыдняў, але друкарні пагражала небясьпека. Усё гэта змусіла да ліквідацыі яе, што і было памысна праведзена пры помачы той жа канторы Ваявудзкага ў канцы сьнежня. Усяго працаваў я ў гэтай друкарні два месяцы.

[24] Вёрш Цёткі «Хрэст на свабоду». У «Выбраных творах» паэткі (2001) апошні радок у іншай рэдакцыі: *Што больш цара не патрэба.*

[25] Далей выкасаваныя словы «дзеля чаго». Гаворка, мабыць, павінна была ісьці пра наборшчыка, які размаўляў толькі на ідышы. Пра яго ёсьць зьвесткі ўва ўспамінах аўтара «З мінулага беларускага руху»: «Колькі дзён працаваў у нас і наборшчык габрэй, які набіраў пэпээсаўскія адозвы ў жаргоне (так называлі ідыш. – **А. С.**)».

Мой таварыш-друкар, які паказваў мне, як трэба кідаць бомбы, пазьней загінуў сам, кідаючы сапраўдную бомбу пры нейкім замаху ў Польшчы.

У Шчучыне і яго ваколіцы актыўным работнікам тады і пазьней быў вучыцель Шчучынскай пачаткавай школы Ненартовіч.

Значную помач у пашырэньні адозваў на рынках і інш. аказваў яму малодшы брат, хлапчук 12-гадовага веку.

У студзені і лютым 1906 г. у Вільні падгатаўлялась тэхніка для собскай друкарні пад назовам «Аганёк». Гэтая тэхніка была куды прасьцейшая – яе складалі: зялезная рама, у якую заціскаўся набраны шрыфт, з рэльсам па даўжэйшых бакох, драўляны вал, дапасаваны да рэльсаў, і гумовы ролік для намазываньня набору фарбай. Прадукцыйнасьць далёка меншая. У той час як на «амэрыканцы» за дзень можна было зрабіць звыш 2 тыс. адбітак, на гэтай друкарні найбольш 400. Акурат 1 сакавіка я паехаў у Менск, застанавіўшыся на кватэры Лянкоўскага, па мянюшцы Япончык. Праз пару дзён я знайшоў кватэру на Нізкім рынку па Тарговай вул., 40, якая фактычна прадстаўляла адзін пакой, разьбіты перагародкамі на кухонку і тры пакойчыкамі[26], зь якіх адзін сьляпы. Перабраўся я толькі са сваімі асабістымі рэчамі, крэсьлярскай дошкай і зьвіткамі плянаў. Гаспадаром я зарэкамэндаваўся як тэхнік, працуючы пры чыгунцы. Выйшаўшы ў горад, я пакінуў чамадан незачынены, спадзеючыся, што яны зацікавяцца маімі рэчамі.

Друкарскую тэхніку я перавёз толькі праз пару тыдняў. Так у Абсталяваньнем друкарні займаліся – Лянкоўскі, Зязюлькін, Браніслаў, пазьней адзін з пэпээсаўскіх лідэраў, і Віктар Зелязей. Апошні, здаецца, былы с.-р., быў бібліятэкарам гарадзкой Пушкінскай бібліятэкі, карэнны жыхар Менску. Бацька яго калісь быў мяшчанскім старастам. Прозьвішча ягонай сям'і дало назоў Зелязееўшчыне – частцы прыгараду ў раёне Кальварыйскага касьцёлу. Касу для шрыфту давялося заказаць мясцоваму надзейнаму столяру. Празь нейкі час дачка ўласьніка дому прызналася: «Мы думалі, што вы афішкі друкуеце». Уласьнік дома, яўрэй, сам нелегальна пражываў у сваім доме, маючы судовую справу за ўмысны падпал свайго дому. Пад маёй кватэрай знаходзілась чайная, якая гандлявала гарэлкай. Уласьнік чайной трымаў у цёмным пакойчыку маёй кватэры запас гарэлкі. Зь сям'ёй домаўласьніка я падтрымліваў добрыя адносіны. Езьдзіў у Заслаў на шлюб аднэй із дачок гаспадара. Аднойчы быў на вясельлі іхных знаёмых. Каб падтрымліваць сваю «благонадежность», кожную нядзелю я хадзіў у касьцёл і выстойваў суму (урачыстую імшу).

[26] У русацкіе.

Пачаткова пільнаваліся кансьпірацыі, але пазьней так усё часьцей спатыкаўся з таварышамі.

Арганізацыйна Грамада была падзелена на два Краёвыя Камітэты: 1-шы ў Вільні і 2-гі ў Менску[27].

У склад II Камітэту ўваходзілі: Бурбіс, Віктар Зелязей, Браніслаў Зяменцкі, пазьней адзін зь лідэраў ППС у Польскім Сойме, адвакат Антон Шабуня, Уладзімер Самойла, пазьнейшым літаратурныі псэўдонімам Віс, Лянкоўскі, студэнт факультэту ўсходніх моваў, Скандракоў, былы афіцэр, Яноўская (мянюшка Параска), дачка менскага доктара, выйшаўшая пазьней замуж за Скандракова, паэт Кастравіцкі з псэўдонімам Карусь Каганец, Міхась Кардэцкі, адзінаўтробны брат Кастравіцкага, і можа яшчэ я каго прамінуў. Зь іншых актыўных сяброў Грамады, зь якімі мне даводзілась стыкацца, былі: дачка сьвяшчэньніка, па прозьвішчу, здаецца, Красільнікава, брат Віктара Зелязея Зыгмусь, заводзкі рабочы, сьлесар, сястра яго, быўшая лучніком друкарні, і маці Зелязеяў. На вёсцы выдатны працаўнік быў Гула, сам сялянскага паходжаньня.

[27] Было ў Коўні і за мяжой.

Сябра Грамады Станіслаў Кукель зь мянюшкай Апанас пражываў тады стала ў мястэчку Івянец, вядомым вырабам кахляў, дзе ён меў школку звыш дзясятка хлапцоў і дзяўчат, якіх падгатаўляў да экзамэну за чатыры клясы гімназіі. Затое я бываў частым госьцем у сям'і яго маці ўдавы, пражываўшай у Менску з малалетнімі дочкамі.

Спатыкаўся з Брантам, аб якім я чуў, што ён прымаў удзел у вызваленьні з турмы Веры Засуліч. У 1929 г. я спаткаўся зь ім у Вільні на паседжаньні акружнога суда, гдзе ён быў старшынёй судзейскага камплекту, а я абаронцам абвінавачанага ў прыналежнасьці да КПЗБ. Ён, прыпомніўшы наша знаёмства, пусьціўся ў прыватную гутарку, амаль не пытаючы аб маім здароўі.

На кватэры Самойлы, які выдаваў першы зборнік Купалы «Жалейка»[28], я адзін раз спаткаўся зь Янкай Купалам, ён выглядаў вясковым хлапчуком гадоў 18.

[28] Уладзімер Самойла меў намер

Зь іншымі таварышамі пры ўмовах пэўнай канспірацыі ён
давялось спатыкацца або не засталося аб іх памяці.

Да ліку найбольш актыўных сяброў Грамады належаў Бурбіс.
Ён арганізаваў адзін з буйнейшых у Менску прафсаюзаў
шавецкіх чаляднікаў, а таксама саюз цырульнікаў, які складаўся
амаль выключна зь яўрэяў. Прымушаны пакінуць Менск і
перайшоўшы на працу на вёсцы, ён прымаў удзел у арганізацыі
забастовак батракоў і сялян пры работах у маёнтках, якія былі
праведзены летам 1906 году ў Меншчыне ў шырокіх маштабах і
дабіваліся значнага посьпеху ў сваіх дамаганьнях.

Пад восень 1906 г. ён быў арыштаваны[29] пасьля разгрому
манапольке. З турмы ён высылаў таварышам даўжэзныя
інструкцыі аб працы ў прафсаюзах.

Пазьней я спаткаўся зь ім у 1919 годзе ў Бабруйску. Ён
працаваў тады па ліквідацыі прыватных маёнткаў і быў ужо
ажаніўшыся. Больш ужо я нічога аб ім ня чуў.

Праца друкарні складалася з выпуску адозваў палітычнага
характару, першамайскіх, у справах прафсаюзных,
фармуліроўцы эканамічных дамаганьняў, у прыватнасьці,
працаўнікоў вёскі, падчас забастовак на Меншчыне ў 1906
годзе і інш. Між іншым друкаваліся рэвалюцыйныя вершы
Каганца, Выбарская адозва дэпутатаў Дзяржаўнай Думы[30].

Пры рэжыме сталыпінскіх галстухаў[31] заўважыўся адыход ад
партыі як спачуваючых, падтрымліваючых яе матэрыяльна, так і
актыўных работнікаў. Дайшло да таго, што ў расклейшчыкі
першамайскай адозвы 1907 г. прыйшлось прымаць адведзеных,
рызыкуючы правалам друкарскай тэхнікі. У ноч на 1 траўня
ўтрох зь Віктарам Зелязеем і Красільнікавай расклеіць
адозвы, здаецца, на Траецкай гарэ: адзін намазваў сьценку
клеем, другі наклейваў адозву, а трэці быў караульным.

З грашовымі сродкамі таксама было ўжо цяжка. Прыйшлося

аднак кніжнае таварыства «Мінерва», ня маючы патрэбных сродкаў, перадало рукапіс у суполку «Загляне сонца і ў наша ваконца».

[29] А. Бурбіса арыштавалі 24 жніўня 1906 г.

[30] Гаворка ідзе пра зборнік «Народу ад народнае», выдадзены ў Выбаргу

шукаць сродкаў у экспрапрыяцыі. Разам зь нейкай групай анархістаў летам 1907 г. уначы вёрст за 15 ад горада зроблены напад на зборшчыка вінных манапольных крамаў. Нашы абапал дарогі стралялі ў коней. Зборшчык стрэлiў, здаецца, адзін раз. Пры страляніне зборшчык застаўся цэлы, адзін зь сяброў Грамады, былы паштовы ўрадовец, якога не прыпомню, быў ранены ў нагу, магчыма нават кулей сваіх жа.

Нейкі селянін пад пагрозай рэвальвэра давёз раненага да гораду, магчыма, разам з другім сябрам нападу. У Менску ранены дабраўся, ці яго давёў хто з учасьнікаў нападу, да прыватнай лячэбніцы доктара яўрэя, прозьвішча якога таксама не прыпомню. Там яму зрабілі перавязку і палажылі ў лячэбніцы. Але доктар, прачытаўшы ў газэце аб нападзе, спалохаўся і выправіў раненага на вуліцу. Ранены дабраўся да кватэры Шабуні, у якога ён працаваў за сакратара. Шабуня ў той час быў выехаўшы на вёску. Даведаўшыся аб гэтым, мы зь Зелязеем і Кандыгіным выдумалі нейкую хітрасьць, каб выкрасьці раненага. Сяджу я ў Кандыгіна, прыходзіць Зелязей і кажа, што ён ведае, дзе ранены, і што ён ідзе за ім. Кандыгін, пачуўшы гэта, выскокнуў з-за стала і пабег за намі. Мы ўсе трое выйшлі на Турэмную вуліцу. Крыху пазьней мы выйшлі на вуліцу быццам п’яная кампанія і паклікалі возьніка везьці на Навакрасную вуліцу, гдзе месьцілісь публічныя дамы. Дарогай мы ўвесь час разыгрывалі п’яных. На Навакраснай, адпусьціўшы возьніка, мы правялі раненага вакольнай дарогай на кватэру Зелязея, якая знаходзілась на глухой акраіннай вуліцы. Для лячэньня раненага прыйшлось везьці аж зь Ліды доктара Кастравіцкага, брата Каганца. На кватэры Зелязея ранены прабыў пару тыдняў, і калі ён троху паправіўся, яго адправілі да Катовіча, аднаго з братоў Шабунінай жонкі, у маёнтак Берда Ігуменскага ўезду. Там ранены вылечыўся, але, дужаючыся са сваім гаспадаром, ізноў зламаў тую ж нагу. Прыйшлось ізноў яе залечваць. Зусім паздаравеўшы, ён вараціўся ў Менск да Шабуні. Гуляючы зь дзецьмі Шабуні, ён спаткаўся з гарадавым, які прыносіў да Шабуні, як адваката, судзейскія паперы. Той зьвярнуўся да яго: «Што ты тут робіш? Цябе ж шукае паліцыя. Уцякай хутчэй!» Прыйшлось яму ізноў хавацца. Празь нейкі час яго выслалі ў Амэрыку пры помачы нейкай эміграцыйнай агенту-ры.

Матар’яльна, пасьля падзелу з саюзьнікамі, экспрапрыяцыя

31 Сяджу я ў Кандыгіна, прыходзіць Зелязей і кажа, што ён ведае, дзе ранены, і што ён ідзе за ім. Кандыгін, пачуўшы гэта, выскокнуў з-за стала і пабег за намі. Мы ўсе трое выйшлі на

дала дзьвесьце рублёў.

Пры гэткіх умовах прыйшлось ліквідаваць друкарню і наогул спыніць працу. Найбольш рэвалюцыйна настроены Віктар Зелязей прапанаваў для фіналу пэўнай нядзелі ўзяць па рэвальвэру і днём страляць па паставых гарадавых. Аджа яго прапанова была адхілена.

Той жа Зелязей чамусьці намагаўся, каб Грамада была фармальна зачынена. Быў скліканы Зьезд прадстаўнікоў абодвых Краёвых і Цэнтральнага Камітэту ў Докшыцы, «заштатным» горадзе, фактычна мястэчку, значна меншым за Шчучын. Там пражываў у той час швагер Луцкевічаў, акцызьнік, прозьвішча якога ня помню, які матар'яльна падтрымліваў Грамаду.

Прадстаўнікамі ЦК і I Краёвага Камітэту былі абодвы Луцкевічы і Ўласаў, II Краёвы Камітэт прадстаўлялі мы зь Віктарам Зелязеем. Ці быў яшчэ хто ад II Камітэту, не прыпомню. На спацыры за мястэчкам адбылася пастанова аб зачыненьні Беларускай Сацыялістычнай Грамады[32].

Пазьней я даведаўся, што абодвы Зелязеі – Віктар і Зыгмунт – былі арыштаваны. У іх знайшлі склад аружжа[33]. Віктар быў сасланы на Ленскія прыіскі, дзе прымаў удзел у бунце, аб якім шмат пісалі ў газэтах[34]. Аб далейшым яго лёсе нічога ён ведаю.

У Шабуні таксама пазьней шукалі аружжа і не знайшлі, хоць яно і было захавана. Гэта быў таксама адзін з найбольш актыўных і рэвалюцыйна настроеных сяброў Грамады. У яго габінэце, апроч партрэтаў Маркса і Энгельса, вісеў партрэт Пуліхава, замахоўцы на менскага губэрнатара пасьля расстрэлу дэманстрацыі ўвосень 1905 г. Памёр ён у 1920 г. у Менску. Захварэў ён на воспу, празябіўшыся ў дарозе зь вёскі, апрануўшы пры моцным марозе бурку свайму падарожнаму кампаньёну. Пахаваны ён на магільніку, але без удзелу духавенства. Труна была прывезена на простым возе. На паховінах былі толькі: адзін ізь яго братоў, жанчына, якая апошнім часам вяла яго гаспадарку, і я.

На працягу існаваньня друкарні было і некалькі небясьпечных

[32] Фактычна БСГ быў ці, аб якім сваёй дзейнасьці.

АНАТОЛЬ СІДАРЭВІЧ гісторык, даўны аўтар «ARCHE». Укладальнік кнігі «Антон Луцкевіч. Да гісторыі беларускага руху» (Менск, 2003).

мамэнтаў.

Падрыхтаваў да друку чарговы ў два томы твору Антона Луцкевіча.

Аднойчы, ужо пасьля некалькіх месяцаў ад прыезду, дзякуны ў ложку каля гадз. 11-й уначы, я пачуў цяжкія крокі некалькіх чалавек па вонкавых драўляных сходах, якія вялі да другога паверху і карыдору, скуль быў уваход да маёй кватэры і кватэры шавецкай майстэрні ў канцы карыдору. Туды і скіраваліся гэтыя крокі. Аднак неўзабаве пачуўся стук і ў маю дзьверы. Я, ня ўстаючы з ложка, запытаў, хто там. Адказ быў такі: "Адчыніце, паліцыя!" Я ўстаў, запаліў лямпу і адчыніў дзьверы. Увайшоў паліцэйскі афіцэр у суправаджэньні двух паліцыянтаў. Афіцэр, прадставіўшыся, пачаў рабіць вобыск. Ён, відаць, шукаў нейкіх рэчаў, якія, на ягоную думку, павінны былі быць у мяне. Ён перагледзеў усе мае рэчы, але нічога не знайшоў. Тады ён загадаў, каб я апрануўся і ішоў з ім. Я ўзяў з ложка коўдру, загарнуўся ў яе і пайшоў за афіцэрам. Мяне прывялі ў Лукішскую турму, у 250-ю камэру, дзе ўжо сядзелі некалькі чалавек. Гэта было ў ноч з 1-га на 2-гі верасьня 1912 году.

33 В. Зелянкевіч, у якога я начаваў. Ужо ў 1908 г. Ён працаваў у Вільні.

34 Гэта быў Ігнат Дамейка, які ў 1863 г. Пасьля паўстання ён быў сасланы ў Сібір, дзе і памёр.

Падрыхтаваў да друку чарговы ў два томы твору Антона Луцкевіча.

Аднойчы, ужо пасьля некалькіх месяцаў ад прыезду, дзякуны ў ложку каля гадз. 11-й уначы, я пачуў цяжкія крокі некалькіх чалавек па вонкавых драўляных сходах, якія вялі да другога паверху і карыдору, скуль быў уваход да маёй кватэры і кватэры шавецкай майстэрні ў канцы карыдору. Туды і скіраваліся гэтыя крокі. Аднак неўзабаве пачуўся стук і ў маю дзьверы. Я, ня ўстаючы з ложка, запытаў, хто там. Адказ быў такі: "Адчыніце, паліцыя!" Я ўстаў, запаліў лямпу і адчыніў дзьверы. Увайшоў паліцэйскі афіцэр у суправаджэньні двух паліцыянтаў. Афіцэр, прадставіўшыся, пачаў рабіць вобыск. Ён, відаць, шукаў нейкіх рэчаў, якія, на ягоную думку, павінны былі быць у мяне. Ён перагледзеў усе мае рэчы, але нічога не знайшоў. Тады ён загадаў, каб я апрануўся і ішоў з ім. Я ўзяў з ложка коўдру, загарнуўся ў яе і пайшоў за афіцэрам. Мяне прывялі ў Лукішскую турму, у 250-ю камэру, дзе ўжо сядзелі некалькі чалавек. Гэта было ў ноч з 1-га на 2-гі верасьня 1912 году

Незадоўга ўжо да канца існаваньня друкарні газэтчык, які штодня прыносіў мне газэту, папрасіўся пераначаваць. Ён спаў на падлозе ў першым пакою пры дзьверы ў маю спальню. Раніцай а гадз. 5-й ён падышоў да шафкі, на якой між іншым ляжаў гадзіньнік. Калі я парухаўся ў ложку, ён адышоў да сябе. Ня ведаю, ці яму трэ было паглядзець на гадзіньнік, ці ён меў іншую мэту.

У апошні дзень ліквідацыі друкарні, калі я паліў у печы друкі, якіх сабралася досі многа, у коміне загарэлась сажа. Суседзі заўважылі гэта, але, зачыніўшы дзьверку і ўюшку, удалося загасіць агонь.

Усё ж такі друкарня ўтрымалася на працягу году і чатырох месяцаў – ад 1 сакавіка 1906 году да ліпеня 1907 году, калі была ліквідавана самой партыяй.

Такім чынам, улічваючы два месяцы работы ў пэпээсаўскай друкарні, я адбыў умоўлены паўтарагадовы тэрмін сваёй працы.

Пасьля ліквідацыі друкарні, атрымаўшы свой пашпарт ад Антона Луцкевіча, каторы нейкі час карыстаўся ім у Вільні, я паехаў дахаты ў Шчучын.

Падрыхтоўка да друку і камэнтары Анатоля Сідарэвіча

[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 9 (49) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [mk]. Абнаўленьне [czyk].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/12/14
[image]

Былы муж прыехаў са сваёй Амэрыкі неспадзявана. Мы сядзелі за сталом, насупраць адно аднаго. – Я хачу вярнуцца... – сказаў.

Такой цішы ў маім доме яшчэ ніколі не было: калі не адчуваеш нават свайго дыханьня, ціша зьмярцьвеньня.

Стол, даўгі стол для вялікай сям'і, засланы белым настольнікам.

Муж сядзіць смутны, ён няшчасны, ён распавядае пра свой няўдалы раман, ён чакае, спадзяецца, што ягоная бяда стане супольнай, сямейнай бядой. Наша дачка, кажа, застаецца вучыцца за мяжой, ёй там падабаецца, вельмі падабаецца, я, маўляў, павінна згадзіцца: добра, што ён настояў забраць яе з сабой, ад'яжджаючы, гэта, маўляў, для яе такі шанец уратавацца ад нашай быдловасьці. Гаварыў, гаварыў...

Я ня чула, я здагадвалася па вуснах. Я даўно стаю каля зачыненых дзьвярэй, яны зачыненыя ўва мне самой. Ён сьпяшаўся, перабіраў у руках «ключы». Мне не перадаваліся ні ягоны боль, ні цяпло.

Вярнуцца?!

Доўгі стол паміж намі, засланы белым, ён мне выдаваўся засьнежаным. Замяло на ім усё начыньне для кавы, сіверам з

твараў. Засьнежаным, як тое поле калісьці. Вярнуцца? Я ня ведаю дарогі назад. Тады, адразу пасьля разводу, з суду пагнала машыну на лецішча. Вечар зімовы як мігнуць вокам перавярнуўся на другі бок – і адразу ноч. Матор заглох у замётах. Кінула машыну на дарозе, як цяжкі хатуль з плеч, і напрасткі праз поле, па цаліку. Мне трэба было як найдалей ад нашага дому, дзе яшчэ дзейнічалі мужавы замовы, прысягі, вечныя ловы любові і да апошняга надзея, што дачка зь ім не паедзе. Ад таго места, дзе паранілі, зьнікнуць, заблытаць крывавы сьлед, не баючыся, што па ім у полі можа знайсьці цябе, учуць зьвер – самыя красы.

Сьнег правальваўся, месцамі па каленкі. Азірнулася, хацелася вярнуцца, а сьледу не відно – ззаду ішла пазёмка. Поле ўвесь час перасьцілалася нанова, зьмяняючы навакольле. Нечалавечым нюхам, зрокам здагадвалася, дзе тут маё жытло.

Ад парога, праз усю хату, адразу да Багародзіцы, матчынага абраза. Хацелася нешта ёй сказаць – яна падняла руку да вуснаў, запыніла. Так звычайна стаяць, зьбедаваўшыся, сялянкі на хаўтурах – замкнуць вусны, сьцяць мову – знак маўчаньня. «Пакарміце Мурзу...» – патэлефанавала дамоў і заснула, ня цепліўшы, не распранаючыся, як у сабачай будцы, каб не абраз.

Назаўтрая, агледзеўшыся: чатыры сьцяны, нізкая столь, страха на самыя вочы – гэта не работа! Я буду тутака будаваць сапраўдны дом, той, пра які марылі, жывучы разам. Гэта будзе мой Элізіюм на гэтым сьвеце, дзе заўсёды пануе дзень. Душа мая для нараджэньня зноў выбрала вось гэтае месца. Я старажытная пчала: парушыш соты, а яна, не зважаючы, надбудоўвае тое, на чым спыніла стыхія.

Парушаны мой падмурак, а я будую адразу «сёмы паверх»!

Трэба вярнуцца ў горад адно па сабаку.

Людзі дзівіліся: жарт – і мужык, і дачка зьехалі за адным разам. І, пабыўшы: скора яна звыклася, вунь якую будоўлю распачала! Не, гэта ня звычка. Гэта калі ты забываесься, якой была ўчора. Ты быццам раптоўна зайшла ў цень, у свой уласны цень. Ты яшчэ некаторы час павернутая да блізкіх тварам, як да сонца

хатняга, павернутая ўдзень, на змроку і ўначы. Выцягнутыя рукі ў адным кірунку з гадавымі колцамі павернутага да сонца дрэва. І раптам словы, позірк, рухі – усё зьвяла ніцее, пакуль на табе не аджыве атожыльле, як на ствале пашкоджаным.

Зіма, лета, сонечнае сьвятло, ягоны халодны прамень, як ад люстэрка, выцягнутага з кішэні: нехта высачыў цябе, гуляючы, і забыўся.

Вярнуцца?

Я прайшла ў адзіноце занадта вялікі шлях, намагаючыся на ўсё забыцца. Ішла праз гушчар, высякаючы сабе сьцежку, як у джунглях, і яна за мной зарастала ўвачавідкі – я не патраплю вярнуцца. Удзень і ўначы чула галасы людзей, яны прысягалі адно аднаму на вечнае каханьне, на сяброўства, успрымала іх, як сьпевы птушак. Ведала па сабе, што яны часьцей прапануюць замест вечнага нешта ўзамен.

Але хіба можна даць чалавеку нешта ўзамен хлеба надзённага...

Гарадзкія вуліцы звузіліся, як калідоры, цёмныя сьцены з усіх бакоў шорамі на вачах. Вярталася сюды толькі па будаўнічыя матэрыялы. Узіралася ў свой былы дом, бы ў чужыя вокны. Дом быў населены нашымі прывідамі, там быў схаваны наш нечаканы сямейны разлад. Я не гадавала дачку для Амэрыкі, гэта мяне гняло найболей. Я не сурагатная матка. Чаму яна так лёгка ад'ехала?

Зазірнуць ва ўсе цёмныя куткі пакінутага дому, падняць масьніцы, спусьціцца ў падполак. Сабраць аскепкі церніцы матчынай, той пасудзіны, якую я выпусьціла з рук, несучы перад сабой, жывучы ў сям'і.

...Нарадзілася дзіця, Дзям'яна. Дзіця быццам незапрошанае, як неспадзяваны верадлівы госьць у доме. Мы перашкаджалі мужу. Ён вяртаецца стомлены, ён працуе бязь меры, каб сабраць грошы на сапраўдны дом, на машыну і, вядома, на прэстыжную школу. Ён зачыняецца. Ужо дачка стукае ў дзьверы: тук-тук. «Хто там? Я Дзям'яна!» – сама сабе адказвае і

адыходзіцца. Муж глядзіць «навіны», дачка тук-тук па падлозе, як капыткамі, узад-уперад – зноў незадаволенасьць. Ён праз паўгоду настояў, каб мы знайшлі няню, маўляў, мне самой ужо час станавіцца ў аглоблі, і так шмат грошай упушчана праз роды. Я не забавілася ў шчасьлівай пары мацярынства, калі корміш цыцкай. Малако на працы бегла толькі што не па лытках, быў час нейкага дзікага несупыннага гону.

Адна, другая, няні не затрымліваліся. Я разьміналася з каторай, прыйшоўшы, у вітальні, як са зьменшчыцай на казённай працы.

Трэцяя, яна нарэшце размаўляе па-беларуску. Сваю мову маюць ручаі, дрэвы, дождж, птушкі, мову маюць і рэчы. А наш дом быў нямко, гэта я цяпер зразумела, катух бяз ладу і складу, будаўнічая пляцоўка. Дзіця – як на мяжы ў полі, пакуль мы, бацькі, «нажнём» на хлеб з ікрой. Стол, табурэт, зэдлік, чужая цётка побач і, як адкупнога, кожны дзень у руку новую цацку, цэлы пагорак цацак – і гэта ўся краіна дзяцінства. Мы, маўляў, будуем новае заможнае жыцьцё. Можна сказаць, новую вольную краіну, бо лічылі сябе шчырымі прыхільнікамі адраджэньня. Былі, так сказаць, занятыя ў «падтанцоўках» нацыянальнага руху.

Трэцяя няня, яна з інтэрнату, яе памятаю найлепш. Цяпер цяжка сабе прызнацца, як мы з мужам абмяркоўвалі ейны прыход: а ці ня ўгоніць яна нас у кошт, калі будзе і палуднаваць у нас. Апошняя часьцяком прыводзіла да стала і свайго малога сына. А яе, і кожную зь іх, трэба было прыняць інакш? Завесьці ў дом, як на пасад, расказаць пра нашыя традыцыі сямейныя, дарагія звычкі, таямніцы. Бо ў кожным доме жывуць па сваім асабістым сонцы, у кожным, як на іншай плянэце. Урачыста, даверліва перадаць на ейныя рукі сваё дзіця. Хіба дом гэта ня ўнутраная прастора гаспадара, не галоўны інстынкт?

Памятаю, тэлефаную часьцяком ёй з працы, падыходзіць да тэлефона не адразу, быццам у нас трыццаць пакояў. Дзіця сьпіць, кажа. Тады чаму так марудзіць, чым займаецца?

Неяк выдалася, што мы былі зь ёй дома разам. Нехта

патэлефанаваў. Няня стаяла якраз каля апарата. Замест званка іграла музыка, Поль Марэа, таката, нядаўна прыдбалі такую «забаву». Я бачыла праз адчыненыя дзьверы з кухні: няня не падымала трубку, яна стаяла, слухала. Кароткія гукі, тая музыка, якая ўзьнікае ад дотыку блізкага чалавека, ад ягонага слова ці проста, калі адчыніш музычную скрыначку. Яна стаяла нерухома, спынены зрок, невысокая, зграбная, чыстая лялька. Зараз мэханічна, нягнутка падыме адну руку, другую, пратанчыць, зробіць паклоны і зьнікне. Скрыначка зачыніцца, мы зноў застанемся бязь няні.

Я застыгла зь церніцай у руках, яшчэ матчынай, адзіная рэч, якая мела існую назву, магнэс, адзіная з матчынага гнязда. А так ніводнага чарапка дзеля строю, дзеля ладу, забавы, каб спыніць, перавесьці вочы ад пялюшак. Толькі во тэлефон, куплены выпадкова, і той цешыць толькі няньку.

Што гэта нам ёсьць?

Такі дом лёгка пакінуць...

Мы жылі, як перасяленцы, на часовым прыпынку. Нас такіх шмат, несканчоны цягнік. Заўсёды здарожыўшыся, заўсёды пад цяжарам жыцьця, нашыя дзеці не запамінаюць месца, дзе мы спыніліся, бо яно не абжываецца.

Я толькі зараз ірванула ручку стоп-крана, каб нарэшце пабудаваць дом.

Ужо я ваджу дачку ў дзіцячы садок. Зіма, я сьпяшаюся, як заўсёды, я ляту, яна падае з санак у сьнег. Камунальны завулак, ён спускаецца да ракі. Раптам дачка бачыць гэтую раку, вялікую ваду, яна зьнямела, яе туды як за руку пацягнула. Яна да ракі, я назад, да сябе, яна ізноў туды. Злуюся, хапаю, як шчаня, на рукі. Дачка плача, плача ўсю дарогу, крычыць зь нейкім дарослым жалем. Што было ў ейным балючым голасе? Быццам я рыдлёўкай секла, абсякаючы ейнае маладзенькае карэньне, ледзь пазначаны навык супадзеньня з прыродай, зь местам на зямлі.

Усё гэта ўспамінаю, як злачынствы нейкія. Адзінае маё

жаданьне: калі яна наведаецца часам, легчы зь ёй разам спаць. Спавіць яе сваімі думкамі, адпіхнуцца ад сучаснасьці, як у чаўне ад чужога берагу, і плыць. Часта ў сьне бачу вялікую ваду. Заўсёды дзікая, няўрымсьлівая, як зьвер, не стрыножаная парапетам, да яе лёгка падысьці, ступіць у ейны вільготны сьлед.

З усіх бакоў чую гаворку пра матчыну мову і рэдка пазнаю яе, як той казаў, у твар. Быццам каторы прамаўляе словы песьні, ня ведаючы мэлёдыі ці ня маючы голасу. Быццам чалавек не нарадзіўся, а быў знойдзены ў капусьце.

Сяджу з дачкой на бацькоўскім сходзе, слухаю клясную кіраўніцу. Раптам заўважаю, што міжволі рухаю сківіцамі, бы пераціраючы пачутае, сілячыся праглынуць. Нешта сырое, як ня высушанае як мае быць на печы, зерне, засыпаю і засыпаю жменяю ў жорны. Выходжу, аж бакі баляць, як сказала б вясковая баба, праехаўшы ў пустой каламажцы па выбоінах даўнейшай брукаванкі, зьлезшы нарэшце далоў.

Яшчэ доўга словы кіраўніцы целяпаюцца, бразгацяць паражняком, набягаюць адно на адно. Цяпер толькі адныя лекі – здумаць нейкую прычыну зайсьціся да Хрысьціны, каб зьняць сурокі. Па сёньняшні дзень заходжу да яе, як да варажбіткі.

Хрысьціна нешта гаворыць, я не заўсёды лаўлю, унікаю ў сэнс, хай выбачае, я слухаю музыку мовы. Той плыўкі гук веснавое вады зь перакатам праз сустрэчныя камяні на дне, карэньне, вільготны шэпт пяску-плывуна, шоргат белага, сыпучага жвіру з далоняў ці пад нагамі – і зноў перакат. Я каля яе пастаю сьцішана. Я да яе, як да ляснога ручая ў горадзе. Карціць кожны раз запытацца: а што, каля цябе ў вёсцы таксама бегла вада? Кожны раз тое распазнаваньне, тая дарагая згадка, бы раптам пачуў мэлёдыю з тваёй калыханкі.

У такія моманты адчуваю сябе амаль ва Ўэлзе, там пануе на ўзроўні з ангельскай валійская старажытная мова першых жыхароў Брытанскіх выспаў. Паўсюдна даўжэзныя назвы вёсак, адну зь іх можна перакласьці прыкладна так: «Месца каля царквы, дзе б’е чырвоная крыніца і дзе каля пячоры над магілай расьце рабінавы куст». Замест кароткай назвы сваёй

вёскі я напісала б на шыльдзе каля дарогі: «Месца паміж дзьвюма рэчкамі – Лычоўкай і Дубоўкай – і балацінай, дзе «водзіць» і ўдзень, месца на пагорку, адкуль відаецца, пільнуецца кожны свой чалавек, які сышоў ці зьехаў адсюль, месца, дзе... маё сэрца». Царкоўем называюць поле побач, там наша сенажаць.

У такую вёску лёгка трапіць нават у стане амнэзіі.

Рэчкі даўно выпрастала мэліярацыя, ляжаць у равах, як нябожчыцы. Але іхныя галасы па сёньняшні дзень дзынькаюць мне завушніцамі.

Падымаю слухаўку, чую то аднаго Андрэя, то другога (з «НН», зрэдку тэлефануюць, па справах, вядома), іхная скорагаворка што плыткая веснавая вада па каменьні са стрыманым маладым сьмехам на заваротах. Нідзе не замарудзіўшыся, разбураючы межы, перашкоды, напрасткі – да вадаспаду ў вялікую ваду. Аж пырскі халодныя на маім твары. Размова скончылася – і сполах: пра што каторы гаварыў, ці патрапіла адказаць? Бо я слухала толькі музыку бягучай вады. Так гавораць у нашай вёсцы мужчыны. Ідуць заўсёды крыху наперадзе баб ці там касьба, ці малацьба, толькі голас адносіць. Ідзеш ззаду, як крутым высокім берагам гаваркой ракі – не сысьціся і бліжэй не падысьці.

А іншы раз чую ў скорагаворцы Андрэеў рытмічны перастук абцасаў, як у пасадоблі, вядома, зь беларускім музычным акцэнтам: постаць з высока паднятымі грудзьмі, жорстка, нерухома пастаўлена галава – тыповы мужчынскі танец карыды. Жанчыне тутака толькі роль чырвонага плашча.

Ніхто зь іх не выкладаў мову маёй дачцэ, і сама я гавару на трасянцы.

Хаджу вакол свайго былога жытла, зазіраю ў адно акно, у другое, трэцяе... На шкле скрозь марозныя сьвяточныя малюнкі да зоркі Раства можна дакрануцца рукою. Калядкі. Калядкі, памятаецца, толькі на шкле...

Сьвята яшчэ няма, сьвята яшчэ ў дарозе, а дзеці ў ліцэі ўжо

ладзяць сустрэчу, нешта накшталт спэктаклю. Рыхтуецца сьвяточны стол, гульні, падарункі. Усё адбывалася заўчасна, да прыходу вялікай госьці, дзеля якой быццам усё і рабілася. Ніхто не чакаў ейнага прышэсьця. Адным словам, проста спэктакль на тэму. Калі не ўпару, не ў назначаны вякамі час вадзіць карагод, гэта можа падзейнічаць нават на сонца, памятаецца, казалі ў вёсцы старыя людзі. Маўляў, нешта можа парушыцца ў навакольнай прыродзе. І ў чалавеку, вядома.

Дачка вярталася размагнічанай, як я калісьці зь вечарынаў пад раніцу. Да часу, да пары разгортваліся падарункі, сьпешна, нэрвова, у спадзеве адно на той гасьцінец, якога не каштавала, ня бачыла. Цяпер я разумею: яна шукала нейкай дзіцячай неспадзяванкі і не знаходзіла. Падсьвядома адчувала: мяне верадзіла ейнае і маё асабістае несупадзеньне зь векавымі рытмамі. Я спрабавала нешта выправіць, ставіла дома ялінку, вядома, сьпяшаючыся, у самы апошні вечар. Я выконвала, падкрэсьлена выконвала рытуальную дзею, але без рэлігійнай веры, якая мусіла б зьвязаць рытуал з нашым штодзённым жыцьцём. І дзіця лічыла, што гэта проста чарговы спэктакль, хатні тэатар, ня болей. Магнэз рытуалу ня меў сілы.

Сьвята ўжо хадзіла па горадзе, пад нашымі вокнамі, а мы ня чулі, каб адчыніць дзьверы, упусьціць яго ў дом – мы ўжо спалі. Стаяла на кухні пустая латка, у ёй я зьбіралася церці мак на малокі, варыць куцьцю, да апошняга зьбіралася. Але... нашыя калядкі толькі на марознай шыбе.

Мы з усяе моцы разгойдвалі наш дом – вось нашай плянэты.

Сьціралася тысячагадовая памяць роду.

Увечары на пляцоўцы пачула: калядавалі тры хлапчукі, сьпявалі сьвяточнае. «Чаму на расейскай мове?» – запыталася. Дзеці разгубіліся, засьпяшаліся да дзьвярэй.

– Мяне бянтэжыць вашая ўпартая арыентацыя толькі на матчыну мову, не зважаючы тое, хто гаворыць і пра што. А на ёй ужо навучыліся размаўляць і сапраўдныя здраднікі, зламысьнікі, – абурыўся муж надзіва сур'ёзна, быццам я ўзьверадзіла яму нешта вельмі балючае. – Зь несьвядомым

чалавекам трэба працаваць, паводзіць сябе, калі ты разумнейшай сябе лічыш за іншых, гэтаксама, як пастыр у царкве, на ўзроўні казані. Тым больш, што ён табе часьцей невядомы – дыху ягонага ня ведаеш. Тлумачыць трэба. Вы не адчуваеце свойскасьці нацыянальнай. І маральныя, і палітычныя пытаньні вырашаеце па-вясковаму: з каламі адзін на аднаго, вёска на вёску! Нельга так пагарджаць поглядамі тых, хто цябе не разумее, не згаджаецца з табой. Яны разьлічваюцца за сваё непаразуменьне вялікай цаной, такой самай, як і ты, цаной свайго кароткага жыцьця. Яны плацяць будучыняй сваіх дзяцей. Няўжо гэта ня доказ, што твой супраціўнік мае права на павагу, на спачуваньне? Сварай, абразамі ты мне нічога не дакажаш! Не запэўніш, што твая пазыцыя больш вартая за маю, больш чалавечная, не! Гуманную ідэю ў народ павінны несьці гуманісты, а не гуманоіды, якія запалохваюць нязвыклымі выхілкамі. Крэўныя толькі тыя, што размаўляюць па-беларуску, а астатнія – пасынкі? Матчына мова, калі яна сапраўды матчына, ня можа разьяднаць сям'ю, маю на ўвазе нацыю! Як, скажы мне, я магу спадзявацца на тое, што калі ты пераможаш, твая ўлада будзе справядлівейшая? Калі так, дзе падстава? Усялякае зло, самае найменшае, учынак ці слова благое, абсалютнае, як сказаў нехта...

Я маўчала. Ці была я зь ім згодная? Але... Я здагадвалася, з кім ён спрачаецца. Ягоны лепшы сябра выступіў у газэце з артыкулам, дзе амаль гвалціў несьвядомага, так сказаць, чытача, сваімі доказамі. Другі сябар, той пісаў па-расейску, сапраўды, як той пасынак, быў занядбаны на радзіме: уладай, што апазыцыянэр, апазыцыяй – за мову. Іх было трое. Трэці ён сам. Ён пакутаваў: з кім? На чыім баку? Ён перажываў крызіс сэнсу. Адышоў ад усіх, хутка і ад'ехаў за мяжу.

Ня памятаецца, каб мы яшчэ калі-небудзь вярталіся да гэтай размовы. Мы рухаліся з большасьцю гэткіх самых наежджых зь вёсак гараджанаў. Мы яшчэ разам, і кожны раз, калі пільна трэба было ляцець з дачкой на вакацыях у вёску да бабулі, ляцець, як у вырай, мы, вядома ж – у Турцыю.

Мы заглядаліся на чужыя сьвяты, хацелі патрапіць быць

сучаснымі. Мы валодалі стратэгіяй выжываньня, зусім ня ўмеючы проста *жыць. Мы не вытрымлівалі сутыкненьня з цывілізацыяй. З ужо наладжаным сьветам.*

Туга, скруха, мне невядомы гэты стан – я вылечылася ад болю адразу, як толькі пачала сама будаваць дом.

«Вось гэта дык гаспад-а-ар!» – чула, стоячы на панадворку, галасы незнаёмых людзей, ішлі, гуляючы, каля маёй будоўлі. Хоць ты дагані і патлумач: тут ані блізка таго гаспадара! Гэта яшчэ тое сабе, а вось застацца ў доме без мужчыны, што без люстэрка: у мяне гадамі ўборы адным строем. Мне выдавалася: калі я здыму свой фартух, самому Богу давядзецца зачыніць сваю кузьню.

Першы пакой, другі, трэці і адразу пусьціць туды насельнікаў. Фікус! Італьянцы лічаць яго дрэвам жыцьця, гэта праўда. Моцная карнявая сыстэма ягоная сьцягвала да сябе нават мае перадумкі, адчай. Шост пад стольлю каля печы, кубел, скрыні з лазы – усё па памяці, навобмацак сярод звыклых па нашым часе новых бесхарактарных рэчаў. Менавіта найперш куфар. Стары, вялізны, ён стаяў, як саркафаг. Адчыні вечка – дыхаў у твар зямельным тлом, мая складзеная адзежа бы нечыя парэшткі. Там яшчэ жылі духі маіх продкаў. Заставалася толькі завязаць вузёл на апошні час, як рабілі жанчыны майго роду, і скласьці тэстамэнт. Без прымусу, намовы і парады, пры сваёй памяці папрасіць зладзіць апошні прытулак, загадзя прыгледзеўшы месца, вядома, на пагорку, паміж Лычоўкай і Дубоўкай. Іншы раз выдавалася, я зачыняла цяжкое вечка куфра над сваёй галавой з поўным даверам да таго сьвету, якога ня мела на гэтым, і вярталася назад акрыяўшы. Я не баялася, не цуралася старасьці, я прымярала ейныя ролі, як даўнейшыя сукенкі з крэпдэшыну.

Старая рэч робіць бясконцасьць жыцьця ўласнай, як сказаў нехта з геніяльных, вядома ж, мужчына.

Тэраса конча адкрытая, толькі што пад страхой. Заліе, занясе, дошкі пагніюць, ня раілі суседзі. А хацелася, каб так і было, каб хоць адзін «пакой» быў бяз вокан і дзьвярэй, з даверам да дажджу, да сонца, да ветру. Няхай сабе і сьнег забрыдзе сюды, скруціцца, стуліцца белым мядзьведзем пад ногі. Тут лёгка

ўлавіць першы подых вясны ў твар. Ён асаблівы, гэта калі нехта да цябе раптам з блізкай гаворкай, шэптам. Толькі на адзін кароткі момант, потым вецер падымецца ўверх скапой, разьвіхнуўшы вялізнае скрыльле, пабудзіць дрэвы. Усё навокал дыхае, пацягваецца, пазяхае: сёньня якраз Саракі, сорак птушак прыляцела, адна зь іх завітала на маю тэрасу.

Ідзеш, і раптам з галавы спаўзе хустка на плечы, як сьнег на пагорку, сама па сабе, – па цяпле.

«Ты плачаш?» – запытаецца мая сяброўка, пачуўшы мой дрыготкі голас па тэлефоне. Я выціраю вочы, я пярэчу, бо гэта ня сьлёзы. Гэта як на лісьці, на траве, на камянях у самы шчыры ранішні час. А ў мяне ад гэтай самай шчырасьці і колькі разоў на дзень, калі адчуваю сваю жывую душу. Жыць, жыць...

Вечарам неяк, выйшаўшы з Мурзай у лес, забавілася, вярталіся ў поўнай цемры. У вокнах гарэла сьвятло. Здалёк дом быццам углядаўся ў навакольле пільным вокам. То, адышоўшы ад акна, сьвятло цеплілася ціхім вогнішчам у каміне, адкідваючы чыесьці цені. «О, ужо ўсе дома!» – сэрца сарвалася на момант. Звычайны флэш-бэк – карцінкі зь мінулага жыцьця. А я проста забылася выключыць сьвятло, адыходзячы.

Дом выкарыстаў гэта – дом прыкінуўся вясёлым упарадкаваным гняздом. Дом меў сваю волю, як я адчула пазьней. І больш не выключала сьвятло, патураючы яму, калі выходзіла вечарамі ў цемру.

Але сыходзіў ад мяне мой апошні сямейнік, старая Мурза, свайго заводу, сваёй гадоўлі, як кажуць. Сыходзіла з дому дзіўная істота. Ад першага дня, усе гады, кожны раз, кожны! калі падыходзіш да яе, лашчыш, корміш, адчуваньне імгненнага пачуцьця, быццам удалося злавіць, патрымаць у руках рэдкую птушку, прыручаную толькі на момант. Толькі на момант таго захапленьня, што яна табе належыць...

Ноч... Ні здумаць, каб распрануцца, кладуся ў адзежы. Бы я ўжо стала на дарогу нашае бяды, ужо ў дарозе, удзень і ўночы, ужо выправілася, і так да самага скону. Накрыцца карціць (дзіўлюся я зь сябе) нечым старым, куфайку знайшла, нечым даўнім,

звыклым. Да звыклага хочацца дакрануцца, да тых рэчаў, якія табе доўга служылі, былі ўвесь час побач. Каб было, дык матчынай, бацькавай адзежынай – рызы маіх сьвятых, каб адцягнула ад галавы. Шукаю па хаце, зьбіраюся ў начную дарогу.

Я ня спраўлюся… трэба ж капаць копку… трэба каго паклікаць. Званок, чую голас блізкай сяброўкі, не пасьпяваю патлумачыць свой стан – яна сьпешна разьвітваецца, бы ўцякаючы ад нас. Адразу сьцерліся на маёй дарозе ўсе дапаможныя знакі: я мушу ўсё сама зрабіць, у поўнай цемры, захаваць ад чужога вока. І толькі празь некалькі дзён яна зноў патэлефанавала. «Я спужалася, я ня ведала, што табе казаць, пакуль выпадкова не пачытала: у сабаку чалавек знаходзіць тое, чаго ня можа напаткаць у іншым чалавеку». У яе зусім інакшая школа жыцьця.

Мурза адыходзіла на канапе, у маіх нагах. Туман уваччу, бы нехта дыхаў у сьцюдзёным пакоі на люстэрка. А потым, пахаваўшы, я яшчэ доўга спала на тым месцы, на канапе, датуль, пакуль холад з пакою не сышоў, ня зьнікла імжа, каб не баяцца цемры, не баяцца сьмерці. Мяне сустрэнуць там усе тры мае сабакі… І сказаць сябрам, экстравагантна, па сёньняшнім часе, у стылі хай-тэк: пахавайце мяне таксама без труны, я буду яшчэ доўга дыхаць праз поры зямлі, буду жыць, як жыве карэньне. І яны, зьніякавеўшы, будуць сьмяяцца жорсткім сьмехам. Нечы патрывожаны дух ценем мільгане ўваччу, ценем аж з паўночнага Ўэлзу, XIII стагодзьдзя, постаць князя Левэліна, ён адзін з самых першых у вялікай жалобе паставіў помнік свайму сабаку Гелерту.

Толькі аднойчы дзынькнула шыба вакна ў пакоі, дзе мы спалі з новым шчанюком. Самае першае, звыклае: птушка начная? нехта кінуў з вуліцы камянём? Потым яўкнула шчаня ў нагах, паднялося і перайшло на другое месца, азіраючыся. Мурза заўсёды спала менавіта там! Спакой сышоў раптоўна, як сон: так, гэта ня птушка і не камень у шыбіну, гэта быў гук расхінутай фіранкі з шклянымі пацеркамі… Мурза наведалася. Яна вярталася ячшэ раз, ёй нядоўга да нас ісьці. Душы жывёлаў застаюцца там, дзе пахаваныя, запэўніваюць аўтары эзатэрычных пісаньняў, а паводле меркаваньня будысцкіх настаўнікаў душы жывёлаў і людзей наагул прынцыпова нічым не адрозьніваюцца.

Шчанючка пароды шэлці, астраўлянка, любіць станавіцца пярэднімі лапамі на вялікі камень на панадворку і доўга так стаяць, углядацца заўсёды ў адным напрамку. Пэўна, адсюль ёй бачацца родныя Шэтляндзкія астравы.

Мы зь ёй былі вартыя адна адной.

Дом падабаўся маім гасьцям. Яны наяжджалі гуртам, разыходзіліся па пакоях, асядалі там-сям: на высокім куфры, у крэсьле-гушкалцы, стомлена, асалавела пасьля гораду, як птушкі пасьля доўгага пералёту. Весела фатаграфаваліся, іншы раз я здымала сама. Доўга потым разглядаю, што выйшла, бы чытаю пасланьні з тае пары.

І раптам вось гэты: мае маладыя сябры, жонка з мужам. Сядзяць у маім улюбёным крэсьле. Яна прысела ля яго на поручні, ледзьве нахіліўшыся, ледзьве дакрануўшыся крылом да ягонага пляча. Быццам прысела ў апошні момант, зьляцеўшы аднекуль зьверху, анёлам-ахоўнікам. Ейная сукня, падол яшчэ аднесены хваляй паветра. Пярсьцёнкі на руках – закальцаваная рэдкая птушка. Твары іхныя, позы разьняволеныя, хатнія, яны быццам у сваім доме, яны дома. І гэта не выпадковая хвіліна спакою – яны тут гаспадары, сядзяць, адпачываюць. Яны заўсёды былі тут і ніколі нікуды ня сыдуць. Дом мой іх выбраў сабе, затрымаў, пасадзіў.

Дом мне здрадзіў?!

Я ачахла, разумею, што будавала яго не для сябе адной? І гэты другі, ён існаваў тут побач увесь час, пакуль будавалася? Іншы раз шкодзіў, нечага дамагаўся – дамагаўся маёй рукі? Той гук незразумелы раней вечарамі, у кутку, дзе стаяла крэсла-гушкалка, ён цяпер нагадваў мне, бы нехта раз-пораз выбіваў попел зь люлькі, муж ніколі зь ёй не разлучаўся...

Вярнуцца?!

Муж цяпер сядзеў насупраць, ён чакаў адказу.

Дом стаіўся, пільнуючы мяне. Старыя рэчы перагаворваліся паміж сабой, бы старыя людзі, седзячы на прызьбе. А то стаялі,

сьцішыўшыся, урачыста, даўнейшым пасагам. Толькі што выкупу ніхто не патрабаваў. І мне заставалася б толькі пераапрануцца хаця б у нешта лепшае, каб пачуць: «О, табе пасуе!..»

Хутка пераводжу размову. Колькі часу ляцець з Амэрыкі? Дзе перасядка? Нешта пра надвор'е. Мы не перагарнулі аніводнай старонкі нашага жыцьця, гаварылі абы пра што, толькі вецер ганялі туды-сюды. Раз-пораз ён перапытваў нейкія дробязі, забываючыся наразе. Уставаў з-за стала, хадзіў узад-уперад, хваліў дом, і зноў пра тое самае. Хвалюецца? Ці слухае ён мяне?

– Час ляціць хутка, – зазначае сам сабе, – вельмі хутка...

Хутка? А мне выдавалася: я стаю дрэвам у полі, дрэвам зь нелічонымі гадамі, дрэвам без узросту, ад усходу да захаду, ад зімы да лета, не захінаючы голаў, поўнае вецьце лёгкіх думак, як залётных птушак пералётным часам. І толькі адна балючая думка, ад поўдня да нашай поўначы гэтай вясной, каб які чалавек з ружжом не пераняў птаха ў дарозе да мяне, да майго гнязда. Як гэта «апэратыўна» робіцца на Ўрале: забіта шмат – і аніводнага хворага, паведамляецца без спачуваньня.

Ці бачыць муж мяне такой, якая я цяпер ёсьць? Да каго ён хоча вярнуцца?

Ён раптоўна засьпяшаўся, быццам аб усім ужо дамовіўшыся, звыкла запрасіў яшчэ гарбаты, знарочыста адкінуўся на сьпінку крэсла, запаліў люльку. Ён ствараў моманты даўнеўшага жыцьця паміж намі.

Я, падаючы на стол, адчувала сябе, як у кавярні «бістро» дзе-небудзь пры дарозе.

Хутка і ад'ехаў.

Выйшла на панадворак, хадзіла па садзе. Вось і скончыўся мой жаночы век, думалася пільна. Глядзела сабе пад ногі, быццам недзе менавіта тут знаходзіўся пункт незвароту, як кажуць псыхолягі.

Нехта паклікаў. За плотам стаяў мужчына: мардаты, барада

саламяная, увесь у гліне, у цэгле – чысты гліняны Вялес! Ледзь пазнала: будуецца недалёка, пад лесам, разводнік, казалі бабы. Здаецца, яшчэ недзе бачыла, так... у акрэсьцінскім пастарунку, нас разам затрымалі на плошчы... Так, гэта ён.

Гліняны Вялес папрасіў вады. Адзін кубак, другі, трэці, знарочыста марудзіў. Хацела забраць вядро, ён запыніў:

– Я доўга буду піць, – сказаў, гледзячы ў вочы, грымнуў уладарна, аж, здалося, над домам, над садам да лесу – рэхам.

Божа... у чым я... у што апранута... як я выглядаю? – сполахам пранеслася ў думках, высьвечаных да дна, бы маланкай, нечаканым першым громам. Хіба толькі ў люстэрку поўні я бачыла адбітак свайго твару, гадамі стоячы ноччу ў акне, углядаючыся. Твар невыразны, зь мінай нязьменнай вартаўніцы свайго зорнага дому.

У паўдні заўважыла, перад каменнай дарожкі ў садзе вільготную цень ад падземнага ручая.

Пэўна, ён зьмяніў сёньня свой напрамак да мора, пайшоў праз мой сад. Запульсавала ягоная таямнічая вэна зусім блізка...
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/10/03
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 9 (49) - 2006**

[image]

[image]

[image]

[image]

[image]2006

літаратура • **літаратура** • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Марсэль Пруст
У пошуках страчанага часу
У апрацоўцы Гаралда Пінтэра і Ды Трэвіс

МАРСЭЛЬ ПРУСТ (1871—1922) — францускі пісьменьнік, ляўрэат Ганкураўскай прэміі, аўтар эпапэі «У пошуках страчанага часу».

Прэм’ера адбылася ў тэатры Котслоў Каралеўскага нацыянальнага тэатру 23 лістапада 2000 году.

ГАРАЛД ПІНТЭР (нар. у 1930 г.) — вядомы брытанскі драматург, ляўрэат Нобэлеўскай прэміі ў галіне літаратуры за 2005 г.

ДЫ ТРЭВІС — брытанская рэжысэрка, першая жанчына — кіраўнік трупы Каралеўскага нацыянальнага тэатру.

Марсэль — Сэб Каралеўскага нацыянальнага тэатру.

Франсуаза — Бэрнардэта Шорт.

Маці / каралева Нэапалітанская — Жулі Легран.

Бацька / д-р Катар — Пол Рытэр.

Бабуля — Джудзі Кэмпбэл.

Пэрсп’е / герцаг дэ Германт — Джон Бэт.

Сван — Дункан Бэл.

Герцагіня дэ Германт — Даяна Гардкасл.

Мсье дэ Камбрэмэр / Нарпуа — Джон Бэрджэс.

Мадам дэ Камбрэмэр / маркіза дэ Вільпарызі — Джыл Джонсан.

Рахіль — Сафі Джэймз.

Жыльбэрта — Бэвэрлі Лонгхёрст.

Шарлю — Дэвід Рынтаўл.
Адэта / мадмуазэль дэ Сэн-Лю — Фрыса Гудзі.
Мадам Пазьняк — Жанін Дувіцкі.
Мсье Пазьняк / журналіст — Джым Хупэр.
Дэшамбр — Мэт'ю Франклэнд-Кумз.
Мадмуазэль Вэнтэйль — Шарлота Рэндл.
Альбэртына — Індыра Варма.
Андрэ — Ханна Ўоткінз.
Дэльфіна — Аніта МакКэн.
Жызэль — Марына Морган.
Рабэр дэ Сэн-Лю — Багдан Порай.
Жуп'ен — Стывэн О'Шы.
Марэль — Олівэр Уільямз.
Марсэль у дзяцінстве — Брэнвэл Донагі,
Роры Коўпас,
Льюіс Крач.

Астатнія ролі выконваюцца акторамі трупы

Рэжысэр — Ды Трэвіс.
Мастак — Элісан Чыці.
Мастак па сьвятле — Бэн Ормрад.
Музыка — Дамінік Малдоні.
Пластыка — Джэк Мэрфі.
Гукарэжысэр — Ніл Аляксандэр.
Праца над галасамі — Пэтсі Родэнбэрг.

ЧАСТКА ПЕРШАЯ

Кавалак жоўтай сьцяны.
Зьвініць званочак на весьнічках, што вядуць у сад.
Прыём.
Гуд галасоў.
Цішыня.
Афіцыянт незнарок стукнуў лыжкай па талерцы.
Цішыня.
Па сьцяне спачывальні тройчы грукаюць.
Мігціць сьвечка.
Па коле цягніка б'юць малатком.

Сад у Камбрэ.

Б а ц ь к а. А ці не спазьняецца крыху наш Сван? А каторай мы вячэраем?

Д - р П э р с п ’ е. Чароўны чалавек, мсье Сван. Я ўчора заходзіў да ягонай жонкі. Лёгкая мігрэнь.

Б а ц ь к а кашляе.

Бабуля. У Марсэля змораны выгляд.

Д - р П э р с п ’ е. Наколькі я разумею, вы сёньня вячэраеце толькі з мсье Сванам?

Б а ц ь к а. Так.

Маўчаньне.

Д - р П э р с п ’ е. Ммм. Ну, я мушу ісьці. Мне яшчэ трэба пабачыць мсье Вэнтэйля. Зусім, нябога, расхварэўся.

Б а ц ь к а. Хмм.

Д - р П э р с п ’ е. Відаць, у іх гасьцюе сяброўка ягонай дачкі.

Б а ц ь к а (*змрочна*). Праўда, доктар?

Д - р П э р с п ’ е. Так. Яна настаўніца музыкі.

М а ц і. Але мсье Вэнтэйль і сам настаўнік музыкі.

Д - р П э р с п ’ е. Відаць, мадмуазэль Вэнтэйль больш падабаецца займацца музыкай са сваёй сяброўкай. Урэшце, гэтая паненка мае поўнае права любіць музыку. (*Сьцішвае голас.*) І некаторыя кажуць, што навучае яна зусім ня музыцы. Мсье Вэнтэйль мусіць быць сьляпым, каб не заўважаць.

Б а ц ь к а (*рэзка*). Ну, Марсэль… Колькі разоў табе паўтараць? Ідзі спаць… не, пакінь маму ў спакоі. Вы ўжо сказалі адно адному дабранач — і досыць. Што за дзівацтвы? Ідзі наверх.

М а р с э л ь падыходзіць да Ф р а н с у а з ы, зьвініць званочак на садовых весьнічках.

Зьяўляецца мсье С в а н.

Б а б у л я. Добры вечар, мсье Сван.

Спачывальня М а р с э л я.

М а р с э л ь. Франсуаза, калі ласка, аднясі гэтую цыдулку маман…

Ф р а н с у а з а. Не. Няўжо я стану назаляць тваёй матулі, калі яна прымае гасьцей? Га?

М а р с э л ь. Яна сама прасіла. Яна хацела, каб я ёй нешта сказаў.

Ф р а н с у а з а. Прыйшоў мсье Сван. Ходзяць чуткі, ён вельмі блізкі знаёмы самога прэзыдэнта Рэспублікі, ужо ня кажучы пра прэфэкта паліцыі і ангельскага прынца Ўэлскага. Ягоны фурман абмовіўся, што ён вячэрае з прынцэсамі. Прынамсі, да іх так зьвяртаюцца. Так кажуць.

М а р с э л ь выпускае з рук цыдулку і неадрыўна глядзіць на Ф р а н с у а з у.

Ф р а н с у а з а. Можа, паспрабую перадаць разам з кавай. Пабачым.

М а р с э л ь. Франсуаза, мілая, калі ласка.

Ф р а н с у а з а. Ды няўжо тут нешта настолькі пільнае?

Сад.

С в а н. Калі вы едзеце ў Парыж?

Б а ц ь к а. Відаць, тыдні праз два. На жаль.

Ф р а н с у а з а прыносіць цыдулку пад кубачкам кавы,

цішком перадае яе м а ц і.

С в а н. Мы таксама хутка зьяжджаем.

М а ц і. Заўсёды так сумна, калі сканчаецца лета і даводзіцца ехаць з Камбрэ. Для здароўя Марсэля тут паветра нашмат лепшае, чым у Парыжы…

С в а н. Як ён?

Б а ц ь к а. Дыханьне. З гэтым трэба ўважліва.

М а ц і глядзіць на цыдулку.

М а ц і. Адказу ня будзе.

Ф р а н с у а з а выходзіць.

С в а н. У мяне ёсьць адна кніга — думаю, Марсэлю спадабаецца. Заўтра вам яе дашлю.

М а ц і. Вялікі дзякуй.

Б а ц ь к а. Мы перад вашым прыходам размаўлялі пра мсье Вэнтэйля. Вы яго ня ведаеце?

С в а н. Не, ніколі зь ім не сустракаўся, але я часта думаў, ці не сваяк ён кампазытару.

Б а ц ь к а. Якому кампазытару?

С в а н. Вы ж ведаеце санату Вэнтэйля?

Б а ц ь к а. Ведаю?

С в а н. Хіба не? Ах, які цудоўны твор. Упершыню я пачуў яго… гэтак даўно… шмат гадоў таму…

Б а ц ь к а. А, *санату* Вэнтэйля. Ах, так, так, вядома. Выдатная рэч.

С в а н. Цікава, ці не сваяк яму ваш прыяцель. Трэба высьветліць.

Б а ц ь к а. Наўрад ці.

Ф р а н с у а з а прыносіць б а б у л і шаль.
С в а н падымаецца і цалуе руку б а б у л і.

С в а н. Што ж, ужо позна. Да пабачэньня. Дзякуй за такі прыемны вечар.

С в а н сыходзіць. Ф р а н с у а з а дапамагае б а б у л і падняцца ў дом.

Б а ц ь к а. Па-мойму, ён ня надта добра выглядае. Мабыць, яму шмат крыві папсавала ягоная мярзотніца жонка. Падумаць толькі, кінуць жыцьцё пад ногі… ёй? У галаве не зьмяшчаецца. А кожная жанчына палічыла б за гонар стаць ягонаю. Ды насамрэч і была ягонаю. Ну што, хадзем спаць?

М а ц і. Ты хоць бы дазволіў мне даслаць спытацца пра ягоную дачку. Ён так ёю ганарыцца.

Б а ц ь к а. Пачні пытацца пра дачку — і не заўважыш, як станеш пытацца і пра жонку. А там неўзабаве яна заявіцца да цябе зь візытам. Пра гэта ня можа быць і гаворкі.

Б а ц ь к а выходзіць.
М а р с э л ь стаіць у ценю.
Кідаецца да м а ц і, моцна яе абдымае.

М а р с э л ь. Маман. Маман.

М а ц і. Што ты робіш? (*Шэптам.*) Не. Ідзі да сябе. Не хапала яшчэ, каб бацька пабачыў, што ты тут тырчыш, як дурань.

Агеньчык сьвечкі. Са свайго пакою выходзіць б а ц ь к а.

Б а ц ь к а. Што такое?

М а ц і. Ён хоча, каб я яго пацалавала перад сном у ягоным пакоі. Дурэе — няма зь ім ніякага ладу.

Б а ц ь к а. Ну дык пайдзі да яго.

М а ц і. Не, нельга патураць дзіцяці.

Б а ц ь к а. Ніхто і не патурае. А калі ён празь цябе расхварэецца — што тады? Пасьпі ў яго — хоць раз. (*Пазяхае.*) Ну, я пайшоў. Добрай ночы. (*Сыходзіць.*)

М а р с э л ь усхліпвае.

М а ц і (*пяшчотна*). Годзе. Бо я зараз таксама заплачу, калі ты не супакоісься. Ну…

Сцэна: дарослы М а р с э л ь з жалем паглядае на малога М а р с э л я.

Гучыць раманс на верш Апалінэра «Мост Мірабо»:

пад мостам Мірабо сплывае Сэна
й каханьне наша
памятай на зьмену
тузе прыходзіць радасьць несумненна

прабіў гадзіньнік ноч імкне
дні прамінаюць паўзь мяне

рука ў руцэ стаім мы ў хваляваньні
пакуль пад мостам
нашых рук дазваньня
мінулага зьнікае люстраваньне

прабіў гадзіньнік ноч імкне
дні прамінаюць паўзь мяне

мілосьць мінае хуткаю вадою
жыцьцё ідзе
маруднаю хадою
адно надзеям дужацца зь бядою

прабіў гадзіньнік ноч імкне
дні прамінаюць паўзь мяне

гады і дні сыходзяць вокамгненна
мілосьці не вярнуць
адно нязьменна
пад мостам Мірабо сплывае Сэна

прабіў гадзіньнік ноч імкне
дні прамінаюць паўзь мяне[1]

[1] Пераклад Андрэя Хадановіча.

Воплескі.

Апошні прыём у Германтаў. 1921 год.

М а р с э л ь аплядуе. Усе прысутныя — ужо вельмі старога веку — паварочваюцца да яго.

К а м б р э м э р [2] . Марсэль, дарагі, як я рады пабачыць вас ізноў. Наколькі я зразумеў, вы хварэлі? Як цяпер пачуваецеся? Лепей?

[2] «Камбрэмэр» нагадвае назву французскага сыру камамбэр. У расейскім перакладзе М. Любімава мсье і мадам Камбрэмэр фігуруюць пад прозьвішчам Гаважо. — *Заўв. перак.*

Г е р ц а г і н я. Ах, Марсэль, мой дарагі Марсэль…

М а р с э л ь. Арыяна, вы цудоўна выглядаеце. Як заўсёды.

Г е р ц а г і н я. Божа, як лятуць гады… Колькі часу прамінула? Калі тое было? Дзе вы прападалі?

К а м б р э м э р. Мне казалі, вы шмат гадоў лячыліся ў санаторыі. Вы па-ранейшаму пакутуеце ад прыступаў удушша? То бок, ці стала вам лягчэй?

М а р с э л ь. Ня надта.

К а м б р э м э р. Але з узростам яны, вядома, усё радзейшыя. Галоўнае — жыцьцё працягваецца.

Г е р ц а г і н я. Вы зусім не зьмяніліся. Я вас ледзь пазнала. Ах, ўжо зусім старая. Хіба не? Ну, прынамсі, далёка ня першай маладосьці… Шкада, што вы так і не ажаніліся. Але, магчыма, усё толькі на лепшае. Вашыя дзеці загінулі б на вайне. Як мой

няшчасны пляменьнік Рабэр. Ведаеце, я дасюль яго часта згадваю.

М а р с э л ь. І я таксама.

У пакой заходзіць М а р э л ь.

Стары Ш а р л ю, якога падтрымлівае
Ж у п ’ е н, крычыць на ўвесь пакой.

Ш а р л ю. А, вось і наш вялікі музыка, наша славутасьць.

М а р с э л ь. Хто гэта?

Г е р ц а г і н я. Мой кузэн Мэмэ. Няўжо вы ня памятаеце Мэмэ? Небарака. З кожным разам, як яго бачу, ён усё больш нагадвае маю сьвякроўку. Падумаць толькі, ён меў жахлівую рэпутацыю. Пераважна сярод лёкаяў.

М а р с э л ь. Неверагодна.

Г е р ц а г і н я. Не, вядома, ён зьмяніўся. Але, на жаль, не ягоныя прыяцелі.

М а р с э л ь. А, мсье Жуп’ен.

Г е р ц а г і н я. Божа мой! Вы зь ім знаёмы?

М а р с э л ь. Так. То бок не. Не.

Г е р ц а г і н я. Не, зразумела, не. Вы ведаеце, вы тут, бадай, мой адзіны сябар. Мой самы верны сябар. Вы з усімі пазнаёміліся ў мяне, праўда? І са Сванам таксама.

М а р с э л ь. Я трошкі ведаў яго ў дзяцінстве.

Г е р ц а г і н я. Тут недзе ягоная дачка Жыльбэрта. Вы зь ёю знаёмыя?

М а р с э л ь. Ня надта.

Г е р ц а г і н я. Ніяк не разумею, чаму Рабэр зь ёй ажаніўся. Яна ніколі яго не кахала. Ніколі. Вось брыдкая істота.

М а р с э л ь. А дзе прынцэса? Дзе наша гаспадыня?

Г е р ц а г і н я. Вунь яна.

М а р с э л ь. Гэта не яна.

Г е р ц а г і н я. Яна самая. Былая мадам Пазьняк. Мая дарагая кузіна памерла. І новай прынцэсай стала матухна Пазьняк. Яна цяпер мая новая кузіна. Хто б мог падумаць? Прынцу яе грошы прыйшліся вельмі дарэчы.

М а р с э л ь. Выбачайце, я на хвілінку вас пакіну. Трэба засьведчыць ёй маю пачцівасьць.

Г е р ц а г і н я. Вядома. Дарагі Марсэль, вы заўсёды гэтак па-добраму ставіліся да абдзеленых лёсам.

М а д а м д э К а м б р э м э р. Арыяна, а што сталася з маркізай д'Арпажон?

Г е р ц а г і н я. Памерла.

М а д а м д э К а м б р э м э р. Не! Вы, пэўна, блытаеце яе з графіняй д'Арпажон.

Г е р ц а г і н я. Ніякім чынам. Маркіза таксама памерла. Недзе з год таму.

М а д а м д э К а м б р э м э р. Недзе з год таму я была ў яе на музычнай вечарыне.

Г е р ц а г і н я. І, аднак, яна памерла, магу вас запэўніць. Ня дзіва, што вы нічога ня чулі. Самая звычайная сьмерць.

Ж ы л ь б э р т а. Марсэль. Не чакала вас тут сустрэць. Бачу, што вы прынялі мяне за маю маці. Усе нас блытаюць. Яна недзе тут, але… занятая.

А д э т а сьмяецца.

Ж ы л ь б э р т а. Няўжо вам цікава на гэткім прыёме? Можа, мы б лепей павячэралі разам у якім-небудзь рэстаране?

М а р с э л ь. Так, абавязкова… калі вы не баіцеся сябе скампрамэтаваць, вячэраючы сам-насам з маладзёнам.

Ж ы л ь б э р т а сьмяецца.

М а р с э л ь. Са старым.

Паўза.

Ж ы л ь б э р т а. Я часта думаю: адзінае суцяшэньне ў сьмерці Рабэра — тое, што ён ніколі ня стане старым.

М а р с э л ь. Так. Для нас ён назаўжды застанецца маладым.

Ш а р л ю (*прынцэсе*). Якая жудасьць. Усе мёртвыя: Ганібал дэ Брэатэ — мёртвы, Антуан дэ Мушы — мёртвы, Шарль Сван — мёртвы, Адальбэр Манмарансі — мёртвы.

П р ы н ц э с а сьмяецца і папраўляе манокль.

П р ы н ц э с а. Мсье Жуп'ен, мы ўсе дзякуем Богу за тое, што нашаму міламу старому сябру лепей. Але, мне здаецца, вам усё ж варта адвезьці яго дадому.

Ж ы л ь б э р т а. Яна цяпер мая цётка. Хто б паверыў? Ведаеце, Марсэль, у мяне ёсьць вельмі блізкая сяброўка, Андрэ. Здаецца, вы калісьці былі знаёмыя.

М а р с э л ь. Так.

Ж ы л ь б э р т а. Яна недзе тут, з мужам. А, не, вунь яна — размаўляе з Марэлем. Ён цяпер дырэктар Кансэрваторыі. Трэба сказаць маме, што вы тут. Ёй будзе вельмі прыемна.

Да іх, хістаючыся, падыходзіць зьнячэўленая, змораная старая.

С т а р а я. Дзень добры.

Пакульгала прэч. М а р с э л ь і Ж ы л ь б э р т а праводзяць яе позіркамі.

Ж ы л ь б э р т а. Вікантэса дэ Ф'якр. Какаіністка.

Р а х і л ь. Марсэль. Не, бачу, вы мяне ня памятаеце.

М а р с э л ь. Як вы маглі падумаць?

Р а х і л ь. Тады скажыце, хто я такая?

М а р с э л ь. Я…

Р а х і л ь. Я вам нагадаю. Мы аднойчы з вамі сустрэліся за кулісамі. Вы былі зь сябрам. Ён бяз памяці мяне кахаў. Памятаеце?

М а р с э л ь. Так, так! Вядома, памятаю.

Р а х і л ь. Бедны Рабэр. Гэтае кальe… Ён мне яго падараваў. Ах, як ён мяне багоміў…

Г е р ц а г і н я. А, вы знаёмыя з Рахільлю. Вы ж ведаеце, гэта найвялікшая акторка Парыжу. Абавязкова прыходзьце да мяне, калі яна будзе чытаць Расіна.

Яны ідуць далей.
Г е р ц а г і н я абарочваецца да М а р с э л я.

Г е р ц а г і н я. А, дарэчы, мой муж завёў новы раман, хоць яму ўжо семдзесят пяць. Неверагодна! Але, ведаеце, у нас паранейшаму вельмі цёплыя адносіны.

Ж ы л ь б э р т а. Цётухна Арыяна ўмее быць і чароўнай, і прывабнай, але трэба прызнаць, ёй ніколі ня стацца арыстакраткай духу. Ейны муж закаханы ў маю маці. Увесь час праводзіць у ейным доме. А яна ніколечкі не старэе, мая мама, праўда?

М а р с э л ь. Так, праўда.

Ж ы л ь б э р т а. Яе заўсёды кахаюць.

А д э т а. Сядайце побач. Я вельмі рада вас бачыць. Вы ж добра ведалі майго першага мужа?

М а р с э л ь. Першага?

А д э т а. Шарля Свана. Цяпер я мадам дэ Фаршвіль. Хаця мсье дэ Фаршвіль ужо таксама пакінуў гэты сьвет. Але ж вы ведалі Шарля.

М а р с э л ь. Так, калі-нікалі бачыў яго ў дзяцінстве.

А д э т а. Вы, я ведаю, пісьменнік. О! Я б столькі магла вам распавесьці, такі матэрыял даць! Вас цікавіць каханьне? То бок, вы пішаце пра каханьне? А пра што ж яшчэ пісаць? Усіх маіх каханкаў гняла рэўнасьць. Шарль… неверагодны раўнівец. Але які сьветлы розум… Я б ніколі не пакахала неразумнага мужчыну. Мсье дэ Фаршвіля я насамрэч ніколі не кахала. Гэткая пасрэднасьць. Але Шарль… Шарля я абагаўляла, мы былі такія шчасьлівыя, збольшага. Шарль заўжды сам хацеў пісаць, але… (*Яна хіхікае.*) Надта мяне кахаў, таму ў яго ніколі не ставала часу.

Гучыць вальс.

А д э т а (*у маладосьці*). А вы ня прыйдзеце як-небудзь да мяне на кубак гарбаты?

С в а н. У мяне столькі працы — я пішу эсэ пра Вэрмэера.

А д э т а. Вы будзеце зь мяне сьмяяцца, але я нічога ня чула пра гэтага чалавека, празь якога вы ня едзеце да мяне.

С в а н. Ён быў мастаком.

А д э т а. О! У гэтай галаве не спыняецца праца думкі. Якое шчасьце было б для мяне дапамагаць вам у вашых занятках!

С в а н. Не, не! У вас, мусіць, плойма справаў, вы рэдка бываеце вольная.

А д э т а. Хто, я? Мне зусім няма чаго рабіць! Я заўжды вольная, для вас я заўжды буду вольная. Вам захочацца мяне пабачыць — дашліце па мяне ў любы час дня і ночы, і я з задавальненьнем прымчуся да вас. Добра?

С в а н. Даруйце. Я заўжды баюся заводзіць новыя

прывязанасьці. Баюся… стацца няшчасным.

А д э т а. Вы баіцеся прывязанасьцяў? Як дзіўна. А я толькі гэтага і шукаю, я б за гэта жыцьцё аддала. Напэўна, вы шмат пакутавалі празь нейкую жанчыну.

Сцэна: С в а н на самоце. Ён бачыць малога
М а р с э л я , які чытае кнігу.
С в а н глядзіць хлопчыку цераз плячо.

С в а н. Так. Гэта пра Вэрмэера. Я так і думаў, што табе спадабаецца.

Прыём у Пазьнякаў.

М а д а м В э р д у р э н. Сёньня на вечары ў нас будзе мсье Сван.

Д - р К а т а р. Сван? А хто такі гэты Сван?

М а д а м В э р д у р э н. Ды гэта ж сябар Адэты, пра якога яна нам казала.

Д - р К а т а р. Ах, вось хто гэта, цяпер зразумела! Ладзіць вясельлі — мая жарсьць.

М а д а м В э р д у р э н. Дасюль мне надта шанцавала па гэтай частцы.

Д - р К а т а р. Праўда?

М а д а м В э р д у р э н. Нават у жанчын.

Уваходзяць С в а н і А д э т а.

М а д а м В э р д у р э н. А, Адэта… нарэшце.

С в а н. Вельмі ўдзячны, што вы велікадушна мяне запрасілі.

М а д а м В э р д у р э н. Нам так прыемна вас бачыць. Хіба я магу ў чым-небудзь адмовіць гэтай чараўніцы? Бачыце, яна

чырванее!

М с ь е В э р д у р э н. Вы дазволіце, я запалю люльку, мсье Сван? І вы паліце. У нас без цырымоніяў, па-таварыску.

М а д а м В э р д у р э н. Так. Мой муж заўжды кажа: ніякіх цырымоніяў, ніякага снабізму, ніякай пыхі і вытанчаных манераў. А, наш юны геній ужо за раялем! Што вы нам сёньня зайграеце?

Д э ш а м б р (*з усьмешкай*). Санату нейкага Вэнтэйля.

М а д а м В э р д у р э н. Ах, не, не, толькі не маю санату. Бо я зайдуся сьлязьмі. Зь мяне даволі, вам дык што — ніхто з вас потым ня будзе валяцца поўны тыдзень у ложку.

М с ь е В э р д у р э н. Ну што ж, пагодзімся на тым, што ён зайграе толькі андантэ.

М а д а м В э р д у р э н. Толькі андантэ, які ты разумнік! Гэта ўсё адно, што сказаць пра «Дзявятую»: «Паслухаем толькі фінал» альбо «Паслухаем увэртуру да «Майстэрзынгераў».

Д - р К а т а р. Сёньня вы не захварэеце, вось пабачыце. А захварэеце — мы вас вылечым.

М а д а м В э р д у р э н. Праўда? Тады мне застаецца толькі здацца. Ахвярую сабою дзеля мастацтва.

А д э т а (*накіроўваецца да дывановай канапы побач з раялем*). Вы ведаеце, гэта маё ўлюбёнае месьцейка.

М а д а м В э р д у р э н (*заўважыўшы, што Сван сядзіць на крэсьле*). Вам тут няўтульна, сядайце побач з Адэтай. Адэта, мілая, пасунься.

С в а н. Які цудоўны «бавэ».

М а д а м В э р д у р э н. Я вельмі радая, што вам спадабалася мая канапа. Гэта шыкоўна. Мсье Сван! Абавязкова памацайце бронзавыя аздабленьнечкі на сьпінках. Ды вы ня бойцеся, памацайце як сьлед.

Д - р К а т а р. Ну, калі мадам Пазьняк наехала на бронзу, дык музыкі нам сёньня ўжо не пачуць.

М а д а м В э р д у р э н. Маўчыце, непачцівец! Па сутнасьці, нам, жанчынам, забароненыя менш спакушальныя асалоды. Усё ж з гэтым не параўнаецца ніякае цела! Але вы яшчэ пасьпееце яе палашчыць — зараз будуць лашчыць вас самога, будуць лашчыць ваш слых. Мае шаноўныя сябры — Агюс Дэшамбр.

Д э ш а м б р. Саната Вэнтэйля ў фа-дыез.

Д э ш а м б р грае санату Вэнтэйля.
А д э т а праходзіць па пакоі.
С в а н закахаўся ў яе бяз памяці.

А д э т а сядае за фартэпіяна.

С в а н. Зайграйце яшчэ раз.

А д э т а. Яшчэ раз! Толькі адну фразачку — і ўсё. Я так дрэнна граю. (*Ён цалуе яе.*) Выберы што-небудзь адно. Што я павінна: граць ці лашчыцца?

С в а н. Гэта нашая музыка. Гімн нашага каханьня. Якое харaство, праўда?

А д э т а. Вельмі прыгожа.

С в а н. У Батычэльлі ёсьць карціна «Вясна» — гэта вы. Яна — гэта вы.

А д э т а (*лёгка яго цалуе*). Вы такі мілы.

С в а н. Вы казалі, вам патрэбныя грошы.

А д э т а. Мой любы! (*Нахіляецца, каб яго пацалаваць.*)

Сцэна: А л ь б э р т ы н а ўцякае ад М а р с э л я. Той спрабуе яе дагнаць з букетам язьміну ў руках.

А л ь б э р т ы н а. Язьмін, ах, я не выношу паху язьміну.

С в а н дакранаецца да архідэяў на ліфе Адэты.

С в а н. Нічога, нічога, ня бойцеся. Галоўнае, не размаўляйце, адказвайце мне знакамі, іначай вам будзе яшчэ цяжэй дыхаць. Вы нічога ня будзеце мець супраць, калі я папраўлю кветкі на сукні? Яны ў вас ледзь трымаюцца. Як бы яны ня выпалі — я хачу засунуць іх глыбей.

А д э т а. Так, так, вядома, калі ласка.

С в а н. Не, не, галоўнае — не размаўляйце. Паглядзіце: вось тут трошачкі… па-мойму, на вас насыпаўся пылок. Дазвольце, я яго змахну. Так вам ня вельмі непрыемна? Я баюся памяць сукню. А калі я іх панюхаю? Мне хочацца праверыць, пахнуць яшчэ архідэі ці не. Я ня ведаю, як яны пахнуць. Можна?

А д э т а. Дзівак! Вы ж бачыце, што мне гэта ў асалоду.

Сцэна: С э н - Л ю зьнянацку дае
ж у р н а л і с т у поўху.

С э н - Л ю. Мушу заўважыць, шаноўны мсье, што вы ня надта ветлівы.

С в а н стукае ў дзьверы А д э т ы. Цішыня.

С в а н. Даруй, што гэтак позна.

А д э т а. Ты ж не зьбіраўся прыходзіць. Як жа твой банкет?

С в а н. Я рана сышоў. Каб пабачыць цябе.

А д э т а. Мне ад навальніцы зрабілася блага. Разбалелеся галава.

С в а н. Можна, я ўвайду? Я… акурат марыў пра добрую архідэйку.

А д э т а. Не, не мілы. Сёньня ніякіх архідэяў, ты ж бачыш, я дрэнна пачуваюся! Ужо ноч.

С в а н. Яшчэ ўсяго адзінаццатая гадзіна.

А д э т а. Як для мяне, дык ужо самая ноч. Але, для мяне гэта сярэдзіна ночы. (*Мякчэйшым тонам.*) Калі ласка, не цяпер. Заўтра, заўтра ўвечары. Мне будзе лепш, уяві, як усё будзе цудоўна.

Сцэна: м а д м у а з э л ь В э н т э й л ь бегае і зачыняе аканіцы.

М а д м у а з э л ь В э н т э й л ь. Куды табе! Сьмеласьці ня хопіць.

С в а н. Адэта, родная мая, мне ўсё ж трэба спытацца ў цябе нешта.

А д э т а. Ну, што яшчэ? (*Глядзіць на яго.*) Пытаньні, вядома, з падкавыкай.

С в а н. Скажы, ці было ў цябе што-небудзь насамрэч… зь іншымі?

А д э т а. Я так і думала — у цябе на твары напісана. Не. Навошта мне іншыя, дурненькі? У мяне ёсьць ты.

Паўза.

С в а н. А з жанчынамі?

А д э т а. З жанчынамі?

С в а н. Памятаеш, мадам Пазьняк аднойчы казала табе: «Беражыся, я здолею цябе растапіць — ты ж не мармуровая».

А д э т а. Я ж табе казала, ты ж цудоўна ведаеш…

С в а н. Так, ведаю, але ты сама ў гэтым пэўная?

А д э т а. Я табе казала, гэта быў жарт. Проста жарт.

С в а н. У цябе калі-небудзь зь ёю?..

А д э т а. Я ж табе казала, ты ж цудоўна ведаеш… Яна не з такіх.

С в а н. Ты мне не кажы: «Ты ж цудоўна ведаеш», — а скажы: «У мяне ніколі нічога падобнага не было зь ніводнай жанчынай».

Маўчаньне.

С в а н. А ты можаш мне паклясьціся на тваім абразку Лягецкай Божай Маці?

А д э т а. Не, гэта проста кара! Што з табой сёньня? Якая муха цябе ўкусіла?

С в а н. Паклаўшы руку на абразок, скажы «так» або «не», ці было калі-небудзь у цябе гэта?

А д э т а. Ну скуль жа я ведаю? Можа быць… вельмі даўно… прычым я сама не здавала сабе справы… разы два-тры.

Паўза.

С в а н. Колькі дакладна?

А д э т а. Ах, Шарль, ты мяне замучыў! (*Невялічкая паўза.*) У пракаветныя часы. Я зусім пра гэта забыла — можна падумаць, што ты наўмысна мне нагадваеш.

С в а н. Пытаньне цалкам натуральнае. Згадзіся. Адэта, мая радасьць, ты ж не магла забыцца — з кім… Напрыклад — апошнім разам.

А д э т а расслабляецца і пачынае гаварыць больш разьняволена.

А д э т а. Ды не, ня памятаю. Здаецца, у Булёнскім лесе, калі ты прыехаў да нас на выспу. Ты вячэраў у прынцэсы дэ Лём. За суседнім столікам сядзела жанчына, зь якой мы вельмі даўно ня бачыліся. Яна мне прапанавала: «Зойдзем вунь за той камень, паглядзім, як вада блішчыць пад месяцовым сьвятлом». Я пазяхнула і адказала ёй: «Не, я стамілася, мне і тут добра». Яна пачала пераконваць мяне, што сёньня месяцовае сьвятло

нейкае асабліва прыўкраснае. Я сказала ёй: «Байкі!» Я выдатна разумела, чаго ёй хочацца.

А д э т а сыходзіць.

С в а н. Як жа так? Я забіў некалькі гадоў жыцьця, я хацеў памерці толькі таму, што ўсёй душою кахаў жанчыну, якая мне не падабалася, жанчыну не па маім гусьце!

Дом м с ь е В э н т э й л я ў Манжувэне. 1895 г.

М а д м у а з э л ь В э н т э й л ь зь с я б р о ў к а й.

С я б р о ў к а. Ну калі ўжо ты перастанеш насіць гэтую брыдкую сукенку? Не зьбіраесься ж ты вечна хадзіць у жалобе па сваім бацьку?

М а д м у а з э л ь В э н т э й л ь ідзе зачыніць акаціцы.

С я б р о ў к а. Не зачыняй, мне горача.

М а д м у а з э л ь В э н т э й л ь. Але ж гэта брыдка, нас могуць убачыць. (*Сяброўка ўсьміхаецца.*) Убачаць, як мы чытаем — чым бы мы ні займаліся, хоць бы самай звычайнай справай.

С я б р о ў к а. Так, тут людное месца, на нас, пэўна, глядзяць. Ну і што ж з таго? (*Паўза.*) А дзе твая кніга?

М а д м у а з э л ь В э н т э й л ь. Якая кніга?

С я б р о ў к а. Як жа чытаць бяз кнігі, дурнічка? У любым выпадку, я не чытаю, я думаю.

М а д м у а з э л ь В э н т э й л ь. Я бачу, сёньня ў вас, мадмуазэль, вельмі нясьціплыя думкі.

С я б р о ў к а падыходзіць да м а д м у а з э л ь В э н т э й л ь і цалуе яе.
М а д м у а з э л ь В э н т э й л ь вырываецца, і с я б р о ў к а гоніцца за ёй,

М а д м у а з э л ь В э н т э й л ь падае на канапу, сяброўка кладзецца на яе зьверху.

М а д м у а з э л ь В э н т э й л ь. Ах, на нас глядзіць партрэт бацькі!

С я б р о ў к а абарочваецца і бярэ фатаздымак.

С я б р о ў к а (*шэптам*). Ведаеш, што я б зрабіла з гэтым старым пудзілам?

М а д м у а з э л ь В э н т э й л ь. Куды табе! Сьмеласьці ня хопіць.

С я б р о ў к а. Ня хопіць сьмеласьці плюнуць? Вось на гэта?

Плюе на фатаздымак.

Сцэна:

А л ь б э р т ы н а. Мая прыяцелька — самая блізкая сяброўка дачкі Вэнтэйля, з дачкой Вэнтэйля я таксама сяброю. Я іх абедзьвюх называю маімі старэйшымі сёстрамі.

Б а ц ь к а. А, Марсэль, хадзі сюды. Я хачу цябе пазнаёміць зь ягамосьцю амбасадарам маркізам дэ Нарпуа.

class="t2" Яны кланяюцца адзін аднаму.
М а р к і з у д э Н а р п у а — семдзесят гадоў.

М а р с э л ь. Добры вечар, вашамосьць.

Н а р п у а. Добры вечар. Твой бацька кажа, што ты хочаш стаць пісьменьнікам?

М а р с э л ь. Я… так, вашамосьць, пэўна, так.

Н а р п у а. А не дыпляматам?

М а р с э л ь. Пэўна… вашамосьць.

Н а р п у а. І ты ня маеш жаданьня пайсьці слаўным шляхам свайго бацькі?

Б а ц ь к а. Вядома, Марсэлю яшчэ зарана прымаць канчатковае рашэньне.

Н а р п у а. Кар’ера пісьменьніка можа прынесьці наўзьдзіў добры плён, так бы мовіць, калі захоўваецца належная раўнавага паміж працавітасьцю, рашучасьцю і амбітнасьцю ў спалучэньні зь ясным усьведамленьнем сваіх слабых і моцных бакоў, і, вядома, (*з усьмешкай*) пэўным талентам, калі аўтар ім надзелены. Вось акурат у сына майго сябра, *mutatis mutandis*, тое ж, што і ў вас. Два гады таму ён выпусьціў кнігу пра адчуваньне бясконцасьці, што ўзьнікае на заходнім беразе возера Вікторыя-Ньянца, а ў гэтым годзе — менш значную працу, зрэшты, напісаную борзка, часам нават не бяз кплівасьці: пра аўтаматычную зброю ў баўгарскай арміі. Гэтыя два творы зрабілі яму імя. Ён прабіўся, далёка пойдзе. Мне вядома, што хоць ягоная кандыдатура яшчэ не вылучалася, пра яго згадвалі — у прыхільным для яго сэнсе, — у Акадэміі маральных навук.

Б а ц ь к а. Праўда?

Н а р п у а. О, так, ён, не шкадуючы высакародных намаганьняў, заваяваў сабе цудоўнае становішча, і посьпех, які далёка не заўсёды выпадае на долю крыкуноў і выскачак, — посьпех узнагародзіў ягоныя высілкі. (*Да Марсэля.*) Што ты напісаў?

М а р с э л ь. Што-што, вашамосьць?

Н а р п у а. Што ты ўжо напісаў?

М а р с э л ь. На жаль… нічога… яшчэ не завяршыў.

Б а ц ь к а бярэ аркуш паперы са стала.

Б а ц ь к а. А гэта?

М а р с э л ь. Што?

Б а ц ь к а. Твой твор. Верш у прозе, ці як там ты казаў. Пра шпілі Мартынвілю.

М а р с э л ь (*зьляканы*). О, не! Не… гэта…

Б а ц ь к а. Ён жа дапісаны, хіба не?

М а р с э л ь. Так, але гэта было так даўно… Ён… дзіцячы.

Н а р п у а. Часта раньнія спробы пяра шмат пра што гавораць. (*Бацьку.*) Вы дазволіце?

Б а ц ь к а (*перадае аркуш*). Вядома, калі ласка.

Н а р п у а (*праглядае яго, мармыча*). Шпілі.

Цішыня. Н а р п у а прачытвае верш, адрывае позірк ад паперы, прачышчае горла, вяртае аркуш М а р с э л ю, доўга і ўважліва глядзіць на яго. Б а ц ь к а бярэ аркуш, кладзе яго назад на стол.

Б а ц ь к а. Ну, а цяпер — вячэраць?

Сцэна: Бальбэк.

А л ь б э р т ы н а і невялічкая купка дзяўчат.

Б а б у л я. Мадам, дазвольце пазнаёміць вас з маім унукам. Марсэль — маркіза дэ Вільпарызі.

М а р к і з а д э В і л ь п а р ы з і. А, добры дзень! Я сутыкнулася з вашай бабуляй у дзьвярах крамы. І ведаць ня ведала, што яна ў Бальбэку. Які прыемны сюрпрыз. Дазвольце пазнаёміць вас з маімі двума пляменьнікамі. Дакладней — з пляменьнікам і ўнучатым пляменьнікам. Адзін даводзіцца другому дзядзькам, а я — цётка ім абодвум. Барон дэ Шарлю.

Ш а р л ю, не падымаючы вачэй на М а р с э л я, ня зьняўшы пальчаткі, сагнуўшы мезенец, указальны і вялікі палец, працягвае яму сярэдні і безыменны.
М а р с э л ь паціскае іх.

М а р к і з а д э В і л ь п а р ы з і. І маркіз дэ Сэн-Лю-ан-Брэ.

Твар і цела С э н - Л ю не зварухнуліся, у вачох нічога не выяўляецца.
Ён рэзка выкідвае наперад руку. М а р с э л ь яе паціскае.

Сцэна: невялічкая купка дзяўчат.

Д з я ў ч ы н а. Здаецца, ён на мяне зірнуў. Ён праўда на мяне зірнуў.

Астатнія д з я ў ч а т ы сьмяюцца.

С э н - Л ю і М а р с э л ь у рэстаране.

С э н - Л ю. Нячаста сустрэнеш чалавека, які цікавіцца пісьменствам, які хоча пісаць, каго хвалюе праблема выказваньня перажытага ў словах.

С э н - Л ю чакае, што адкажа М а р с э л ь. Той маўчыць.

С э н - Л ю. Высокі сьвет, да якога я маю няшчасьце належаць, — недасьведчаная і сябелюбная каста. Іх вытанчаныя жэсты, манеры, гонар, выхаваньне — усё за стагодзьдзі выродзілася ў сапраўдную пошласьць. Яны ніколі нават не задумляюцца, што ў іхным пазэрстве і прэтэнцыйнасьці ўжо выяўляецца нішчымнасьць розуму. Ды яны нічога ня ведаюць і нічым не цікавяцца, апроч грошай і становішча ў сьвеце. Мяшчане.

Афіцыянт абслугоўвае іх.

С э н - Л ю. Вы на мяне неяк няўхвальна паглядалі, калі я прабіраў сёньня фурмана.

М а р с э л ь. Сапраўды, вы абыходзіліся зь ім досыць груба.

С э н - Л ю. Навошта ж мне гуляцца зь ім у ветлівасьць? Хіба мы зь ім ня роўныя? Ці вы думаеце, што я мушу ставіцца да яго з асаблівай павагай на той падставе, што ён быццам бы ніжэйшы за мяне? Хіба ён не такі ж блізкі мне, як мае дзядзькі ці стрыечныя сёстры? Вы разважаеце, як арыстакрат. Маёй сям'і вельмі не падабаецца, што я кахаю акторку. Ды ў яе ў адным

мезенцы больш вытанчанасьці і чуласьці, чым ува ўсіх іх разам узятых. Аднак трэба прызнаць: я ад яе вар'яцею. Яна мне ўвесь час сьніцца. Мінулай ноччу мне сьнілася, што я ў вёсцы ў обэр-вахмістра. Мы сядзім зь ім і п'ём. Раптам я чую… перарывістыя ўскрыкі… ускрыкі, што вырываюцца зь яе грудзей. Яна ў сваім пакоі зь іншым. Я чуў ейныя ўскрыкі, але обэр-вахмістар не пушчаў мяне да яе. Такі вось ідыёцкі сон. Цалкам немагчымы.

С э н - Л ю сыходзіць.

М а р с э л ь кліча а ф і ц ы я н т а.

М а р с э л ь. Вады, калі ласка.

А ф і ц ы я н т. Хвіліначку, мсье барон.

М а р с э л ь. Я не барон.

А ф і ц ы я н т. Даруйце, мсье граф.

С э н - Л ю прабягае па вузкім карнізе, як канатаходзец у цырку.

Воплескі.

С э н - Л ю працягвае Марсэлю ягонае паліто.

С э н - Л ю. Здаецца, пахаладала.

Сцэна: д з я ў ч а т ы пераскокваюць цераз с т а р о г а.

Д з я ў ч ы н а (*гучна*). Бедны старыкан, мне яго шкада. Як бы ён ня здырдзіўся.

Ноч. Спальня М а р с э л я. Ціхі стук у дзьверы.

М а р с э л ь. Хто там?

Ш а р л ю. Гэта Шарлю. Можна да вас? Мой пляменьнік сказаў, што вам сумна бывае перад сном, а яшчэ ён сказаў, што вы

захапляецеся Анатолем Франсам. Я знайшоў у сябе ягоную кнігу — вы, напэўна, яе не чыталі, і я вам яе прынёс: калі засумуеце, яна разгоніць ваш сум.

М а р с э л ь. Дзякуй вялікі. Але пэўна вы думаеце, што калі ноч гэтак дзейнічае на мяне, я яшчэ дурнейшы, чым здаюся.

Ш а р л ю. Ды не! Можа быць, вы чалавек шараговы, але ж нешараговых людзей гэтак мала. А пакуль вы, прынамсі, малады, у маладосьці заўжды ёсьць нешта чароўнае. Але вы любіце маці — гэта вельмі добра. І потым, гэтая прывязанасьць — разумная, то бок, я хачу сказаць, узаемная. Гэта далёка ня часта сустракаецца.

Ш а р л ю ходзіць па пакоі ў задуменьні.

Ш а р л ю. У мяне тут ёсьць яшчэ адна кніга Анатоля Франса, я вам яе дам.

Ш а р л ю нікуды не ідзе. Яны стаяць моўчкі.

М а р с э л ь. Вы дарэмна турбуецеся. Мне дастаткова адной кнігі.

Ш а р л ю. Так, хіба што.

Паўза.

Ш а р л ю (*рэзка*). Дабранач.

Сцэна: некалькі напаўаголеных п р а ч а к стаяць у рацэ і мыюць бялізну.

А л ь б э р т ы н а, амаль ня бачная за імі, на беразе адкідаецца ў экстазе.

А л ь б э р т ы н а. Ах, якая асалода… якая асалода!

П р а ч к і заміраюць. Чуваць толькі іх дыханьне.

Г о л а с. Заносім перагародку. Асьцярожна — перагародка!

Запальваецца асьвятленьне. Вобраз распадаецца…

Закулісьсе тэатру. Антракт. Р а б о ч ы я с ц э н ы перасоўваюць дэкарацыі. На сцэну выходзяць М а р с э л ь і С э н - Л ю. Апроч іх, там завіхаецца шмат іншых людзей.
Т а н ц о р, які рэпэтуе на авансцэне, адыходзіць назад, выкарыстоўвае раяль замест станка. На сцэну выходзяць два ж у р н а л і с т ы. Адзін зь іх паліць цыгару.

Ж у р н а л і с т (*да рабочага сцэны, што праходзіць міма*). Я зь «Ле Суар». Ён з «Нувэль Абсэрватэр». Мы шукаем мсье Бувэ.

Р а б о ч ы. Ён за хвіліну будзе.

С э н - Л ю. Ну як вам?

М а р с э л ь. Вы пра Рахіль? Яна цудоўна трымаецца на сцэне.

С э н - Л ю. Сапраўды — яна нібы бліскавіца. І прыгожая, праўда?

М а р с э л ь. Вельмі ўражвае.

Р а б о ч ы я працягваюць пераносіць дэкарацыі.

С э н - Л ю. Яшчэ хвілінку — яна зараз прыйдзе. Ёй вельмі хочацца з вамі пазнаёміцца.

М а р с э л ь. Пакуль яна не прыйшла… Хацеў у вас запытацца.

С э н - Л ю. Слухаю.

М а р с э л ь. Вашая цётка, герцагіня дэ Германт…

С э н - Л ю. Так…

М а р с э л ь. Па-мойму, яна лічыць мяне за поўнага ідыёта.

С э н - Л ю. Чаму вы гэтак кажаце?

М а р с э л ь. Ходзяць чуткі… вось і ўсё.

С э н - Л ю. Ня думаю. Вы зь ёй знаёмы?

М а р с э л ь. Не.

С э н - Л ю. Я вас пазнаёмлю.

М а р с э л ь. Калі?

С э н - Л ю. Як-небудзь… пры нагодзе.

Да ж у р н а л і с т а ў падыходзіць ч а л а в е к. Чуваць, як адзін зь іх кажа:

Ж у р н а л і с т. Мы чакаем мсье Бувэ.

С э н - Л ю (*да Марсэля, няпэўна*). Як вам пішацца?

М а р с э л ь. Ды ніяк.

Зьяўляецца Р а х і л ь.

С э н - Л ю (*цалуе яе*). Дарагая, ты проста цуд. Дазволь пазнаёміць цябе з Марсэлем. Марсэль, гэта Рахіль.

Яны паціскаюць рукі.

М а р с э л ь. Прыміце мае віншаваньні.

Р а х і л ь. Вам спадабалася?

М а р с э л ь. Вельмі!

С э н - Л ю. Ты цудоўна грала.

Р а х і л ь. Як можна цудоўна граць у такой маленькай ролі? Вось у наступным сэзоне я буду выступаць у галоўных ролях. Тады паглядзіце.

Кажучы гэта, Р а х і л ь пераводзіць позірк на т а н ц о р а, які рэпэтуе каля раяля.

С э н - Л ю. Куды ты глядзіш?

Р а х і л ь. Ммммм?

С э н - Л ю. Чаму ты на яго глядзіш?

Р а х і л ь. На каго?

С э н - Л ю. На таго танцора, ліха на яго.

Р а х і л ь. Няўжо?

Р а б о ч ы я с ц э н ы, перасоўваючы дэкарацыі, прыціскаюць С э н - Л ю, Р а х і л ь і М а р с э л я бліжэй да журналістаў, якія зь цікавасьцю слухаюць іх размову.

Р а х і л ь. А чаму б і не? Паглядзі, як гожа ён складзены. Якія рукі…

Т а н ц о р апрануты як паж з карціны Вато, павекі густа нафарбаваныя, на шчоках — густы слой румянаў. Пачуўшы словы Р а х і л ь, ён вельмі грацыёзна паўтарае рух рукамі.

Р а х і л ь. Якая грацыя.

С э н - Л ю. Перастань, іначай я адразу ж сыду, зразумела? (*Марсэлю.*) Ня дыхайце цыгарным дымам, вам зробіцца блага.

Р а х і л ь (*да Сэн-Лю*). Ах, якое будзе шчасьце, калі ты сыдзеш!

С э н - Л ю. Але я не вярнуся — папярэджваю.

Р а х і л ь. Тым лепей.

С э н - Л ю. Паслухай, ты памятаеш, я абяцаў падараваць табе кальe…

Р а х і л ь. Ах, як міла! Ты вырашыў мяне шантажаваць. Я не такая карысьлівая, як ты. Пляваць мне на тваё кальe — мне яго іншы падаруе.

С э н - Л ю. Значыць, ты хочаш, каб я сышоў? Так?

Р а х і л ь. Ах, якія ў яго чароўныя рукі!

М а р с э л ь кашляе.

С э н - Л ю (*да журналіста*). Шаноўны мсье! Ці нельга вас папрасіць не паліць? Мой сябар не трывае дыму.

Р а х і л ь (*да танцора*). А гэтыя ручкі, гэтыя цудоўныя ручкі і з жанчынамі гэтак жа дзівосна абыходзяцца? Рукі — як дзявочыя. Ды ты і сам падобны да жанчыны. Мне думаецца, што вы з адной маёй прыяцелькай лёгка паразумеліся б.

Р а х і л ь сыходзіць.

Ж у р н а л і с т. Наколькі мне вядома, тут не забаронена паліць. Вашага сябра нішто не змушае тут заставацца.

С э н - Л ю. Мушу заўважыць, шаноўны мсье, што вы ня надта ветлівы.

С э н - Л ю з усяе моцы дае ж у р н а л і с т у поўху.

А с ы с т э н т р э ж ы с э р а праходзіць цераз сцэну, звонячы ў званочак.

А с ы с т э н т. Займаем месцы, шаноўнае спадарства. Пачынаем.

Д р у г і ж у р н а л і с т. Божа мой, зараз падымецца заслона. Нашы месцы зоймуць.

С э н - Л ю заўважае, што М а р с э л ь глядзіць на яго.

С э н - Л ю сыходзіць.

Дом б а р о н а д э Ш а р л ю. Ноч.

Ш а р л ю ў кітайскім халаце.

Л ё к а й праводзіць М а р с э л я ў пакой і сыходзіць. На крэсьле, на складзеным плашчы — цыліндар з бліскучым верхам.

Ш а р л ю моўчкі глядзіць на М а р с э л я.

М а р с э л ь. Добры вечар.

Адказу няма. Ш а р л ю ўтаропіў у М а р с э л я бязьлітасны позірк.

М а р с э л ь. Я абавязкова мушу стаяць?

Маўчаньне.

Ш а р л ю. Сядайце ў фатэль Людовіка XIV.

М а р с э л ь сядае на бліжэйшы да яго фатэль.

Ш а р л ю. На вашую думку, гэта фатэль Людовіка XIV? Адразу відаць, што вы юнак адукаваны. Гэтак вы прымеце калені мадам дэ Вільпарызі за ракавіну і чорт ведае што наробіце.

Паўза.

Ш а р л ю. Шаноўны мсье, гэтая размова, якой я вас спадобіў у выглядзе выключнае ласкі, паставіць у нашых адносінах кропку.

Ён выцягвае руку ўздоўж сьпінкі канапы.

Ш а р л ю. Паколькі я — усё, а вы — нішто, я зрабіў першы крок. Вы мелі глупства на гэта адказаць, што ня мне гаварыць пра высакародзтва. Я толькі ўсьміхаўся ў адказ на вашае нахабства, калі толькі можна назваць нахабствам вашыя паводзіны з чалавекам, на столькі галоў вышэйшым за вас. Але — гэта маё апошняе слова, якое я скажу вам на гэтым сьвеце, я жадаю абараніць сябе ад вашых паклёпніцкіх плётак.

Паўза.

М а р с э л ь. Шаноўны мсье барон, я ні з кім пра вас не размаўляў.

Ш а р л ю. Вашыя паводзіны сьведчаць ня толькі пра недахоп выхаваньня, добрых манер і чуласьці, але і самага звычайнага сярмяжнага глузду. На жаль, у іншым месцы і пры іншых абставінах вы казалі пра мяне зусім іншае.

М а р с э л ь. Клянуся вам, барон, што я нічога крыўднага пра вас не казаў.

Ш а р л ю (*вельмі злосна*). А хто вам сказаў, што я пакрыўджаны? Няўжо вы ўяўляеце, што я магу на вас пакрыўдаваць? Ды вы ведаеце, з кім размаўляеце? Дазвольце вас запэўніць, што атрутная сьліна пяцісот вашых прыяцеляў, хоць бы яны ўскараскаліся адзін на аднога, магла б запэцкаць толькі вялікія пальцы на маіх ступаках.

М а р с э л ь разьятрана глядзіць на яго, накідваецца на новы цыліндар Ш а р л ю, шпурляе яго на падлогу, топча, зрывае падкладку і разьдзірае баронскую карону.

Ш а р л ю. Што вы робіце? Вы звар'яцелі?

М а р с э л ь кідаецца да дзьвярэй. Ш а р л ю заступае яму дарогу.

Ш а р л ю. Досыць, досыць дзяцінства, зайдзіце да мяне на хвілінку. Сувора карае той, хто горача любіць, і калі я вас сувора пакараў, дык толькі таму, што горача люблю вас. Куанье!

Заходзіць л ё к а й.

Ш а р л ю. Забярыце гэты цыліндар і падайце новы.

Ш а р л ю і М а р с э л ь стаяць; л ё к а й падбірае ашмёткі разьдзёртага цыліндра.

М а р с э л ь. Ужо вельмі позна. Мне трэба дахаты.

Ш а р л ю. Што ж… Аднак калі вы стаміліся… я мог бы даць у вашае распараджэньне пакой.

М а р с э л ь. Дзякуй. Але я ня стомлены.

Ш а р л ю. Ну дык вось, праўда гэта ці няпраўда, але мая прыхільнасьць да вас памерла. Уваскрасіць яе не ў маёй уладзе. Я магу сказаць пра сябе словамі Ваоза зь Віктора Юго: «Я ўдавец, я адзін, і спускаецца вечар».

М а р с э л ь маўчыць.

Ш а р л ю. Ну, я сваю ролю адыграў, скажу яшчэ некалькі словаў. Няхай выпадак са мною будзе вам урокам. Гэтага ўрока вы не забывайце. Добрае стаўленьне трэба цаніць. Бывайце!

М а р с э л ь сыходзіць.

Вуліца.

Зь ценю зьяўляецца Ж у п ’ е н.

Ш а р л ю. У вас часам ня знойдзецца запалак?

Ж у п ’ е н. Калі ласка.

Ш а р л ю. Я прашу ў вас запалак, а сам забыў дома цыгары.

Ж у п ’ е н. Заходзьце! Тут вам дадуць усё, што заўгодна.

Сцэна: М а р с э л ь слухае, як Ш а р л ю і Ж у п ’ е н займаюцца сэксам.

У цемры чыркае запалка.

Ж у п ’ е н. Навошта вы голіцеся? Прыгожая барада так надае вабнасьці.

Ш а р л ю. Фу, якая брыдота! Вы ведаеце таго, хто гандлюе на рагу каштанамі, але толькі ня зь левага боку — там гандлюе нейкае страшыдла, — а з правага: высокага, смуглявага дзецюка?

Ж у п ’ е н. А вы, як я гляджу, аматар заляцацца.

Ш а р л ю. Я вяртаюся да размовы пра трамвайнага кандуктара таму, што, апроч усяго іншага, гэта можа мне спатрэбіцца на зваротным шляху. Сапраўды, іншым разам я, як халіф, што абышоў Багдад пад выглядам простага гандляра, іду ўсьлед за цікавай маладой асобай, чый сылюэт захапіў маё ўяўленьне. Каб ня страціць яго з вачэй, я ўскокваю за ім у трамвай. Калі ён

перасаджваецца ў іншы трамвай, я бяру — можа, разам з чумнымі мікробамі — «перасадачны квіток», нумар якога, хоць яго даюць *мне*, не заўсёды бывае першы. Часам я аб адзінаццатай гадзіне вечара даяжджаю да Арлеанскага вакзалу. І, каб ня так сумна было ехаць насамоце, мне хацелася б пазнаёміцца з правадніком спальнага вагона, з кандуктарам омнібуса. Вы маглі б быць маім агентам. Зрабілі б мне добрую паслугу.

Ж у п ’ е н. Як ужо не аднойчы рабіў.

Ш а р л ю. Вы чулы чалавек. Па вашым твары адразу відаць.

Ж у п ’ е н. Прыемна пачуць.

Ш а р л ю лезе ў кішэню па грошы.

Ж у п ’ е н. Не. Ня трэба грошай. Мне было прыемна зрабіць вам паслугу.

Ш а р л ю. Мне таксама было прыемна.

Ш а р л ю сыходзіць.

Вуліца.

Ж у п ’ е н (*нейкаму мужчыну*). Ён заўжды такі прыязны. Ніколі ня скажаш, што герцаг.

Яны сыходзяць разам.

Сцэна: д з я ў ч а т ы танчаць на тэрасе ў Бальбэку. Каляровае асьвятленьне, сэнтымэнтальная музыка.

М а р с э л ь. Як добра яны танчаць!

Д-р Катар. Так, але куды глядзяць бацькі? Тут дзяўчаты набываюць благія звычкі. Я сваім дочкам ніколі не дазволіў бы сюды ехаць. А яны хоць бы прыгожанькія? Я не магу разгледзець, якія ў іх твары. Вось, глядзіце — я забыў пэнснэ і дрэнна бачу, але нават мне зразумела, што яны на вяршыні

асалоды. Мала каму вядома, што жанчыны адчуваюць асалоду галоўным чынам грудзьмі. Ну вось, глядзіце, іх грудзі прыціскаюцца ўшчыльную.

Сцэна:

А л ь б э р т ы н а: Я не хачу, але магла б.

М а р с э л ь у спальні свайго нумару ў гатэлі. Падыходзіць да сьцяны. Троху марудзіць, а затым асьцярожна стукае тры разы. Паўза. І тры ўдары з суседняга пакою.

Заходзіць б а б у л я.

Б а б у л я. Табе блага?

М а р с э л ь. Не. Проста стаміўся.

Хістаючыся, падыходзіць да крэсла.

М а р с э л ь. Праўду кажучы… праўду кажучы, я думаў, што буду сумаваць без матулі ў Бальбэку, але вось не сумую. Доктар меў поўную слушнасьць наконт каньяку. Поўную. Мне значна лепей.

Б а б у л я падыходзіць да яго, дакранаецца да ягонага лба. М а р с э л ь моцна яе абдымае і цалуе ў шчаку. Яна абдымае яго.

Б а б у л я. Ну-тка, падыміся. (*Ён падымаецца.*) І давай здымем чаравікі.

М а р с э л ь. Не, я…

Б а б у л я. Не-не, я сама… Мне няцяжка. Толькі абапрыся рукой мне на плячо — і ўсё.

Укленчыўшы, яна разьвязвае яму матузкі, а ён паглядае на яе сур'ёзна, зьверху ўніз.

Сцэна: праз адтуліну ў жывой агароджы малы М а р с э л ь

бачыць трынаццацігадовую Ж ы л ь б э р т у. Яна робіць непрыстойны рух у яго бок.

А д э т а (*кліча*). Жыльбэрта, хадзі сюды. Што ты там робіш?

Ж ы л ь б э р т а зьбягае. А д э т а ў суправаджэньні Ш а р л ю ідзе за ёю.

Купка д з я ў ч а т з кошыкамі прысмакаў і з дыванком. Пікнік на вяршыні скалы ў Бальбэку.

Д э л ь ф і н а. Хочаце сэндвіч?

М а р с э л ь. Не, мне больш даспадобы гэта.

А л ь б э р т ы н а. Што?

М а р с э л ь. Шакалядны эклер.

Маўчаньне. Усе жуюць.

А л ь б э р т ы н а. Мабыць, вы ня любіце сэндвічаў?

М а р с э л ь. Так, ня надта.

Маўчаньне.

Ж ы з э л ь. Ну як табе, Андрэ?

А н д р э ўсьміхаецца.

А л ь б э р т ы н а. Вы тут нічым не займаецеся? Вас не відаць ні на гольфе, ні на вечарох у казіно, і конна вы ня езьдзіце. Вы не знаходзіце, што можна звар'яцець, калі ўвесь час бавіцца на пляжы? Я бачу, вы любіце грэцца на сонейку. У нас з вамі розныя густы — я люблю ўсе віды спорту. Але, вядома, з большасьцю астатніх гульцоў у гольф — туга сьмяротная.

Паўза.

А л ь б э р т ы н а. Вы думаеце толькі пра тое, як бы пазнаёміцца з маімі сяброўкамі. Вы надта высокай пра іх думкі.

Ня думайце пра іх — яны нічога зь сябе не ўяўляюць. Што можа знайсьці ў гэтых дзеўках такі чалавек, як вы? Андрэ, прынамсі, надзіва разумная. Яна добрая дзяўчынка, хоць і поўная дзівачка, а іншыя, шчыра кажучы, вельмі бязглуздыя.

Дз я ў ч а т ы пачынаюць гуляць у мудрагелістую гульню, намагаючыся злавіць адна адну.

А л ь б э р т ы н а. Божа! Колькі часу? Ды нас жа запрасіла мадам Дур'е!

А н д р э. Мы пасьпеем.

А л ь б э р т ы н а. Ну, як хочаш, а я лячу; па-мойму, твой гадзіньнік адстае.

А н д р э. Мне хочацца зь ім пагутарыць.

А л ь б э р т ы н а. Ты спозьнісься.

А н д р э. Паслухай, міленькая, не дурыся.

А л ь б э р т ы н а. Ну, як хочаш. У мяне для вас цыдулка. (*Перадае яму капэрту.*) Хутчэй, хутчэй, бо спозьнімся.

Дз я ў ч а т ы зьбіраюць свае рэчы і, задыханыя, сьмеючыся, зьбягаюць.

М а р с э л ь. Можна, я раскрыю?

А н д р э. Калі ласка.

Ён разьдзірае капэрту, чытае і перадае А н д р э.

А н д р э. «Вы мне падабаецеся». (*Вяртае цыдулку Марсэлю і ўсьміхаецца.*) Ведаеце, яна сірата.

Сцэна: Л е а вальсуе зь с я б р о ў к а й.

А л ь б э р т ы н а. Я пераначую ў вашым гатэлі. Я вяртаюся ў Парыж першым цягніком, адтуль на вакзал ідзе омнібус.

Пасядзіце са мною, пакуль я павячэраю ў ложку, а потым мы пагуляем, ува што пажадаеце.

М а р с э л ь. О так.

А л ь б э р т ы н а. Я ўклала валасы, каб дагадзіць вам. Праўда, вам падабаецца?

Ф р а н с у а з а дапамагае б а б у л і прымяраць капялюшыкі.

Ф р а н с у а з а. Маркіз дэ Сэн-Лю зьбіраецца сфатаграфаваць вашую бабулю. Яна ў такімі захапленьні, што нават апранула свае найлепшыя строі.

Б а б у л я. Ну хіба ня глупства? Маркіз…

М а р с э л ь. Па-мойму, гэта фрывольна і сьмеху варта.

Ф р а н с у а з а. На ёй будзе капялюшык, які аздобіла Франсуаза.

М а р с э л ь. Які?

Ф р а н с у а з а. Той, што цяпер на ёй.

Ён нічога ня кажа.

Б а б у л я. Табе не падабаецца?

М а р с э л ь. Вельмі элегантна.

Б а б у л я. Калі ты лічыш, што мне ня трэба…

М а р с э л ь. Ды не, рабі, як хочаш. Хоць у тваім узросьце я б падумаў… Ну, добра, я пайду. Прыбірайцеся.

Сыходзіць.

Б а б у л я. У мяне такі хворы выгляд. Дзякуй, Франсуаза. Пад капялюшыкам будзе незаўважна.

Уваходзіць С э н - Л ю.

С э н - Л ю. Які пекны капялюшык.

С э н - Л ю фатаграфуе бабулю.

Пакой А л ь б э р т ы н ы ў гатэлі. Ноч. На ёй пэньюар. Валасы распушчаныя.

А л ь б э р т ы н а. Я легла яшчэ да вячэры — я крыху прастыла.

М а р с э л ь. Прастыла?

А л ь б э р т ы н а. Не, мяне ўжо не ліхаманіць. Я ўгрэлася ў ложку. Я сказала, што крыху прастыла, і пайшла ў ложак. Сядайце.

М а р с э л ь нахіляецца і спрабуе пацалаваць А л ь б э р т ы н у.

А л ь б э р т ы н а. Перастаньце, а тое я зараз пазваню!

Ён яе цалуе. Яна звоніць у званок.

М а ц і. Марсэль, наколькі я зразумела, твой шлюб з Альбэртынай — мара ейнай цёткі.

М а р с э л ь (*зьдзіўлена*). Сапраўды?

М а ц і. Як шмат ты выдаткоўваеш на яе грошай. Па-мойму, ты ім усім вельмі сымпатычны. Але і раскоша, якой, як ім здаецца, ты можаш яе атачыць, і сякія-такія сувязі, што, наколькі ім вядома, у нас ёсьць, — усё гэта таксама, мне думаецца, адыгрывае тут не апошнюю ролю.

Паўза.

М а р с э л ь. А якой ты думкі пра яе?

М а ц і. Ды ня мне ж зь ёю жаніцца. І калі ты будзеш зь ёю шчасьлівы, я буду да яе добра ставіцца.

М а р с э л ь. Мне тужліва зь ёю. Я не зьбіраюся зь ёю пабрацца.

М а ц і. Тады мне варта менш зь ёй бачыцца.

Уваходзіць Ф р а н с у а з а.

Ф р а н с у а з а. Мадмуазэль Альбэртына прыйшла.

М а р с э л ь. Скажы ёй, што я не магу яе прыняць.

Ф р а н с у а з а. І я гэтак думаю. Ад гэтых дзявуль адна няслава.

Сцэна: м а д м у а з э л ь В э н т э й л ь зачыняе аканіцы.

М а д м у а з э л ь В э н т э й л ь. Куды табе! Сьмеласьці ня хопіць.

А л ь б э р т ы н а і М а р с э л ь у ложку.
А л ь б э р т ы н а ўскоквае, папраўляе адзеньне, расчэсве валасы.

А л ь б э р т ы н а. Мне трэба ехаць.

М а р с э л ь. Куды? Чаму?

А л ь б э р т ы н а. Трэба быць у адным месцы а пятай.

М а р с э л ь. Дзе?

А л ь б э р т ы н а. У Энфрэвілі. У адной страшэнна зануднай дамы — цётчынай сяброўкі.

М а р с э л ь. Але вы пра гэта ня згадвалі, калі прыйшлі.

А л ь б э р т ы н а. Я не хацела вас засмучаць. Яна прымае штодня а пятай. Мне нельга спазьняцца.

М а р с э л ь. Але ўсё ж можна і ня ехаць.

А л ь б э р т ы н а. Яна чакае мяне. Чакае, што я прыеду.

М а р с э л ь. Яна ж прымае штодня.

А л ь б э р т ы н а. Так, штодня… Але сёньня я прызначыла ў яе сустрэчу маім сяброўкам. Мне будзе ня так нудна.

М а р с э л ь. Альбэртына! Калі вы баіцеся, як бы вам не было там нудна, і ўсё ж вырашаеце пакінуць мяне хворага, няшчаснага, аднаго, значыць, вы аддаяце перавагу нуднай даме і сяброўкам перада мною?

А л ь б э р т ы н а. Я дзеля сябровак. Я прывязу іх дадому ў маёй двуколцы. Іначай ім адтуль ня выбрацца.

М а р с э л ь. Але цягнікі з Энфрэвілю ходзяць аж да дзясятай вечара.

А л ь б э р т ы н а. Гэта слушна, але, разумееце, можа быць, нас папросяць застацца вячэраць.

Паўза.

М а р с э л ь. А ведаеце што, Альбэртына: усё можна зладзіць вельмі проста. Я адчуваю, што на паветры мне будзе лепей. Калі вы баіцеся пакрыўдзіць даму, я вас правяду да Энфрэвілю. Не турбуйцеся: я не дайду да вілы гэтай дамы, я не пабачу ні дамы, ні сяброваk.

А л ь б э р т ы н а доўга і ўважліва глядзіць на яго.

М а р с э л ь. Мне сапраўды хочацца сьвежага паветра.

А л ь б э р т ы н а. Калі мы з вамі выпраўляемся на шпацыр, дык ці ня лепш пайсьці ў іншы бок ад Бальбэку? Там значна прыгажэй.

М а р с э л ь. Дык прыяцелька вашай цёткі пакрыўдуе, калі вы да яе не прыедзеце.

А л ь б э р т ы н а. Ну і хай крыўдуе!

М а р с э л ь. Не-не, ня трэба крыўдзіць людзей.

А л ь б э р т ы н а. Ды яна і ўвагі ня зьверне, яна прымае штодня. Прыеду заўтра, пазаўтра, праз тыдзень, праз два —

гэта ня мае ніякага значэньня.

М а р с э л ь. А вашы сяброўкі?

А л ь б э р т ы н а. Ах, яны мяне столькі разоў за нос вадзілі. Цяпер мая чарга.

Ён уважліва яе разглядае.

М а р с э л ь. Не, Альбэртына, я не хачу псаваць вам задавальненьня, едзьце да вашай энфрэвільскай дамы ці нават да таго, хто хаваецца пад гэтым псэўданімам — мне ўсё роўна.

А л ь б э р т ы н а. Чаму?

М а р с э л ь. З адной-адзінай прычыны — вам гэтага ня хочацца.

А л ь б э р т ы н а. Як вы можаце такое казаць?

М а р с э л ь. Вы разоў пяць, калі ня больш, самі сабе супярэчылі — і нават не заўважалі.

А л ь б э р т ы н а. Ну што ж, так — я сыходжу. Вы вельмі злосны. Я ўсё мяняю, каб правесьці з вамі прыемны вечарок, а вы ня хочаце, ды яшчэ сьцьвярджаеце, што я хлушу. Вы ніколі яшчэ не былі са мной настолькі жорсткім. Я вас больш не пабачу.

М а р с э л ь. Гэта найлепшае выйсьце.

А л ь б э р т ы н а глядзіць на гадзіньнік.

А л ь б э р т ы н а. Што ж — тады я паеду да цётчынай прыяцелькі.

Яна сыходзіць.

Л е а танцуе зь сяброўкай. М а р с э л ь і А н д р э глядзяць на іх.

М а р с э л ь. На што вы гэтак загледзеліся?

А н д р э. На тых жанчын.

М а р с э л ь. Якіх?

А н д р э. Вунь на тых. Ведаеце, хто яны такія?

М а р с э л ь. Не.

А н д р э. Леа — акторка. І яе каханка. Яны адкрыта жывуць разам. Проста абуральна.

М а р с э л ь. Вось як… Значыць, у вас гэткія схільнасьці не выклікаюць спачуваньня?

А н д р э. У мяне? Ды мне гэта гідка.

М а р к і з а д э В і л ь п а р ы з і дома, малюе акварэль. М а р с э л ь і С э н - Л ю слухаюць, што яна кажа. М а р с э л ь трымае свой капялюш на каленях. У пакоі сядзяць яшчэ некалькі гасьцей. Яны размаўляюць. Іх капелюшы раскіданыя па дыване. Г е р ц а г і н я д э Г е р м а н т сядзіць трошку воддаль і разглядае гасьцей.

М а р к і з а д э В і л ь п а р ы з і. Так, я вельмі добра памятаю мсье Мале. Дасьціпны быў, але ж надта цырымонны. Так і бачу яго, як ён у сябе дома спускаецца абедаць з цыліндрам у руцэ.

М а р с э л ь. Тады, напэўна, увогуле было прынята хадзіць у сябе дома з цыліндрам у руцэ.

М а р к і з а д э В і л ь п а р ы з і. Ну не. Гэткая звычка была толькі ў мсье Мале. Я ні разу ня бачыла дома майго бацьку з цыліндрам, апроч, вядома, тых выпадкаў, калі прыяжджаў кароль, бо кароль паўсюль у сябе дома, а гаспадар пры ім і ва ўласнай гасьцёўні ўсяго толькі госьць.

С э н - Л ю пазяхае.

С э н - Л ю. Я выйду папаліць.

С э н - Л ю падымае з падлогі свой капялюш і выходзіць. М а р с

э л ь аглядаецца наўкола і затым нэрвова кладзе свой капялюш на падлогу. Г е р ц а г і н я разглядае М а р с э л я .

Л ё к а й абвяшчае, што прыехаў б а р о н д э Ш а р л ю.

М а р к і з а д э В і л ь п а р ы з і. Напэўна, вам варта ведаць, што я чакаю сёньня мадам Сван.

Г е р ц а г і н я. Праўда? Дзякуй, што папярэдзілі.

Г е р ц а г і н я зноў пераводзіць позірк на М а р с э л я .

Г е р ц а г і н я. Добры вечар. Як вы маецеся?

М а р с э л ь. Дзякуй, мадам. Даволі добра.

Л ё к а й абвяшчае прыезд прынца фон Фафэнхайм-Мюнстэрбург-Вайнігена.

Г е р ц а г і н я. Я часам бачу вас зранку. Шпацыраваць вельмі карысна для здароўя.

Л ё к а й абвяшчае прыезд м а д а м Ш а р л ь С в а н.

Г е р ц а г і н я глядзіць на свой гадзіньнік.

Г е р ц а г і н я. Божа, я мушу ляцець.

Г е р ц а г і н я сыходзіць. Уваходзіць А д э т а. Нейкі стары ўзьнімаецца зь месца, цалуе ёй руку, зноў сядае. А д э т а праходзіць далей.

М у ж ч ы н а. Прыгожая жанчына, га? Я быў зь ёю, калі маршал Макмахан падаў у адстаўку.

Спачывальня.

А л ь б э р т ы н а. За што вы на мяне злуяцеся?

М а р с э л ь. Вы сапраўды хочаце, каб я быў з вамі шчыры?

А л ь б э р т ы н а. Так, хачу.

М а р с э л ь. Мне апавядалі пра вас.

Яна пільна глядзіць на яго.

М а р с э л ь. Пра ваш лад жыцьця.

А л ь б э р т ы н а. Што вы хочаце сказаць?

М а р с э л ь. Жанчыны, якія аддаюцца гэтаму граху, выклікаюць у мяне глыбокую гідлівасьць.

Паўза.

М а р с э л ь. Мне казалі, што вас зьвязваюць пэўныя адносіны з Андрэ.

А л ь б э р т ы н а. Хто гэты пляткар?

М а р с э л ь. Я не магу вам сказаць.

А л ь б э р т ы н а. І Андрэ, і мне — нам абедзьвюм гэта гідка. Той тып жанчын, пра які вы гаворыце, мы акурат трываць ня можам.

М а р с э л ь. Вы хочаце сказаць, што гэта няпраўда?

А л ь б э р т ы н а. Я клянуся. (*Падыходзіць бліжэй да яго.*) Клянуся.

Бярэ яго за руку.

А л ь б э р т ы н а. Вы дурненькі. (*Гладзіць ягоную руку.*) Слухаць гэтыя байкі пра Андрэ… (*Дакранаецца да ягонага твару.*) Дурненькі. Я ваша Альбэртына. (*Гладзіць яго па твары.*) Вам добра… са мною?

М а р с э л ь. Так.

Яна спрабуе яго пацалаваць. Аднак ягоныя вусны застаюцца сьціснутыя. Яна правозіць па іх языком.

А л ь б э р т ы н а. Раскрыйце вусны. Раскрыйце вусны. Які вы ўсё ж злосны!

Яна прымушае яго раскрыць вусны, цалуе яго і валіць.

Сцэна: б а б у л я пры сьвятле лямпы чытае кнігу. Адкладае кнігу і ўсьміхаецца.

Б а б у л я. Добры дзень, Марсэль.

Малы М а р с э л ь падбягае да яе. Б а б у л я яго цалуе.

Па коле цягніка б'юць малатком.

Чыгуначны пэрон. С э н - Л ю чакае. Побач зь ім сабачка.

С э н - Л ю. Я толькі атрымаў тваю тэлеграму. Прыемна цябе бачыць.

М а р с э л ь. Я падумаў, што файна было б сустрэцца, хоць бы на пяць хвілінаў.

С э н - Л ю. Малайчына.

Да іх далучаецца А л ь б э р т ы н а.

М а р с э л ь. Альбэртына, пазнаёмся з Рабэрам. Мадмуазэль Альбэртына Сыманэ. Маркіз дэ Сэн-Лю.

С э н - Л ю кланяецца.

А л ь б э р т ы н а. О, які мілы сабачка. Як яго зваць?

С э н - Л ю. Гэта сучка. Пэпі.

А л ь б э р т ы н а. Прывітаньне, Пэпі.

М а р с э л ь. Мы едзем да Пазьнякаў. Шкада, што ты ня можаш з намі.

С э н - Л ю. Ведаеш, нават калі б і мог — не паехаў бы. У іх у

доме такая атмасфэра — звар'яцець можна.

А л ь б э р т ы н а гуляецца з сабачкам. Павадок трэцца аб ногі С э н - Л ю.

А л ь б э р т ы н а незнарок прыціскаецца да С э н - Л ю.

А л ь б э р т ы н а. У вас такі цудоўны сабачка. Хадзі сюды, Пэпі.

М а р с э л ь. Як вас разумець?

А л ь б э р т ы н а. Вой, да вас паўсьцінка прычапілася! Да такога цудоўнага мундура. Які жах! І да нагавіцаў. Ах, Пэпі, ах, свавольніца!

С э н - Л ю. Нічога — зьляціць. (*Да Марсэля.*) Гэта асаблівая сэкта. (*З усьмешкай.*) Свой манастыр са сваім статутам. Яны ходзяць на задніх лапках перад тымі, хто належыць да іх кола, і ад іх патыхае холадам пагарды на ўсіх, хто да яго не належыць. Я гэтую публіку ніколі асабліва не любіў — нічога не магу з сабою зрабіць.

Гудок цягніка.

М а р с э л ь. Ну, мы пайшлі, а ня тое спозьнімся на цягнік.

А л ь б э р т ы н а. Да пабачэньня, сабачка. Як, вы казалі, яе зваць?

С э н - Л ю. Пэпі. (*Яны паціскаюць рукі.*) *Au revoir*, мадмуазэль.

С э н - Л ю сыходзіць. А л ь б э р т ы н а маша яму.

М а р с э л ь. Што вы сабе дазвалялі з Сэн-Лю?

А л ь б э р т ы н а. З Сэн-Лю? А што такога?

М а р с э л ь. Вы прыціскаліся да яго, фліртавалі зь ім. Як гэта разумець?

А л ь б э р т ы н а. Я наўмысна. Я не хацела, каб ён падумаў,

што ў нас з вамі… блізкія адносіны. Дый фліртавала я ня зь ім, а зь ягоным сабачкам.

М а р с э л ь. Хіба вы ня чулі, што гэта сучка?

А л ь б э р т ы н а ўздыхае.

Маўчаньне. А л ь б э р т ы н а адварочвае позірк.

М а р с э л ь. Напэўна, пара гэта ўсё спыніць. Даўно пара.

Ён глядзіць А л ь б э р т ы н е ў патыліцу.

М а р с э л ь. Некалькі гадоў жыцьця…

Доўгая паўза.

Сцэна: С в а н стаіць, абапёршыся на піяніна, і паглядае на пусты зэдлік, седзячы на якім, зазвычай грала А д э т а. Гучыць урывак з санаты Вэнтэйля.

С в а н. Як жа так? Я забіў некалькі гадоў жыцьця, я хацеў памерці толькі таму, што ўсёй душою кахаў жанчыну, якая мне не падабалася, жанчыну не па маім гусьце!

Канец першай часткі.

ЧАСТКА ДРУГАЯ

Дом Германтаў.

Г е р ц а г д э Г е р м а н т. Мой дарагі Марсэль, як прыемна, што вы завіталі да нас. Арыяна хутка будзе. Яна пераапранаецца. Мы абедаем у мадам дэ Сэн-Эвэрт, а потым ідзем на шыкоўны прыём у майго кузэна — прынца дэ Германт. А затым вяртаемся сюды — пераапрануцца на баль-маскарад, які дае маркіза д'Арпажон. Я буду ў касьцюме Людовіка XI, а Арыяна — Ізабэлы Баварскай.

Л ё к а й. Мсье Сван, ваша мосьць.

Уваходзіць С в а н.

Г е р ц а г. А, Шарль, вы знаёмы з гэтым маладым чалавекам?

С в а н няўпэўнена глядзіць на М а р с э л я, яны паціскаюць рукі.

С в а н. Рады вас бачыць.

М а р с э л ь. Я прыемна зьдзіўлены, што вы мяне памятаеце, мсье.

С в а н. Вядома, а як жа іначай! Як вашыя сямейнікі?

М а р с э л ь. Дзякуй, добра.

С в а н. Выдатна, выдатна.

Г е р ц а г. Паслухайце, Шарль, вы ж вялікі знаўца, падыдзіце да мяне, я вам зараз нешта пакажу.

Падводзіць іх да карціны.

Г е р ц а г. Ну, як вам? Я абмяняў яе на пару Манэ. Па-мойму, гэта, Вэрмэер. А як вы думаеце?

С в а н. Цяжка вызначыць.

Г е р ц а г. Годзе вам, Шарль, усе ведаюць, што вы вялікі знаўца. Вы ж пішаце кнігу пра Вэрмэера.

С в а н. Ну, не зусім кнігу… усяго толькі артыкул, пра адзін твор.

М а р с э л ь. «Відарыс Дэльфту».

С в а н. Так.

М а р с э л ь. Кавалак жоўтай сьцяны.

С в а н. Так.

Г е р ц а г. Які кавалак? Якой сьцяны?

С в а н раптам пазнае М а р с э л я.

С в а н. О, вядома, Марсэль! Даруйце…

М а р с э л ь. Я думаю, што гэта найлепшая карціна ў сьвеце.

Г е р ц а г. Здаецца, я яе ўжо недзе бачыў. Але, усё ж такі, (*паказвае на карціну*) што вы скажаце? Каму вы гэта прыпісваеце?

С в а н. Вашаму ворагу.

Г е р ц а г. Праўда?

Уваходзіць г е р ц а г і н я. На ёй чырвоная ядвабная сукенка.

Г е р ц а г і н я. Шарль! Марсэль! Я вельмі радая. Божа мой, якая гэта нудота: апранацца, выяжджаць, калі хочацца пасядзець дома. На такіх вечарынах часам такая туга, што хоць памірай. Але, магчыма, сьмерць — рэч яшчэ нудотнейшая, хто ведае? (*Яна кідае позірк на капялюш Свана.*) Мне вельмі падабаецца зялёная аблямоўка вашага капелюша. Ды ў вас, Шарль, усё добра: і тое, што вы носіце, і тое, што вы кажаце, і тое, што вы чытаеце, і тое, што вы робіце. Амаль як у мяне. Мы з Басэнам думаем правесьці наступнае лета ў Італіі ды Сыцыліі. Ну дык як жа, ці паедзеце вы з намі ў Італію? Гэта было б так дарэчы. З вамі бачыш тое, чаго бяз вас ня ўбачыш, вы адкрываеце новае нават у тым, што нібыта ўсе ведаюць, дзякуючы вам можна ацаніць такія дэталі, паўзь якія дваццаць разоў праходзіш, не заўважаючы.

С в а н. Баюся, што не змагу, герцагіня.

Г е р ц а г. Як шкада!

Г е р ц а г і н я. Мне ўсё ж хацелася б ведаць, як можна за дзесяць месяцаў да паездкі прадбачыць, што яна немагчымая?

С в а н. Дарагая герцагіня! Я вам адкажу на вашае пытаньне, калі вы патрабуеце, але ж вы самі бачыце, што я вельмі хворы.

Г е р ц а г і н я. Шарль, родны мой, вы і сапраўды вельмі нядобра выглядаеце, мне не падабаецца ваш колер твара, але ж я вас прашу паехаць з намі не праз тыдзень, а месяцаў за дзесяць.

Уваходзіць л ё к а й.

Л ё к а й. Экіпаж пададзены, вашамосьць.

Г е р ц а г. Ну, Арыяна, хутчэй.

Г е р ц а г зьбіраецца ісьці.

Г е р ц а г і н я. Дык чаму ж вы не паедзеце ў Італію?

С в а н (*мякка*). Таму што за колькі месяцаў мяне ўжо ня будзе ў жывых. Я раіўся з дактарамі, і яны мне наўпрост сказалі, што мая хвароба, ад якой я магу памерці кожную хвіліну, дасьць мне пражыць у найлепшым выпадку месяцы тры-чатыры, але ніяк ня болей.

Г е р ц а г і н я. Ды ну што вы! Вы жартуеце?

С в а н. Нішто сабе, міленькі жарт. Ня ведаю, навошта я вам пра гэта апавёў. Але ж вы сталі распытваць… Аднак я вас затрымліваю, вы спозьніцеся на абед.

Г е р ц а г і н я. Ах, ды што там абед! Якое гэта мае значэньне!

Г е р ц а г. Арыяна! Вы ж ведаеце, што ў мадам дэ Сэнт-Эвэрт сядаюць за стол раўнюсенька а восьмай. Даруйце, Шарль, але ўжо дзесяць да восьмай. Арыяна вечна спазьняецца.

Г е р ц а г і н я (*да Свана*). Я ня веру ні адзінаму слову з таго, што вы нагаварылі пра сваю хваробу. Але мы гэта яшчэ абмяркуем. Прыходзьце на сьняданак, калі вам будзе заўгодна, толькі прызначце дзень і час.

Г е р ц а г раптам спыняецца і пільна азірае жонку.

Г е р ц а г. Бяда з вамі, Арыяна! Пра што вы думалі? Вы апранулі чорныя туфлі! А сукня — чырвоная! Бяжыце, апраніце

чырвоныя туфлі…

Г е р ц а г і н я. Мілы мой, мы ж спазьняемся.

Г е р ц а г. Ды не, у нас яшчэ ёсьць час. Ну, а ўрэшце, нават калі мы прыедзем а палове на дзявятую, — нічога, пачакаюць, ня можаце ж вы ехаць туды ў чырвонай сукенцы і чорных туфлях.

Г е р ц а г і н я падымаецца наверх.

Г е р ц а г (*Сванў і Марсэлю*). Бачылі? Калі б ня я, Арыяна пакаціла б на абед у чорных туфлях.

С в а н. Я ня бачу ў тым бяды. Я заўважыў, што на герцагіні чорныя туфлі, але мяне гэта ніколечкі не зьбянтэжыла.

Г е р ц а г. Не зьбянтэжыла дык не зьбянтэжыла. Але ўсё ж калі туфлі аднаго колеру з сукняй, то гэта выглядае больш элегантна. І потым, шчыра казаўшы, я дзіка галодны. Я кепска пасьнедаў. А гэтых чортавых дактароў вы ня слухайце — ці мала якіх глупстваў яны вам нагавораць. Дактары — ёлупні. Вы здаровы, як бык. Вы яшчэ ўсіх нас перажывяце!

М а р с э л ь паглядае на С в а н а.

Сцэна: госьці ў Пазьнякаў сабраліся каля вялізнага акна і моўчкі глядзяць на заход сонца.

Ля Распэльер.

Д - р К а т а р. Добры дзень. Я доктар Катар. Я лячыў вашу бабулю. Але, на жаль, безвынікова. Што ж…

М а р с э л ь (*паціскаючы яму руку*). Так, так. Дазвольце прадставіць мадмуазэль Альбэртыну Сыманэ.

Паціскаюць рукі. К а т а р уважліва глядзіць на А л ь б э р т ы н у, нібыта пазнаючы яе з Бальбэку. Ён начэплівае акуляры.

К а т а р. Ну вось, нарэшце вы прыехалі ў Ля Распэльер.

Пазьнякы, ведаеце, займаюць бліскучае становішча ў сьвеце. У іх бываюць самыя вяршкі грамадзтва. Кажуць, што багацьце мадам Пазьняк пацягне на трыццаць пяць мільёнаў. Трыццаць пяць мільёнаў! Як вам гэта падабаецца? Вядома, яна вельмі, вельмі шмат зрабіла для мастацтва. Вы пісьменьнік, так? Таму яна так прагне з вамі пазнаёміцца.

М а д а м В э р д у р э н. А вось і вы!

Яны паварочваюцца, каб павітаць м а д а м В э р д у р э н. К а т а р пільна ўглядаецца ў Альбэртыну.

М а д а м В э р д у р э н. Мы сёньня чакаем такога выдатнага музыку. Нашае з мужам адкрыцьцё. Марэль. Яго чакае вялікая будучыня. На жаль, за ім увязаўся стары сябар ягонай сям'і, нейкі барон дэ Шарлю. Так што давядзецца трываць і яго.

Яна паварочваецца, каб павітаць іншую групку гасьцей.

Б р ы ш о (*да Катара*). Я забыўся паведаміць вам, Катар, сумную навіну. Наш бедны сябар Дэшамбр памёр.

К а т а р. А зусім яшчэ малады. Але ў яго, я думаю, было нешта зь печанямі, апошнім часам выгляд у яго быў паршывы. (*Да Марсэля.*) Дэшамбр — піяніст, якога раней асабліва любіла мадам Пазьняк.

Б р ы ш о. Ды не такі ўжо ён быў малады. Калі толькі мне ня здраджвае мая старая памяць, Дэшамбр іграў санату Вэнтэйля для Свана.

К а т а р. Праўда? Нешта я ня памятаю.

Б р ы ш о. Бедны Сван.

К а т а р. А што такое з Сванам?

Б р ы ш о. Ён, даражэнькі мой, памёр. Месяцы два таму.

К а т а р. Праўда? А я і ня ведаў. Божа мой. Усе мруць, як мухі.

Да іх падыходзіць В э р д у р э н.

К а т а р. Мы тут размаўлялі пра Дэшамбра. Як жудасна! Такі малады…

В э р д у р э н. Так. Але навошта плакаць над тым, чаго ня вернеш? Галоўнае, Богам прашу, не загаворвайце з мадам Пазьняк пра Дэшамбра. Ейная чульлівасьць даходзіць літаральна да хваробы. Не, праўда, клянуся: калі ёй сказалі, што Дэшамбр памёр, яна ледзь не заплакала.

К а т а р. Праўда?

Л ё к а й. Шаноўнае панства, маркіз і маркіза дэ Камбрэмэр.

Яны пераводзяць позіркі туды, дзе м а д а м В э р д у р э н вітаецца з Камбрэмэрамі.

К а т а р. Маркіз і маркіза? Ага.

В э р д у р э н. Так, ну і што з таго? (*Да Марсэля.*) Мы зьнялі ў іх гэты дом на лета. Зануды страшэнныя, але мы мусілі іх хоць раз запрасіць. Зь ветлівасьці. (*Ідзе павітацца з Камбрэмэрамі.*)

К а т а р (*да Марсэля*). Маркіз ды маркіза. Неверагодна! Каго тут толькі не сустрэнеш.

Л ё к а й. Мсье Марэль і барон дэ Шарлю.

Б а р о н вітаецца з М а р э л е м.

Ш а р л ю. Дазвольце прадставіць майго юнага сябра, мсье Шарля Марэля.

М а р с э л ь (*углядаючыся*). Мсье Марэль. Здаецца, мы з вамі ўжо сустракаліся.

М а р э л ь. Магу вас запэўніць, мсье, што вы памыляецеся. Я ня меў гонару бачыць вас раней.

М а р с э л ь. Мабыць, так.

А л ь б э р т ы н а неадрыўна глядзіць на М а р э л я.

М а р с э л ь. Дазвольце вас пазнаёміць з мадмуазэль Сыманэ.

А л ь б э р т ы н а. А, гэта вы той самы юны геній, пра якога мы столькі чулі. Мадам Пазьняк вас чакае.

Ш а р л ю (*да Марсэля, які назірае за размовай Альбэртыны і Марэля*). Прыгожы ён ад прыроды. Я зраблю яго вялікім.

М а д а м В э р д у р э н (*шэптам да свайго мужа*). Да стала мяне павінен весьці барон дэ Шарлю? Ты павядзеш маркізу дэ Камбрэмэр.

В э р д у р э н. Не, маркіз вышэйшы за яго чынам. Так што Шарлю нібыта ягоны падначалены. Здаецца, так. Праваруч ад цябе за вячэрай павінен сядзець Камбрэмэр. Яму і падасі руку.

М а р к і з а д э К а м б р э м э р. Тут усё, як было тады.

М а д а м В э р д у р э н. А хіба вам ня кінуліся ў вочы некаторыя зьмены? Па-першае, тут былі барбэд'енскія бронзавыя боўдзілы і брыдкія плюшавыя фатэлікі. Я іх у імгненьне вока выправіла на гарышча, дый тое я лічу, што для іх гэта зашмат гонару.

Л ё к а й. Вячэра пададзеная.

М а д а м В э р д у р э н. Найдаражэйшыя сябры, любыя госьці, сардэчна запрашаем на Парнас.

К а т а р. Добры дом, праўда?

М а р к і з а д э К а м б р э м э р. Гэта наш дом!

Г о с ь ц і займаюць месцы за сталом.

М а р э л ь і А л ь б э р т ы н а ўзіраюцца адно ў аднога праз стол, М а р с э л ь глядзіць на іх.

К а т а р (*да Марсэля*). У вас бываюць прыступы ўдушша; дык вось, калі вы апынаецеся на досыць высокім месцы, кшталту таго, дзе мы цяпер з вамі знаходзімся, вы не заўважаеце, што вам робіцца цяжка дыхаць?

М а р с э л ь. Не.

К а м б р э м э р. Удушша? У каго прыступы ўдушша?

М а р с э л ь. У мяне. Часам здараюцца.

М а р к і з д э К а м б р э м э р. Я не магу вам перадаць, які я шчасьлівы, што ў вас здараюцца прыступы ўдушша. Шчасьлівы, таму што і ў маёй сястры таксама бываюць прыступы ўдушша. Сьвет цесны. Трэба будзе ёй апавесьці.

Ш а р л ю глядзіць на М а р э л я, які глядзіць на А л ь б э р т ы н у.

В э р д у р э н (*шэптам*). Вядома! Я зь першых жа словаў, якімі мы з вамі абмяняліся, здагадаўся, што вы — чалавек асаблівага складу.

Ш а р л ю. Што вы хочаце гэтым сказаць?

В э р д у р э н. Я ўпэўнены, што вы на гэта глядзіце проста.

Ш а р л ю. Я не зусім вас разумею.

В э р д у р э н. Ды мы ж пасадзілі вас зьлева! Я не надаю ніякага значэньня тытулам. Але, урэшце, калі ўжо ў нас у гасьцях дэ Камбрэмэр, а ён — маркіз, а вы ж — усяго толькі барон…

Ш а р л ю. Выбачайце, але я яшчэ і герцаг Брабанцкі, дамуазо дэ Мантаржы, прынц Алеронскі, Карансійскі, Віярэджойскі, а таксама Дзюнскі. Зрэшты, гэта лухта. Не пераймайцеся. Я адразу зразумеў, што вы ў гэтых рэчах недасьведчаны.

Ш а р л ю падсоўваецца да М а р э л я.

Сцэна: гуд галасоў за сталом. Раптам — цішыня. М а р с э л ь глядзіць на А л ь б э р т ы н у.

М а р к і з а д э К а м б р э м э р (*калі амаль усе госьці выйшлі з-за стала*). Што яны зрабілі з нашым домам! Поўная

адсутнасьць адчуваньня стылю! А зрэшты, чаго вы ад іх хочаце? Хіба яны што-небудзь ведаюць, дзе ім было чаму-небудзь навучыцца? Верагодна, гэта багатыя гандляры. Што зь іх возьмеш?

М а р к і з д э К а м б р э м э р. Мне падалося, сьвечнікі неблагія.

М а р к і з а д э К а м б р э м э р. Я думаю, што нам варта ўзьняць аплату.

М а д а м В э р д у р э н (*да Марэля, які нешта нашэптваў Альбэртыне*). Мой Моцарт, мой юны Моцарт! Калі хочаце, заставайцеся ў нас пераначаваць. Тут ёсьць цудоўныя пакоі зь відам на мора.

Ш а р л ю (*падыходзячы да яе*). Баюся, гэта немагчыма. Ён мусіць вярнуцца ў сваю пасьцельку, як пай-хлопчык, паслухмяны, добра выхаваны.

М а д а м В э р д у р э н (*зьверху ўніз аглядаючы Альбэртыну*). Якая на вас прыгожая сукенка. (*Да Марэля.*) Праўда, прыгожая?

М а р э л ь. Надзвычай.

А л ь б э р т ы н а. Дзякуй.

М а д а м В э р д у р э н. Калі хочаце, заставайцеся ў нас пераначаваць. Я магу паказаць вам пакой, які, па-мойму, вы б вельмі ўпадабалі.

М а р с э л ь (*выходзячы наперад*). Баюся, гэта немагчыма. Мадмуазэль Сыманэ чакае цётка.

М а р э л ь. Як шкада.

К а т а р (*жонцы*). Гэй, Леантына, ты дрыхнеш.

М а д а м К а т а р. Я, любы мой, слухаю, што кажа мсье Сван.

М а д а м В э р д у р э н. Яна, доктар, кантактуе з духамі і, трэба прызнаць, даволі сумнеўнымі духамі.

К а т а р (*крычыць*). Сван! Ды ну, Леантына, страпяніся.

М а д а м К а т а р. Ванна досыць цёплая, але вось пер'е са слоўніка!.. (*Раптам падскоквае ў крэсьле.*) Ах, божа мой, якая я дурніца? Што гэта я вярзу? Я думала пра свой капялюшык і, мабыць, несла лухту, яшчэ крыху — і я б задрамала, а ўсё гэты агонь, ліха на яго.

К а т а р (*крычыць*). Ды ніякага агню і блізка няма. Сярэдзіна ж лета. (*Да лёкая.*) Мадам Катар паедзе дадому. (*Да збору.*) Яна ўся чырвоная як бурак.

К а т а р уводзіць яе.

М а р к і з д э К а м б р э м э р (*Марсэлю*). Мой дарагі сябра, абавязкова заходзьце да нас яшчэ, і чым хутчэй. Пагаворыце пра ўдушша з маёй сястрой. Не сумняюся, ёй было б вельмі прыемна.

М а р с э л ь адводзіць убок А л ь б э р т ы н у.

А л ь б э р т ы н а. Не, я не хачу сыходзіць. Мне тут так добра.

Паўза.

М а р с э л ь. Як вам Марэль?

А л ь б э р т ы н а. Ну… Кажуць, што ён цудоўна грае на скрыпцы.

М а р с э л ь (*рэзка*). Ён сын былога камэрдынэра майго стрыечнага дзеда.

А л ь б э р т ы н а. Праўда? Але, кажуць, ён цудоўна грае на скрыпцы.

Сцэна: М а р э л ь грае на скрыпцы.

А л ь б э р т ы н а і М а р э л ь усьміхаюцца.

М а р с э л ь (*да маці*). Я ведаю, як я цябе расчарую. Перш за ўсё, я зьяжджаю разам з табою. Але ты выслухай мяне да канца і не журыся. Вось у чым рэч. Учора я памыліўся, я ненаўмысна ўвёў цябе ў зман, я думаў усю ноч. Мне абавязкова трэба — і давай на гэтым і дамовімся, таму што цяпер я з усяго цалкам здаю сабе справу, таму што цяпер я ўжо не адступлюся, таму што іначай мне няма дзеля чаго жыць — мне абавязкова трэба ажаніцца з Альбэртынай.

Сцэна: дзьве д з я ў ч ы н ы танчаць.

А н д р э. Я ня ведаю, хто вам апавядаў гэтыя плёткі. Ды ў іх няма і слова праўды. Мы з Альбэртынай у гэтым падобныя. Мне гэта агідна.

М а р с э л ь разглядае малюнкі А л ь б э р т ы н ы.

М а р с э л ь. Выдатна.

А л ь б э р т ы н а. Не, гэта вельмі кепска, але ж я не ўзяла ніводнага ўрока маляваньня…

М а р с э л ь. Неяк увечары, у Бальбэку, вы мне сказалі, што бралі ўрок маляваньня.

А л ь б э р т ы н а. Калі гэта?

М а р с э л ь. Аднойчы вы мне сказалі, што ня зможаце сустрэцца са мною, бо ў вас увечары ўрок маляваньня.

А л ь б э р т ы н а. А, так, але гэта было толькі адзін раз. Настаўніца трапілася вельмі слабая — я пра той урок і забылася. Поўная няздара.

Паўза.

М а р с э л ь. Я хацеў у вас нешта запытацца…

А л ь б э р т ы н а. Што?

М а р с э л ь. Вы ведаеце мадмуазэль Леа?

А л ь б э р т ы н а. Леа?

М а р с э л ь. Акторку.

А л ь б э р т ы н а. Не, ня ведаю. А што такога?

М а р с э л ь. Цікава, што яна сабою ўяўляе?

А л ь б э р т ы н а. Гэта вельмі прыстойная жанчына.

М а р с э л ь. А хіба яна не падуладная пэўным схільнасьцям?

А л ь б э р т ы н а. Мушу сказаць, што са мною яна сябе паводзіць бездакорна.

Паўза.

М а р с э л ь. Вы мне не давяраеце? Вы ж ведаеце, як я вас кахаю.

А л ь б э р т ы н а. Я веру толькі вам. І вам гэта добра вядома. Вы ведаеце, што я вас таксама кахаю.

Паўза.

М а р с э л ь. Я тут падумаў… Па-мойму, вам занадта небясьпечна езьдзіць конна. Вы можаце ўпасьці, разьбіцца.

Яна паглядае на яго зь лёгкай усьмешкай.

А л ь б э р т ы н а. Калі б я загінула, вы б засіліліся?

Сцэна: б а б у л я пазуе для фатаздымка.

Раніца. М а р с э л ь і А л ь б э р т ы н а ў сумежных купальнях. Ён чуе, як А л ь б э р т ы н а фальшыва напявае.

Ф р а н с у а з а прыносіць каву. Яна стаіць і нешта бурчыць.

Ф р а н с у а з а (*прыбіраючы ў пакоі*). Гэтая дзеўка вас да бяды давядзе.

М а р с э л ь. Што ты хочаш сказаць?

Ф р а н с у а з а. Я сорак гадоў у вас жыву.

М а р с э л ь. Пра што гэта ты?

Ф р а н с у а з а. Вы разьбіваеце сваім бацькам сэрцы.

М а р с э л ь. Ды як у цябе язык паварочваецца? Мае бацькі — на вяршыні шчасьця. Мама ў кожным лісьце так піша.

Ф р а н с у а з а сыходзіць, але не перастае буркатаць.

М а р с э л ь. Хопіць зь мяне.

Сцэна: С в а н трымае твар А д э т ы і пільна глядзіць ёй у вочы.

М а р с э л ь. Вы нешта вельмі засмучаная.

А л ь б э р т ы н а. Не, вам падалося. Я шчасьлівая, як ніколі.

М а р с э л ь. І вы не адчуваеце сябе палоньніцай?

А л ь б э р т ы н а. Я ж сказала, што я шчасьлівая, як ніколі.

Паўза.

А л ь б э р т ы н а. Магчыма, я заўтра зьежджу да Пазьнякаў, але толькі пэўна сказаць не магу: асаблівага жаданьня ў мяне няма.

М а р с э л ь. Навошта?

А л ь б э р т ы н а. Хіба я забылася вам сказаць, што мы з Андрэ нядаўна сустрэлі мадам Пазьняк?

М а р с э л ь. Мадам Пазьняк? Не, ня памятаю.

А л ь б э р т ы н а. Праўда? А мне здавалася, я вам казала. Як

бы там ні было, яна запрасіла мяне на гарбату. Мне ня надта і хочацца, але, можа, я б неяк разьвеялася. Яна і Андрэ запрасіла.

М а р с э л ь. Я мог бы паехаць з вамі.

А л ь б э р т ы н а. Куды?

М а р с э л ь. Да Пазьнякаў на гарбату.

А л ь б э р т ы н а. Як заўгодна. Але толькі я вас папярэджваю, што сёньня ўвечары страшэнны туман, і заўтра, зразумела, таксама будзе туман. Мне-то, вядома, было б лепей, каб вы паехалі з намі. Ды я яшчэ ня ведаю, ці паеду я да Пазьнякаў. Мне абавязкова трэба набыць белую шэмізэтку, а то гэтая сукенка ўжо надта цёмная.

Сцэна: С в а н і А д э т а.

А д э т а. Ну скуль жа я ведаю? Можа быць… вельмі даўна… разы два-тры…

М а р с э л ь. Вы набылі шэмізэтку?

А л ь б э р т ы н а. Не.

Паўза.

М а р с э л ь. Сёньня мне значна лепш. Хочацца пабачыцца зь сябрамі: з маркізай дэ Вільпарызі, герцагіняй дэ Германт. Вы са мной не паедзеце?

А л ь б э р т ы н а. Не, у мяне няма сукенкі. І потым, я так кепска прычасаная! Вы лічыце, што я магу ехаць у гэтай прычосцы?

М а р с э л ь. Ну добра, я паехаў. Вы будзеце дома, калі я вярнуся?

А л ь б э р т ы н а. Вядома.

Сцэна: С в а н і А л ь б э р т ы н а сынхронна праходзяць праз сцэну і сыходзяць.

Ш а р л ю сустракае М а р с э л я ў В э р д у р э н а ў.

Ш а р л ю. Дазвольце вас запэўніць, што гэты вечар станецца памятным і нават гістарычным. Вы ведаеце, што сёньня адбудзецца?

М а р с э л ь. Не. А што?

Ш а р л ю. Прэм'ера новага твору Вэнтэйля, у выкананьні Марэля. Я б абавязкова даслаў вам запрашэньне, але я думаў, што вы хварэеце. Вам лепей?

М а р с э л ь. Так, дзякуй. Першае выкананьне новага твору? Вэнтэйля?

Ш а р л ю. Так. Ягоны сэптэт.

М а р с э л ь. Ён жа даўно памёр.

Ш а р л ю. Так. Але стала вядома, што ня толькі саната, але і ўсё астатняе было запісана ім на шматках і не паддавалася прачытаньню. І здагадайцеся, хто на працягу некалькіх гадоў разьбіраў ягоныя крамзолі, вызначаючы адзінае слушнае прачытаньне ягоных загадкавых герогліфаў? Сумнавядомая сяброўка мадмуазэль Вэнтэйль… разам з дачкой Вэнтэйля. Спачатку яна паскорыла сьмерць музыкі сваёй бессаромнасьцю, а цяпер ён абавязаны ёй неўміручай сваёю славаю. Выдатны твор, і Чарлі выдатна яго выканае. Калі я не памыляюся, гэтыя бессаромныя паненкі былі сёньня на рэпэтыцыі. Марэль казаў, што яны зьбіраліся прыйсьці.

М а р с э л ь у здранцьвеньні глядзіць перад сабою.

Ш а р л ю. Я ня бачыў падшыванца з самай раніцы. Так, ён зранку да мяне прыйшоў і пацягнуў мяне за ногі. Як жорстка. А для яго ж не таямніца, што я ненавіджу, калі мяне бачаць у ложку. Да таго ж я выдатна разумею, што мне ўжо даўно не дваццаць пяць і што я не спрабую ўразіць дзяўчыну. Але ўсё ж

крыху какетнічаеш. Хлопчык з кожным днём прыгажэе, хоць у яго і жорсткае сэрца.

М а р с э л ь. Мадмуазэль Вэнтэйль зь сяброўкай… мусілі быць сёньня папаўдні ў Пазьнякаў?

Ш а р л ю. Іх чакалі. (*Паварочваецца да Марсэля.*) Я хачу вам нешта апавесьці. Вы пісьменьнік.

М а р с э л ь. Ды што вы?

Ш а р л ю. Вы будзеце пісьменьнікам. Таму вас цікавяць складаныя, таямнічыя бакі чалавечай натуры. Да таго ж я вам давяраю. Не ўяўляю чаму. Я выпадкова прачытаў ліст, адрасаваны Марэлю. Ён быў ад акторкі Леа, вядомай сваёй прыхільнасьцю да жанчын. Празь ягоную грубасьць яго немагчыма цытаваць цалкам, але Леа пісала да Марэля, як да жанчыны: «Мая прыгажуня — вачэй не адвесьці», і «Ты, прынамсі, такая, як мы». У гэтым лісьце ішла размова пра іншых жанчын, якія, відаць, былі гэткімі ж блізкімі сяброўкамі Марэля, як і Леа. Гамарыцянак. А я заўсёды думаў, што Марэль — «такі, як мы». Не, натуральна, у яго былі жанчыны, шмат жанчын, дый цяпер ён знаходзіць сабе жанчын, калі хоча, мяне гэта не абыходзіць, але гэтыя — не жанчыны. Вы разумееце мяне? Калі Леа называе яго «такая, як мы», што б гэта азначала? Я думаў, што ён — такі, як мы. То бок мы ведаем пра рознабаковасьць ягоных парыванняў. Як вы лічыце — ён яшчэ і гамарыцянін?

М а р с э л ь. Ня ведаю.

Ш а р л ю. Як, скажыце мне, мужчына можа быць гамарыцянінам? Ці, інакш кажучы, чым яны займаюцца?

М а р с э л ь. Не ўяўляю…

Ш а р л ю. Ня дзіва, што вы ня можаце мне дапамагчы. З вашай недасьведчанасьцю…

Паўза.

Ш а р л ю. Вы чулі, што мой пляменьнік Сэн-Лю зьбіраецца

ажаніцца з Жыльбэртай, дачкой Свана? Эх, быў бы жывы небарака Сван… Такая партыя вельмі б яго ўзрадавала. Што з вамі? Вы дрэнна выглядаеце. Вам блага?

М а р с э л ь. Не, са мною ўсё добра.

Л ё к а й. Герцагіня дэ Германт.

Г е р ц а г і н я. Мэмэ, як прыемна вас бачыць. Дзякуй вялікі за запрашэньне, але мушу заўважыць, што апошнім часам вы бываеце ў самых нечаканых месцах. Якія жудасныя карціны! А дзе матухна Пазьняк? Мне ж не абавязкова зь ёю гутарыць, праўда? Спадзяюся, празь яе маё імя ня трапіць у газэты, бо тады ніхто не захоча са мной размаўляць.

Ш а р л ю. Мушу вам сказаць, што на сёньняшні вечар запрашаў я сам. Мадам Пазьняк можа запрасіць сваіх знаёмых бакалейшчыкаў, мадыстак, мясьнікоў, ня кажучы ўжо пра даглядчыцу прыбіральні на Элізэйскіх палёх, наступным разам. Сёньня слухаць Марэля будуць сьвецкія людзі, людзі «майго кола».

Уваходзяць два м а л а д ы я ч а л а в е к і. Абодва высокія, зграбныя, золатавалосыя. Л ё к а й таксама малады.

Л ё к а й. Прынц дэ Фуа.

Ш а р л ю. Што я вам казаў? Прыйшоў Бібі.

П р ы н ц д э Ф у а праходзіць у пакой.

Л ё к а й і другі м а л а д ы ч а л а в е к раптам пазнаюць адзін аднога. Л ё к а й таропіцца на яго.

Л ё к а й. Дзень добры…

М а л а д ы ч а л а в е к хутка прыкрывае вочы.

Л ё к а й (*ціха*). Як пра вас дакладаць, мсье?

М а л а д ы ч а л а в е к (*хутка*). Герцаг дэ Шатэльро.

Л ё к а й паварочваецца да прысутных у пакоі і з гонарам абвяшчае.

Л ё к а й. Яго каралеўская высокасьць, герцаг дэ Шатэльро.

Ш а р л ю. Антуан, мой любы хлопчык.

Уваходзіць м а д а м В э р д у р э н.

М а д а м В э р д у р э н (*да мсье Пазьняка, напаўголасу, вельмі злосна*). Тут гаспадыня я, і гэта мой дом. Здаецца, ён на гэта забыўся. Ён яшчэ пашкадуе.

М а р с э л ь. Выбачайце, а хіба вы не чакаеце мадмуазэль Вэнтэйль? Зь сяброўкай.

М а д а м В э р д у р э н. Яна даслала нам тэлеграму. Ім давялося застацца за горадам.

Яна адцягвае мужа ўбок.

М а д а м В э р д у р э н. Мы мусім «прасьвятліць» Марэля, якую сьмешную і ганебную ролю прымушае яго граць дэ Шарлю. Гэта наш перад ім абавязак. Вы павінны зь ім пагутарыць.

М с ь е В э р д у р э н. Я згодны. Але пасьля сэптэту.

М а д а м В э р д у р э н. Я ўсё жыцьцё прысьвяціла мастацтву, музыцы. Мы абавязаныя яго ўратаваць ад гэтай пачвары.

М а р с э л ь. А ці не запрошаная акторка Леа?

М а д а м В э р д у р э н. Не, ну што вы!

П р ы н ц і г е р ц а г цалуюць руку г е р ц а г і н і д э Г е р м а н т і сядаюць побач зь ёй, кладучы свае шаўковыя цыліндры на падлогу каля ног.

В э р д у р э н. Я думаю, што ня варта пакідаць цыліндры на падлозе. На іх могуць наступіць.

П р ы н ц д э Ф у а пільна глядзіць на В э р д у р э н а

пранізьлівым і халодным позіркам. В э р д у р э н запінаецца і сыходзіць.

П р ы н ц д э Ф у а (*да герцагіні*). Хто гэта такі? Той, хто толькі што да мяне зьвярнуўся?

Г е р ц а г і н я. Нават не ўяўляю сабе.

Яна паварочваецца да Ш а т э л ь р о, які сядзіць з заплюшчанымі вачыма.

Г е р ц а г і н я. Шатэльро, чаму вы такі бледны? Вы захварэлі?

Ш а т э л ь р о. Сянная ліхаманка.

Л ё к а й (*аб'яўляе*). Яе каралеўская мосьць каралева Нэапалітанская.

Усе паварочваюцца да яе, Ш а р л ю выходзіць наперад. К а р а л е в а яго цалуе.

К а р а л е в а. Дзень добры, кузэн.

Ш а р л ю. Рады вас бачыць, кузына.

К а р а л е в а. Вы пазнаёміце мяне з гаспадыняю?

Ш а р л ю. З гаспадыняй? А, так, вядома. З вашага ласкавага дазволу маю гонар рэкамэндаваць вам мадам Пазьняк, гаспадыню гэтага дому.

К а р а л е в а. Як ласкава з вашага боку запрасіць мяне, і з такой прыемнай нагоды. Вельмі рада з вамі пазнаёміцца.

М а д а м В э р д у р э н. Ах, вашая каралеўская мосьць, я ня маю словаў… Спадзяюся, што вам спадабаецца ў маім «храме музыкі», як я яго называю.

К а р а л е в а. Такі мілы храм!

Ш а р л ю падводзіць к а р а л е в у да яе пачэснага месца.

М а д а м В э р д у р э н (*да мсье Пазьняка*). Сама прастата і

шчырасьць! Вось сапраўдная каралеўская кроў. Як яна розьніцца ад усіх гэтых выскачак. Думаю, што калі б раскрылася праўда, я б не зьдзівілася, што палова гэтых шаноўных герцагіняў стаіць на ўліку ў паліцыі.

Г о с ь ц і займаюць свае месцы перад пачаткам канцэрту.

Г о с ь ц ь. Я ўвесь час забываюся, як зваць таго кампазытара?

Ш а р л ю. Цішэй!

Сцэна: М а р э л ь іграе. Яму на лоб падае пасма валасоў.

Трансцэндэнтны момант для М а р с э л я нагадвае захапленьне С в а н а ад твораў Вэнтэйля.

К а р а л е в а (*да Шарлю*). Мэмэ, дарагі мой, якое харство. І вы таксама, мадам, у гэтым ёсьць і ваша заслуга. Ваша імя ня зьнікне ў забыцьці. (*Да Марэля.*) Як цудоўна вы гралі, мсье.

К а р а л е в а сыходзіць.

М а д а м В э р д у р э н (*Пазьняку*). Ну, што я казала — сама прастата і шчырасьць!

Г е р ц а г і н я. Праўда, Мэмэ, вы проста цуд. Калі б вам прыйшло да галавы зрабіць фэерыю ў лазенцы, яна б ад гэтага ніколечкі б не прайграла. Дарэчы, а ці бачыў хто калі мсье Пазьняка?

Г о с ь ц і скупіліся вакол Ш а р л ю, віншуюць яго. «Бясспрэчна, добра граць — справа вельмі нялёгкая». — «Мы мусім падзякаваць Палямэду — яму столькі прыйшлося дзеля гэтага зрабіць».

М а д а м В э р д у р э н (*да Брышо*). Ён гідкі чалавек. Прапануйце яму папаліць з вамі, а тым часам мой муж незаўважна для яго выведзе ягонага хлопчыка, а потым асьвеціць яму бездань, у якую ён коціцца.

Ш а р л ю. Вось і вы! Ну як, вы задаволеныя? Па-мойму,

засталіся збольшага задаволеныя ўсе. У вас былі каралева Нэапалітанская, прынцэса дэ Таарміна, брат караля Баварскага, тры самыя старажытныя пэры, мноства герцагіняў, сярод іх мая нявестка Арыяна дэ Германт. Калі Вэнтэйль быў бы Магамэтам, мы маглі б сказаць, што дзеля яго мы зрушылі зь месца найменш рухавыя горы. А дзе Чарлі?

Б р ы ш о. Ён зь іншымі музыкамі.

М а д а м В э р д у р э н. Каралева Нэапалітанская нават забылася на свой веер.

Ш а р л ю. Якое відовішча! Кранальнае і разам з тым жудаснае. Чарлі граў, як бог, праўда? Герцагіня дэ Дурас была ў захапленьні. Яна нават папрасіла мяне так вам і сказаць.

Б р ы ш о. Барон, хадземце папалім, га? На маю думку, вы гэтага цалкам заслужылі.

Ш а р л ю. Я з вамі згодны. Які ні з чым не параўнальны посьпех! Ён граў, як бог. Вы зьвярнулі ўвагу, калі яму на лоб раптам упала пасма валасоў? Каралева Нэапалітанская, пабачыўшы тую чарадзейную пасмачку, і тая зразумела, што гэта музыка, а не гульня ў покер.

М а д а м В э р д у р э н (*да Марэля*). Нам трэба паведаміць вам нешта надзвычай важнае. Я лічу, што вы ня можаце далей гэтага трываць!

М а р э л ь. Як? Што трываць?

М а д а м В э р д у р э н. Я лічу, што вы ня можаце надалей трываць гнюсную блізкасьць з гэтым распусным старым, якога нідзе не прымаюць. Вашае імя — на языкох усёй кансэрваторыі. Яшчэ месяц — і вашая артыстычная будучыня зьнішчаная.

М а р э л ь. Але мне ніхто нічога не казаў, я ў шоку, я вам бязьмежна ўдзячны…

М а д а м В э р д у р э н. Значыць, вы адзіны, хто нічога ня ведаў. У гэтага мсье заплямленая рэпутацыя, ён трапляў у брыдкія гісторыі. Мне дакладна вядома, што ён на прыкмеце ў

паліцыі. Ён і ў матэрыяльным пляне вам не апірышча. Ён усё прамантачыў з тае пары, як трапіў у лапы да людзей, якія яго шантажуюць.

М а р э л ь. Я нічога нават не падазраваў…

М а д а м В э р д у р э н. Вядома, ніхто вам гэтак адкрыта ў твар ня скажа, і ўсё ж на вас пальцам паказваюць. Я лічу, вы чалавек з характарам, сапраўдны мужчына, і вы змыеце гэтую пляму, пакуль яна не прысмакталася на ўсё астатняе жыццё…

М с ь е В э р д у р э н. Пакуль ваша жыццё…

М а д а м В э р д у р э н. І ваша кар’ера…

М с ь е В э р д у р э н. Не зруйнаваныя дазваньня!

М а р э л ь. Так, так.

М а д а м В э р д у р э н. Ён прыкідваецца вашым сябрам, але гаворыць пра вас з пагардаю.

М с ь е В э р д у р э н. Нядаўна нехта сказаў яму: «Мы захапляемся вашым сябрам Марэлем». Ведаеце, што ён яму адказаў?

М а д а м В э р д у р э н. «Чаму вы думаеце, што ён мой сябар? Мы зь ім не з адной клясы, гэта толькі мая крэатура, мой пратэжэ».

М с ь е В э р д у р э н. Мне перадавалі, што ён сказаў пра вас: «мой слуга», але я не паверыў.

М а д а м В э р д у р э н. Але ён сапраўды мне казаў: «Гэта сын лёкая».

М а р э л ь. Што?

Вяртаюцца Ш а р л ю і Б р ы ш о.

Ш а р л ю. Чарлі! Ну як, вы задаволены, нашая юная славутасьць? Як вам падабаецца быць пакрытым славаю?

К а р а л е в а Н э а п а л і т а н с к а я вяртаецца па свой веер.

М а р э л ь. Адчапіцеся ад мяне! Я вам забараняю да мяне падыходзіць! Я пра вас усё ведаю! Я ня першы, каго вы спрабавалі разбэсьціць.

Ш а р л ю замірае агаломшаны.

Цішыня.

М а р э л ь. Вычварэнец!

Ш а р л ю паглядае на іншых. Ніхто ня рухаецца.

Ш а р л ю (*амаль бязгучна*). Што гэта азначае? Што здарылася?

Траціць прытомнасьць.

К а р а л е в а Н э а п а л і т а н с к а я. Вы дрэнна пачуваецеся, мой дарагі кузэн. Абапрыцеся на маё плячо. Ведаеце, неяк у Гаэце мая рука дала адчуць сваю моц усялякай швалі. Зараз яна паслужыць вам апірышчам.

Ш а р л ю бярэ яе руку. Яны разам павольна выходзяць з пакою. В э р д у р э н ы і М а р э л ь пільна сочаць за імі. М а р с э л ь таксама на гэта глядзіць.

Усе прысутныя на сцэне расступаюцца. Пасярод сцэны — А л ь б э р т ы н а чытае кнігу.

М а р с э л ь. Здагадайцеся, адкуль я. Ад Пазьнякаў.

У яе падае кніга.

А л ь б э р т ы н а. Я і не сумнявалася.

Паўза.

М а р с э л ь. Чаму гэта вас так зачапіла?

А л ь б э р т ы н а. Зачапіла? Чаму вы ўявілі, што мне не напляваць? Мяне гэта зусім не абыходзіць. А мадмуазэль Вэнтэйль там была?

Ён сядае.

Паўза.

А л ь б э р т ы н а. Як вам спадабаўся сэптэт?

М а р с э л ь. Адкуль вы ведаеце пра сэптэт?

А л ь б э р т ы н а. Усе ведаюць. Гэта не сакрэт.

М а р с э л ь. Я ня ведаў.

Паўза.

А л ь б э р т ы н а. Марэль добра граў?

М а р с э л ь. Вы знаёмыя з Марэлем?

А л ь б э р т ы н а. Я ледзьве яго ведаю.

М а р с э л ь. Тады адкуль вы даведаліся пра сэптэт?

А л ь б э р т ы н а. Пэўна, мне сказала Андрэ. Яна добра ведае Марэля.

Паўза.

М а р с э л ь. Вэнтэйль — гэта проста цуд. Я адчуваў такое шчасьце, як… бадай, ніколі.

Паўза.

М а р с э л ь. Там была Леа. Акторка.

А л ь б э р т ы н а. Як дзіўна.

М а р с э л ь. Яна сяброўка Марэля.

А л ь б э р т ы н а. Яна перадавала вам свае найлепшыя пажаданьні.

А л ь б э р т ы н а. Праўда? Як дзіўна. Я яе амаль ня ведаю. Мы неяк летась былі на ейным спэктаклі, а потым зайшлі да яе ў

грымэрку, каб павітацца. Вось і ўсё.

Паўза.

М а р с э л ь. З кім вы былі?

А л ь б э р т ы н а. Зь сяброўкамі.

Паўза.

М а р с э л ь. Вы ведалі, што мадмуазэль Вэнтэйль была запрошаная сёньня да Пазьнякаў?

А л ь б э р т ы н а. Колькі можна мучыць мяне пытаньнямі! (*Паціскае плячыма.*) Так, ведала.

М а р с э л ь. Ці маглі б вы, прынамсі, даць мне клятву, што да вашага жаданьня паехаць да Пазьнякаў не дамешвалася прадчуваньне задавальненьня ад сустрэчы з мадмуазэль Вэнтэйль?

А л ь б э р т ы н а. Не, гэткай клятвы я вам даць не магу. Ад сустрэчы з мадмуазэль Вэнтэйль я атрымала б вялікае задавальненьне.

М а р с э л ь. Паслухайце… сёньня ўвечары я даведаўся, што…

А л ь б э р т ы н а. Я вам хлусіла, калі запэўнівала, што мяне часткова выхавала сяброўка мадмуазэль Вэнтэйль? Сапраўды, я вас трошачкі падманула. Але мне здавалася, што вы глядзіце на мяне паблажліва, я бачыла, як на вас дзейнічае музыка Вэнтэйля, і ў сваім дурноцьці я вырашыла, што вырасту ў вашых вачох, калі вы даведаецеся, што я іх ведаю. Я думала, вы будзеце ставіцца да мяне з большай павагай, і гэта нас наблізіць адно да аднога. Я хлушу толькі праз прыязнасьць да вас. Насамрэч я бачыла мадмуазэль Вэнтэйль ня больш за два разы ў маёй прыяцелькі. Зразумела, мне не стае шыку для людзей вядомых, і ў мяне няма ні сантыма — я проста жабрачка.

Ён вывучае яе.

М а р с э л ь. Дарагая мая, што за глупства! Ды я з задавальненьнем даў бы вам грошы, каб вы маглі пайсьці куды заўгодна і каб вы, напрыклад, запрасілі на шыкоўны абед мсье і мадам Пазьняк.

А л ь б э р т ы н а. О Божа! Шчыра дзякую! Ды я б ані су ня выдаткавала на гэтых старых порхавак. (*Нешта ціхенька гаворыць сабе пад нос.*) Лепей бы вы мяне хоць раз адпусьцілі, каб мяне праз…

Яна рэзка змаўкае.

М а р с э л ь. Што вы сказалі, Альбэртына?

А л ь б э р т ы н а. Нічога. Я думала пра абед з Пазьнякамі…

М а р с э л ь. Не. Вы нешта іншае хацелі сказаць. А іначай навошта вам было перапыняць сябе?

А л ь б э р т ы н а. Я палічыла сваю просьбу нясьціплай.

М а р с э л ь. Якую просьбу?

А л ь б э р т ы н а. Запрасіць на абед.

М а р с э л ь. Ды не, гэта ня тое.

А л ь б э р т ы н а. Нельга злоўжываць дабрынёй каханага чалавека. Клянуся, рэч толькі ў гэтым.

Паўза.

М а р с э л ь. Ды майце ж вы мужнасьць давяршыць фразу! Вы спыніліся на «праз»…

А л ь б э р т ы н а. Ды не, адчапіцеся!

М а р с э л ь. Чаму?

А л ь б э р т ы н а. Гэты выраз, мне сорамна вымаўляць яго пры вас. Я і сэнсу-то ягонага не разумею, а чула я яго на вуліцы ад нейкіх нягоднікаў, і вось зараз ён ні з пушчы ні з бору зьляцеў

у мяне зь языка.

М а р с э л ь разгублена глядзіць на яе.

М а р с э л ь. Мілая Альбэртына, нам лепей разьвітацца. Я вас прашу разьвітацца са мною сёньня ж увечары і зьехаць заўтра ж зранку, калі я буду яшчэ спаць.

А л ь б э р т ы н а. То бок як — заўтра зранку?

М а р с э л ь. Мы з вамі былі шчасьлівыя. А цяпер мы адчуваем, што далей былі б нешчасьлівыя. Вось і ўсё.

А л ь б э р т ы н а. Не кажыце «мы», гэта толькі вы так лічыце.

М а р с э л ь. Нам лепей больш ня бачыцца.

А л ь б э р т ы н а. Мне патрэбны толькі адзін чалавек — вы.

М а р с э л ь. Мне заўжды хацелася зьезьдзіць у Вэнэцыю. І нарэшце зьежджу. Адзін.

Маўчаньне.

М а р с э л ь. Колькі разоў вы мяне падманвалі?

Паўза.

А л ь б э р т ы н а. Дарэмна я хавала ад вас, што я тры тыдні падарожнічала зь Леа. Але гэта было яшчэ да Бальбэку, да таго, як мы з вамі пазнаёміліся. Але Леа, покуль мы падарожнічалі, трымалася са мною бездакорна.

Яна абводзіць позіркам пакой.

А л ь б э р т ы н а. Я не магу паверыць, што я ўсяго гэтага не пабачу ні заўтра, ні пазаўтра, ніколі.

М а р с э л ь. Гэтак трэба, вы тут няшчасная.

А л ь б э р т ы н а. Я не была тут няшчасная, я буду няшчасная цяпер.

М а р с э л ь. Куды вы паедзеце?

А л ь б э р т ы н а. Я сама ня ведаю. Можа, у Турэн, да цёткі.

Паўза.

М а р с э л ь. Вы мне рвяце душу. Хочаце, паспрабуем пажыць яшчэ колькі часу разам?

А л ь б э р т ы н а. Які вы мілы!

М а р с э л ь. Яшчэ некалькі тыдняў.

А л ь б э р т ы н а. Так, я думаю, што нам варта паспрабаваць.

Сцэна: д з і ц я бяжыць і кліча Ф р а н с у а з у.

Ф р а н с у а з а бачыць М а р с э л я здранцьвелым, маўклівым.

Ф р а н с у а з а. Я ня ведала, што і рабіць. А восьмай ранцы мадмуазэль Альбэртына загадала прынесьці ейныя валізкі, а я адмовіць не наважылася і баялася, што вы на мяне раззлуецеся, як я вас пабуджу. Яна зьехала.

М а р с э л ь. А, ну вось і выдатна. Вы добра зрабілі, што не пабудзілі мяне.

М а р с э л ь пачынае задыхацца.

Сцэна: А л ь б э р т ы н а рэзка расчыняе аканіцы.

А л ь б э р т ы н а. Мне трэба сьвежае паветра!

Сцэна: вочы герцагіні дэ Германт на вуліцы.

Вочы Адэты на Авэню Акацыяў.

Вочы маці ў спальні ў Камбрэ.

Вочы Марсэля.

Ф р а н с у а з а працягвае М а р с э л ю тэлеграму, ён адкрывае яе і чытае.

М а р с э л ь (*вяртаючы ёй тэлеграму*). Мадмуазэль Альбэртына загінула. Упала з каня і…

Сцэна: А л ь б э р т ы н а, з распушчанымі валасамі павольна здымае сарочку.

М а р с э л ь. Прызнайцеся, вы любіце жанчын.

А н д р э. Так.

М а р с э л ь. Вы… блізка ведалі мадмуазэль Вэнтэйль, так?

А н д р э. Не, не яе, а ейную сяброўку.

Паўза.

М а р с э л ь. Я, бясспрэчна, даўно ведаў, чым вы займаліся з Альбэртынай.

А н д р э. У нас з Альбэртынай нічога такога не было.

Яны мяняюць пазыцыю.

М а р с э л ь. Вы мяне вельмі вабіце. Магчыма, гэта таму, што я ведаю, чым вы займаліся з Альбэртынай. Мне хочацца адчуць тое, што адчувала яна.

А н д р э. Гэта немагчыма. Вы ж мужчына.

Паўза.

А н д р э. Яна была такая жарсная. Памятаеце, аднойчы вы вярнуліся раней, і я перастрэла вас на прыступках. Вы несьлі букет язьміну.

М а р с э л ь. Так, памятаю.

А н д р э. Але Альбэртына не выносіла паху язьміну. Яна кінулася бегчы. Ад моцнага паху яна самлела.

М а р с э л ь. Так, памятаю.

А н д р э. Насамрэч вы нас тады ледзьве не засьпелі. Гэта было так рызыкоўна, мы ведалі, што вы можаце вярнуцца ў любую хвіліну, але ёй так карцела, яна не магла стрымацца. Таму я і зрабіла выгляд, нібы яна ня любіць язьмінавага паху. Вы ўсё памятаеце. Яна была за дзьвярыма і таксама прыкінулася, што не выносіць язьміну, каб вы да яе не падыходзілі, каб не адчулі на ейным целе мой пах. (*Сьмяецца.*) Альбэртына любіла язьмін.

Яны мяняюць пазыцыю.

А н д р э. Вам гэта хочацца ад мяне пачуць, так? Але я ня буду казаць няпраўду. У Альбэртыны гэта выклікала агіду. Клянуся. Клянуся, што ў мяне з Альбэртынай ніколі нічога такога не было.

Мяняюць пазыцыю.

А н д р э. Яны з Марэлем імгненна паразумеліся. Ён залучаў для яе дзяўчат. Зазвычай сьпярша ён спакушаў дзяўчыну, а тады, калі яна была цалкам у ягонай уладзе, Марэль перадаваў яе Альбэртыне, і яны цешыліся дзяўчынай разам.

Паўза.

А н д р э. Летась, у Бальбэку, яна часта заставалася ў купальнях зь Леа. А памятаю, аднойчы мы бавіліся зь ёю на беразе ракі блізу Бальбэку, там яшчэ былі прачкі, зусім маладзенькія. І адна зь іх — ах, якая міленькая — вырабляла з Альбэртынай такое, што і не перадаць, і тая крычала. «Ах, якая асалода… Якая асалода!» — і, голая, зьвівалася на траве.

Яны мяняюць пазыцыю.

А н д р э. Няўжо вы не разумееце, што тыя, хто апавядаў вам гэтыя плёткі пра Альбэртыну, хлусілі!

М а р с э л ь. Мне ніхто нічога не апавядаў.

Мяняюць пазыцыю.

А н д р э. Яна спадзявалася, што вы ўратуеце яе, ажэніцеся зь ёю. Яна вас кахала. У глыбіні душы яна адчувала, што ў ейным насланьні было нешта ад вар'яцтва, злачынства. Па-мойму, ня выключана, што яна ад роспачы зрабіла сабе сьмерць.

Скрозь аканіцы мігціць сьвятло. Парыж падчас авіяцыйнага налёту. Дзьверы гатэлю.

Грамафон грае рэгтайм.

Адчыняюцца дзьверы. Выходзіць афіцэр. Гэта С э н - Л ю. Ён нейкае імгненьне марудзіць, зашпільвае мундур, а потым шпарка сыходзіць.

У гатэлі.

М а р с э л ь. Пакой, калі ласка. Пакуль ня скончыцца налёт.

М э т р д а т э л ь. Хвіліначку, мсье.

М а р с э л ь. І, калі ласка, бутэльку шампанскага.

М э т р д а т э л ь. Зараз будзе.

М э т р д а т э л ь праводзіць яго да крэсла. М а р с э л ь заўважае, што аднекуль здалёк даносіцца музыка.

М э т р д а т э л ь. Што-небудзь яшчэ, мсье?

М а р с э л ь паварочваецца і бачыць задымлены, напаўцёмны пакой. Два хлопцы танчаць разам; жаўнеры граюць у косьці.

М а р с э л ь (*зьбянтэжана*). Не. Не. Дзякуй.

М э т р д а т э л ь. Калі вам яшчэ што-небудзь спатрэбіцца, мсье, толькі скажыце мне, і я паклапачуся, каб у вас было ўсё, што вы хочаце.

Уваходзіць Ж у п ’ е н. Ён цягне некалькі мэтраў цяжкога жалезнага ланцуга, зь яго ліецца пот.

Ж у п ’ е н. Фух, які цяжар. Марыс, прыбяры.

М а р ы с бярэ ланцугі.

Ж у п ’ е н. Не былі б вы гэткія лайдакі, не прыйшлося б мне самому іх цягнуць. П’еро, ты чаго тут стаіш? Цябе ж чакаюць у нумары 14Б. Давай, варушыся. (*Да мужчыны.*) А табе каго? Красуню Памэлу?

Уваходзіць Ш а р л ю.

Ж у п ’ е н. Добры вечар, мсье барон. (*Дапамагае яму зьняць паліто, праводзіць яго да фатэля. Да мэтрдатэля.*) Келіх мсье барону. Ну, як вам гэты? Ён малочнік. (*Шарлю пацягвае з келіха.*) І самы небясьпечны бандыт у Бэльвілі.

Ш а р л ю. Добра. (*Перадае 50 франкаў.*)

Ж у п ’ е н (*кліча*). Марыс. Пакой 43. (*Да мэтрдатэля.*) Падрыхтуйце 43-ці. Хутчэй!

Ш а р л ю сыходзіць разам з М а р ы с а м.

М э т р д а т э л ь прыносіць М а р с э л ю бутэльку шампанскага, Ж у п ’ е н заўважае яго новага кліента.

Ж у п ’ е н. Не чакаў вас тут сустрэць, мсье.

М а р с э л ь. Я зайшоў, каб перачакаць налёт.

Ж у п ’ е н. Так, вядома… усе так кажуць.

М а р с э л ь. Наколькі я разумею, вы гаспадар гэтага… гатэлю?

Ж у п ’ е н. Так, але мне б не хацелася, каб вы мяне ня так зразумелі. Прыбытак вельмі маленькі. Вось часам я і здаю пакоі салідным людзям. Выдаткі на ўтрыманьне вельмі вялікія. Абсталяваньне, накладныя выдаткі, заробкі… Праўду кажучы, я набыў гэты дом для барона, каб пацешыць старога. Я яго

люблю. А хлопцы… Барону прыемна ў іхнай кампаніі, дык чаму б і не… Ён часта гуляе зь імі ў карты. Вазьміце хоць Марыса. Ён не бандыт. Ён мілы, добры маладзён. Амаль усё, што зарабляе, дасылае сваёй старой матулі.

Уваходзіць б а р о н д э Ш а р л ю, у ланцугох.

Ш а р л ю. Можна вас на адно слова?

Ж у п ’ е н. Слухаю вас, барон?

Ш а р л ю. Гэты хлопец, ён не ўкладае душы ў тое, што робіць. Я разумею, што ён вельмі стараецца, але яму папросту нават блізка не стае грубай сілы. Ён не ўсур’ёз гэта, ён грае, як на сцэне!

Ж у п ’ е н (*кліча*). Марыс! Хадзі сюды.

М а р ы с. Іду, мсье Жуп’ен.

Ж у п ’ е н. Выбачайце, мсье барон. Ёсьць памочнік мясьніка. Днямі ледзь не забіў манаха-расстрыгу. Можа, вам яго?

Ш а р л ю. О, гэткі мне больш даспадобы.

Ж у п ’ е н. Жуло! Надзень вось гэта і марш з баронам.

Ж у л о. Давай, варушыся.

Ш а р л ю. Так, так, іду.

Ж у л о і б а р о н сыходзяць.

М а р с э л ь. Што гэта?

Ён нагінаецца і падымае Ваенны крыж, працягвае яго Ж у п ’ е н у.

Ж у п ’ е н. О Божа! Ваенны крыж!

М а р с э л ь. Мабыць, трэба вярнуць яго ўладальніку.

Ж у п ’ е н. Так-так, абавязкова.

Ж ы л ь б э р т а. Праз два дні па сьмерці Рабэра я атрымала пасылку без зваротнага адрасу. У ёй быў ягоны Ваенны крыж. І ні тлумачальнай нататкі, нічога. Дасланы ён з Парыжу. Як дзіўна, праўда?

М а р с э л ь. Так, дзіўна.

Ж ы л ь б э р т а. Я кахала яго. Але шчасьце паступова сышло. У яго зьявілася іншая жанчына… ці жанчыны — я ня ведаю.

М а р с э л ь. Што вы кажаце?

Ж ы л ь б э р т а. Так. Ён вёў нейкае сваё таемнае жыцьцё і ніколі ім са мною не дзяліўся, але я ведаю, што ён ня мог ад яго адмовіцца.

М а р с э л ь. Што ж, усё можа быць…

Ж ы л ь б э р т а. А вы памятаеце сваё дзяцінства ў Камбрэ?

М а р с э л ь. Не.

Ж ы л ь б э р т а. Няўжо яно для вас нічога не азначае?

М а р с э л ь. Нічога. Усё памерла. Я нічога ня памятаю.

Паўза.

М а р с э л ь. Памятаю, як бачыў вас праз жывую агароджу. Я абагаўляў вас.

Ж ы л ь б э р т а. Праўда? Чаму ж вы тады мне нічога не казалі? Вы мне вельмі падабаліся.

М а р с э л ь. Што вы кажаце?

Ж ы л ь б э р т а. Мне хацелася быць з вамі. Вядома, я рана пасталела. Я хадзіла на руіны ў Русэнвілі… У цемры, зь вясковымі хлопцамі і дзяўчаткамі. Што мы чынілі — сорамна прыгадаць… Мне так хацелася, каб і вы прыйшлі. Я памятаю, як вы глядзелі праз агароджу. Я паспрабавала паказаць вам, як

я вас жадала, але вы, мабыць, не зразумелі.

М а р с э л ь сьмяецца.

Ж ы л ь б э р т а. Чаму вы сьмеяцеся?

М а р с э л ь. Таму што я нічога не зразумеў. Я і цяпер амаль нічога не разумею. Мяне залішне займала іншае. Па праўдзе, я змарнаваў жыцьцё.

Уваходзіць м а л а д а я д з я ў ч ы н а.

Ж ы л ь б э р т а. Ах, вось і ты, мілая. Марсэль, дазвольце пазнаёміць вас з маёй дачкой, мадмуазэль дэ Сэн-Лю.

М а д м у а з э л ь д э С э н - Л ю праходзіць праз пакой. Гучыць саната Вэнтэйля.

М а р с э л ь. Яна была вельмі прыгожая, яшчэ поўная надзеяў, гатовая радасна сьмяяцца. У ёй увасобіўся той самы час, страчаны для мяне. Яна нагадала мне маё юнацтва. Час, бясколерны і няўлоўны, час, які можна было амаль што ўбачыць і памацаць, уцелясьніўся ў гэтай дзяўчыне.

Усе гукі замірaюць.

Паволі праступае першая сцэна.

М а р с э л ь. Ідучы на прыём да Германтаў, я спатыкнуўся на двух няроўных камянёх брукаванкі, і перад маім зрокам неяк расплывіста прамільгнулі Вэнэцыя, Вялікі канал, гандола. Я зноў адчуў сябе на дзьвюх няроўных плітах у саборы сьвятога Марка, і зноў убачыў лязуркавую фрэску, і прыгадаў, што калі афіцыянт незнарок стукнуў лыжкай па талерцы, мне прыгадаліся дрэвы, што прабягалі за акном цягніка. І тады мне падалося, што я зноў у вагоне, гэтак моцна стук лыжкі па талерцы нагадаў грукат малатка станцыйнага рабочага, які выпраўляў нейкі дэфэкт. І тады я прыгадаў паездку з маці. На павароце дарогі я адчуў раптам тую нечаканую асалоду, непараўнальную ні зь якой іншай, калі маім вачом зьявіліся шпілі Мартынвілю, на якіх грала вечаровае сонца, а затым і

трэці шпіль. І хоць паміж ім і тымі двума ляжаў узгорак і даліна, ён стаяў вышэй, і здавалася, што ён побач зь імі. І калі я выціраў рот сурвэткай, мне раптам падалося, што афіцыянт адчыніў акно, якое выходзіла на пляж. І я ўбачыў праз акно кавалак блакітнага неба, бо сурвэтка была гэткая ж жорсткая і накрухмаленая, як той ручнік, якім я выціраў твар у першы дзень, калі прыехаў у Бальбэк. (*Гучна зьвініць званочак на садовых весьнічках.*) І я прыгадаў:

Дрэвы Юдэмэнілю.
Шпілі Мартынвілю.
Раку Вівону ў Камбрэ.
Дахі Камбрэ.
Вечаровы сад у Камбрэ.
Свана, які адчыняе садовыя весьнічкі.
Кавалак жоўтай сьцяны на карціне.
Вэрмэераў «Відарыс Дэльфту».
Быў час пачатку.

Канец.

З ангельскай мовы пераклалі Аляксей Ігнатовіч і Марыя Роўда

[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
№ 9 (49) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2007 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2007/02/18**
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 9 (49) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

[image]

[image]2006

[image] [image] [image]

[image] [image] [image]

МАРСЭЛЬ ПРУСТ (нар. у 1955-м у Шчучыне) — загадчык аддзелу рэдкіх кніг Расейскай нацыянальнай бібліятэкі, Санкт-Пецярбург. Доктар гістарычных навук. Яго апошняя публікацыя ў «ARCHE» — рэцэнзія «Папялушка выдавецтва «Беларусь» (5/2006).

Мікола Нікалаеў Мне 17 год. Вечарам я запісваю, што сёння бачыў і пра што думаў

Ён быў вясковы музыкант, сын багатых бацькоў. Першы хлопец у вёсцы. Вучыўся ў суседнім горадзе. Займаўся палітыкай, разважаў пра будучыню, не хаваў сваіх садысцкіх парыванняў, углядаўся ў жыццё. Часта ён занатоўваў уражанні і думкі ў сшытку. На той мове, якая гучала ў галаве, — часам блытана, але заўсёды шчыра. Па-расейску пісаў так, як вучылі ў Менскім рэальным вучылішчы, па-беларуску так, як гаварылі дома і на вёсцы, як чулася, — бо не вучылі. Усё гэта робіць яго дзённік не толькі дакументам эпохі — на вуліцы быў 1920 год, — але і помнікам літаратуры. Мікалай Баяровіч піша па-беларуску неўнармаваным правапісам і ў мове сваёй надзіва падобны да аўтараў некаторых сённяшніх выданняў, якія ігнаруюць тое, што вучылі ў школе…

Дзённік увесь складаецца з рэаліяў часу. Чытаючы, мы добра бачым, як шмат змянілася і… як нічога не змянілася. Для маладога хлопца на пачатку XXI стагоддзя, як і на пачатку XX стагоддзя, актуальны ананізм, праблема сям'і, уладкавання ў жыцці, сацыяльнай справядлівасці і праўды.

У маленькім архіўным фондзе Мікалая Баяровіча ёсць яшчэ

працы па свінагадоўлі пазнейшага перыяду. Ён вывучыўся і стаў спецыялістам, распрацаваў «Хозметрыку», якая атрымала прызнанне ў Германіі, Амерыцы і нават у Японіі…

Цяпер яго вёску праглынуў ужо Менск. Яго самога рэпрэсавалі ў 1930-я гады. Невядомы лёс — ці расстралялі, ці саслалі ў Казахстан (у каталогах Нацыянальнай бібліятэкі Расіі занатаваныя працы нейкага Н. М. Бояровича, што выйшлі ў Алма-Аце ў гады хрушчоўскай адлігі). Дзённік рэпрэсаванага без руху і ўвагі праляжаў да сёння ў Аддзеле рукапісаў Расійскай нацыянальнай бібліятэкі ў Пецярбурзе, на рагу Неўскага праспекта і Садовай вуліцы.

1920 год. Дзённік Мікалая Баяровіча

6-VII. Ну, сягоння скучнавата. Нейкая слабасць напала. Рабіць ні хочацца, а чытаць — дрэнна робіцца. Здаецца, толькі б з дзеўкамі дурачыўся бы. Добра, што хоць на Юстыну троха забыўся. Любіў яе, што ні было каго лепшага любіць, любіў яе, што і кажды малады улюбляецца хоць у каго. Што з-за любві нічога дрэннага ні відзіш у дзеўкі, гэта я ўжо ведаю.

Сягоння Купалля, дак будзя вялікая гуляння ў бярэзніку на Васілеўскай гары.

8-VII. Пазаўчора хадзілі на Купалля у бярэзнік. Вялікі агонь гарэў усю ноч. Туды сышліся хлапцы і дзеўкі з некалькіх сёл. Гулялася добра. Назад праважаў Юстыну. Ці любіць яна мяне? Ні хацела сядзець, але сама абнімалася. Харашо было з ею. Свяціў месяц, і пры нім неяк яна выдавалася яшчэ харашэйшай. Ну, чорт з ею! Пры адходзе я сказаў, што апошні раз сяджу з ею. Назаўтрае быў кірмаш у Віскаўшчыне, я зайшоў па Юстыну і разам пайшлі аж туды (4 вярсты). Там шмат было знакомых, і ўсе гаварылі, што з нашых дзевак харашэйшая — Юстына. Ну, пасьля гэтага і я прызнаў, што яна харашэйшая. А увечара пашоў іграць вечарынку у Шпількі (2 вярсты). Там пазнакоміўся шмат з якімі хлопцамі. Праводзіў шпількаўскіх дзяўчат. А план «объединения молодёжи» ідзе добра: ужо згаварыўся з Валіцкаўскімі, Грышчанскімі і др. хлопцамі.

Думаю прачытаць трохо днявніка за леташняя лета. Тады я любіў Апрасеню, як цяпер Юстыну. Я гэтак цаніў яе славы, гэтак гадзіў ёй, гэтак хацеў любві з ёй, як цяпер з Юстынаю. Апрасення ж абыкнаваенная мужыцкая дзеўка: сварлівая, ні з харошых і г. д. Можа гэта і з Юстынаю?

9-VII. Я сягоння раніцаю спаў, як прыбегла мамка, скора начала будзіць, крычучы: «Скарэй уставай! Вунь прыйшлі гілі у другія сёлы, прыдуць зараз сюды. Яны адступаюць».

13-VII. Долго и трудно писать, как отступали поляки. Отступали безостановочно трое суток. На большаке давили друг друга. До того скопились, что нельзя было двигаться и установить орудия, чтобы остановить напор большевиков. Я с коровами прятался в лесу. Польские снаряды свистали над головой, а ответные большевистские разрывались неподалёку. Некоторые плакали, а я рад был стрельбе, и приятно было слышать удары. Жена Дежица, когда у её дома начали стрелять из орудий, выбежала от страха в поле и начала петь священные песни. Наши женщины-односельчане попрятались в погреба. Легионеры обращались с людьми зверским образом. В деревне пострадали все. У нас взяли четверо лошадей, не считая мелкого скота. Жеребец был заперт в хлеве, так пощепали двери, замок мешал, так заложили бомбу и потребовали ключа. Родители открыли, но затем откупили за 5000 руб. Всё же к вечеру жеребца забрали. Кто не слушался — били, приставляли дуло и требовали исполнения. Мужчинам невозможно было оставаться дома, все попрятались, оставались женщины и дети. Я с коровами трое суток сидел в лесу. Страха не было у меня — напротив, с молодёжью мы весело проводили дни и ночи. В лес поляки боялись идти. Они поджигали деревни, и мы думали, что не миновать и нашему селению. Население так возненавидело поляков, что готово было сейчас же сражаться. Вот теперь я знаю, как возникает патриотизм. Но разве можно назвать это патриотизмом: поляки ограбили крестьян, а крестьяне за это желают их ограбить и мучать. Теперь понятно, почему в 1812 г. русские так воодушевились против французов. Итак, патриотизм возникает из чувства мщения. Но… у людей есть другое чувство. Когда пришли большевики, то крестьяне

ловили поляков. Вчера поймали и мы двух поляков. Естественно, они должны были быть наказаны, но, несмотря на всё, наши мужики их накормили и хотели отвести к коменданту. Только мой отец бил их и хотел застрелить, но соседи не допустили этого. Мой отец — исключение, а остальные все? И что-то есть у людей другое кроме чувства мщения? Как бы ни ограбили крестьян поляки, всё забудется. Но зачем война? Зачем прославлять Скобелева, Александра I, II? Зачем считать святыми Невского, Ослябя и Пересвета? Для какой цели поляки уничтожили Минск, Койданов, деревни?..

13-VIII. Ніхай яна гарыць з жызняю! Дзе узяць шчасця, дзе яго найсці? Ці ест гэтая на свеце жызня, каб пражыць у шчасці?! Жыву ізноў па старому. Паскудна жыць. Хочацца чытаць, а тут выпраўляюць на работу, ну і мусіш сварыцца, каб сябе боля лепшага зрабіць. Што мне уважаць бацькоў, што мне іх слухаць, — што яны дадуць мне шчасця ці што?! Ах, жызня, жызня.

14-VIII. Жывецца мне ні добра ні дрэнна. Я злую, як толькі магу, але ў гэтай злосці ёсць нешта харошае. У мамкі рэўматызм, пальцы ня гнуцца. Яна складае снапы і чуць можа. Я гляджу на яе, шкадую яе, але кажу, што рабіць ня буду і што мне трэба рабіць. Пазалетась у служанкі быў хлапчук. Я моцна біў яго, паіў салонаю вадою, глядзеў, шкадаваў яго і ў той жа час неяк харашо рабілася. Вот цяпер я гэтак атнашуся к бацькам: шкадую іх, але ня слухаю і мучу, і ад гэтага мне харашо. Жыву, як прыходзіцца. Смерці не баюся. Шоў бы ў салдаты, цярпеў бы голад і нічога не страшна. Вялікая путаніца ў мяне ў галаве. Толькі адно жаданне: чытаць, вучыцца больш і больш.

У нас жыве сусед Антось, год пад пяцьдзісят. Дзеці ужо вялікія. Жонка, Ганна, баба крутадух, здаровы камель, сварлівая. Яна цемгля па сяле бегае і аббрэхвае каго толькі выпадзе. Я думаў, што у гэтай сям'і добра жывецца. Нідаўна было вяселле у Паўлюка. Я іграў. Гляджу, у поўнач усе із хаты даліся на вуліцу. Крык. Антосіха з кіем бегае каля варот і ва ўсё горла: «Стаю я каля варот за шулцам і гляджу: выбягае ад Паўлюка гэта блядзюга, падскаквае бягачу, б'е па назе і кажа: «лытачка,

лытачка», каб яна ёй, даў Бог, адсохла да заўтрашняга дня. За ёю зараз бяжыць гэты сукін сын (муж) з Міхалам (мой бацька). Я за рыдлёўкі і за імі: на ганак ды па плячуку: ага, злавіла бурдаля. Ды па акне ішчэ — ведай, курва, як абманваць. Глядзеця, людзі, на майго бурдаля! Людцы мае, ён жа мне жыць ні дае. Колькі раз ён мяне душыў. На купалля як зачаў біць, дак я зусім асталбянела». Якое ж жыццё пасля гэтага у Антосявай сям'і!

Талсты і другія хваляць дзеравенскую жызню, гавораць, што мужыкі больш нраўственны, што ім добра жывецца. Нічога гэтага німа ў сёлах: усе сварацца у сям'і, з суседзямі, праклінаюць сваю жызьню, усе завідуюць чыноўнікам.

Калі хочыця, каб добра ішлося з дзеўкамі, дак гаварэця пусьцякі, будзьця вясёлыя, спрытныя, сьмяшныя і хітрыя. Калі якая стыдзіцца абнімацца пры людзях, то рабіце гэта у дваіх: людзі думаюць, што вот які ціхі хлопяц, а дзеўка каждая думае і рада, што толькі із ёю хоча ён пабыць.

Канчаю чытаць «Война и Мир» Толстого.

17-VIII. Гаспадарка наша усё горшае. Німа каму рабіць, ні дружна жывецца, а татка ні ўмея камандаваць. Ён к пусцякам прыдзіраецца, а галоўнага ні глядзіць, каб ні мамка, дак ні ведаю што б было. Ды як ні злаваць: Косцік з парабкам мабілізаваны, старыя хворыя, работы шмат, а рабіць няма каму. Я ж хачу чытаць і адказваюся ад работы. Каб ні вучэнне, дак можа я быў бы добры сын, а то баюся, што астануся нідавучаным. Я б кінуў бы усё і астаўся у сяле, але горкі успех в хрысціянскай жызні палохае мяне.

18-VIII. Скажу па праўдзе: хрысціянінам я быў ад ананізма. Я толькі зраблю яго, дак раскаяваюся і пачынаю хрысціянскую жызнь.

Усёж-такі, камунізм ляпей, чым хрысціянства. Камунізм трэба для цяперашней жызні.

Прыехаў із Масквы сусед — Ванька Дзідзюляў. Ён, мусіць, камуніст. Я завідую яму. Як паеду у Мінск, дак трэба знайсці месца савецкага чыноўніка.

24-VIII. На днях был в Минске и от нечего делать слушал лекцию Плетнёва «Идеал анархизма». Когда слушал, то всё казалось хорошим, но когда возвратился домой, то всё показалось глупым.

Был сход мужиков. Надо было поделить 8 дес. земли, даровой, помещичьей. Что же получилось? Те мужики, которые кричали «земли и воли», которые требовали хлеба в комитете, — они отказались от даровой земли! Так и не взяли всей земли. Кто виноват? Боятся брать. Следуют поговорке: «лучше подождать да посмотреть». Фронт у большевиков слабый, что будет если прийдут поляки? Кроме того, без семян, машин, тягсилы трудно справиться с землёю.

25-VIII. Вчера беседовал с Ваньком Дядюля. У него на войне оторвало руку, он начал учиться и теперь служит. Я с успехом спорил. Он — большевик, а я взгляды черпал из Толстого. Большевик не может переспорить христианина, но у него одного не опровергнешь, он говорит: «нынешняя жизнь ложна, но именно потому мы хочем её улучшить. А ради этого лучшего приходиться вести войну, поддерживать тюрьмы и т. д. Капитал можно свергнуть только силою, если останется капитал, то не только коммунизм, но и христианство неосуществимо». Ну, и говори с большевиком! Говорит, что цель его жизни — приносить пользу другим и самому жениться. Воображает, что будет наслаждаться семейной жизнью.

29-VIII. Я ізноў хрысціянін. Я кідаю усё людскае і с аднэю вераю у лепшую жызню іду на новую дарогу. Я ці пагібну, ці найду лепшае жыццё. Так і быць.

24-IX. Работа не только не страшна, не тяжела, а даже

радостна, полезна. Не работа страшна, а страшна та среда, в которой живёшь. Когда работаю — всё хорошо, но как только придёшь с работы в семью, то брань, неурядица и работать не хочется.

Я люблю беседовать с мужиками-бедняками. Рассказываю о толстовстве. Все соглашаются, но некому дать пример. С кулаками же не очень хорошо говорить.

У отца 30 дес. земли. Хозяйство наживалось в течение десятков лет с таким трудом. Большевики грабят. Понятно, что отец против них. С кулаками надо разбираться.

26-IX. Говорят, народ суеверен и что это вредно. Но суеверия приносят также пользу: народ боится причинять зло другим и воздерживается от него. Суеверный народ пусть останется таким, если суеверия нельзя заменить более высоким, нравственным.

Люблю беседовать со стариками: у них большой опыт и могут научить многому.

30-IX. …На днях я писал, что от суеверий польза. Как нарочно, пришёл лекарь-знахарь и обобрал мужиков. Вот и польза от суеверий! Хороший для меня урок.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2007 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2007/02/18**
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 9 (49) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

[image]2006

да Літыка • гісторыя • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Аляксей Бацюкоў Мой цень на тваёй руцэ Апавяданьне

АЛЯКСЕЙ БАЦЮКОЎ
пісьменьнік, эсэіст. Даўні аўтар «ARCHE».

Я загінуў пад аўтамабілем. Гэтая дарога супраць дому заўсёды нас палохала. Ты сьціскала рукой кончыкі маіх пальцаў і рвалася празь яе, кідаючы цераз плячо злосныя позіркі на машыны — падпарадкаваныя сваёй жывёльнай дрыгоце, яны набліжаліся рыўкамі і рыўкамі падалі ўперад, адразаючы ад нас нашыя цені. Аднойчы я ішоў адзін, і каля пераходу мяне зьбіў аўтамабіль. Я ня бачыў яго, ён выскачыў з-за грузавіка. Гучны ўдар — і, узмахнуўшы рукой, я ўпаў на асфальт. Непрыгожа, нават вычварна: зьведзеныя разам рукі і раскіданыя ногі. Вуліца спынілася.

Потым некалькі месяцаў мяне не было, але ўвосень, нават на пачатку зімы — сухой, але чамусьці туманнай — я прыйшоў да цябе дамоў. Ты ляжала на ложку, мінаў дзень, ты ня плакала, проста ляжала, калі я паклікаў цябе. Я стаяў каля сьцяны ў зялёным швэдры. Сказаў «прывітаньне». Ты паглядзела на мяне з жахам — я памятаю. Але ніколі потым я не крыўдаваў на цябе за гэты позірк. Я пастаяў нядоўга і зьнік. Калі я прыйшоў другі раз, ты зноў была адна. Ты паволі мыла на кухні посуд, часам спыняючыся і гледзячы перад сабой. Я паклаў на стол руку, і ты папрасіла: «Падай мне анучу», — а потым падхапілася, паглядзела на мяне і заплакала. Магчыма, ты доўга плакала ў той дзень — я ня ведаю, гэтым разам я быў таксама ненадоўга. Але я заўважыў, што ты была вельмі бледная і нейкая

незвычайна тонкая.

Калі я прыйшоў яшчэ, ты гуляла ў парку. Дакладней, уладкоўвалася на лаўцы, папраўляючы плашч. Падняла вочы — а я сяджу насупраць, усьміхаюся, нават трымаю ў руцэ цыгарэту, а з кішэні плашча тырчыць газэта. Я глядзеў на цябе, ня рухаючыся зь месца, чакаючы, пакуль ты ажывеш тварам, расьцісьнеш кулакі і прымружыш павекі. Тады я падняўся, наблізіўся, ткнуўся вуснамі ў выгін шыі, дакрануўся імі да вушка, ледзь чутна пацалаваў, прыціснуў цябе да грудзей, абняў за талію, прыпаў да вуснаў так моцна, што мы абое пачалі заглынацца гэтым пацалункам. Я зьнік, бо да цябе падышла нейкая старая і спытала, ці добра ты сябе адчуваеш. Сыходзячы, я пасьпеў пабачыць, зь якім болем ты расплюшчваеш вочы.

Потым я стаў зьяўляцца часьцей. Адбіткам твару ў вітрыне крамы, нечаканым голасам сярод ночы, знаёмаю постацьцю ў натоўпе. Я ўзьнікаў зь цемры падземнага пераходу, глядзеў табе ў вочы — ты спынялася, не наважваючыся крануцца, узіралася — і я аказваўся незнаёмым маладым чалавекам. Я клікаў цябе на вуліцы, ты рэзка абарочвалася, затым апускала галаву і ішла далей. Я дыхаў каля самай тваёй шчакі, з шолаху ветру і кропляў дажджу сплятаючы свой ледзь чутны шэпт — *я тут, я кахаю цябе, нічога ня бойся, гэта я*.

Упершыню пасьля маёй сьмерці мы загаварылі раніцай у ложку ў нейкі сонечны выходны. У тую самую гадзіну, калі ты ўжо прачнулася, але яшчэ не магла знайсьці сілы расплюшчыць вочы і атрэсьці рэшткі цёмнай іррэальнасьці. У гэтым разоры нешта разьняволіла цябе, і ты стала размаўляць са мною. Ты казала, як табе цяжка адной, прасіла абняць мацней, яшчэ мацней, лаяла мяне за тое, што я загінуў — *чаму, ну чаму?* — крычала ты, затым схапіла за руку, прыцягнула да сябе, не расплюшчваючы вачэй, уткнулася тварам мне ў грудзі — *даруй, ня слухай мяне*. Раптам сонца засьляпіла ў вакно, адступілі цені. Разор паміж іррэальнасьцю і днём звузіўся да тонкай рысы тваіх прымружаных павекаў. Ты ня спала, але не наважвалася іх прыўзьняць. Адзін твой рух, адно слова, думка — і я сыду разам з усім, што сыходзіць!

Наступным разам я прыйшоў амаль праз год. Ты крыху зьмянілася, ажыла, ці што. Але ўсё яшчэ заставалася адна. Сумная чыстая кватэра — сумная якраз сваёй бездакорнай чысьцінёй. Вечар, толькі што выключаны тэлевізар. Ты нешта млява вязала шэрымі ніткамі, часта спыняючыся, і нарэшце адклала сьпіцы.

Я быў ценем каля тваіх ног і спаўзаў да сьцяны, падуладны непазьбежнаму падзеньню сонца ў ноч. Доўгі, выцягнуты чорны абрыс, я трывожна адсоўваўся ад цябе, а ты спакойна глядзела на мяне.

І тады я пазваніў у дзьверы. Мой голас зазьвінеў за вакном, і я паклікаў цябе аднекуль з глыбі другога пакою — адначасова, так, што ты схамянулася, падскочыла і ўключыла сьвятло, заткнула вушы. Але змагалася ты нядоўга. Я зноў пазваніў. Ты патушыла сьвятло.

Адчыніла дзьверы. Я ўсьміхнуўся і, не чакаючы запрашэньня, увайшоў. Ты не вымавіла ані слова, толькі, здаецца, сьпярша расплакалася. Праўда, сьлёзы хутка высахлі. Мы пайшлі на кухню. Там на стале мяне чакала гарачая вячэра. Я еў, а ты лашчыла рукамі мае валасы. Раз-пораз я казаў: *«Ну, перастань!»* — і мы сьмяяліся. Ты сядзела побач, пакуль я піў гарбату. Мы падняліся, трымаючыся за рукі, паплылі ў залю. Ты пасунула два крэслы, так, каб яны стаялі насупраць тэлевізара, але каб мы былі напалову зьвернутыя адзін да аднаго. Паказвалі мой любімы фільм. Некалькі разоў, як у сьне, паўтарыўся эпізод, дзе людзі сядзяць за сталом, чакаючы ежы, і апынаюцца на сцэне тэатру. Фільм доўжыўся амаль бясконца. Ты бачыла адно водбліскі экрану на маім твары. Потым мы леглі спаць — ты пасьцяліла, зьняла адзеньне і схавалася ў маіх абдоймах. Ты нават енчыла, узьбіваючы каленьмі прасьціну, пакуль у зморы і роспачы ня страціла прытомнасьць. Заўтра быў выходны дзень, мы абое бачылі вуліцу, лёталі на самалёце паміж засьнежаных гор, плылі пад вадой, сьмяяліся ў высокім гатычным саборы, разразаючы воклічамі дрогкі паўзмрок. Калі нараніцу ты паднялася з ложка, крыху пацепваючыся ад холаду, табе падалося, што я ляжу побач. Падалося на адно нецьвярозае і несапраўднае імгненьне. Я адразу зьнік.

Але я стаў прыходзіць усё часьцей і заставацца дольш. Аднойчы я правёў цябе на працу, наступным разам не ўтрымаўся і праседзеў побач аж да перапынку. Па абедзе ты адпрасілася ў начальніка і ўцякла дамоў. Некалькі кварталаў я бег за табой адлюстраваньнямі ў вітрынах, але ня змог дагнаць. Дома ты была расчырванелая і заплаканая. Ня ў стане падысьці бліжэй, я чакаў увесь вечар на сваім крэсьле ў залі. Некалькі разоў ты выходзіла са спачывальні, пераконвалася, што я тут, і цяжка крочыла назад.

Калі ты хадзіла ў госьці да сястры, я быў з табой, я трымаўся ззаду. Калі яна адведвала цябе, я сядзеў побач зь ёй, так што ты ўвесь час пераводзіла позірк зь яе на мяне. Позірк зь ціхай скрухай і мальбой. Сястра пачала нешта падазраваць і доўга не сыходзіла, выпытваючы, як ты пачуваесься. Калі ты нарэшце ўздыхнула: *«Госпадзе, у мяне так баліць галава!»* — яна супакоілася, выпіла гарбату і разьвіталася. Пасьля яе сыходу ты доўга не наважвалася ўвайсьці ў залю. Я чакаў цябе, у тэлевізары людзі апыналіся на сцэне і ня ведалі, што сказаць. Пасьля гэтага вечара я больш ніколі не зьнікаў надоўга. Я пакідаў цябе адну ў купальні, чакаў пасьля працы, не глядзеў, калі ты апраналася. Часам ішоў па вуліцы, калі ты ехала ў аўтобусе. Ішоў паволі, але на кожным прыпынку ты бачыла мяне ў вакно. Перш чым растаць у натоўпе, я падымаў каўнер, баронячыся ад ветру, коратка і з трывогай кідаў вокам на неба і глядзеў на цябе. Мімаходзь, як і на ўсіх навокал. Але вылучаў цябе з усіх астатніх адным тым, што бачыла гэты позірк толькі ты.

Старая спадніца, цёплы шэры швэдар, расьцягнуты на лакцях. Той, які ты вязала сама. Зачасаныя за вушы, але крыху ўскудлачаныя валасы. Штораз папраўляючы, ты блытала іх яшчэ больш.

«І цяпер вы таксама яго бачыце?»

Ты кідаеш на мяне кароткі пагляд — я адкладаю пульт тэлевізара, вяртаю табе позірк, але ты ўжо апусьціла галаву.

«Так».

Шырокая сьпіна мужчыны, нахіленага да цябе. У спачывальні ўздыхае, часам усхліпваючы, сястра, але яна занадта разгубленая, каб плакаць. Мужчына нешта зноў спакойна запісвае, ледзь заўважна назіраючы за табой краем вока. Тым часам ты падымаеш галаву, і асьцярожна, перамагаючы ўсё, глядзіш на мяне. Я ўсё прачытаў у тваіх вачох. Ты баялася. Ацьверазеньне ад відзежы расьсякло сьвядомасьць на два няроўныя кавалкі, і кожны зь іх жахаўся і ўпотай ненавідзеў другога. Паміж гэтымі асклепкамі, паміж сьвядомасьцю і антысьвядомасьцю, заблытаны ў абедзьвюх і непрыналежны ніводнай цалкам, я сядзеў насупраць цябе, сьціснуўшы рукі, каўтаючы некалькі словаў, гатовых вось-вось сарвацца і ўвайсьці ў цябе, але цяпер да жаху немагчымых.

Пасьля зьяўленьня мужчыны з шырокай сьпінай для нас пачаліся самыя складаныя часы. Мне было цяжка, амаль балюча, аднак я ня мог не прыйсьці, бо толькі так ты магла пазбавіцца ад мяне. Ты адмовілася ад лекаў і вынішчала мяне выключна ашчэпкамі сілы волі. Зьедзенымі іржой маіх позіркаў высілкамі адмовіцца ад часткі сябе.

Ты таропка пісала дзёньнік, падкрэсьліваючы маё імя, выводзячы яго невыносна тоўстымі літарамі, невыносна для самой сябе вялікімі літарамі, якія ўрэшце пачыналі жэрці ўсе аркушы, не пакідаючы волі ані іншым словам, ані табе. Ты да галавакружэньня глядзела мне ў вочы, штоночы слухала енкі з майго фільму — ён разьбіўся на безьліч негарманічных рухаў і рэхаў. Калі мы сутыкаліся ў калідоры, ты ішла проста на мяне, змушаючы адступаць і прапускаць цябе. Аднак нельга сказаць, што менавіта ў той час я пабачыў, як тваё каханьне ператвараецца ў нянавісьць. Нянавісьць была і раней, ледзь заўважная, яна заўсёды перасьледавала цябе ў кожным ацьверазеньні ад мяне. Яна прасьлізвала невыразным ценем, як нібыта нехта ў чорным прайшоў за вакном. А цяпер, калі ты прагла яе, каб празь яе аддзяліць мяне ад сябе — яе не засталося. Усе твае рухі, позіркі і словы выдавалі хіба адчай, а не нянавісьць. І яшчэ сьмяротную нечалавечую стому. Сілы змагацца супраць паловы сябе давала табе толькі каханьне. Каханьне як успамін пра жывога мяне, як нязьдзейсьненая мара пра няіснага, але магчымага мяне. Каханьне, якое цьвёрда

адмяжоўвала мяне-памяць ад мяне-хваробы. Дзеля мяне адмовіцца ад мяне.

Тактыка, прапанаваная табе мужчынам з шырокай сьпінай, выявілася вычварна дзейснай. Наталіцца мной, нажэрціся дасхочу. Да агіды. Толькі ён ведаў, што агіда будзе выядаць у табе без разбору — і хваробу, і памяць. Потым гэта пачала ўсьведамляць і ты — але запозна. Таму я і перастаў прыходзіць. Мужчына з шырокай сьпінай давёў табе, што, каб выратавацца, трэба быць бескампраміснай. Дзеля мяне ты пагадзілася, не ўсьведамляючы пакуль, што сам я, вось такі я — адзіны кампраміс паміж тваім жыцьцём і маёй сьмерцю.

Колькі прайшло гадоў, я ня ведаю. Мабыць, шмат — ты была замужам, у вас нарадзіліся дзеці. Ты не выглядала самотнай — наадварот, у кожнай рысцы адчувалася стомленасьць ад людзей. Ужо зусім не маладая, крыху больш мяккая целам, запаволеная, але прыгожая. Ты сядзела вечарам каля вакна — у іншай кватэры, большай за нашу і менш напоўненай табой. Ты тулілася на краёчку канапы пры выключаным сьвятле і выглядала ноч. Быў дзень твайго нараджэньня. Усе ў доме ўжо леглі, хоць часам зь іншых пакояў даносіліся нейкія гукі і нібыта ломкі падлеткавы голас твайго сына. Я бачыў гэта ўсё адно імгненьне — тое імгненьне, у якое ты дазволіла сабе слабасьць успомніць проста пра мяне.

Потым такое здаралася яшчэ. Але я не прыходзіў. Промільг ценю, згадка, што я мог бы прыйсьці, — і правал у месяц, паўгоду, год — і ўсё. Ты разумела, чаму. Разам з хваробай і памяцьцю ўмелы мужчына з шырокай сьпінай выдраў каханьне — засталася адна туга.

Мой непрыход пацьвярджаў для цябе несапраўднасьць нашага каханьня. Бо іначай ніякія мужчыны з шырокай сьпінай!..

Я мінаў скрозь цябе, не затрымліваючыся і не даючы надзеі, але ты заўсёды адчувала мяне і адчайвалася намацаць.

Аднойчы я змог шапнуць табе на вуха сярод ночы:

Як мы кахалі? Нема!

Хто не існаваў безь цябе? Я!

Ты не паверыла, што гэта я, падумала, што проста паддалася віхуры даўніх успамінаў. Ты доўга разважала — чаму згадаліся менавіта гэтыя словы? Магчыма, таму, што ўсё танчэла вера, што я сапраўды калісьці існаваў у тваім жыцьці? *Хто не існаваў безь цябе? Я!*

Сысьці ўвесну — што можа быць прыгажэйшым? — думала ты, гледзячы ў вакно бальнічнай палаты.

Крыху запыненая наркотыкамі, твая сьвядомасьць ажывала рэдкімі, павольнымі думкамі, густымі ад болю, як кроў. Ты нават ня думала, ты адчувала сьвет вакол сябе ў нейкім адзіным прасторава-часавым вымярэньні. Пад вокнамі цьвіла яблыня, і ты загадала сабе, што спынісься, як толькі ападзе апошні пялёстак.

Толькі адпусьціце мяне — часам хвалявалася ты, баючыся, што раптам цябе спыніць чыясьці неміласэрная дабрыня. *Толькі адпусьціце мяне*, — аднойчы сказала ты старэйшаму сыну. Ён наведваў цябе адзін, вы стаялі моўчкі. Хворая, ты ўжо не пазнавала яго — прыняла за доктара. *Толькі адпусьціце мяне* — ён перамяніўся тварам. Потым, сыходзячы, плакаў на лесьвіцы, доўга стаяў у закутку каля ліфта. Атупелы ад болю страты, ён вырашыў, што ты ўжо зусім ня можаш трываць.

Трываць ты магла, ты была чалавекам на вяршыні гары, які чакае ўзыходу сонца і не зважае на ранішні туман. Ты плыла ў цёплай, крыху саланаватай вадзе, абкружаная зіхоткім срэбрам і золатам рыбінаў, зь цеснай цемры на паверхню, ужо нават дасягнуўшы паверхні кончыкамі пальцаў.

Ты ня думала пра мяне, ты чакала.

Адчай у апошнія гады зьмяніўся глухой тугою, ціхім бясколерным шкадаваньнем. Як даўно я быў! Калі быў…

Ты чакала. Табе абяцалі некалькі апошніх дзён. Ты чакала

гэтыя дні, кожную раніцу вяртаючыся да вакна глядзець, як на яблыні растае бель. Гатовая прыняць і мой прыход і непрыход *пасьля*. Верыла — ня верыла ў мяне. Існавала — не існавала. Маўчала, маўчаньнем прамаўляючы. Чакала, падала зь пялёсткамі, раставала ў зялёнай пяшчоце, бачыла, засынала. Спала, плыла, падала і раставала, белая, *да*, існавала, маўчала ў чаканьні. Верыла, усьміхалася, белая, прамаўляючы, ты, ты.

Подых. Цішэй, цішэй. Распушчаны ў агні сьвітанку стогн. Я прысеў побач і ўзяў цябе за руку.

Ты спала ў той момант, але пачула, як далёка ўнізе апусьціўся на траву пялёстак.
[image]
[image]

№ 9 (49) - 2006
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2007 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2007/02/18**
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 9 (49) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

9[image]-[image]2006

[image] [image] [image]

ДАНІЛА ЖУКОЎСКІ

Даніла Жукоўскі Saeculorum novus nascitur ordo[1]

крытык літаратуры. Апошняя публікацыя ў «ARCHE» – рэцэнзія «Апокрыф зьняверaных» (5/2006).

Кісліцына, Ганна. *Новая літаратурная сітуацыя: змена культурнай парадыгмы*. Навуковае выданне. – Мінск: Логвінаў, 2006.

[1] Параджаецца новы парадак вякоў (*лац.*).

Моцнае і магутнае не мае тых пераваг, якія мае далікатнае і кволае.

Дао Дэ Цзін

Беларусам ужо даўно вядомыя творы – ад слоўніка Ластоўскага да «Старажытнай Беларусі» М. Ермаловіча, – якія хоць і пазіцыянуюцца як навуковыя, насамрэч маюць нашмат больш агульнага з мастацкаю літаратураю ды яшчэ нясуць значны прапагандысцкі зарад. Кніга літаратуразнаўцы Ганны Кісліцынай хутчэй працягвае даўнюю традыцыю падмяняць *science* на *fiction*, чым прапануе ўзор традыцыйнага навуковага даследавання. Аўтарка наўпрост працягвае лінію тэарэтыкаў літаратурных навацый В. Акудовіча і Ю. Барысевіча.

Тым не менш, гэта даволі незвычайна – напісаць гісторыю фармавання Новай Літаратурнай Сітуацыі (далей – НЛС) з уласнага суб’ектыўнага гледзішча. Але цікавейшая за нестандартнасць погляду прыналежнасць да пэўнай метадалогіі – дастаткова думкі спадарыні Ганны супаставіць з меркаваннямі спадароў: Дубаўца, Акудовіча, Барысевіча,

Вішнёва, Гуменюка… І ў гэтым выяўляецца адметная рыса самой НЛС. Хіба з Кісліцынай пачалася традыцыя не ставіць сваё бачанне ў адзін шэраг з іншымі, калі не больш аб'ектыўнымі, дык хаця б статыстычна больш прадстаўнічымі? Выдаўшы кнігу пад эгідаю ордэна Дружбы народаў Інстытуту літаратуры імя Янкі Купалы Нацыянальнае акадэміі навук Беларусі, Ганна Кісліцына толькі прасунула пэўны метад культураўспрымання далей у навуковым кірунку. І ў гэтым сэнсе кніга робіць свой унёсак у тое, што аўтарка заве НЛС, – вось ужо і на навуковай арэне година выступіў гладыятар, які адстойвае першаснасць нутранага пераканання над дробязнымі флуктуацыямі фактаў.

Найважнейшае адкрыццё постперабудовачнае эпохі ў галіне культуралогіі цалкам змясцілася ў поўнай захаплення фразе расійскага журналіста: «*ПИПЛ ХАВАЕТ*!». У перакладзе: прыбытковай для творцаў ды асоб, што кормяцца вакол іх, з'яваю культуры можа быць усё, што заўгодна. Ва ўмовах разнастайнасці крыніц фінансавання ды культурнага плюралізму дэкларацыянне нечага творам культуры (асабліва ж – культурнага авангарду) вызваляе ад неабходнасці адпавядаць якімсьці крытэрам, апроч наяўнасці акта публічнага выяўлення. Дыскурс фрагментуецца. Крытэры страчваюць універсальнасць. Сродкі абгрунтавання прыналежнасці да жанру множацца. Немагчымае робіцца магчымым. Падаецца бессэнсоўным вылушчваць аўтарскія недакладнасці ды суб'ектыўнасці.

Ганна Кісліцына сваёй кніжкай зрабіла яшчэ адзін важкі ўнёсак у развіццё мілай яе сэрцу НЛС – як яна яе разумее. А чаму б і не? З пункту гледжання спадарыні Кісліцынай, сутнасць трансфармацыйных працэсаў у беларускай літаратуры, распачатых пад уплывам гарбачоўскае перабудовы, трэба шукаць у тым, як на нашым літаратурным полі адбывалася прышчэпліванне новых (на той час і менавіта для нашае літаратуры) мастацкіх сродкаў і падыходаў. Цалкам лагічна, што ў наратыўнай частцы кнігі пераважна асвятляецца хроніка літаратурнага эксперыменту – з'явы сапраўды нечуванай паводле як маштабу, гэтак і формаў для літаратурнага жыцця Беларусі познесавецкага перыяду.

Калі б аўтарка акрэсліла тэмай сваёй працы менавіта гэткі эксперымент у адпаведны гістарычны перыяд, тэкст істотна наблізіўся б да канонаў навуковай строгасці. Але ёй хочацца, каб менавіта гэтая дзейнасць, гэтыя людзі й гэтыя падзеі занялі цэнтральнае месца ў гісторыі грамадска-літаратурных пераўтварэнняў апошніх дзесяцігоддзяў – і менавіта ў тым ракурсе, які яна ім надасць. (Свядома ўстрымаемся тут ад разгорнутых прыкладаў – хай пра гэта гавораць людзі, якія мелі да падзей больш шчыльнае дачыненне. Абмяжуемся згадкай пра раман А. Наварыча, дзе, здавалася б, і магчымасць адвольнай трактоўкі, і працаёмкасць праверкі фактаў зведзеныя да мінімуму.) Так, перад намі глыбока асабісты погляд зацікаўленага чалавека дый актыўнага ўдзельніка шмат якіх падзей. Крытыкаваць кнігу за недахоп навуковай аб'ектыўнасці ды ўзважлівай бесстароннасці – гэта ганіць оперу за тое, што ў ёй зашмат музыкі і ўсе спяваюць. Авангард, як з'ява паводле вызначэння малая і кволая ў параўнанні з уласным патэнцыялам, заўсёды патрабуе калі не спрыяльнага, дык спачувальнага асяродку. І гэты асяродак актыўна стварала і стварае Ганна Кісліцына.

«Новая літаратурная сітуацыя: змена культурнай парадыгмы» – перш за ўсё вартасны чалавечы дакумент, які сведчыць пра адданасць аўтаркі пэўным ідэям, датычным літаратурнага жыцця. Дакумент тым больш каштоўны, што пры ўсіх асабістых прыхільнасцях Ганна Кісліцына вельмі цвяроза ацэньвае маштаб і моц уплыву апісаных ёю творчых ініцыятыў. Яна шораз згадвае зацятае маўчанне калялітаратурных СМІ, слабую ўвагу грамадства, малы абсяг аўдыторыі, непрацяглае існаванне перыёдыкаў. Але яна піша пра любае яе сэрцу, і на другі план адсоўваюцца больш трывалыя праявы НЛС, кшталту працяглае дзейнасці ТВЛ, шматгадовай працы «Нашай Нівы», існавання незалежных літаратурных прэмій ці някідкага, але год ад года большага даробку перакладчыкаў. Аўтарка цягнецца да дынамічнага, але няўстойлівага авангарднага асяродку, і можна толькі пагадзіцца, што наяўнасць гэткае з'явы – вельмі важны знак паўнакроўнасці літаратурнага працэсу.

Аднак у тым, мусіць, і асаблівасць БелНЛС, што пры наяўнасці

гэткіх знакаў сам працэс ледзьве намацваецца. Знакі ёсць – кантэксту, на які яны нібыта паказваюць, малавата. Але гэта не перашкаджае любіць знакі, узносіць іх на найвышэйшае месца на шкале вартасцяў і – з улікам Новай, і не толькі Літаратурнай, Сітуацыі – ператвараць сваё захапленне ў прафесійны і навуковы занятак. Дык павіншуем з кнігай Ганну Кісліцыну!

[image]

[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.

Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine

Апошняе абнаўленьне: 2006/10/03

[image]

ПАВЕЛ УСАЎ
палітолаг. Яго апошні аналіз у «ARCHE» «Расея, сацыял-дэмакратыя і «праект Казулін» (7/2006)

Павел Усаў Геапалітычная карыда

Marples D. *Europe's Last Dictatorship: The Roots and Perspectives of Authoritarianism in «White Russia»* // Europe-Asia Studies. Vol. 57. No. 6, September 2005. P. 895—908.

Main S. *The Bison And The Bear: Belarussian — Russian Relations 2003 — 2006* // Conflict Studies Research center. February 2006.

Беларусь усё больш пагружаецца ў палітычную самаізаляцыю і тым самым прыцягвае ўвагу заходніх палітолагаў. Яны спрабуюць адказаць, галоўным чынам, на пытанне: як стаў магчымым прыход Лукашэнкі да ўлады і хуткі пераход да аўтарытарнага стылю кіравання краінай? Другім аб'ектам зацікаўлення выступае геапалітычнае становішча Беларусі і яе хістанне паміж Усходам і Захадам.

Першыя пытанні разглядаюцца ў артыкуле канадскага гісторыка Дэвіда Марплза. Праблематыка геапалітычнай сітуацыі і стасункаў з Расіяй падымаецца ў публікацыі доктара Стывена Мэйна: «Зубр і мядзведзь: Беларуска-расійскія адносіны 2003—2006 гг.».

Д. Марплз пабудаваў свой артыкул у форме дыскусіі з пастулатамі іншага амерыканскага спецыяліста па СНД, Грыгора Ёфэ, які сцвярджае, што беларуская дыяспара малюе

неаб'ектыўную карціну гаспадарчай і сацыяльна-палітычнай сітуацыі ў Беларусі, а таксама перабольшвае праблему, звязаную з працэсамі русіфікацыі. Ёфэ ўпэўнены, што на сённяшні дзень дзякуючы палітыцы А. Лукашэнкі краіна дасягнула пэўных поспехаў ва ўсіх сферах жыцця грамадства, а пытанне нацыянальнай самаідэнтыфікацыі ніколі не хвалявала большасць беларусаў.

Марплз лічыць такі погляд на сучасную сітуацыю ў Беларусі, асабліва ў нацыянальным пытанні, вельмі спрошчаным. Праблему нацыянальнай самаідэнтыфікацыі трэба разглядаць у плоскасці палітыкі, якую праводзіць кіроўная эліта краіны. Нацыянальная палітыка кіроўнага класа дэструктыўная, хаця і не сустракае супраціву большасці грамадства. Сутнасць нацыянальнай палітыкі Лукашэнкі палягае ў дзяржаўна-палітычным нацыяналізме, гэта значыць, правядзенні такой нацыянальнай палітыкі, якая спрыяе ўмацаванню і ўтрыманню яго асабістай палітычнай улады. Таму ўлада ўслаўляе найперш той гістарычны перыяд, калі Беларусь існавала ў складзе СССР. Адначасова затушоўваюцца тыя вобразы, міфы і сімвалы, якія тычацца дасавецкай гісторыі беларускіх земляў. Так, беларускае грамадства пазбаўляецца магчымасці нацыянальнага выбару.

Д. Марплз аналізуе аб'ектыўныя прычыны таго, чаму значная частка беларускага грамадства абыякава ставіцца да сваёй мінуўшчыны і не змагаецца за сваю гістарычную спадчыну. На ягоную думку, сярод іх былі наступныя:

1. Адсутнасць нацыянальных міфаў, якія б падзяляла большая частка насельніцтва і якія б пацьвярджалі суцэльнасць беларускай гісторыі ад мінуўшчыны да сучаснасці.

2. Адсутнасць архетыповых, знакавых нацыянальных беларускіх гісторыкаў, такіх як М. Грушэўскі ва Украіне. Згодна з Марплзам, такія постаці, як У. Ігнатоўскі і З. Пазьняк, не мелі значнага ўплыву на фармаванне нацыянальнай самасвядомасці беларусаў.

3. Дэнацыяналізацыя гісторыі Беларусі ў савецкі час і сучасны перыяд.

4. Неэфектыўнасць беларускай дыяспары, няздольнай аказваць значны ўплыў на развіццё нацыянальнай культуры.

Для кансервацыі і саветызацыі нацыянальнай свядомасці беларусаў афіцыйная прапаганда вельмі эфектыўна выкарыстоўвае вобразы і падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Менавіта гэтая гістарычная падзея стала асноўным аб'ектам палітычных спекуляцый рэжыму Лукашэнкі. Матыў вайны выціскае ўсе астатнія падзеі ў сучаснай гісторыі краіны, асабліва тыя, якія сведчаць аб вынішчэнні нацыянальнай эліты падчас сталінскіх рэпрэсій. Нацыянальная трагедыя Беларусі ў час сталінскіх рэпрэсій не ўпісваецца ў карціну палітычнай рэчаіснасці, якую стварыла афіцыйная прапаганда, бо між іншым нагадвае тое, што робіць рэжым Лукашэнкі з незалежнай інтэлектуальнай элітай. Пакуль беларусы не звольняцца ад міфаў савецкага мінулага, не згадаюць пра ахвяры савецкага часу, датуль умацаванне нацыянальнай сьвядомасці будзе немажлівае. Прыкладам маніпуляцыі нацыянальнай свядомасцю Марплз называе змену назваў двух сталічных праспектаў — імя Скарыны на Незалежнасці, а Машэрава на Пераможцаў.

Блакаванне росту нацыянальнай свядомасці беларусаў і ўзмацненне лукашэнкаўскага рэжыму стала мажлівым перш за ўсё з прычыны сацыяльнай спецыфікі беларускага насельніцтва:

— беларускае насельніцтва збольшага сельскага паходжаньня і не мае эмацыйнай прыхільнасці да ідэі нацыянальнай дзяржавы.

— на тэрыторыі Беларусі здаўна не існавала культурных цэнтраў, здольных генераваць нацыянальную ідэю і фармаваць культурную і палітычную эліту краіны.

— скіраванасць Лукашэнкі да Расіі абумоўлівае неабходнасць стварэння і развіцця такіх міфаў, якія б сьведчылі аб культурна-палітычнай еднасці абодвух народаў і дзяржаў.

— у беларускім грамадстве адсутнічае дыялог паміж рознымі сацыяльнымі і палітычнымі групамі ў нацыянальным пытанні.

Марплз, тым не менш, упэўнены, што афіцыйная палітыка ў сферы нацыянальнай культуры — гэта палітыка без будучыні. Сапраўды, яна адпавядае цяперашнім інтарэсам паноўнага рэжыму, але шкодная для нацыі ў цэлым.

Аналіз геапалітычнага палажэння Беларусі даецца ў артыкуле С. Мэйна. Ён прапануе адысці ад эмацыянальнага асэнсавання тых працэсаў, якія адбываюцца ў Беларусі, а паглядзець на іх з пункту гледжання геапалітычных інтарэсаў. Ці ёсць магчымасць выкарыстаць Лукашэнку ў інтарэсах Захаду так, як яго выкарыстоўвае Расія, дарма што Захад лічыць яго злачынцам?

Мэйн крытыкуе няправільнае стаўленне Захаду да рэжыму Лукашэнкі. Палітыка ізаляцыі краіны пазбаўляе яе альтэрнатывы ў пошуку шляху для далейшага развіцця і тым самым штурхае Беларусь у абдымкі Расіі. Калі Захад не зменіць сваёй палітыкі ў дачыненні да рэжыму, то Беларусь цалкам апынецца ў палітычнай арбіце Расіі.

Расія была і застаецца імперыяй, а яе пашырэнне і ўзмацненне ёсць большым злом, чымся існаванне няхай і дыктатарскага, але незалежнага рэжыму Лукашэнкі:

Прыйдзе той час, калі Захад перастане дэманізаваць рэжым і пачне яго падтрымліваць. Тое, што ніхто на Захадзе не гатовы выслухоўваць альбо размаўляць з Беларуссю, адпавядае інтарэсам Расіі. Захад ізаляваў рэжым, а цяпер наракае, што той знаходзіцца ў абдымках Расіі.

На думку аўтара, пазіцыя Захаду павінна ўлічваць наступныя фактары:

1. Беларусь — еўрапейская краіна, і яе развіццё павінна быць звязана з Еўрапейскім Саюзам.

2. Нягледзячы на недэмакратычнасць рэжыму Лукашэнкі, у краіне назіраецца сацыяльна-гаспадарчая стабільнасць, што

пазітыўна характарызуе ўладу ў краіне ў параўнанні з яе суседзямі.

3. Слабасць і няздольнасць апазіцыі змяніць уладу ў краіне. Спробы вонкавага ўмяшальніцтва.

4. Геапалітычная і геастратэгічная важнасць Беларусі для Расіі. Выхад краіны з геастратэгічнай сферы Расіі значна аслабіць апошнюю і пазбавіць яе непасрэднага выйсця да Еўропы, што можа змяніць стратэгічны баланс сілаў у гэтым рэгіёне свету не на карысць Расіі: «Без Беларусі Расія будзе вымушана траціць значна больш сродкаў і высілкаў дзеля абароны заходняй мяжы і падтрымкі стратэгічнай абароны на сушы і ў паветры».

5. Непастаянны характар расійска-беларускіх адносін, што можа выкарыстаць Захад.

У сферы беларуска-расійскіх адносін стварылася парадаксальная сітуацыя. З аднаго боку, гаспадарчая і палітычная залежнасць Беларусі ад Расіі відавочна, але з другога — Лукашэнка робіць усё мажлівае, каб абмежаваць уплывы Масквы на ўнутранае становішча. Лукашэнка жадае максімальна абмежаваць расійскі фактар у беларускай палітыцы, але не можа гэтага зрабіць, бо страціць палітычную падтрымку Масквы. Ён добра разумее, што можа рабіць што заўгодна і праводзіць незалежную ад інтарэсаў Расіі палітыку, бо Масква не адважыцца на змену рэжыму, бо гэта можа прывесці да страты палітычнага кантролю, няхай і няпоўнага, над Беларуссю.

Мэйн упэўнены, што Беларусь і далей будзе паступова дыстанцыявацца ад Расіі, але толькі датуль, пакуль гэта не будзе пагражаць уладзе А. Лукашэнкі. Менавіта цяпер, калі вырашаецца лёс незалежнай дзяржавы, Беларусь апынулася адзін на адзін з Расіяй і не можа разлічваць на падтрымку Захаду ў выпадку нарастання палітычных супярэчнасцяў паміж Менскам і Масквой. Знакавым момантам у расійска-беларускіх адносінах стаў газавы крызіс 2004 года, калі Захад, у першую чаргу ЕС, пакінуў Беларусь без палітычнай падтрымкі. Такая пазіцыя сведчыць, што ЕС адмовіўся ад удзелу ў геапалітычнай

барацьбе за Беларусь і аддаў яе ў сферу ўплыву Расіі. Адзіным гульцом, якога непакоіць геапалітычная сітуацыя ва Усходняй Еўропе, засталіся ЗША, аднак і яны, на думку аўтара, занялі не зусім правільную пазіцыю што да Беларусі.

Дыстанцыяванне Беларусі ад Расіі выражаецца ў пошуках новых рынкаў збыту і крыніц энергіі. Гэта сьведчыць толькі аб тым, што А. Лукашэнка не давярае Маскве. Такая сітуацыя вельмі карысная для Захаду, каб абмежаваць уплыў Масквы на Беларусь. Аўтар упэўнены ў тым, што калі А. Лукашэнка атрымае падтрымку краін Заходняй Еўропы і ЗША, то ён адвернецца ад Расіі.

З гэтага можна зрабіць наступны вывад. С. Мэйн ставіць пытанне геапалітычнай незалежнасці Беларусі на першае месца, а пытанне ўнутрыпалітычнай сітуацыі на другое. Адрыў Беларусі ад Расіі рана ці позна прывядзе да зьмены рэжыму ў краіне, але пакуль Беларусь знаходзіцца ў сферы ўплыву Масквы, ніякія палітычныя трансфармацыі немажлівыя. Тым не менш, разумеючы палітычны сэнс сувязяў Лукашэнкі з Масквой, аўтар не кажа аб тым, што адыход ад Расіі пагражае палітычнай смерцю рэжыму, нават калі Беларусь увойдзе ў сферу ўплыву Еўропы.

Склалася парадаксальная сітуацыя. Нельга змяніць палітычны рэжым у Беларусі, пакуль яна цесна звязана з Расіяй, але, з другога боку, немагчыма вывесці Беларусь з-пад кантролю Масквы, пакуль краінай кіруе Лукашэнка.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2007 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2007/02/19
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 9 (49) - 2006**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам Форум

[image]

рэцэнзіі

[image]-[image]2006

ад Зыкату

ўдалітыка • гісторыя • літаратура • **рэцэнзіі**

[image] [image] [image]

АНДРАНІК АНТАНЯН

Андранік Антанян Вільня новалітоўскага пэрыяду

эсэіст. Жыве ў Вільні. Апошняя публікацыя ў «ARCHE» — рэцэнзія «Беларуская кніга ў міжваеннай Польшчы» (5/2005).

Tomas Venclova. *Vilniaus vardai*. — Vilnius: R. Paknio leidykla, 2006. — 333 p.

Новая кніга літоўскага паэта, перакладчыка, прафэсара Ельскага ўнівэрсытэту Томаса Венцлавы (н. 1937) «Імёны Вільні» — лягічны працяг яго папярэдняй краязнаўчай (у лепшым сэнсе гэтага слова) працы «Вільня», якая пабачыла сьвет чатыры гады таму, стала бэстсэлерам, перакладалася на пяць замежных моваў — дакладней, на ўсе турыстычныя мовы краю — і вытрымала не адно перавыданьне.

«Імёны Вільні» — гэта ці ня першая спроба ў гісторыі новалітоўскага пэрыяду Вільні сабраць пад адной вокладкай біяграфіі вядомых віленчукоў незалежна ад этнічнага паходжаньня ці вынесеных нашчадкамі ацэнак іх дзейнасьці. Для энцыкляпэдыста не бывае адмоўных пэрсанажаў. Біяграмаў сабралася больш за 550. Кніга падзеленая на дзевяць храналягічных пэрыядаў, і прадстаўнікі кожнага пададзеныя ў сваім разьдзеле паводле альфабэту. У выніку атрымалася энцыкляпэдычнае выданьне, якое фактычна ня мае аналягаў.

Што праўда, кніга не пазбаўленая пэўнага літуанацэнтрызму. І

гэта выяўляецца ня толькі ў тым, што артыкул пра Чурлёніса — мастака, якога любяць у Літве сапраўднай любоўю без асаблівых на тое падставаў, — у колькі разоў большы за артыкул пра Мсьціслава Дабужынскага, а ён зрабіў у фармаваньне Вялікага Віленскага Міту куды большы ўнёсак. Але Томас Венцлава адным зь першых паспрабаваў зафіксаваць на паперы поліфанічнасьць гэтага места.

Беларускага чытача перадусім цікавіць, як у гэтай стракатай мазаіцы пададзеная Беларусь.

І тут ёсьць чым цешыцца. Беларусы на старонках кнігі прысутнічаюць у больш чым прымальнай прапорцыі. Аднак тое, што беларушчына для сучаснага літоўскага інтэлектуала — зьява экзатычная, адбілася на якасьці падачы беларускага матэрыялу. Найперш зьвяртае на сябе ўвагу непасьлядоўнасьць у транскрыпцыі беларускіх імёнаў. У адным месцы беларускае «г» аўтар перадае як «h», у іншым — як «g». Тая самая гісторыя выйшла і з «ў», якое перадаецца то праз «v», то праз «u». Вынікам падобнага падыходу стала тое, што Вацлаў Ластоўскі ў кнізе фігуруе як Vaclav Lastouski (с. 198). На такую драбязу можна было б не зьвяртаць увагі, калі б падобная несыстэмнасьць у падыходзе назіралася і ў дачыненьні да іншых моваў. Аднак ані з польскай, ані з вугорскай такіх праблемаў не ўзьнікае.

Сьпіс беларускіх пэрсаналіяў атрымаўся даволі вялікі. Францішак Аляхновіч, Натальля Арсеньнева, Багушэвіч, Багдановіч, Антон Луцкевіч, Вацлаў Ластоўскі, Рыгор Шырма, Колас і Купала, Максім Танк, Браніслаў Тарашкевіч, Казімер Сваяк, Дамінік Сямашка… Хоць сьпіс гэты і прадстаўнічы, нельга не зьвярнуць увагі на некаторую яго выпадковасьць з ухілам у літаратурацэнтрызм. Пры ўсёй павазе да паэтычнага таленту Натальлі Арсеньневай мне цяжка знайсьці аргумэнты, чаму ў гэтым сьпісе апынулася менавіта яна, а не, скажам, яе школьны настаўнік Максім Гарэцкі, чый унёсак у беларускую літаратуру пераацаніць проста немагчыма. Чаму, напісаўшы грунтоўны артыкул пра Антона Луцкевіча, аўтар адвёў усяго пару сказаў ягонаму брату Івану (а той, як ні круці, зьяўляецца бацькам мадэрнай беларускай нацыі)? Вядома, Казімер Сваяк

— фігура ў беларускай хадэцыі вельмі важная, але пры адсутнасьці артыкулу пра Адама Станкевіча яна безнадзейна выпадае з кантэксту. Безумоўна, постаць Браніслава Тарашкевіча даволі значная ў беларускім пантэоне, але несправядліва выглядае адсутнасьць побач другога віленскага мовазнаўцы Янкі Станкевіча — таго, хто сфармуляваў базісныя прынцыпы беларускай артаграфіі (абодвух яе варыянтаў). Чамусьці ў шырокі віленскі нэкропаль ня трапіў ніводзін з братоў Іваноўскіх (Іванаўскасаў), чыімі біяграфіямі любяць ілюстраваць складанасьць нацыятворчых працэсаў на Віленшчыне.

Зьвяртае на сябе ўвагу і тое, што ў разьдзелах, прысьвечаных паваеннай Вільні, беларусаў зусім няма. Вядома, пасьля рэпрэсіяў 40—50-х гг. XX ст. беларускае жыцьцё выглядала даволі бляклым, але біяграмы мастака Пётры Сергіевіча або пісьменьніцы і лексыкографа Зоські Верас маглі б прыкметна дапоўніць карціну.

Аднак будзьма справядлівымі. На няпоўнасьць і суб'ектыўнасьць сьпісу маюць падставы наракаць ня толькі беларусы, але і астатнія народы, рэпрэзэнтаваныя ў «Імёнах Вільні», не выключаючы і літоўцаў. У кнігу ня трапілі (цяжка сказаць, зь якой прычыны) такія знакавыя фігуры савецкага пэрыяду, як мастак Стасіс Красаўскас і паэт Эдуардас Межалайціс.

Некаторыя ацэнкі, вынесеныя аўтарам, выклікаюць пытаньні. Фэномэн Багушэвіча палягае зусім ня ў тым, што ён «першы аўтар, які пісаў толькі па-беларуску». Якуб Колас ніяк не падпадае пад такое вызначэньне: «жвавага, крыху багемнага складу чалавек, быў адной з цэнтральных фігураў культурнага жыцьця віленскіх беларусаў» (с. 195). Гэтае азначэньне хутчэй пасуе да Янкі Купалы. Хоць дзеля справядлівасьці можна сказаць, што ў новабеларускай міталёгіі Купала і Колас, браты-блізьняты нашай літаратуры, стаяць так блізка, што ня кожны выпускнік беларускай школы іх адрозьнівае. Што праўда, пад «клясычнай спадчынай» Якуба Коласа ў Беларусі маецца на ўвазе перадусім «Новая зямля», якую ніяк не аднесьці да «раньніх твораў». Няма ў артыкуле пра Якуба Коласа і згадкі,

што ў савецкі час у Павільнісе пачаў быў арганізоўвацца мэмарыяльны дом-музэй беларускага песьняра, — праўда, цішком пераведзены ў каматозны стан падчас чарговай спробы літуанізаваць Вільню. Зрэшты, гэтая кніга і не задумлялася як крытыка культурніцкай палітыкі Літвы ў Вільні, яна — толькі далікатная спроба паказаць, ад якога кавалку спадчыны адмаўляюцца літоўцы.

Трапляюцца ў кнізе Томаса Венцлавы і пэўныя недакладнасьці. Унёсак Антона Луцкевіча ў вывучэньне літоўскіх статутаў і спадчыны Францішка Скарыны (с. 243) больш чым сымбалічны. Дзіўны пасаж сустракаецца і ў біяграфіі Максіма Танка: «Напрыканцы жыцьця пісаў пра злачынствы сталінізму, чарнобыльскую катастрофу, падтрымліваў барацьбу за правы беларускай мовы» (с. 260). Магчыма, Максім Танк і трымаўся такіх поглядаў, толькі іх асабліва не афішаваў.

Томас Венцлава старанна падкрэсьлівае сувязь беларусаў зь літоўскім асяродзьдзем Вільні, але зусім ніяк не закранае кантактаў літоўцаў зь беларусамі. Выключэньне складае артыкул пра друкара Марціна Кухту (Кукту). Атрымліваецца пэўная несувымернасьць. У артыкулах пра Коласа і Купалу паведамляецца, што яны кантактавалі зь Людасам Гіром[1], але ў артыкуле пра самога літоўскага паэта — ні слова пра яго кантакты зь беларускімі літаратарамі і беларускай літаратурай наагул. А яны былі, і назваць іх выпадковымі не выпадае. Цяжка сказаць з пэўнасьцю, ці гэта літоўскі чытач не дасьпеў да такой інфармацыі, ці аўтар проста не палічыў важным згадаць, што Владас[2] Дрэма працаваў у свой час у Віленскім Беларускім музэі, або што паэтка Она Міцютэ пісала, апроч літоўскай, і на беларускай мове.

Перакрыжаваныя спасылкі паміж артыкуламі — маюць, найменш прапрацаваная частка гэтай манаграфіі. У артыкуле пра Мацкевіча-Цата (с. 245) Томас Венцлава распавядае аўтараў, якія друкаваліся ў рэдагаванай Мацкевічам «Слова», аднак сярод іх ня згадвае Аляхновіча, хоць ён «Слове» і адбылася першая публікацыя ягонай найбольш вядомай кнігі «У кіпцюрох ГПУ». Магчыма, факт сяброўства паміж Максімам Танкам і Еспам Грыгулевічам ня

[1] Зрэшты, у артыкуле пра Гіра згадваецца яго ўдзел у «Слове» і адбылася першая публікацыя ягонай найбольш вядомай кнігі «У кіпцюрох ГПУ». Магчыма, факт сяброўства паміж Максімам Танкам і Еспам Грыгулевічам ня

[2] Як і «Власт».

[3] Гл. напрыклад: Аляхновіч Ф. Выбраныя творы / Укл., прадм. А. Сабалеўскага. — Менск, 2005. — 544 с.

ў біяграфіі аднаго і другога, але калі ў кнізе прысутнічаюць абодва, то пра іх стасункі варта было б згадаць, тым больш, што легендарны разьведчык караімскага паходжаньня неаднаразова іх падкрэсьліваў у сваіх успамінах. Прыклады можна працягваць.

Знаёмства дасьледчыка зь беларускай гістарыяграфіяй усё ж фрагмэнтарнае, і асноўныя матэрыялы для свайго слоўніка ён мусіў шукаць у іншых крыніцах. Але тое, што нібыта павінна было стаць грунтоўным недахопам кнігі, нечакана зрабілася яе плюсам. Слабое ўяўленьне Томаса Венцлавы пра ступень дасьледаванасьці біяграфіі Францішка Аляхновіча паспрыяла таму, што на старонках «Імёнаў Вільні» апублікаваны фрагмэнт дзёньнікавага запісу Мікалая Ромэра пра беларускага драматурга (с. 219) — той выйшаў друкам амаль дзесяць гадоў таму, аднак дасюль ня ўведзены ва ўжытак беларускімі літаратуразнаўцамі[3].

У мяне няма ніякіх сумневаў у тым, што кніга вытрымае не адно перавыданьне. Хацелася б спадзявацца, што хоць нейкая частка заўваг, агучаных у рэцэнзіі, будзе ў іх улічаная.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2007 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2007/02/19**
[image]

[image]
A R C H E **П а ч а т а к** **№ 9 (49) - 2006**
[image]
[image]
Пачатак Цалкам Форум
[image]
[image]-[image]2006
Пачатак
Цалкам
Форум
Пачатак
Цалкам
Форум
Пачатак
Цалкам
Форум

стахастычнасці генетычных працэсаў захавалі сваю стабільнасць» (с. 12). Працэс спадкавання генетычных структур мае сваю храналогію. Паказнікі абагульненых біягенетычных адлегласцяў і розніцы паміж сучаснымі сельскімі групамі дазволілі адшукаць след генетычнай памяці папуляцый. Вынік, атрыманы на аснове гэткага падыходу да аналізу генетычных матэрыялаў, дазволіў аўтару сцвердзіць, што: *«…Беларусы (папуляцыі карэнных жыхароў) вядуць свой радавод цягам не меней як 130—140 каленаў, гэта значыць пачынаючы амаль за 1,5 тысячы гадоў перад Н. Х.»* (с. 112). На сёння найбольш пашыраным гледзішчам на паходжанне беларусаў з'яўляецца метысная балцка-славянская гіпотэза, згодна з якой пошук пачаткаў прабеларускага этнасу мае карэлявацца з часам масавай славянскай міграцыі на землі, заселеныя балцкімі плямёнамі. Аднак працытаваная выснова сведчыць, што нашыя генетычныя вытокі звязаныя хутчэй з эпохай **да** меркаванага славянскага рассялення і сягаюць больш даўніх часоў — задоўга да гістарычна ды нават тэарэтычна дапушчальнага з'яўлення славянаў.

Між тым, сам А. Мікуліч мяркуе, што *«на нашай тэрыторыі славяне асімілявалі аўтахтонных балтаў, і гэтакім парадкам сфармаваўся прагенафонд сучаснага беларускага этнасу»* (с. 73). Якім жа чынам гэта стасуецца з папярэднімі высновамі і ці ёсць пэўныя доказы масавай міграцыі славянаў ды, адпаведна, асіміляцыі імі мясцовых балтаў? Як нам здаецца, у сваёй найноўшай працы аўтар усё ж не надаў належнай увагі гэтаму сапраўды ключавому моманту этнічнай гісторыі беларусаў. Фактычна, адзіным доказам славянскай міграцыі ў кнізе ёсць карта 12, якая нібы *«фіксуе сляды міграцыі ўсходніх славян з Балканаў праз Румынію, Украіну, Беларусь на паўночны захад, а потым, магчыма, на ўсход»*. Пры адсутнасці тлумачэння, чаму адлюстраваная там карціна мае карэлявацца з перыядам славянскай экспансіі, гэткае цверджанне не выглядае дастаткова абгрунтаваным. У іншым месцы чытаем, што *«Палессе можна разглядаць у якасці магчымай прарадзімы славян»* (с. 80), адкуль становіцца незразумелым, чаму ж тады ўсходнія славяне міграваліе на Беларусь не проста, а з Балканаў? Яшчэ раней пра (заходне)палескі арэал, які некаторымі навукоўцамі ўлучаецца ў абшар славянскай

прарадзімы, гаворыцца: *«Пазнейшая славянізацыя не паўплывала на старажытныя асаблівасці насельнікаў гэтага рэгіёну»* (с. 67). Такім чынам, сітуацыя з генетычнымі слядамі славянскай каланізацыі канчаткова заблытваецца. А гэта яшчэ раз змушае згадаць, што праўдзіваю праблемаю ёсць не гэтулькі высвятленне ролі балтаў у беларускім этнагенезе (яна відавочная), колькі ролі славянаў, таго, адкуль, калі і як адбываўся іх меркаваны міграцыйны рух[1].

Карты першай і другой галоўных кампанентаў зменлівасці генафонду Усходняй Еўропы (мал. 5—7) дэманструюць сувязь генафонду паўднёвых беларусаў і паўночных украінцаў з балканскім генафондам часоў неаліту ці ранняга бронзавага веку (с. 73). Маючы на ўвазе таксама наяўнасць слядоў паўднёвых еўрапеоідаў на беларускім Палессі, можна казаць пра даўнюю сувязь гэтай тэрыторыі з Балканамі. Аднак адпаведнай аргументацыі гэтая сувязь не можа быць беспасярэдне суаднесеная са славянскімі перасяленцамі. Акрэслены часавы перыяд стасуецца хіба са сведчаннямі адмысловых старажытных ізаглосных стасункаў балцкіх і фракійскіх моваў. Ёсць падставы меркаваць, што і паўночныя рысы, характэрныя для паўднёвых еўрапеоідаў, найбольш імаверна звязваць не са славянамі, а з некаторымі заходнябалцкімі плямёнамі, у прыватнасці, з ятвягамі[2]. Мікуліч не раз заўважае, што этнагенетычны працэс беларусаў адбываўся амаль на мяжы паўднёвых еўрапеоідаў з паўночнымі, але беларускі генафонд, маючы сваю адметнасць, *«цалкам захаваў генетычную памяць паўночнай еўрапеоіднай расы»* (с. 23), што адпавядае антрапалагічнай класіфікацыі частку беларусаў як належных да балтыйскай (паўночнаеўрапеоіднай) расы[3]. Цікава таксама, што ва першай галоўнай зменлівасці генафонду адпавядаюць на тэрыторыі Беларусі двух антрапалагічных тыпаў: валдайскага і палескага[4].

Аўтар, відаць, схільны атаясамліваць з’яўленне індаеўрапейцаў з балканскім генетычным «вектарам» і міграцыйным рухам паўднёвых еўрапеоідаў (с. 23, 74). Прадстаўнікі міжземнаморскага антрапалагічнага тыпу прысутнічалі на поўначы Усходняй Еўропы ўжо ў часы позняга неаліту[5]. Быў такім і

[1] Санько С. Балцкая сувязь // Дняпроўскі ўзбярэжжа. № 13. С. 153; Дзеркант А., Санько С. Этнагенез беларусаў: лінгвістыка і ідэалогія // Arche. 2005. № 5. С. 233—253; Дзеркант А., Санько С. Этнагенез беларусаў. II: Ясіндзкі след // Arche. 2006. № 3. С. 185—203.

[2] Гуляеў В. Заходнебалцкія ўплывы ў тапаніміцы Беларускага Падзвіння // Беларускае Падзвінне. Вып. 3. Віцебск, 1997. С. 5—11; Санько С. Балцкая сувязь // Дняпроўскі ўзбярэжжа. № 13. С. 153; Дзеркант А., Санько С. Этнагенез беларусаў: лінгвістыка і ідэалогія // Arche. 2005. № 5. С. 233—253; Дзеркант А., Санько С. Этнагенез беларусаў. II: Ясіндзкі след // Arche. 2006. № 3. С. 185—203.

[3] Гуляеў В. Заходнебалцкія ўплывы ў тапаніміцы Беларускага Падзвіння // Беларускае Падзвінне. Вып. 3. Віцебск, 1997. С. 5—11; Санько С. Балцкая сувязь // Дняпроўскі ўзбярэжжа. № 13. С. 153; Дзеркант А., Санько С. Этнагенез беларусаў: лінгвістыка і ідэалогія // Arche. 2005. № 5. С. 233—253; Дзеркант А., Санько С. Этнагенез беларусаў. II: Ясіндзкі след // Arche. 2006. № 3. С. 185—203.

[4] Гуляеў В. Заходнебалцкія ўплывы ў тапаніміцы Беларускага Падзвіння // Беларускае Падзвінне. Вып. 3. Віцебск, 1997. С. 5—11; Санько С. Балцкая сувязь // Дняпроўскі ўзбярэжжа. № 13. С. 153; Дзеркант А., Санько С. Этнагенез беларусаў: лінгвістыка і ідэалогія // Arche. 2005. № 5. С. 233—253; Дзеркант А., Санько С. Этнагенез беларусаў. II: Ясіндзкі след // Arche. 2006. № 3. С. 185—203.

[5] Гуляеў В. Заходнебалцкія ўплывы ў тапаніміцы Беларускага Падзвіння // Беларускае Падзвінне. Вып. 3. Віцебск, 1997. С. 5—11; Санько С. Балцкая сувязь // Дняпроўскі ўзбярэжжа. № 13. С. 153; Дзеркант А., Санько С. Этнагенез беларусаў: лінгвістыка і ідэалогія // Arche. 2005. № 5. С. 233—253; Дзеркант А., Санько С. Этнагенез беларусаў. II: Ясіндзкі след // Arche. 2006. № 3. С. 185—203.

рустнасельніцтва з Уйкаў на поўдзень, пра што сведчаць
[1] Аляксеева Т. І. Этногенез восточных славян по данным антропологии // Советская этнография. 1969. № 2. С. 3—17.
[2] Аляксеева Т. І. Этническая история восточных славян по данным антропологии (Опыт сравнительного исследования). М., 1973. С. 234, 242—243.
[3] Дерябина В. Е. Сорбская проблема: этногенез, этническая история, культура. Новосибирск, 2002. С. 44—45.
[4] Дерябина В. Е. Сорбская проблема: этногенез, этническая история, культура. Новосибирск, 2002. С. 44—45.
[5] Бокарев Е. А. Славяне и их соседи в конце I тысячелетия до н. э. — первой половине I тысячелетия н. э. М., 1959. С. 7.
[6] Дерябина В. Е. Сорбская проблема: этногенез, этническая история, культура. Новосибирск, 2002. С. 44—45.
[7] Не каранне генетычных адлегласцяў ад сярэдніх беларускіх
[8] Аляксеева Т. І. Этногенез восточных славян... С. 231.
[9] Денисова Р. Я. Антропологический состав восточных латышей и восточных литовцев. Автореф. дисс. канд. ист. наук. Москва, 1958. С. 9.
[10] Адметнасцю менавіта
[11] Денисова Р. Я. К истории формирования антропологического состава восточных латышей и восточных литовцев // Latvijas PSR Zinatņu Akadēmijas Vestis. 1958. № 3. S. 17—23.
[12] Kasperaviciute D., Kucinskas V., Stoneking M. Y Chromosome and Mitochondrial DNA Variation in Lithuanians // Annals of Human Genetics. Vol. 68. 2004. P. 438—452.
[13] Sistonen P., Virtaranta-Knowles K., Denisova R., Kucinskas V., et al. The LWb Blood Group as a Marker of Prehistoric Baltic Migrations and Admixture // Human Heredity. Vol. 49. 1999. P. 154—158.

lahkiem, gazeta „Vilniaus balsas“. 1997. 8 sk. P. 297—302.
[1] Аляксеева Т. І. Этногенез восточных славян по данным антропологии // Советская этнография. 1969. № 2. С. 3—17.
[2] Аляксеева Т. І. Этническая история восточных славян по данным антропологии (Опыт сравнительного исследования). М., 1973. С. 234, 242—243.
[3] Дерябина В. Е. Сорбская проблема: этногенез, этническая история, культура. Новосибирск, 2002. С. 44—45.
[4] Дерябина В. Е. Сорбская проблема: этногенез, этническая история, культура. Новосибирск, 2002. С. 44—45.
[5] Бокарев Е. А. Славяне и их соседи в конце I тысячелетия до н. э. — первой половине I тысячелетия н. э. М., 1959. С. 7.
[6] Дерябина В. Е. Сорбская проблема: этногенез, этническая история, культура. Новосибирск, 2002. С. 44—45.
[7] Не каранне генетычных адлегласцяў ад сярэдніх беларускіх
[8] Аляксеева Т. І. Этногенез восточных славян... С. 231.
[9] Денисова Р. Я. Антропологический состав восточных латышей и восточных литовцев. Автореф. дисс. канд. ист. наук. Москва, 1958. С. 9.
[10] Адметнасцю менавіта
[11] Денисова Р. Я. К истории формирования антропологического состава восточных латышей и восточных литовцев // Latvijas PSR Zinatņu Akadēmijas Vestis. 1958. № 3. S. 17—23.
[12] Kasperaviciute D., Kucinskas V., Stoneking M. Y Chromosome and Mitochondrial DNA Variation in Lithuanians // Annals of Human Genetics. Vol. 68. 2004. P. 438—452.
[13] Sistonen P., Virtaranta-Knowles K., Denisova R., Kucinskas V., et al. The LWb Blood Group as a Marker of Prehistoric Baltic Migrations and Admixture // Human Heredity. Vol. 49. 1999. P. 154—158.

[14] *Мікуліч А.І.* Фарміраванне генафонду беларускага этнасу ў кантэксце этнагенезу ўсходніх славян // Беларускі этнаграфічны зборнік. Вып. 3. Мінск, 1994. С. 9.

адрозненні ад іншых славянскіх этнасаў і генафондаў усходнеславянскіх народаў, у прыватнасці ад беларускага, а таксама ад балцкіх народаў Еўропы — літоўцаў, латышоў, вытокі якога прасочваюцца яшчэ з часоў неаліту[11].

Агулам жа шкала генетычных адлегласцяў выглядае наступным чынам: да беларусаў Падзвіння найбліжшымі ёсць насельнікі колішняга «крыўскага» арэалу — Пскоўшчыны, Наўгародчыны, Смаленшчыны, троху далей ад іх знаходзяцца папуляцыі Цэнтральнай Беларусі і Падняпроўя разам з жыхарамі паўднёва-ўсходняй Літвы і ўсходняй Латвіі, далей знаходзяцца заходнія беларусы Панямоння (разам з палякамі сумежжа, заходнімі літоўцамі, латышамі) і паўднёвыя папуляцыі Беларускага Палесся (с. 78—79).

У сувязі з гэтым досыць цікавай ёсць палеміка аўтара з расійскімі аўтарамі, у прыватнасці з тым, што ядро расійскага генафонду знаходзіцца на паўночным захадзе расійскага этнічнага арэалу з далучэннем часткі беларускага. На думку ж А. Мікуліча, карта блізкасці да беларускага этнасу насамрэч паказвае, што гэтыя два субарэалы аб’ядноўваюцца ў адзін — беларускі. У адрозненне ад беларускага, асноўны расійскі абшар не мае скансалідаванасці і вылучаецца значнай ступенню мазаічнасці (с. 79), а ў цэлым *«генафонд беларусаў істотна адрозніваецца ад рускіх»* (с. 78).

Спецыяльны раздзел у кнізе прысвечаны аднаму з найбольш перспектыўных кірункаў развіцця сучаснай этнагеномікі — даследаванню геаэтнічнага размеркавання ДНК-маркёраў, якое, магчыма, дазволіць вызначыць долю балцкага і славянскага элементаў у складзе сучаснага карэннага насельніцтва Беларусі. Але вывучэнне генафонду беларусаў у гэткай відалі толькі пачалося, а звесткі, прыведзеныя аўтарам, яшчэ патрабуюць памнажэння, ды для таго, каб быць скарыстанымі ў этнагенетычным даследаванні — параўнання з аналагічнымі паказнікамі суседніх этнасаў. Дарэчы, ужо ёсць публікацыі па абагульненым аналізе варыяцый мтДНК і Y-храмасомы літоўцаў, дзе адлюстраванае і лакальнае іх размеркаванне[12]. Надзвычай актуальным было б і даследаванне наяўнасці сярод беларусаў г. зв. «балцкага

гена»[13].

Методыка «генетычнага гадзінніка», выкарыстаная А. Мікулічам, не дазваляе зазірнуць глыбей за бронзавы век, але гэта не значыць, што біялагічны век беларускага этнасу пачынаецца толькі з гэтага часу, бо геаграфічная структура беларускага генафонду збольшага адпавядае арэалам старажытных археалагічных культур. Прыкладам, прыдзвінскі генагеаграфічны арэал накладваецца на тэрыторыю пашырэння неалітычнай нарваўскай культуры (IV—III тыс. да н. э.) і паўночнабеларускай культуры ранняга бронзавага веку (канец III — першая пал. II тыс. да н. э.), што ёсць дадатковым аргументам на карысць генетычнай непарыўнасці тутэйшага насельніцтва (с. 77). А ўся даўняя Беларусь, згодна з сярэдняўзважанымі эфектыўна-рэпрадуцыйнымі дэмаграфічнымі памерамі і паводле звестак пра восем антрапасістэм генетычных прыкмет, была заселеная продкамі сучасных беларусаў прыкладна 9 ± 1 тысяч гадоў таму (с. 16). Такім чынам, *«сучасных беларусаў з высокай доляй упэўненасці можна лічыць нашчадкамі мясцовага старажытнага насельніцтва»* (тамсама).

Усё гэта разам з найноўшымі дасягненнямі іншых навук змушае калі не перагледзець звыклыя схемы этнагенезу беларусаў, то, прынамсі, значна іх скарэгаваць. Перадусім гэта тычыцца ролі міграцый (асабліва славянскай) у этнагетычным працэсе. У змястоўнай манаграфіі А. Мікуліча няма пэўных доказаў масавай славянскай міграцыі на тэрыторыю будучай Беларусі, затое, наадварот, шмат простых ды ўскосных сведчанняў аўтахтоннасці беларусаў. У гэткім святле дадатковае абгрунтаванне атрымліваюць словы аўтара з іншай працы:

Не адмаўляючы ролі міграцыі ў фармаванні лакальных асаблівасцяў насельніцтва, мы лічым, што станаўленне гістарычных карэляцыяў паміж генадэмаграфічнымі прыкметамі неабходна разглядаць як працэс эвалюцыйна-экалагічнай залежнасці чалавека на працягу ўсёй яго жыццядзейнасці на канкрэтнай тэрыторыі. Хутчэй за ўсё, толькі праз біясацыяльныя адаптацыі маглі сфармавацца антрапалагічны

тып і генагеаграфія сучаснага насельніцтва Рэспублікі Беларусь і памежных з ёй тэрыторыяў[14].

Маем спадзявацца, што новыя і арыгінальныя тэзы, сфармуляваныя Аляксеем Ігнатавічам у гэтай кнізе, знойдуць сваё развіццё і працяг у наступных публікацыях, а інфармацыя, змешчаная тут, будзе карысная як для спецыялістаў, што займаюцца пытаннямі этнагенезу, гэтак і для ўсіх беларусаў, якія цікавіцца паходжаннем і этнічнай гісторыяй свайго народу.

[image]

[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2007 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2007/02/19

[image]